**Архіепіскап Апанас**
**(Антон Мартас)**

# НА НІВЕ ХРЫСТОВАЙ

**Архіепіскап Апанас**

# НА НІВЕ ХРЫСТОВАЙ:

у пяцідзесятыя ўгодкі
сьвятарства
1928 – 1978

Успаміны

Нью Ёрк – Менск – Варшава
2005

Успаміны арх. Апанаса выдадзены
зь ініцыятывы й коштам спадарства
Лізы Літаровіч, Надзі і Яна Запруднікаў
**(Нью Джэрзі, ЗША)**

Пераклад з расейскай мовы
*Аляксандра Гарбінская й Міраслава Шавыркіна*

Уступнае слова й навуковая рэдакцыя
*Юрась Гарбінскі*

Падрыхтоўка тэксту да друку й камэнтары
*Ларыса Задзяркоўская*

Карэктура
*Алесь Суша*

Кампутарная вёрстка
*Іна Кузьмянкова*

© Copyright by Belarusian Institute of Arts and Sciences in New York

Printed in U.S.A.

Сэрыя „Гісторыя  беларускага рэлігійнага жыцця"
Кніга № 4



*Цяпер з далёкай чужыны думкі мае мкнуцца да роднага краю і памяць рысуе мілыя сэрцу незабытыя малюнкі радзімы. Прад вачыма ажываюць беларускія векавечныя пушчы і драмучыя лясы з багацтвам птушынага царства і рознлікай зьвярыны, якія некалі вабілі польскіх каралёў і расейскіх цароў на паляваньне. Прыпамінаюцца неабсяжныя далі і старадаўныя шырокія гасьцінцы з сыпучымі пяскамі і плакучымі сталетнімі бярэзінамі, пасажанымі паабапал дарогі. І хто не таптаў гэтыя гасьцінцы – дарогі на іх доўгім вяку? Былі тут татары й палякі, швэды й французы, немцы й расейцы. Кажды з іх нешта пакінуў беларусам: татары – бізун, палякі – халеру, французы – пранцы, немцы – штунду, расейцы – зьнявагу маці ў лаянцы.*

*„Беларусь, Беларусь залатая", – сьвежа зьвіняць словы юнацкай песьні, чаруюча дзеюць на душу, распаляючы вагонь любві да радзімы. Але каб моцна яе любіць, трэба беларусам радзіцца і беларусам памерці, бо хто аброс чужым мясам ня ўмее любіць Беларусі.*

*арх. Апанас*

## Уступнае слова

У беларускай гісторыі ёсьць розныя гадавіны: радасныя, урачыстыя, часам – камічныя, часьцей – трагічныя. Адны зь іх сьвяткуем з гонарам ці смуткам. На іншыя забываемся або проста сарамліва абмінаем.

Увосені 2004 году споўнілася 100 гадоў з дня нараджэньня і 21 год з дня сьмерці архіепіскапа Апанаса, аднаго зь гіерархаў былога епіскапату Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (БАПЦ). Ягоная жыцьцёвая і сьвятарская біяграфія цесна зьвязаная зь беларускай гісторыяй, а ў паасобных месцах пакручаная часам і людзьмі.

Архіепіскап Апанас (у сьвецкім жыцьці Антон Мартас) нарадзіўся 8 верасьня (па новым стылі 21 верасьня) 1904 году ў засьценку Завітая Наваградзкага павету Менскай губэрні[1]. Паходзіў зь беларускай сялянскай сям'і. Сярэднюю адукацыю атрымаў у расейскай мужчынскай гімназіі ў Нясьвіжы. Ужо пазьней, на эміграцыі, успамінаючы пра родныя мясьціны, арх. Апанас напісаў:

„Наваградчына – мая радзіма. Завітая была маёю нянькаю, а Нясьвіж – настаўнікам. Тут прайшлі мае маладыя гады. Старэнькі дзед Макаш казаў мне сказкі пра былое, а Завітанскі лес разбудзіў у маім сэрцы любоў да красы прыроды ды навучыў Богу маліцца ў адзіноце. Няраз вячэрняю парою ясныя зоркі мне тайну Божую вяшчалі і жар малітвы ўзмацнялі. У экстазе гарачай малітвы здавалася мне, што ў нябёсах я бачу Бога. У Завітой я навучыўся верыць і маліцца. Адсюль жыцьцёвы шлях павёў мяне ў шырокі сьвет служыць Богу й людзям у духоўным стане"[2].

У 1925 годзе А. Мартас паступіў на праваслаўны багаслоўскі факультэт Варшаўскага ўнівэрсытэту. На 2-м курсе навучаньня ў Пачаеўскай Лаўры прыняў манаскі пострыг зь імем Апанас (Афанасій), а праз год быў высьвечаны ў сьвятары. У сьнежні 1930 году іераманах Апанас атрымаў першае прызначэньне і выехаў у Яблачынскі манастыр, дзе выконваў абавязкі заступніка ігумена ды кіраваў пры-

---

[1] Curriculum vitae of Archbishop Athanasios (Martos). Перахоўваецца ў архіве мітр. прот. М. Лапіцкага: Бібліятэка Радгэрскага ўнівэрсытэту ў Нью Брансвіку (Нью Джэрзі, ЗША).

[2] Архиепископ Афанасий, Беларусь в исторической государственной и церковной жизни. Книга в трёх частях. Буэнос–Айрес. Аргентина. 1966, с. 6.

тулкам для састарэлага духавенства. Тут аднак надоўга не затрымаўся. У верасьні 1931 году епархіяльныя ўлады перавялі іераманаха Апанаса ў мястэчка Туркавіцы на Холмшчыне з даручэньнем арганізаваць манастырскае падвор'е[3]. Потым былі чарговыя прызначэньні й пярэбары.

На пачатку сьнежня 1932 году малады сьвятар апынуўся ў г. Кельцы, што ў Цэнтральнай Польшчы, дзе па загаду вышэйшых духоўных уладаў займаў пасаду настаяцеля ў мясцовай праваслаўнай парафіі. У міжчасе ў Варшаўскім ўнівэрсытэце абараніў магістэрскую працу „Сьвяты Дзімітры, мітрапаліт Растоўскі як пастыр і настаўнік пастыраў" і атрымаў ступень магістра багасловя. Неўзабаве зноў чакала Варшава.

У кастрычніка 1934 году іераманаха Апанаса прызначылі выхавацелем у інтэрнаце для праваслаўных студэнтаў багасловскага факультэту ў тым-жа Варшаўскім унівэрсытэце, а пазьней усклалі на яго абавязкі інспэктара. Усё гэта ішло ў пары з малітвай і кніжкамі.

У 1936 годзе з навуковай ступеньню магістра іераманах Апанас закончыў вышэйшы курс пэдагогікі й прапэдэўтыкі на гуманітарным факультэце Варшаўскага ўнівэрсытэту. Тут, у Варшаве, атрымаў намінацыю на архімандрыта. Па-ранейшаму быў зьвязаны з роднай вучэльняй, дзе ў 1937 – 1939 гадах вучыўся ў дактарантуры й напісаў доктарскую дысэртацыю на тэму „Праваслаўнае Вызнаньне Веры (Вялікі Катэхізіс) Кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы".

Пачатак Другой сусьветнай вайны не дазволіў архім. Апанасу атрымаць навуковую ступень доктара праваслаўнага багасловя і прадоўжыць далейшую працу на Варшаўскім ўнівэрсытэце. У лютым 1940 году мітрапалітам Сэрафімам (Лядэ) ён зноў быў накіраваны ў Холмшчыну на пасаду настаяцеля праваслаўнай парафіі ў Туркавіцах, дзе ахвярна працаваў пры аднаўленьні жаночага манастыра[4].

Другая сусьветная вайна сталася пераломным момантам у далейшым жыцьці й сьвятарскім служэньні архім. Апанаса. У сакавіку 1942 году ён быў хіратанізаваны й атрымаў тытул епіскапа Віцебскага й Полацкага, але ў сувязі зь цяжкасьцямі ваеннага часу мусіў выконваць тымчасова абавязкі адміністратара Навагрудзка-Баранавіцкай епархіі. У гэтым часе актыўна выступаў за ўвядзеньне беларускай мовы ў праваслаўнай царкве ў Беларусі й заахвочваў да гэтага ніжэйшае духавенства. Браў таксама чынны ўдзел ва

[3] Curriculum vitae of Archbishop Athanasios (Martos), ibidem.
[4] Curriculum vitae of Archbishop Athanasios (Martos), ibidem.

Ўсебеларускім царкоўным саборы, які адбыўся ў жніўні-верасьні 1942 году ў Менску і аднавіў на Бацькаўшчыне дзейнасьць Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Варта аднак заўважыць, што пазьней, ужо як гіерарх Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царквы (РПЗЦ), арх. Апанас, спасылаючыся на царкоўныя каноны, бадай заўсёды катэгарычна адмаўляў факт аднаўленьня аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы на Ўсебеларускім царкоўным саборы ў Менску.

Эвакуацыя гіерархіі й духавенства БАПЦ у чэрвені 1944 году ў Нямеччыну запачаткавала апошні й найбольш драматычны разьдзел жыцьцёвай ды сьвятарскай біяграфіі арх. Апанаса. Ягоным кульмінацыйным момантам стаўся пераход беларускага епіскапату ў юрысдыкцыю Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царквы, што ў далейшым спрычынілася да палітычнага і царкоўнага падзелу беларускай эміграцыі ў вольным сьвеце на „крывічоў" і „зарубежнікаў"[5]. На жаль, ані адзін зь беларускіх епіскапаў, у тым ліку арх. Апанас, здаецца, так ніколі гэтага й не зразумелі.

Па-рознаму склаліся лёсы былых гіерархаў БАПЦ на эміграцыі. На пачатку 50-х гадоў у Нямеччыне адышлі ў вечнасьць галоўныя ініцыятары далучэньня беларускага епіскапату да Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царквы – мітрапаліт Панцялейман (Ражноўскі) і архіепіскап Горадзенскі й Беластоцкі Венэдыкт (Бабкоўскі) Абодва пахаваныя ў мясцовасьці Фельдмохэн каля Мюнхэну. Епіскап Павал (Мяленцьеў) перайшоў у каталіцтва й атрымаў тытул біскупа Гэраклiопальскага. У травені 1962 году ён трагічна загінуў у Бэльгіі, зьбіты аўтамабілем.

Архіепіскап Пінскі Аляксандар знаходзіўся ў перасыльных лягерох у Нямеччыне. У паразуменьні зь беларускім грамадзкімі й палітычнымі дзеячамі меўся ачоліць працэс аднаўленьня Беларускай Аўтакефаліі на чужыне. Зьвяртаў увагу на тое, што недастаткова мець епіскапаў, але ў першую чаргу „трэба мець дзесятак сьведамых беларусаў і абсадзіць імі сьвятарскія пасады ў беларускіх перасыльных лягерох"[6]. Дастаткова скептычна падыходзіў да высілкаў некаторых беларускіх сьвецкіх дзеячаў у справе вяртаньньня беларускіх епіскапаў з РПЗЦ. Памёр ён у лютым 1948 году ў Мюнхэне ў выніку цяжкіх цялесных пашкоджаньняў, пасьля таго як быў скіну-

[5] Гл.: Зьніч М. [Адамовіч Ант.], Здрада (або як запрадаўся былы беларускі япіскапат маскоўскаму зарубежжу), Нямеччына, 1948.

[6] Гл.: Вініцкі А., Матар'ялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне ў гг. 1939 – 1951. Частка II: Рэлігійныя справы, Лос Анжэлес, 1968.

ты зь лесьвіцы каля сваёй кватэры. Паводле беларускіх эміграцыйных колаў забойства арх. Аляксандра было арганізаванае агентамі савецкіх спецслужбаў у Нямеччыне.

Адносна спакойна, безумоўна, з пэўнай умоўнасьцю, склаўся лёс трох іншых гіерархаў БАПЦ. Архіепіскап Палескі й Берасьцейскі Іаан (Лаўрыненка) пасьля 1945 году служыў настаяцелем Сьвята-Ўладзімерскай царквы ў Марыенбадзе. У 1946 годзе арх. Іаан вярнуўся ў Савецкі Саюз. Быў епіскапам Пермскім (1946), архіепіскапам Алма-Ацінскім (1956), Чалябінскім і Златавускім (1957), Кастрамскім (1961). У 1961 годзе пайшоў на пэнсію. Памёр у кастрычніку 1985 году.

Епіскап Гомельскі й Мозырскі Грыгор (Барышкевіч) зь Нямеччыны выехаў у Паўночную Амэрыку. У 1947 годзе атрымаў тытул епіскапа Манрэальскага й Усходнеканадзкага. Рашэньнем Архірэйскага Сыноду РПЗЦ у 1954 годзе еп. Грыгор узначаліў Чыкаска-Кліўлендзкую епархію ў ЗША з тытулам архіепіскапа, а пазьней – епархію Чыкаска-Дэтройцкую і Сярэдняга Захаду. Памёр у кастрычніку 1957 году ў Чыкага.

Епіскап Смаленскі й Бранскі Сьцяпан (Севба) пасьля пераходу епіскапату БАПЦ у расейскае зарубежніцтва застаўся ў Заходняй Эўропе У пасьляваенныя гады жыў у Аўстрыі, займаючы пасаду епіскапа Венскага й Зальцбурскага. Памёр еп. Сьцяпан у 1965 годзе ў Зальцбургу.

Здаецца больш-менш шчасьліва склаўся лёс толькі адной асобы з былога епіскапату БАПЦ – арх. Філафея (Нарко). У сваім часе ён займаў высокія пасады ў Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царкве ў Эўропе і да выхаду ў 1982 годзе на адпачынак кіраваў Германскай епархіяй. Аднак і арх. Філафей паводле сьведчаньняў Надзеі Касмовіч, беларускай грамадзкай дзеячкі ў Нямеччыне, праз увесь час свайго пастырскага служэньня так і не прыняў да сваёй душы расейскага зарубежніцтва. Пры сустрэчах у вузкім коле суродзічаў у Штутгарце часта падкрэсьліваў, што тут, сярод сваіх, можа хоць на нейкі час уцячы ад расейшчыны й адчуць сябе беларусам. У 1971 годзе арх. Філафей меў намер вярнуцца ў Беларусь, пра што ў Берліне ў прыватнай размове паінфармаваў арх. Філярэта (Вахрамеева)*. Аднак такога кроку не зрабіў. Са сьмерцю арх. Філафея ў верасьні 1986 году ў Гамбургу адышло ў гісторыю яшчэ адно імя і яшчэ адна дата.

* Рэляцыя мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філярэта ад 22 сьнежня 2005 году для аўтара гэтых радкоў.

Свой досыць няпросты лёс меў і арх. Апанас. У другой палове 40-х гадоў ён браў актыўны ўдзел у арганізацыі рэлігійнага жыцьця ў беларускіх лягерох ДП у Нямеччыне. Неаднойчы еп. Апанас зьвяртаўся і ў Галоўную Кватэру УНРРА з просьбай зарганізаваньня яшчэ некалькіх асобных лягераў для беларусаў, што жылі ў польскіх перасяленчых асяродках Брытанскай акупацыйнай зоны Нямеччыны[7]. Вучыў рэлігіі ў беларускай гімназіі ў Ватэнштэце. У няпростых варунках жыцьця ў лягерах ДП знаходзіў магчымасьці й час, каб апрацаваць гісторыю Праваслаўнай Царквы ў Беларусі ў часе нямецкай акупацыі й выдаць два школьныя падручнікі па навучаньню рэлігіі. Ведаючы цяжкае матар'яльнае становішча беларускай моладзі на эміграцыі, прыняў рашэньне ўвесь даход ад продажу гэтых падручнікаў перадаць беларускім студэнтам[8].

У ліпені 1946 году ўказам Архірэйскага Сіноду Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царквы еп. Апанас быў прызначаны на кафедру епіскапа Венскага й Аўстрыйскага, але на ўласную просьбу быў вызвалены ад гэтага прызначэньня. У жніўні, паводле ўказу таго-ж Сіноду, ён узначаліў вікарыят Германскай епархіі РПЗЦ зь месцам жыхарства ў Гамбургу.

Напачатку 50-х гадоў прыйшоў час разьвітацца з Эўропай і выбрацца ў далёкі сьвет. Наперадзе чакалі поўныя экзотыкі Аўстралія, Аргэнтына, Парагвай і Ўругвай, а зь імі – новыя пасады, тытулы... і, на жаль, чарговыя канфлікты, крыўды, непаразуменьні. З паасобнымі гіерархамі, з вышэйшымі духоўнымі ўладамі Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царквы, урэшце зь вернікамі-расейцамі. Магчыма таму напачатку 60-х гадоў арх. Апанас разам з арх. Філафеем меў намер пакінуць расейскае зарубежніцтва і перайсьці ў юрысдыкцыю мітрапаліта Леонція (Туркевіча) з Амэрыканскай праваслаўнай мітраполіі. Аднак той былым епіскапам БАПЦ адмовіў.

Тымчасам да новых канфліктаў і абвінавачваньняў арх. Апанаса ў антырасейскасьці не ў апошнюю чаргу спрычынілася манаграфія арх. Апанаса „Беларусь в исторической государственной и церковной жизни" (Буэнос Айрес. Аргентина, 1966), прысьвечаная гісторыі палітычнага і царкоўнага жыцьця ў Беларусі й напісаная ў

[7] Ліст арх. Апанаса ад 27 траўня 1947 году да Беларускага Дапамаговага Камітэту ў Ватэнштэце. Перахоўваецца ў Беларускай Калекцыі Зоры й Вітаўта Кіпеляў (The Slavic and Baltic Division of the New York Public Library: *QM 99-5211 and *QM 99-5212).

[8] Ibidem.

расейскай мове. Кніжка выклікала вострыя закіды з боку значнай часткі расейскага эміграцыйнага духавенства й вернікаў[9]. Усё гэта прывяло да таго, што аўтара пазбавілі пасады й адправілі на адпачынак, а распаўсюджваньне манаграфіі рашэньнем Сыноду РПЗЦ у верасьні 1971 году забаранілі.

У адным з адкрытых лістоў і допісаў, якія ў 60-я і 70-я гады шырока публікаваліся ў расейскай эміграцыйнай пэрыёдыцы („Сеятель", „Русское Слово" і інш.), арх. Апанаса абвінавачвалі ў тым, што ён загадвае царкоўным старастам выносіць з расейскіх цэркваў на эміграцыі нацыянальныя расейскія сьцягі, здымаць расейскія нацыянальныя ленты з лампад перад іконамі Маці Божай і Госпада Ісуса Хрыста, зьмяняць лямпачкі на крыжы над алтаром, паколькі яны былі ўкладзены ў колерах нацыянальнага расейскага сьцягу. Вось што, у прыватнасьці, пісаў да арх. Апанаса аўтар аднаго з такіх „адкрытых лістоў":

„В своей проповеди Вы отметили, что в Церкви не должно быть ничего политического. Совершенно верно: для Вас, Ваше Высокопреосвященство, национальный русский флаг или ленты императорских орденов – это политика, тогда как для нас, Ваших прихожан, это святыни, ибо под трехцветным русским флагом умирали наши предки защищая свою Родину и кровью своею созданную Великую Россию. (...)

Вы никогда не поймёте наших чувств. Вы никогда не станете истинным пастырем Русской Зарубежной Церкви. Вот уже 25 лет как Вы епископ Православной Церкви. Но Вы за это время даже не сочли нужным выучить русский язык. Вы не наш, даже хуже того, Вы – наш враг. (...)

Можем ли мы забыть те оскорбления, которые Вы так щедро рассыпали по страницам „Беларуси" по отношению к нашей великой России?"[10].

Справа не абмежавалася толькі публікацыямі ў эміграцыйным друку. Паасобныя прадстаўнікі расейскай эміграцыі зьвярнуліся зь лістамі й пратэстамі да першагіерарха РПЗЦ Філярэта, мітрапаліта Ньюёрскага і Ўсходне-Амэрыканскага, а таксама да дзейных сяброў Сіноду РПЗЦ, у якіх называлі арх. Апанаса актыўным ворагам Расеі і заклікалі прыняць адпаведныя крокі:

---

[9] Гл.: Великоросс, Открытое письмо архиепископу Афанасию, „Сеятель", № 121, Буэнос Айрес, 1968, с. 15 – 17; Письмо в редакцию, „Сеятель", № 128, Буэнос Айрес, 1970, с. 2 – 4; 23 – 26.

[10] Великоросс, ibidem.

„Книга „Беларусь” обьясняет всё: арх. А. Мартос был и есть активный враг Национальной России! Самостийник, забывающий в своей злобе и ненависти, что он, если и не русский, то всё же архиерей Православной Церкви ! (...)

Для каждого, кто внимательно и беспристрастно прочтёт „Беларусь”, будет совершенно ясно, что, насколько её автор любит свою родину Белоруссию, настолько он ненавидит Россию. Россия – страна многонациональная, но все национальности, продолжая любить свою родину (армяне – Армению, грузины – Грузию, белоруссы – Белоруссию, и т. д.) считают себя неотъемлемой частью России. Иными словами, все национальности, объединенные под скипетром Русских Императоров, и составляли Российскую Империю, которую они любили, как родную мать. Были и есть, конечно, и шовинисты-сепаратисты, ненавидевшие Россию, мечтавшие и мечтающие от неё отделиться. Именно к таковым и относится архиепис-коп Афанасий Мартос”[11] Копія ліста ініцыятаўнай групы расейскіх эмігрантаў з Буэнас Айрэс ад 15 верасьня 1970 году.

Дзеля аб’ектыўнасьці варта аднак заўважыць, што сярод расейскіх эмігранцкіх колаў у Аргентыне, у тым ліку і з асяродзьдзя зрусыфікаванай часткі тутэйшых беларусаў, было шмат тых, хто з прыхільнасьцю прыняў манаграфію арх. Апанаса. Гэта яны пазьней арганізоўвалі „Общество почитателей его Высокопреосвященства Архиепископа Афанасия”, а ў эміграцыйным друку актыўна баранілі ад абвінавачваньняў у антырасейскасьці і аўтара, і яго публікацыю[12].

Сваю ацэнку кнізе арх. Апанаса дала й беларуская эміграцыя. У лісьце да мітр. прот. Мікалая Лапіцкага беларускі пісьменьнік і грамадзка-культурны дзеяч Юрка Віцьбіч, не без іроніі, заўважаў:

„Шчыра кажучы, ня ведаю, для каго арх. Апанас прызначыў гэтую сваю даволі блытаную кніжку. Ні беларусаў, ні расейцаў яна не ў стане задаволіць. Пэўне ён прыпушчаў, што пасьля ейнага зьяўленьня зможа апынуцца па-за Расейскай Зарубежнай Царквой. Сумняваюся таксама ў тым, што зь ейнай дапамогай ён меркаваў атры-

[11] Копія ліста ініцыятаўнай групы расейскіх эмігрантаў з Буэнас Айрэс ад 15 верасьня 1970 году да мітрапаліта Філярэта, першагіерарха РПЗЦ. Перахоўваецца ў архіве арх. Філафея (Гамбург, Нямеччына).

[12] Гл.: Белая Книга. Жизнь и деятельность Архиепископа Афанасия. Издание Общества почитателей его Высокопреосвященства Архиепископа Афанасия. Buenos-Aires – Agosto, 1971; Отзывы о книге „Беларусь в исторической государственной и церковной жизни”. Архиепископа Афанасия Мартоса. Издание защиты церкви им. преп. Афанасия, игум. Брестского, Buenos-Aires – Agosto, 1973.

мацьрэгабілітаваньне ад усіх беларусаў, як колішні здрайца беларускае нацыянальнае справы. І можа варта цяпер „Юрию Стукаличу” узяць, наўсуперак свайму жаданьню, ягоную кніжку пад абарону, каб расейцы, якія здаўна й дагэтуль ставяцца да мяне з асаблівым „замілаваньнем”, зь яшчэ большай упартасьцю ўзяліся-б за выдаленьне ейнага аўтара са свайго асяродзьдзя.

А далей што? Кніжка архіепіскапа Апанаса „Беларусь”, нават з адпаведнымі й вельмі істотнымі папраўкамі, на якія аўтар ніколі ня згодзіцца, спазьнілася на дваццаць з гакам год”[13].

Вычарпаны псыхічна, у жніўні 1971 году ў рапарце Сабору епіскапаў Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царквы па справе свайго звальненьня на пакой арх. Апанас пісаў:

„Архиерейский Синод официально объявил после всяких перемен и колебаний, что 26 августа / 8 сентября сего 1971 года открывается сессия Собора Епископов в гор. Монтреале Канадском.

Не предвидя возможности лично присутствовать на предстоящем Соборе вследствие своего заштатного положения и отсутствия денежных средств на дальнее путешествие, я решил обратиться к Собору Епископов на имя каждого Преосвященного в отдельности с настоящим РАПОРТОМ и усердно просить познакомиться с его содержанием и сделать соответствующее решение.

В нем я обращаю внимание на два важных постановления Архиерейского Синода, которые оказались роковыми в моей жизни в последние два года и лишили меня епископской кафедры и духовной паствы.

Весь материал, относящийся к этому делу, излагаю в том виде, в каковом он в действительности был — без преувеличения или искажения.

Не считаю сей свой РАПОРТ формальной апелляционной жалобой на Архиерейский Синод, потому что это было бы бесцельно, но представляю его Преосвященным для сведения и усмотрения по совести.

Не ищу и не ожидаю сочувствия, но имею основание надеяться на справедливое и объективное отношение ко мне Преосвященных, с которыми обменивался лобзанием братской любви и предстоял у св.престола в храме Божием.

---

[13] Ліст Ю. Віцьбіча ад 26 кастрычніка 1967 году да мітр. прот. М.Лапіцкага. Перахоўваецца ў архіве мітр. прот. М. Лапіцкага: Бібліятэка Радгэрскага ўнівэрсытэту ў Нью Брансвіку (Нью Джэрзі, ЗША).

По своему делу я писал много писем, рапортов и докладов в Архиерейский Синод на имя Высокопреосвященного Митрополита Филарета и многих Преосвященных, но в ответ получал гробовое молчание, свидетельствовавшее о равнодушии и безучастии к моему положению.

В этом отношении я уподоблялся внучку, посылавшему свое скорбное письмо к дедушке на деревню, или просителю, безнадежно стучавшему в наглухо запертую дверь. Такое отношение настроения не поднимает. Между мною и Синодом возникла стена, которую, по пословице, „лбом не прошибить”[14].

Чым былі выкліканы такія адносіны вышэйшых царкоўных уладаў РПЗЦ да арх. Апанаса? Красамоўны адказ на гэтае пытаньне дае карэспандэнцыя вышэйшых гіерархаў РПЗЦ, а менавіта, ліставаньне арх. Сэрафіма зь мітрапалітам Філярэтам. Датычыла яно справы магчымага прызначэньня арх. Апанаса ў Германскую епархію РПЗЦ у Эўропе. У адным зь лістоў з гэтай карэспандэнцыі арх. Сэрафім перасьцерагаў ад такога кроку мітрапаліта Філярэта і пісаў: „Глубоко уверен, что если передать Германию двум закадычным приятелям [меліся на ўвазе арх. Філафей і арх. Апанас. – заўвага наша. Ю.Г.], которые совершенно случайно оказались в нашей Русской Зарубежной Церкви и ее терпеть не могут, то они без особого сопротивления передадут Германию Никодиму, особенно если тот их оставит правящими. Ведь просились они лет 10 тому назад к Леонтию. Только тот их не принял. Можно ли рисковать, чтобы арх. Афанасий погубил нам и Германию? Довольно его художеств в Аргентине и в Австралии!...”[15].

Варта зазначыць, што арх. Апанас быў бадай што адзіным зь епіскапаў былога епіскапату БАПЦ, які пасьля пераходу ў Расейскую Зарубежную Царкву стараўся не парываць сувязяў зь беларускім праваслаўнымі вернікамі на эміграцыі. У сярэдзіне 50-х гадоў менавіта ён адгукнуўся на ініцыятывы беларускага царкоўнага актыву ў Паўночнай Амэрыцы. У 60-я і 70-я гады падтрымліваў ідэю аднаўленьня аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы на эміграцыі ў юрысдыкцыі Канстантынопальскага Патрыярхату. Ажыцьцяўлень-

---

[14] Копія рапарту арх. Апанаса Сабору епіскапаў Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царквы. Перахоўваецца ў архіве арх. Філафея ў Гамбургу (Нямеччына).

[15] Копія ліста арх. Сэрафіма з Чыкага ад 11 лютага 1971 году да мітрапаліта Філярэта, першагіерарха РПЗЦ. Перахоўваецца ў архіве арх. Філафея ў Гамбургу (Нямеччына).

не гэтага пляну зьвязваў з царкоўным актывам беларускіх парафіяў Сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рыверы (ЗША) і ў Таронта (Канада). У сувязі з гэтым у лісьце да Віталя Цярпіцкага, беларускага грамадзкага і царкоўнага дзеяча ён пісаў: „ ...Усёю душою і ўсім сэрцам я хацеў-бы быць з Вамі зь беларусамі, сваімі суродзічамі й таму над гэтым даўно ўжо думаю, як зрэалізаваць гэта, бо не ад мяне цалком гэта залежыць, а ад двух важных фактараў: прыхільнае становішча Сыноду Зарубежнай Царквы да майго адыходу, і прыхільнае становішча Сыноду ў Канстантынопалі да мяне. Я не магу самавольна нічога зрабіць, знаходзячыся на службе, як япархіяльны архіярэй. Як я быў у Аўстраліі на пакоі, дык тагды першы фактар мною быў-бы залагоджаны, а другі залежыў ад Канстантынопаля. Я чакаю магчымасьці й аказыі выйсьці ізноў на пакой, а тагды ўзяцца да зрэалізаваньня нашага супольнага пажаданьня адносна мяне. Трэба чакаць. Іншага выхаду няма. Сынод ніякай адпускной граматы мне ніколі ня дасьць, ды яшчэ цяпер. А калі Канстантынопаль упрэцца на гэтую фармальнасьць, дык я магу павіснуць у паветры”[16]. На жаль, з прычынаў кананічных гэтых задумаў па аднаўленьню аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы на эміграцыі зрэалізаваць не ўдалося. Шмат у чым да таго спрычынілася й непасьлядоўнасьць самога арх. Апанаса, які так і ня змог прыняць канчатковага рашэньня й вярнуцца да сваіх. Жыцьцё былога гіерарха БАПЦ тымчасам паціху дагасла ... сярод чужых.

Архіепіскап Апанас адышоў у вечнасьць 3 лістапада 1984 году ў Буэнас Айрэсе (Аргентына). Пахаваны на могілках пры манастыры Сьвятой Тройцы Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царквы ў мясцовасьці Джорданвілл (штат Нью Ерк, ЗША).

* * *

Архівы царкоўных інстытуцыяў і прыватныя эмігранцкія калекцыі перахоўваюць у сабе яшчэ сотні таямніцаў. Адна зь іх нечакана аказалася зьвязанай з арх. Апанасам і ягонымі невядомымі ўспамінамі. Дзесьці напрыканцы 80-х гадоў, ужо пасьля сьмерці аўтара, іх фатаграфічны асобнік трапіў у Канаду да мітрафорнага пратаіерэя Паўла Вялікага. У 90-я гады з успамінаў была зробленая копія і перасланая ў Саўт Рывэр (ЗША) да Віталя Цярпіцкага і гэткім чынам праз яго стала вядомая аўтару гэтых радкоў.

---

[16] Ліст арх. Апанаса ад 13 сакавіка 1973 году да В. Цярпіцкага. Перахоўваецца ў прыватным архіве В. Цярпіцкага ў Саўт Рывэры (Нью Джэрзі, ЗША).

Успаміны напісаныя ў расейскай мове й прысьвечаныя пяцідзесяцігодзьдзю пастырскага служэньня арх. Апанаса ў манаскім сане (1928 – 1978) ды 75-м угодкам з дня яго нараджэньня. Яны былі выдадзеныя на пачатку 80-х гадоў невялікім накладам з выкарыстаньнем капіравальна-фатаграфічнай тэхнікі, аб чым зазначаў ва ўступным слове іх аўтар. Тытульны ліст успамінаў выглядае наступным чынам:

Архиепископ Афанасий
НА НИВЕ ХРИСТОВОЙ
Пятидесятилетний юбилей священнослужения
1928 – 1978
Издательство общества
Преподобномуч. Афанасия, игумена брестского
1981

Кніга ўспамінаў арх. Апанаса складаецца з васемнаццаці разьдзелаў і распавядае пра ягонае жыцьцё і сьвятарскую працу ў міжваенны перыяд у Польшчы, а таксама ў часе Другой сусьветнай вайны. Але бадай асноўная іх частка прысьвечаная душпастырскай дзейнасьці на эміграцыі. На пачатку – у Нямеччыне, а пазьней – у Аўстраліі ды Аргентыне. Асобным фрагмэнтам ва ўспамінах выдзелены разьдзел, прысьвечаны памяці сяброў. Напрыканцы зьмешчаны сьпіс апублікаваных працаў і артыкулаў арх. Апанаса.

Па-рознаму сёньня ўспрыме кнігу ўспамінаў і старэйшае пакаленьне беларускай эміграцыі, і маладзейшыя. Так, зрэшты, неадназначна як успрымаў перажытае і сам аўтар: „На маю долю выпалі важныя царкоўныя ды палітычныя падзеі ва ўсім сьвеце, якія моцна ўскладнілі маё служэньне Царкве. Народжаны й ахрышчаны ў лоне Расейскай Праваслаўнай Царквы царскіх часоў, духоўна я ўсёж узрастаў у мацярынскіх абдымках Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, дзе прыняў манаства і атрымаў ласку быць высьвечаным у сьвятары. У сан епіскапа мяне ўзьвялі й хіратанізавалі ў цяжкі ваенны час у роднай маёй Беларусі, дзе стваралася Беларуская Праваслаўная Царква як самастойная царкоўная адзінка, незалежная ні ад Масквы, ні ад Варшавы, ні ад Берліна. Так было на радзіме, але на эміграцыі цягам 35-ці гадоў Бог судзіў мне праходзіць сваё архіпастырскае служэньне ў лоне Расейскай Праваслаўнай Зарубежнай Царквы.

Усе згаданыя Цэрквы былі для мяне як-бы марскімі маякамі, што асьвятлялі мой шлях плаваньня па бурапенных хвалях жыцьцёвага

мора. Яны не былі мэтаю маёй духоўнай кар’еры дзеля зямнога дабрабыту. Нейкая злая сіла перасьледавала мяне на ўсіх этапах майго жыцьця і дзейнасьці. Асабліва гэта моцна і трагічна выявілася ў апошнія дзесяцігодзьдзі майго архіпастырскага служэньня на чужыне. Разважаючы пра гэты перыяд майго служэньня Царкве, мне думаецца, не зграшу, калі прывяду як параўнаньне словы сьв. апостала Паўлы: „Беды ад паганцаў, - якімі былі слугі богаборчых сілаў; беды псеўдабраціі, - якая апранала мантыю маіх судзьдзяў”. У такіх выпадках я маліўся і чэрпаў сілы ў словах Хрыста: „Дабрачасныя вы, калі будуць вас ганьбіць і гнаць і ўсякім словам ліхім несправядліва зьневажаць за Мяне” (Мц.5,11). Нейкую фатальную ролю адыгралі ў маім жыцьці й архіпастырскім служэньні на эміграцыі тры гарады, тры сучасныя Бабілёны: Буэнас Айрэс, Сіднэй і Нью Ерк. Паводле графічнай сімболікі яны ўтвараюць кабалістычную форму трохкутніка вяршыняю ўніз. Гэтыя гарады пакінулі глыбокі сьлед у маім жыцьці асабліва на старасьці гадоў.

На змрочным фоне пражытага ўспамінаецца мне маладосьць, сьветлая і радасная, якая праімчала хутка і непрыкметна. Адклалася ў памяці служэньне царкве ў сане іераманаха і архімандрыта. Гэтыя гады былі шчасьліваю парою ў маім жыцьці. Сёньня ўспамінаю пра іх зь вялікаю тугою. (...)

Усё пражытае, зь мінулага і сёньняшняга, падштурхнула мяне напісаць гэтыя радкі й апублікаваць іх для сяброў, якія магчыма яшчэ жывуць у Буэнас Айрэсе, Сіднэі, у Паўночнай Амэрыцы і на маёй паняволенай Бацькаўшчыне”.

Лёс не ашчаджаў арх. Апанаса пры жыцьці, гісторыя – пасьля сьмерці. Зрэшты, як і ўвесь епіскапат Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, які ў лютым 1946 году ў Заходняй Нямеччыне пакінуў на чужыне без духовай апекі тысячы беларусаў-бежанцаў і ў поўным складзе перайшоў у Расейскую Праваслаўную Зарубежную Царкву. У лістападзе 1983 году, падаючы вестку пра сьмерць аднаго з былых гіерархаў БАПЦ, рэдакцыя беларускага рэлігійнага часапісу „Царкоўны Сьветач”, не прамінула нагадаць, што пераход епіскапа Апанаса спрычыніўся да ягонай асабістай трагедыі, „бо ён ведаў аб тым, што служачы Праваслаўю ўва ўлоньні Расейскае Царквы, рабіў шкоду Беларусі”. Адышоўшы ад беларусаў, арх Апанас так ніколі й ня стаўся „сваім” для чужога расейскага духавенства. І ўсёж са сваёй царкоўна-гістарычнай спадчынай ён належыць да беларускай гісторыі. Ня толькі як яе творца ды трагічная ў сваіх памылках-шуканьнях постаць. Але яшчэ як і перасьцярога для іншых.

Можа таму, больш чым сімвалічна, сёньня ўспрымецца сэнс тых шчымлівых радкоў, якія на эміграцыі якраз напісаў аднойчы арх. Апанас:

„Цяпер з далёкай чужыны думкі мае мкнуцца да роднага краю і памяць рысуе мілыя сэрцу незабытыя малюнкі радзімы. Прад вачыма ажываюць беларускія векавечныя пушчы і драмучыя лясы з багацтвам птушынага царства і розналікай зьвярыны, якія некалі вабілі польскіх каралёў і расейскіх цароў на паляваньне. Прыпамінаюцца неабсяжныя далі і старадаўныя шырокія гасьцінцы з сыпучымі пяскамі і плакучымі сталетнімі бярэзінамі, пасажанымі паабапал дарогі. І хто не таптаў гэтыя гасьцінцы – дарогі на іх доўгім веку? Былі тут татары й палякі, швэды й французы, немцы й расейцы. Кажды з іх нешта пакінуў беларусам: татары – бізун, палякі – халеру, французы – пранцы, немцы – штунду, расейцы – зьнявагу маці ў лаянцы.

„Беларусь, Беларусь залатая", – сьвежа зьвіняць словы юнацкай песьні чаруюча дзеюць на душу, распаляючы вагонь любві да радзімы. Але каб моцна яе любіць, трэба беларусам радзіцца і беларусам памерці, бо хто аброс чужым мясам ня ўмее любіць Беларусі".

Напрыканцы хачу выказаць словы асаблівай удзячнасьці Лізе Літаровіч, Надзі Запруднік і др. Яну Запрудніку (Саўт Рывэр, ЗША) – мэцэнатам гэтай публікацыі, а таксама шчырую падзяку др. Вітаўту Кіпелю (Нью Ёрк, ЗША), мітр. прот. Паўлу Вялікаму й матушцы Зоф'і (Бэры, Канады), Віталю Цярпіцкаму, Міхасю й Валі Сенькам (Саўт Рывэр, ЗША), Эмігідыю Рыжаму (Асінінг, ЗША).

*Нью Ёрк, лістапад – сьнежань 2005*

Юрась Гарбінскі

Faci quod potui,
faciant meliora potentas...

## Прысьвячэньне

Гэтую сьціплую працу прысьвячаю пяцідзесятым угодкам свайго пастырскага служэньня ў манаскім сане і 75-годзьдзю свайго жыцьця...

Да такога веку я змог дажыць па Волі Божай, хоць шмат разоў стаяў вочы ў вочы перад сьмерцю. Але Хрыстос Выратавальнік захаваў мяне і паставіў на пастырскае, а пазьней і архіпастырскае служэньне ў Сьвятой Ягонай Царкве. І гэты абавязак служэньня нясу ўжо палову стагодзьдзя і буду несьці яго да таго моманту, пакуль Усемагутны не пакліча мяне да жыцьця вечнага.

На маю долю выпалі важныя царкоўныя ды палітычныя падзеі ва ўсім сьвеце, якія моцна ўскладнілі маё служэньне Царкве. Народжаны і ахрышчаны ў лоне Расейскай Праваслаўнай Царквы царскіх часоў, духоўна я ўсё ж узрастаў у матчыных абдымках Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Польшчы[1], дзе прыняў манаства і атрымаў ласку быць высьвечаным. У сан епіскапа мяне ўзьвялі і хіратанізавалі ў цяжкі ваенны час у роднай маёй Беларусі, дзе стваралася Беларуская Праваслаўная Царква як самастойная царкоўная адзінка, незалежная ні ад Масквы, ні ад Варшавы, ні ад Бэрліна. Так было на радзіме, але на эміграцыі цягам 35-ці гадоў Бог судзіў мне праходзіць архіпастырскае служэньне ў юрысдыкцыі Расейскай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы[2]. Усе згаданыя Цэрквы былі для мяне як бы марскімі маякамі, што асьвятлялі шлях майго плаваньня па бурапенных хвалях жыцьцёвага мора. Яны не сталіся мэтаю маёй духоўнай кар'еры дзеля зямнога дабрабыту.

Нейкая ліхая сіла перасьледавала мяне на ўсіх этапах майго жыцьця і дзейнасьці. Асабліва гэта моцна і трагічна выявілася ў апошнія дзесяцігодзьдзі майго архіпастырскага служэньня на чужыне. Разважаючы пра гэты пэрыяд майго пастырства, мне думаецца, не зграшу калі прывяду як параўнаньне словы сьв. апостала Паўла: “Беды ад паганцаў, – якімі былі слугі багаборчых сілаў; беды ад ілжэбраціі, – якая апранала мантыю маіх судзьдзяў”. У такіх выпадках я маліўся і чэрпаў сілы ў словах Хрыста: “Шчасьлівыя вы, калі будуць вас ганьбіць і гнаць, і ўсякім словам ліхім несправядліва зьневажаць за Мяне” (Ев. Мацьв. 5, 11).

Нейкую фатальную ролю адыгралі ў маім жыцьці і архіпастырскім служэньні на эміграцыі тры гарады, тры сучасныя Вавілоны: Буэнас-

Айрэс, Сіднэй і Нью Ёрк. Паводле графічнай сымболікі яны ўтвараюць кабалістычную форму трохкутніка вяршыняй уніз. Гэтыя гады пакінулі глыбокі сьлед у маім жыцьці на старасьці гадоў.

На змрочным фоне перажытага ўспамінаецца мне маладосьць, сьветлая і радасная, якая праімчала хутка і непрыкметна. Захавалася ў памяці служэньне Царкве ў сане гераманаха і архімандрыта. Гэтыя гады былі шчасьлівай часінай у маім жыцьці. Сёньня ўспамінаю пра іх зь вялікай тугою і зь нейкай асаблівай шчымлівасьцю, што перапаўняе сэрца. Гэты стан маёй душы найлепш перадаюць радкі Цютчава:

Нет дня, чтобы душа не ныла,
Не изнывала б о былом.
Искала слов и не находила,
И сохла, сохла с каждым днём.

Усё перажытае, зь мінулага і сёньняшняга, падштурхнула мяне напісаць гэтыя радкі і апублікаваць іх для сяброў, якія, магчыма, яшчэ жывуць у Буэнас-Айрэсе, Сіднэі, у Паўночнай Амэрыцы і на маёй паняволенай Бацькаўшчыне.

Успаміны друкую ў абмежаванай колькасьці экзэмпляраў. З гэтай прычыны карыстаюся не друкарскімі, а фатаграфічна-капіравальнымі прыладамі.

*Аўтар*

## Замест прадмовы

## Даведка пра прозьвішча Мартас

У “Энциклопедическом Словаре” Бракгаўза і Эфрона, а таксама ў “Большой Энциклопедии” Южакова, выдадзеных на пачатку нашага стагодзьдзя ў Санкт-Пецярбургу, знаходзім наступныя зьвесткі: „Мартас – галоўны горад у гішпанскай правінцыі Хаэн, старажытнае места, забранае ад маўраў у 1225 годзе Фердынандам III і перададзенае Ордэну Калатравы. У той жа правінцыі ўзвышаецца гара, якую таксама называюць “Мартас”. Ад назвы гэтага гішпанскага горада атрымалі сваё прозьвішча маркізы дэ Мартас у Гішпаніі. Адтуль паходзіць вядомы дзяржаўны дзеяч з прозьвішчам Мартас – дон Крыстына (1830 – 1893). Іншыя прозьвішчы Мартасаў з Гішпаніі ў энцыкляпэдыі ня трапілі. Іх, па ўсім відаць, было гэтулькі, колькі ў Расеі Івановых ці Пятровых.

У Расейскай імпэрыі прозьвішча Мартас зьявілася ад гішпанскага эмігранта, які першапачаткова атабарыўся на поўдні – на Ўкраіне. А ўжо адтуль яго нашчадкі разьнесьлі прозьвішча па розных расейскіх гарадох. Так, напрыклад, Аляксей Іванавіч Мартас (1790 – 1840) – пісьменьнік і гісторык, які напісаў працу “История Малороссии” ў 3-х тамах і лісты пра Ўсходнюю Сыбір, а таксама шэраг іншых кніг; Іван Пятровіч Мартас (1750 – 1835) – вядомы скульптар, рэктар Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбургу. Найбольш значныя яго працы – помнік Мініну і Пажарскаму ў Маскве, помнікі Аляксандру I у Таганрогу, Рышэлье ў Адэсе, Пацёмкіну ў Херсоне, Ламаносаву ў Халмагорах, агромністая бронзавая статуя сьв. Яна Хрысьціцеля ў портыку Казанскага сабора ў Санкт-Пецярбургу ды іншыя. Іван Раманавіч Мартас (1760 – 1831) вучыўся ў Кіеўскай духоўнай акадэміі. Містык і масон Мартас, камянец-падольскі памешчык, які ў 1860-х гадох выдаў зборнік вершаў “Кабзар” украінскага народнага паэта Тараса Шаўчэнкі. Генэрал Мартас (1914 – 1918) – удзельнік Першай сусьветнай вайны, паходзіў з Палтавы. Мартас – міністар Украінскай Рэспублікі ў 1918 – 1919 гадох. Памёр на эміграцыі.

Як відаць з гэтага пераліку-агляду, прозьвішча Мартас было пашырана пераважна на Ўкраіне. Украінскія нацыяналісты лічаць яго сваім, украінскім.

У Заходняй Беларусі прозьвішча Мартас задамавілася толькі ў адной мясцовасьці – у маёнтку барона Гартынга ў вёсцы Круты Бераг, дзе служыў мой дзед Дамінік Францавіч. Яго адзіны сын, Вікенцій

Дзям'янавіч Мартас (1868 – 1922), быў маім родным бацькам.

Падчас знаходжаньня ў Буэнас-Айрэсе (Аргентына) я знайшоў у тэлефоннай кніжцы гэтага гораду 46 асобаў з прозьвішчам Мартас. Усе яны гішпанскага паходжаньня. Гэта прозьвішча сустрэлася мне ў тэлефоннай кніжцы ў Нью Ёрку, а таксама ў Сіднэі (Аўстралія).

Напрыканцы магу сказаць, што мае далёкія продкі былі гішпанцамі, але ў Расейскай імпэрыі яны цягам часу забыліся на сваё паходжаньне і карані. Мой дзед наўрад ці гаварыў па-гішпанску. Ва ўсялякім выпадку, бацька пра гэта ніколі не згадваў. Не было ў нашым доме і гішпанскіх традыцый. У маладосьці я ня ведаў і нават не падазраваў, што маё прозьвішча замежнае – гішпанскага паходжаньня.

## Разьдзел першы

## Родныя далячыні

Родныя мясьціны страчаныя для маіх вачэй назаўсёды. Яны засталіся толькі ў памяці. Ваенная віхура нечакана наляцела на мірных жыхароў маёй радзімы і зьнішчыла іх дабрабыт, а многіх зь іх забіла ці выгнала ў далёкі і невядомы край. Тыя, што выратаваліся і аселі на чужыне, хутка забыліся на свае родныя мясьціны, а дзеці іх зрабіліся "бязроднымі іванамі". І толькі нямногія па-ранейшаму сумуюць па сваёй далёкай бацькаўшчыне.

Памяць пра родныя мясьціны мае істотнае значэньне для мяне. Іх нельга проста так выкрасьліць. Яны ўзнаўляюцца ў маёй памяці ва ўсёй сваёй прыгажосьці і веліччы. Словы паэта А. Жукоўскага пра радзіму знаходзяць жывы водгук у маім сэрцы. Як далікатна і шчымліва яны гучаць:

Страна родная, где мы впервые
вкусили сладость бытия:
Поля, холмы родные, родного неба милый свет,
Златые игры детских лет и первых лет уроки, –
Что вашу прелесть заменит?
О, родина святая! Какое сердце не дрожит,
Тебя благословляя?

Мы жылі на Бацькаўшчыне і па-сапраўднаму яе не шанавалі. Але апынуўшыся на чужыне, чулае сэрца ірвецца да родныя палёў і залатых ніў. Польскі паэт Адам Міцкевіч, жывучы ў эміграцыі, далёка ад сваёй радзімы, пачаў паэму "Пан Тадэвуш" такімі словамі:

O Litwo! Ojczyzna moja.Ty jesteś jak zdrowie…
Ile ciк trzeba ceniж ten tylko siк dowie,
Kto ciк stracii…

Адам Міцкевіч нарадзіўся і некаторы час жыў у фальварку Завосьсе на Наваградчыне (Заходняя Беларусь).

Беларуская паэтка Алаіза Пашкевіч (псэўданім Цётка) праславіла сваю радзіму тужлівымі словамі жалю:

Люблю мой край, старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,

Дзе першы раз пазнала шчасьце,
Бяду нядолі спажыла.

Мая радзіма – Навагрудчына, ці Наваградчына. З тых самых мясьцінаў паходзілі паэты Адам Міцкевіч і Якуб Колас (Канстанцін Міцкевіч). Яны былі блізкімі землякамі, але рознае выхаваньне зрабіла іх чужымі: першы стаўся патрыётам польскім, а другі – беларускім.

Маляўніча выявіў у паэме родныя краявіды Якуб Колас:

Там шуршат тростники, и бубнят бугаи,
И где травы, как море, легли.
Если лес там – так лес!
В девять дней не пройдешь,
А простор, как простор,
И конца не найдешь,
Не охватишь и взглядом земли!

Спрадвеку Наваградчына славілася лясамі і бурлівымі рэкамі. Там мелі жытло шматлікія зьвяры і птушкі, а ў рэках і азёрах вадзіліся рыбы і бабры. Непраходныя лясы і кашлатая пушча былі яе скарбам. Таму Наваградчыну ў далёкім мінулым называлі Чорнай Русьсю[3], у адрозьненьне ад Белай Русі[4], дзе лясоў было менш.

Наваградчына была цэнтрам утварэньня Вялікага Княства Літоўскага[5] ў трынаццатым стагодзьдзі. Межы яго цягнуліся да Чорнага мора і ўключалі Ўкраіну і ўсю Беларусь. Нястомным творцам гэтай дзяржавы быў вялікі князь Гедымін[6], які заснаваў сваю сталіцу ў Наваградку і пабудаваў умацаваны палац, што ўзвышаўся на гары. Пачынаючы ад паловы XV стагодзьдзя ў Наваградку мелі сваю катэдру кіева-літоўскія мітрапаліты. Іх катэдральным саборам быў Барыса-Глебаўскі храм. Ён захаваўся да сёньняшняга дня, хоць неаднойчы падлягаў на працягу стагодзьдзяў архітэктурным зьменам. Частку гораду, дзе стаіць гэты сабор, і сёньня называюць “Мітраполіяй”.

Калі гаворым або пішам пра Вялікае Княства Літоўскае і яго сталіцу Навагрудак, ці па-гістарычнаму Наваградак, варта зьвярнуць увагу на адну з істотных памылак гісторыкаў, якія пісалі працы пра гэтую дзяржаву. Гэта памылка заключаецца ў няправільнасьці выкарыстаньня назвы “літоўскі”. У той далёкі час, калі стваралася Вялікае Княства Літоўскае, жылі тут плямёны люцічаў, якіх палякі называлі “вільцы”, а заходнія гісторыкі называлі іх “вялетамі”. Плямёны люцічаў былі славянскімі плямёнамі, продкі якіх насялялі калісьці мясьціны Лабы ці Эльбы ў Нямеччыне. Гэтыя плямёны нападалі на сваіх суседзяў – крывічоў і дрыгавічоў, якія празвалі іх за лютасьць і жорсткасьць лютвой. Гэтую назву сказілі ў “літву” і пачалі ўжо з лёгкай рукі называць “літвой”. Але літоўскае племя – неславянскае і мае

сваю адметную мову. Цяперашніх літоўцаў ў гістарычным мінулым называлі жмудзінамі, а іх зямлю – Жмудзьдзю, ці Самагітыяй[7]. Гэтае важнае гістарычнае пытаньне разглядалі ў сваіх працах вучоныя Нідэрле Любор і чэскі дасьледчык Павел Шафарык. Дзяржаўнай мовай у Вялікім Княстве Літоўскім была старабеларуская, а не літоўская (сёньняшняя), а тым больш старажытная.

Пасьля гэтай гістарычнай даведкі перайду да апісаньня маіх родных мясьцінаў, якія называліся засьценак Завітая. Ён ня мае старажытнага радаводу. Але адміністрацыйныя ўлады называлі Завітую вёскай. Жыхароў у ёй было няшмат і ўсе яны жылі паасобку, на сваіх хутарах. Ня мелі асабліва цёплых адносінаў з суседзямі, але і не варагавалі. Кожны жыў сваім сямейным жыцьцём. Моладзь зьбіралася на забавы ў сьвяточныя дні, наладжвала часам вечарынкі, танчыла і весялілася. Пакуль мае браты былі нежанатыя, гэта адбывалася ў нашай хаце, дзе мелася вялікае памяшканьне. Гэта дало мне магчымасьць рана пазнаёміцца з народнымі звычаямі, гульнямі, танцамі ды часьцяком браць удзел і самому.

У засьценку Завітая мой бацька меў сваю гаспадарку і новую добраўпарадкаваную сядзібу. Прасторны двор ахіналі гаспадарчыя пабудовы: гумно, хлявы, сьвіраны ды іншае. Усё гэта стварала нейкую асаблівую ўтульнасьць. Па двары хадзілі коні і каровы, бегалі авечкі, сабакі, каты, сьвіньні, куры, гарлапанілі пеўні. І не было між імі ані бойкі, ані спрэчкі. На ноч усё жывое заганялася ў стайні і хлявы. Уночы засьценак адведвалі ваўкі, і трэба было берагчы скаціну.

Сядзіба стаяла на ўласнай зямлі, якая цягнулася шырокай паласой на два з паловай кілямэтры. Яе ўпрыгожвалі мурожныя сенажаці, папары, гаі, а таксама магутныя дубы, разложыстыя елкі і дзікія грушы. Яны былі помнікамі вялізнаму кашлатаму лесу, што калісьці ў даўнія часы рос на гэтым месцы. Лес часткова быў высечаны ўласьнікамі Гагенлое і Вітгенштэйнамі, а зямля прададзеная Мінскаму пазямельнаму банку, які пазьней прадаваў яе сялянам пад ворыва. За кілямэтар ад нашай сядзібы знаходзіўся смаляны завод (ці смольня), дзе рабілі дзёгаць, смалу і шкіпінар. Усюды на полі тырчэлі вялізныя карчы, што засталіся ад сьпілаваных дрэваў. Работнікі выкарчоўвалі іх, складалі ў купы і перавозілі да смалярні. Добра памятаю гэтую смольню. Маё сяброўства з сынам гаспадара смольні, Абрамам, дазволіла мне добра пазнаёміцца са смольняй і яе вырабамі. Дарога, якая праходзіла побач са смольняй і далей бегла каля нашай сядзібы, называлася Жыдоўскай. Яна была абсаджаная дрэвамі і кустамі, што надавалі ёй асаблівую прыгажосьць.

Сядзіба майго бацькі знаходзілася ля скрыжаваньня дзьвюх галоўных дарог: Жыдоўскай і Лясной. Да яе падступаў вялікі Завітанскі лес,

частка якога належала майму бацьку. У гэтым лесе я любіў зьбіраць суніцы, чарніцы, арэхі і грыбы, якіх расло шмат. У лясным гушчары хаваліся ваўкі і лісы, а па дрэвах скакалі жвавыя вавёркі. Увесну прыемна было слухаць зязюлю зь яе адвечнай песьняй: “ку-ку, ку-ку”. Варкавалі тут дзікія галубы і дзяўблі па дрэвах дзятлы. Увогуле, у нашым лесе кіпела бурлівае жыццё і забаўляла тых, што жылі ў яго ваколіцы. Як памятаю, асабліва жудасным было завываньне ваўкоў уначы, якія зазвычай бегалі зграямі перад Калядамі.

Завітанскі лес цягнуўся на восем кілямэтраў і межаваў з маляўнічым гасьцінцам Нясьвіж – Гарадзея. Гэты гасьцінец праходзіў за кілямэтар ад нашай сялібы. У дзяцінстве я любіў выходзіць на яго і слухаў гул тэлефоннага дроту, лічыў паласатыя верставыя слупы, а таксама глядзеў на рэдкія пасажырскія фурманкі, пра якія казалі: “Шэсьць жыдоў ня воз, абы конь павёз”. Аўтамашын тады не было. Пра іх ніхто нічога ня ведаў.

Бацька мой купіў зямлю ў Завітой, куды перасяліўся зь вёскі Круты Бераг. Сваю сялібу ён будаваў з любоўю, цяжка працаваў не пакладаючы рук. Сям’я наша была невялікая, таму даводзілася наймаць работнікаў. Мы жылі і ня ведалі вялікіх клопатаў. Да часу.

Улетку 1914 года пачалася Першая сусьветная вайна[8]. У Завітой пра яе даведаліся праз мабілізацыю навабранцаў. З плачам і роспаччу сем’і разьвітваліся з роднымі, якія ішлі на вайну. Гэта я дасканала памятаю, бо меў тады ужо 10 гадоў. Вайна неўзабаве прынесла і ў нашу сям’ю вялікае гора: у палове жніўня таго ж года загінуў на Мазурскіх азёрах ва Ўсходняй Прусіі мой старэйшы брат Канстанцін, які раней служыў вайскоўцам у горадзе Коўна. Удавою засталася яго маладая жонка Вольга, прыгажуня, з аднагадовым сынам-сіратой. Аднак пра гэта нам паведамілі значна пазьней.

Вайна панішчыла і нашу гаспадарку: коней і кароў на свае патрэбы забралі вайсковыя ўлады. Мы задавальняліся тым мізэрным, што заставалася. Усё поле не апрацоўвалася і ляжала пусткай. На ім неўзабаве завяліся мышы і краты, а з часам разгаспадарыліся зайцы і курапаткі. Паляўнічых не было.

Першымі вестунамі вайны сталіся бежанцы з Польшчы і Гарадзеншчыны, якія каля нашага двара ехалі абозамі па Жыдоўскай дарозе ў Расею. Пасьля іх, увесну 1915 года, па гэтай самай дарозе на Заходні фронт ішлі супраць немцаў расейскія вайсковыя часткі – са сваімі сьцягамі ў чахлах, з аркестрамі і музыкай. За першымі салдатамі ехалі доўгай стужкай абозы: спачатку двухколкі з чырвонымі крыжамі, а потым фурманкі з амуніцыяй і рэчамі ды палявыя кухні. Мы з непрыхаванай цікавасьцю назіралі за гэтай працэсіяй, стоячы ля весьніц свайго двара і гледзячы на тых, што праходзілі ці пра-

яжджалі. Жонка майго брата Вольга плакала, згадваючы свайго мужа, які загінуў на фронце. Часам праяжджалі атрады данскіх і арэнбурскіх казакоў на конях, з доўгімі пікамі ў руках. Часта бывала, што яны заяжджалі на наш панадворак і адпачывалі.

У 1916 годзе Заходні фронт замацаваўся каля Баранавічаў, за 40 кілямэтраў ад Завітой. Гарматная страляніна чуваць была асабліва вечарамі і начамі, што выклікала пачуцьцё трывогі і панурасьці. Здавалася, што вось-вось наблізіцца фронт. Так ужо аднойчы было, калі ўлады выдалі загад насельніцтву ў Завітой быць падрыхтаванымі да ад'езду ў бежанства[9]. З гэтай прычыны насушылі жытніх сухароў і склалі неабходныя рэчы на вазы, чакаючы кожную хвіліну ад'езду ў далёкую дарогу. Але гэтага ня здарылася.

У хуткім часе Завітая ператварылася ў вайсковы лягер. На лясной палянцы ля нашай сялібы пабудавалі зямлянкі для запаснога батальёна, у якіх пасяліліся салдаты, а ў нашай хаце разьмясьцілі афіцэраў. На полі паблізу зрабілі ангары з аэрадромам, дзе садзіліся маленькія ваенныя аэрапляны. На ўзгорках вакол усталявалі зэнітныя гарматы, зь якіх абстрэльвалі нямецкія аэрапляны, што ясным надвор'ем высока праляталі над Завітой. Неяк аднойчы позьнім вечарам зьбілі нямецкі цэпэлін. Нямецкая разьведка высьветліла, што ў Завітой разьмешчаны вайсковы лягер, і аднойчы скінулі бомбы, якія разарваліся далёка ў лесе. Мірнае насельніцтва Завітой жыло, як на фронце: штодзённа стральба з гарматаў, разрывы ў паветры снарадаў, сьвіст асколкаў, што ляцелі на зямлю, а часам і неразарваных снарадаў. Усё гэта непакоіла людзей. Мне, юнаку, давялося такое ўбачыць і перажыць.

Каля зямлянак была пабудаваная паходная царква, у якой прыежджы сьвятар праводзіў богаслужэньні. Мае родныя не хадзілі туды: не прызвычаіліся, лічылі, што гэта толькі для салдатаў. Але я стараўся заўсёды прысутнічаць на тых богаслужэньнях.

Для забаваў прыяжджалі да салдатаў артысты і ставілі для іх у лесе, у зьбітых з дошак тэатрах, спэктаклі. Гледачы разьмяшчаліся пад адкрытым небам. Праўда, салдаты зрэдку наведвалі гэтыя імпрэзы.

Надышоў трывожны люты 1917 года. У Расеі выбухнуў бунт рабочых[10]. У нашай Завітой узбунтаваліся салдаты і на парадзе дэманстратыўна не адказвалі камандзіру батальёна на яго прывітаньне. Адказвалі толькі адзінкі. Дзеншчыкі афіцэраў, якія кватаравалі ў нашай хаце, выразалі з залачонай паперы літары і на чырвонай палатніне паўставалі словы: “Няхай жыве свабода!”, “Далоў вайну!”. Дзе яны выстаўлялі гэтыя палатніны, я ня ведаю, але на наступны дзень усе зьніклі – і афіцэры, і іх дзеншчыкі, і салдаты. Зямлянкі апусьцелі. Увесну сяляне іх разабралі, а драўляны матэрыял разьвезьлі. Доўга яшчэ стаяла адзінока царква, але і яе таксама разабралі на матэры-

ял. Мой бацька абгарадзіў плотам месца, дзе яна знаходзілася. Жыццё наша працякала нармальна, і мы ня ведалі, што ў Петраградзе і Маскве насельніцтва галадала, бунтавала і ўрэшце скінула цара. У нашай Завітой было спакойна.

За сем вёрстаў ад нашай сялібы знаходзіўся горад Нясьвіж, старажытны і слаўны сваім гістарычным мінулым. У ім стаяў велічны замак князёў Радзівілаў, пабудаваны ў 1580-х гадох. Яго акружалі азёры, крапасныя равы (фосы), напоўненыя вадою, і высокія валы. У даўнія часы гэты замак быў непрыступны для ворагаў, але ў наш час ён – толькі гістарычны помнік. Замак стаяў на ўскрайку места, ад якога ішла шырокая грэбля-алея, абсаджаная шматвяковымі ліпамі. У 1916 – 1917 гадох у замку разьмяшчаўся штаб 11-й арміі Заходняга фронту. Савецкія камуністычныя ўлады пасьля Другой сусьветнай вайны, у 1945 годзе, ўмацавалі на франтоне замка табліцу з надпісам: "У гэтым замку 1 лістапада 1917 года адкрыўся армейскі зьезд бальшавікоў 11-й арміі Заходняга фронту. На зьезьдзе быў абраны ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які прыняў асобую дэкларацыю ў арміі". Тамсама прадстаўлены фотаздымак гэтага зьезду. На ім відаць побач з шарагоўцамі афіцэры ўсіх рангаў з афіцэрскімі пагонамі.

Заходні фронт разваліўся. "Абаронцы" радзімы кінулі яго і пасьпяшаліся дамоў дзяліць памешчыцкія землі. Замест расейскай арміі, што пакінула фронт, прыйшлі немцы. Яны акупавалі Беларусь і Ўкраіну. Невялікі атрад іх прыехаў у Завітую і правёў рэвізію па гаспадарках і хатах. У майго бацькі канфіскавалі пародзістую кабылу-матку, а замест яе пакінулі сваю, сьляпую на адно вока, якую мы празвалі "германкай". Яна аказалася разумнай кабылкай.

На пачатку 1919 года нямецкія войскі вярнуліся ў Нямеччыну[11]. Да нас прыйшлі бальшавікі. З гэтага цешылася, перад усім, габрэйскае насельніцтва. Габрэйская моладзь ладзіла мітынгі і рэвалюцыйныя маніфэстацыі па вуліцах з чырвонымі сьцягамі. Хрысьціянскае насельніцтва не паказвалася на вуліцах. Яно чакала. Гандаль, што належаў да габрэяў, спыніўся. Не было ў продажы солі, газы, мукі, цукру, запалак і іншага. Але вясковыя жыхары прыстасаваліся да абставінаў: запалкі замянялі крэсівам, газу – лучынай, мыла – лугам з попелу, каву – дубовымі жалудамі, гарбату – ліпавым цьветам і г. д. У гарадах у гэтым пляне было непараўнальна горш.

У лютым 1919 года польскія легіёны прагналі бальшавікоў, якія сышлі ў Расею. Габрэі засмуціліся, прыціхлі. Пачалася польска-бальшавіцкая вайна[12]. У нашай мясцовасьці фронт перасоўваўся і мяняўся: да нас прыходзілі то палякі, то бальшавікі-чырвонаармейцы. Палякі канфіскоўвалі ў вёсках сена і сьвіньняў, а чырвонаармейцы – хлеб і што патрапіць. Бальшавіцка-польская вайна завяршылася ў ліста-

падзе 1920 года. Неўзабаве ў Рызе была падпісаная мірная дамова[13]. Дзякуючы лясам вакол Завітой, мы мелі сваю жывёлу, якую ў часе небясьпекі хавалі ў лясным гушчары.

Надышоў мірны час, і эканамічнае становішча пачало паляпшацца. Наладзіўся гандаль і зьявіліся тавары, якія раней хавалі ў склепе. Мае родныя мясьціны – Наваградчына і Завітая – апынуліся ў межах Польскай дзяржавы. Да нас прыйшлі палякі і Польшча. Бальшавікі засталіся на ўсходзе за мяжой, якая прайшла за 20 кілямэтраў ад Завітой. Насельніцтва прыстасоўвалася да новых, гэтым разам польскіх парадкаў.

## Разьдзел другі

## Рэлігійнасьць

Пісьменьнікі, якія вучыліся ці закончылі духоўныя сэмінарыі і акадэміі, звычайна маўчаць у аўтабіяграфіях пра сваю рэлігійнасьць у юнацкія гады. Калі ж прыгадваюць, то спасылаюцца на праведнасьць сваіх бацькоў ці бабуль, якія ўплывалі на разьвіцьцё іх рэлігійных пачуцьцяў. Ствараецца ўражаньне, што гэтае пачуцьцё прыходзіць звонку. На самай справе яно закладзена ў душу чалавека ад нараджэньня.

Усемагутны Бог запаліў іскру рэлігійнай веры ў душах першых людзей Адама і Евы пры іх стварэньні. І гэты рэлігійны пачатак перадаецца ў спадчыну ад бацькоў да дзяцей і, такім чынам, ахоплівае ўсіх людзей. У выніку такога закону немаўля, нарадзіўшыся ад сваіх бацькоў, мае ўсе ўласьцівасьці чалавечай прыроды, у тым ліку і рэлігійнае пачуцьцё. Таму дзіця, ледзь толькі зьяўляецца ў яго сьвядомасьць, выяўляе жывую цікаўнасьць да Бога. Момант, калі абуджаецца такая цікаўнасьць, залежыць ад асабістых здольнасьцяў дзіцяці, а таксама ад вонкавых абставінаў, у якіх выхоўваецца і гадуецца дзіця.

Адпрыроднае рэлігійнае пачуцьцё паказвае на тое, што нерэлігійных дзяцей няма, як няма адпрыродных атэістаў. Нерэлігійнымі становяцца ў наступныя гады свайго жыцьця пад уплывам бацькоў-нявернікаў, нерэлігійнай сям’і, антырэлігійнага атачэньня і недастатковага рэлігійнага выхаваньня дома і ў школе.

Сучасныя атэісты ці бязбожнікі маюць сваю рэлігію, хоць і не прызнаюць яе. Адхіляючы ісьціну быцьця Бога як Творцы Сусьвету і ўсяго жывога, у тым ліку і чалавека, яны вераць у матэрыю і адпаведна сваёй веры прадвызначаюць сваё стаўленьне да яе. Але прызнаючы матэрыю замест Бога, яны скажаюць сваё рэлігійнае пачуцьцё, уласьцівае іх прыродзе. Вера ў матэрыю ёсьць карыкатурай сапраўднай рэлігіі.

Адпрыроднасьць рэлігійнага пачуцьця яскрава вызначыў адзін філёзаф наступнымі словамі: “Першабытны чалавек ня сонца, ня месяц, ня зоркі прызнаў багамі, але Боскасьць прызнаў у сонцы, месяцы і зорках”, г. зн. пад уплывам бачных нябесных сьвяцілаў адпрыродную ідэю рэлігійнага пачуцьця ўвасобіў у названых сьвяцілах.

Гісторыя чалавецтва сьведчыць, што поўнай адсутнасьці богашанаваньня і імкненьня да ўзаемнасьці з Боскасьцю нельга ўказаць ні ў адным чалавеку, за выключэньнем ідыётаў, дурняў і псыхічна не-

нармальных людзей. Сучасныя бязбожнікі таксама зьяўляюцца хворымі істотамі ня толькі духоўна, але і разумова.

Рэлігійнае пачуцьцё можна часова страціць, засыпаць яго попелам нікчэмных спакусаў, заганаў і памылковых поглядаў. Але зусім згасіць яго немагчыма. Заганы і спакусы прыводзяць грэшніка ў такі стан, калі ён прыпадабняецца да бясслоўнай жывёліны, траціць аблічча і падабенства Божае. Для выратаваньня такога грэшніка патрэбная дапамога Божая, бо сваімі сіламі ён ня здольны падняцца на духоўную вышыню і вырвацца з бездані падзеньня. У стан падзеньня ён трапляе пад уплывам антырэлігійнай прапаганды, матэрыялістычнага вучэньня і памылковасьці ўласнага розуму. Але Гасподзь Бог не жадае сьмерці грэшніка і даруе яму Сваю выратавальную сілу. Божая выратавальная сіла даецца таму грэшніку, які здольны яе прыняць і падняцца духоўна.

Ледзь толькі кранулася выратавальная сіла Божая полагу грэшніка, у душы яго зьдзяйсьняецца пералом ці пераварот. Тады расьсейваецца туман яго бязбожнасьці, разгараецца іскра веры ў Бога, якая прасьвятляе яго розум і прыводзіць да Бога. Прыкладаў падобных ператварэньняў мы ведаем шмат.

Нашы развагі пра сілу і дзеяньне рэлігійнага пачуцьця – не тэарэтычныя, адцягненыя, а заснаваныя на духоўным досьведзе ў жыцьці падзьвіжнікаў і сьвятых мужоў. Свой духоўны вопыт яны засьведчылі ў сваіх творах, якія мы скарыстоўваем для навучаньня.

Маё рэлігійнае пачуцьцё выявілася ў раньнім узросьце, калі я быў яшчэ юнаком і ўжо нешта разумеў. У гэтым узросьце, а можа быць раней, мая родная маці Ева Сьцяпанаўна, глыбока рэлігійная жанчына, вучыла мяне першым малітвам па парадку: знак крыжа з паклонамі, “Боже милостив, буди мне грешному трижды с ударением себя в грудь кулаком, Царю Небесный, Присвятое, Славы и ныне, Пресвятая Троице”, а потым “Ойча наш”, “Багародзіца Дзева, радуйся”, Сымбаль Веры, 10 запаветаў Гасподніх, “Спаси, Господи, люди Твоя”, “Достойно есть”, знак крыжа і канец. Гэтыя малітвы прамаўляў я штодзённа раніцай і ўвечары. Маё рэлігійнае пачуцьцё прымушала мяне маліцца. Браты і бацька не былі вельмі набожнымі асобамі. Я меў двух братоў, старэйшых за мяне – Мікалая і Пятра і ў нашай сям’і быў наймаладзейшым, бо нарадзіўся праз сем гадоў пасьля брата. Я нарадзіўся ў сьвята Нараджэньня Прасьвятой Дзевы Марыі 8/21 верасьня 1904 года. Ад першых хвілін быў хваравітым, таму мяне пасьпешліва хрысьцілі ўжо на трэці дзень пасьля нараджэньня. Бацюшка, які хрысьціў у нашай прыходзкай царкве ў мястэчку Вялікая Ліпа, назваў мяне Антоніем, але забыў сказаць, у памяць якога Антонія, таму я не сьвяткаваў сваіх імянінаў. Можна ўгле-

дзець у гэтым таемнае ўказаньне пра будучае маё манаства.

Хатнія ўмовы абмяжоўвалі ў малітве, таму я шукаў для сябе самотнага месца. Маліўся ў садзе ўвечары, у полі сярод каласістага жыта, у лесе, у хляве ці сьвіране. Там ніхто не перашкаджаў, і я маліўся доўга і старанна. Часам у гарачай малітве мне здавалася, што ў нябёсах бачу Бога, як казаў паэт. Поле і лес былі маім храмам зь дзяцінства. Пазьней, калі я стаў сьвятаром, мне было цесна маліцца ў царкве.

Рэлігійнае пачуцьцё не аслабла ў гімназічныя гады майго навучаньня. Я меў сяброў, але іх легкадумнасьць і часам непрыстойныя паводзіны не прымаў. Вучнем VII і VIII клясаў гімназіі веснавымі вечарамі ішоў за горад у поле і там у начной цішы маліўся ўкленчаны. Вяртаўся запозна, калі ўсе ўжо спалі. Гаспадыня, адчыняючы мне дзьверы, сварылася, прыгаворваючы: “Вось задумаў заляцацца. Экзамэны на носе. Правалішся, тады пашкадуеш страчанага часу”. Я не пярэчыў і ціха ішоў у свой пакой.

Ва ўсіх клясах гімназіі выкладаўся Закон Божы. Выкладчык ставіўся да вучняў паблажліва. Не шкадаваў добрых адзнак па Законе Божым, хоць далёка не ўсе былі іх вартыя па сваіх ведах. Карыстаўся і я дабрынёю бацюшкі, але заўсёды сур’ёзна рыхтаваўся да ўрокаў.

Сваёй рэлігійнасьці я не растраціў ва ўсе наступныя гады свайго жыцьця. Нарадзіўшыся ў сьвята Нараджэньня Прасьвятой Дзевы Марыі, Божай Маці, я глыбока верыў у Яе сьвятое апекаваньне мною. Яна дапамагала і, як Нябесная Маці, даравала мне Сваю міласьць.

## Разьдзел трэці

## Багаслоўскі факультэт

Сваю сярэднюю адукацыю я атрымаў у гімназіі ў Нясьвіжы[14]. Да гімназіі рыхтаваўся спачатку дома ў прыватнага настаўніка. Потым бацька мяне паслаў ў народную вучэльню ў бліжэйшае мястэчка Круты Бераг. Я закончыў і гэтую вучэльню, правучыўшыся ў ёй два навучальныя гады. Пасьля невялікай падрыхтоўкі мяне прынялі ў першую клясу пачатковай школы ў мястэчку Гарадзеі. Правучыўшыся ў ёй два гады, я перавёўся ў Нясьвіж у такую самую вучэльню, якую і закончыў. Пасьля гэтага паступіў у гімназію. Яна і дала мне ў 1925 годзе сярэднюю адукацыю, а таксама атэстат сталасьці. Прызнаюся шчыра, вучыўся я нядрэнна, але выдатнікам ня быў.

З радасьцю закончыўшы навучаньне, я спадзяваўся добра правесьці летнія вакацыі. Гасьцяваў у сястры на хутары. Стаяў сенакосны час, які я ад маленства любіў. Але так сталася, што сьпякотным летам прастудзіўся на сенакосе і захварэў. У мяне адкрыліся сухоты ў самай вострай форме. Доктар вызначыў дыягназ – тубэркулёз лёгкіх. Мая сястра была ў роспачы. Хоць доктар не сказаў, якая ў мяне хвароба, але лекі, ім прапісаныя, сьведчылі пра гэта. Я меў фармакапэю і мэдыцынскія кнігі, якія дапамаглі мне распазнаць сваю хваробу. Я ледзь рухаўся ад слабасьці. Шчыра маліўся і прасіў Бога вылечыць мяне. Бывала так, што пасьля гарачай малітвы на душы рабілася лёгка, і я забываўся на сваю хваробу. Так прыходзіла суцяшэньне ад Бога.

Напрыканцы лета хвароба мая аслабла, і я пачаў пакрысе папраўляцца. Увосень мне даслалі з вайсковай установы прызыўную картку для праходжаньня вайсковай павіннасьці. Давялося падпарадкавацца загаду. Я зьявіўся ў вызначаны мне полк, які аказаўся артылерыйскім. Позьняя восень: дажджы, слота, а потым мароз. Салдату да гэтага не прывыкаць. Навучаньне, гонкі, конная язда, маршыроўка аслабілі мае сілы, і я зноў захварэў. Мяне выправілі ў акруговы вайсковы шпіталь на лячэньне. Прабыў у ім месяц і атрымаў на год адтэрміноўку для ўмацаваньня здароўя. Паехаў дадому. Шкадаваў палка і вайсковай службы. Калі б ня гэта, магчыма стаўся б польскім афіцэрам. Аднак не судзіў Бог. Пакліканьня да вайсковай службы ў мяне не было, але маладосьць на ўсё пагаджаецца.

Дома чакаў новы смутак – сястра Алімпіяда, цяжка хворая на сухоты. Яе муж у адчаі, малыя дзеці плачуць, а маці ў ложку. У хуткім часе яна памерла, асіраціўшы дзяцей і зрабіўшы ўдаўцом мужа. Маё

гора ня мела межаў. Бо яна была маёй адзінай сястрой, якая зь дзяцінства замяняла мне маці.

Праводзячы вясну і лета ў родным доме ў Завітой, я шмат думаў пра сябе і марыў вучыцца на сьвятара ці на доктара. І адно, і другое мне падабалася. Сваталі мне розных дзяўчат, але я не цікавіўся гэтым пытаньнем. Мне хацелася вучыцца. Пра тое, што ў Варшаве адкрыты праваслаўны багаслоўскі факультэт пры ўнівэрсытэце[15], я ня ведаў. Таму думаў ехаць вучыцца ў Баўгарыю. Мэдыцыны я баяўся. Да таго ж патрэбныя былі вялікія сродкі, што было мне не па кішэні. Ня ведаў, куды накіравацца, каб выбіцца з завітанскай глушы і вясковага жыцьця. Прасіў Божай дапамогі. Верыў і маліўся.

Як бы ў адказ на мае малітвы Гасподзь паслаў у Завітую пасланца да мяне з парадай паступіць на багаслоўскі факультэт Варшаўскага ўнівэрсытэта. Гэтым вестуном быў мой калега з Нясьвіжа, які вучыўся ў Віленскай духоўнай сэмінарыі. Ён прывёз мне часопіс з аб’явай пра прыём студэнтаў на гэты факультэт. Я ўсьцешыўся нечаканаму прыезду майго калегі, які ніколі ня быў у мяне ў Завітой і ня ведаў, дзе я жыву, а таксама і яго вестцы. Мае мары рабіліся рэальнасьцю.

Падрыхтаваўшы ўсе неабходныя паперы, я даслаў іх у Варшаву на імя мітрапаліта Дыянісія[16], кіраўніка факультэта, ці дэкана. З нецярплівасьцю чакаў адказу, і ён даволі хутка прыйшоў. У ім паведамлялі, што мяне прынялі на першы курс з пражываньнем у студэнцкім інтэрнаце. Я ўсьцешыўся і дзякаваў Госпаду і Царыцы Нябеснай. У лісьце таксама паведамлялі пра дату пачатку заняткаў, адрас інтэрната і ўнівэрсытэта. Я адчуў, што Завітая робіцца мне чужой. Маё сэрца і думкі цяпер былі скіраваныя на Варшаву і багаслоўскі факультэт. Наш завітанскі настаўнік, паляк, распавёў мне пра славутасьці Варшавы і пазначыў мне мой маршрут па горадзе. Я ўпрыгожыў сваю галаву белай студэнцкай шапкай. Лічыў сябе ўжо студэнтам.

У Варшаву прыехаў датэрмінова. З Брэсцкага вакзала накіраваўся пешшу ў інтэрнат. Ішоў даволі доўга, азіраючыся абапал і разглядаючы вітрыны. Варшава ўразіла мяне сваёй прыгажосьцю і гарадзкім рухам: трамваі, таксоўкі, фурманы з коньмі, пешаходы на тратуарах, высокія дамы, шырокія вуліцы, дрэвы, паркі – усё гэта мяне цікавіла. Непрыкметна для сябе я прыйшоў да вялікага будынка студэнцкага інтэрната на Бялянскай вуліцы, № 9. З гэтага дня і пачалося маё студэнцкае жыцьцё.

Прафэсары нашага факультэта чыталі лекцыі ў аўдыторыях унівэрсытэта. Таму мы, студэнты, хадзілі іх слухаць з нашага інтэрната. Лекцыі чыталі ў розны час: да абеду і пасьля абеду, а часам і ўвечары. Час лекцыі вызначала адміністрацыя ўнівэрсытэта ў залежнасьці ад таго, якая аўдыторыя вольная, таму што ў іх чыталі лекцыі

прафэсары іншых факультэтаў. Наведваньне лекцый было неабходнае, але не абавязковае. Строгасьць у гэтых адносінах залежала ад самога прафэсара.

Нацыянальны склад нашых прафэсараў багаслоўскага факультэта быў даволі разнастайны: румыны, украінцы, грэкі, расейцы. Расейцы і ўкраінцы чыталі лекцыі на сваёй мове. Грэк чытаў па-французску. Такі склад зацьвердзіла Міністэрства асьветы. Студэнты неяк прыстасоўваліся да кожнага прафэсара. Навуковых сьвяцілаў сярод іх не было. Усіх іх набралі пасьпешліва, калі адкрывалі факультэт.

На факультэце першы час я захапляўся чытаньнем навуковых кніг па розных прадметах, якія мяне цікавілі. Гэта штодзённа займала шмат часу. Вялікая цікавасьць да чытаньня паглынала цалкам.

Усе студэнты багаслоўскага факультэта жылі ў інтэрнаце, спэцыяльна для іх нанятым, які аплачваўся Міністэрствам адукацыі і рэлігіі. Парадак і дысцыпліна ў ім мелі за мэту падрыхтаваць вартых кандыдатаў у сьвятары. Харчаваньне і поўнае ўтрыманьне выдавалася на месцы. Для гэтага былі прызначаны службовыя асобы: дырэктар інтэрната, сьвятар, выхавальнікі, інтэндант, загадчыца кухні, прыбіральшчыкі і прыслуга. Загадвала кухняй ігуменьня Зімненскага жаночага манастыра на Валыні зь некалькімі манашкамі. У памяшканьні інтэрната знаходзілася дамавая студэнцкая царква. Уранку і ўвечары ўсе студэнты зьбіраліся ў ёй на богаслужбы. На лекцыі сваіх прафэсараў хадзілі ва ўнівэрсытэт. З 10-ці гадзінаў вечара і да 8-мі раніцы ўваходныя дзьверы інтэрната зачыняліся на ключ, і ніхто ня мог выходзіць зь яго ці прыходзіць пазьней без асабістага дазволу выхавальніка ці дырэктара. Строгі парадак падтрымліваўся як самімі студэнтамі, так і адміністрацыяй.

Склад студэнтаў багаслоўя быў даволі разнастайны: расейцы, украінцы, беларусы. Украінскія студэнты вызначаліся шавінізмам і паміж сабой размаўлялі толькі на сваёй мове. Беларусы былі больш памяркоўныя ў гэтых адносінах. Пакоі для заняткаў і спальні разьлічваліся на некалькі чалавек. У гэтым асяродку я адчуваў сябе няёмка, бо хіба адчуваў уплыў маёй завітанскай самотнасьці. На малітву часта ішоў адзін у інтэрнацкую царкву пасьля богаслужбаў. Там ніхто мяне ня бачыў і не перашкаджаў.

Праваслаўны багаслоўскі факультэт пры сталічным унівэрсытэце быў заснаваны па ініцыятыве Варшаўскага і ўсёй Польшчы мітрапаліта Дыянісія (Валяндзінскага), магістра багаслоўя Казанскай духоўнай акадэміі. Ён жа чытаў і лекцыі на гэтым факультэце, быў яго дэканам і кіраўніком. Факультэт пачаў існаваць ад 1924 года. Я паступіў сюды ў 1926 годзе і закончыў яго ў 1930-м. За працу “Сьв. Дзімітрый, мітрапаліт Растоўскі, як пастыр і настаўнік пастыраў” у

1933 годзе атрымаў навуковую ступень магістра багаслоўя. На факультэце было ўстаноўлена па агульным унівэрсытэцкім пляне, што той, хто закончыў факультэт, здаў усе экзамэны і напісаў магістэрскую дысэртацыю, ухваленую камісіяй прафэсараў, атрымліваў навуковую ступень магістра багаслоўя. Кандыдацкай ступені не было. Найбольш здольныя, маючы жаданьнем працаваць навукова, маглі пісаць доктарскую дысэртацыю на іншым факультэце. Такім чынам, наш багаслоўскі факультэт, названы палякамі "студыямі", за час свайго існаваньня да нямецка-польскай вайны 1939 года[17] падрыхтаваў сотні па-багаслоўску высокаадукаваных сьвятароў. Некаторыя зь іх (каля 20-ці асобаў) былі высьвечаныя ў епіскапы ў ваенны і паваенны час, калі праходзілі сваё служэньне ў розных царкоўных юрысдыкцыях.

Я не абмежаваўся сваёй багаслоўскай адукацыяй, якую атрымаў на багаслоўскім факультэце, але пашыраў яе чытаньнем і вывучэньнем багаслоўскіх кніг. Разам з тым, з прычыны сваёй педагагічна-выхаваўчай пасады ў інтэрнаце для студэнтаў багаслоўскага факультэта, я вывучаў пэдагогіку на гуманітарным факультэце Варшаўскага ўнівэрсытэта і закончыў яго з дыплёмам у 1936 годзе. У наступным годзе мне запрапанавалі заняцца дасьледаваньнем з багаслоўска-гістарычнага пункту гледзішча "Вялікага катэхізіса" кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы. Гэтая тэма стала маёй доктарскай дысэртацыяй. Я з ахвотай узяўся за працу і пасьпеў закончыць яе напярэдадні Другой сусьветнай вайны (1939 – 1945)[18]. Вывучэньне пэдагагічных і іншых навук, а таксама праца над катэхізісам моцна паглыбілі мае веды ў галіне багаслоўя і пэдагогікі, а таксама псыхалёгіі.

На бацькаўшчыне ў той час адукацыя і дапытлівасьць цаніліся высока. На чужыне, ва ўмовах эміграцыі, зусім іншае стаўленьне да гэтага. Тут не цікавяцца навуковымі ведамі. Гэтая галіна адсоўваецца на іншы плян і стаіць на задворках. Затое на авансцэну выходзіць матэрыяльны бок ва ўсёй разнастайнасьці і прываблівасьці. Тут адыгрываюць важную ролю спрыт, беспрынцыповасьць, прага да нажывы і дабрабыту. Шчырасьць і сьціпласьць прыціскаюцца. У такіх умовах веды і адукаванасьць затушоўваюцца.

## Разьдзел чацьвёрты

# Манаства

Упершыню я сустрэўся з манахамі на багаслоўскім факультэце ў Варшаве. Там былі студэнты-манахі з Пачаеўскай Лаўры[19]. Ня меў аказіі паразмаўляць, але сымпатызаваў ім. Ад калег-студэнтаў з Валыні я чуў расповеды пра Пачаеўскую Лаўру, пра Пачаеўскі цудадзейны абраз Божай Маці, пра сьвятыя мошчы вялебнага Іова, ігумена Пачаеўскага, пра Ступню Божай Маці з крыніцай гаючай вады. Даведаўшыся пра гэта, мне захацелася паехаць у Лаўру і памаліцца ля яе сьвятыняў. На калядныя вакацыі я паехаў дадому ў Завітую. Сямейнікам я распавёў пра Пачаеўскую Лаўру і пра сваё жаданьне яе наведаць. Пярэчаньня не было. Але пра свой пострыг у манаства я тады ня думаў. Можа таму, што яго ня ведаў і ня меў уяўленьня пра манастырскае жыцьцё. Маё атачэньне зь дзяцінства не схіляла да манаства.

Тады я ўспомніў пра Жыровіцкі манастыр[20], які знаходзіўся ў Слонімскім павеце, прыблізна за 60 кілямэтраў ад маёй Завітой. Са старажытных часоў у гэтым манастыры знаходзіўся сьвяты цудадзейны абраз Божай Маці, названай Жыровіцкай[21]. Яна славілася многімі цудамі пры вылечваньня хворых. Памятаю зь дзяцінства, як па дарозе паўз нашай хаты праходзілі натоўпы багамольцаў, якія паломнічалі ў гэты манастыр. Пабывала ў ім і мая родная маці. Захацелася і мне наведаць Жыровіцкі манастыр і памаліцца перад яго цудадзейным абразам. Жаданьне сваё я зьдзейсьніў, калі вярнуўся дадому на велікодныя вакацыі. Для гэтага спэцыяльна прыехаў цягніком у горад Слонім і адтуль 10 кілямэтраў прайшоў пешшу па вясновым бездарожжы. Наведаў манастыр, агледзеў яго, памаліўся ля абраза Божай Маці і пешшу вярнуўся на цягнік у Слонім. Прыгажосьць і веліч манастыра вельмі моцна мяне ўразілі. Падчас паломніцтва ў сьвятое месца я потым цэлы дзень нічога ня еў і ня піў. Пра гэта нават і ня думаў, зачараваны бачаным і перажытым.

Пасьля заканчэньня акадэмічнага года на ўнівэрсытэце я паехаў у Пачаеўскую Лаўру. Гэта была мая мара, і я яе ажыцьцявіў. Са мной ехаў мой калега Нікандр Гаскевіч, каб прыняць у Лаўры пострыг. Ён гаварыў мне, што адчувае сябе хворым і хоча памерці манахам. Але ня стаў ім. На наступны дзень пасьля прыезду ў Лаўру ён паехаў да свайго брата-сьвятара і адмовіўся ад пострыгу, пакрыўджаны кепскім прыёмам у а. намесьніка Лаўры. Я ж застаўся, спыніўшыся ў манас-

тырскім гатэлі. Тут правёў усё лета, штодзённа наведваючы манастырскія богаслужбы.

Пачаеўская Лаўра ўразіла мяне сваёй грандыёзнасьцю і прыгажосьцю. Яна стаяла на высокай гары і відаць была за 10 кілямэтраў, а яе высокая званіца – яшчэ далей. Пачаткам існаваньня тут Лаўры лічаць XIII стагодзьдзе.

На вяршыні Пачаеўскай гары ў XIII стагодзьдзі цудоўна зьявілася ў вогненным слупе Божая Маці і пакінула на скале сьлед Сваёй ступні, адкуль пацекла гаючая вада ў выглядзе крыніцы. Цягам часу на вяршыні гэтай гары быў пабудаваны манастыр, які ў наш час вядомы пад назвай “Пачаеўская Лаўра”. Польскі магнат граф Патоцкі пабудаваў на свае сродкі цяперашні Сьв.-Усьпенскі сабор Лаўры і брацкія кельлі вакол сабора, а таксама высокую галерэю перад уваходам у яго. Цудадзейны абраз Божай Маці прынесла ў манастыр праваслаўная памешчыца Ганна Гойская ў XVI стагодзьдзі. Сьвятыя мошчы вялебнага Іова, ігумена Пачаеўскага, захоўваюцца ў Пячорскай царкве з XVII стагодзьдзя.

Настаяцелем Пачаеўскай Лаўры быў мітрапаліт Варшаўскі і ўсёй Польшчы Дыянісій, а намесьнікам Лаўры – архімандрыт Дамаскін (Малюта), адораны талентам прапаведнік і сьвятар у манастве. У Лаўры ён наладзіў электрычную станцыю і млын, а таксама пазалотную і іканапісную майстэрні. У лаўраўскіх майстэрнях выраблялі царкоўныя рэчы і забясьпечвалі імі прыходзкія храмы. У рызьніцы захоўваліся дарагія парчовыя расы, падораныя расейскімі імпэратарамі, і шмат каштоўных чараў і напрастольных эвангельляў у дарагіх акладах. У бібліятэцы захоўваліся рукапісы кнігі з XVII і XVIII стагодзьдзяў. Усё багацьце Лаўры было незьлічонае. У Лаўры за маім часам налічвалася да 200 чалавек брацііі, з паслушнікамі і труднікамі.

У Лаўры я ўсім цікавіўся і ўсё аглядаў. Пазнаёміўся і пасяბраваў з рызьнічым герадыяканам Якавам, які загадваў архірэйскім домам, гераманахам Лаўрэнціем, пасечнікам-гераманахам Алімпіем, якія паказалі мне ўсе славутасьці Лаўры.

З а. намесьнікам Лаўры архімандрытам Дамаскінам маё знаёмства адбылося пры асаблівых абставінах. Аднойчы ён запрасіў мяне да сябе на сьняданак, калі я стаяў у саборы на ютрані. Пры сустрэчы зь ім у яго пакоях ён сказаў: “Я даўно хацеў пазнаёміцца з вамі, але быў заняты і ня мог”. А на самай справе ён здалёку назіраў за мной і за маімі паводзінамі. Пасьля сьняданка прапанаваў штодзённа заходзіць на гарбату пасьля ютрані. Аднойчы я прыйшоў, але калі яго келейнік пачаставаў мяне гарбатай у келейнай, я пакрыўдзіўся і больш не пайшоў, хоць жыў тады без сьняданкаў і вячэраў, задавальняючыся абедамі. Прайшло пасьля гэтага некалькі дзён, як ён зноў запрасіў мяне

на сьняданак, калі быў на ютрані. Гэтым разам я прыйшоў. За сьняданкам, папракнуўшы мяне за тое, што не прыходзіў раніцай да яго келейніка на гарбату, прапанаваў мне прамовіць казаньне ў сьвята Пэратварэньня Гасподняга ў Пячорскай царкве за раньняй літургіяй да багамольцаў. Я рашуча спрабаваў адмовіцца, але беспасьпяхова. Ён настойваў і пераконваў не адмаўляцца. І я вымушаны быў пагадзіцца. Упершыню ў жыцьці выступаць з казаньнем у царкве перад вернікамі! Я хваляваўся да адчаю і баяўся выступаць. Вопыту яшчэ ня меў у гэтым і казаньня не напісаў, каб вывучыць яго. У вызначаны час у алтары апранулі мяне ў стыхар. Зь вялікім хваляваньнем я выйшаў на царкоўны амбон, але не разгубіўся, пачаў сваё імправізаванае казаньне. Ці доўга я гаварыў, ня ведаю, як толькі скончыў, пасьпешліва зьняў стыхар і выйшаў з алтара, адчуваючы сябе няёмка. Зачыніўся ў сваім пакоі ў гатэлі і саромеўся сустракацца з сябрамі-манахамі. Мне здавалася, што я аскандаліўся.

Назаўтра а. намесьнік паклікаў мяне да сябе праз свайго келейніка. Зь вялікай няёмкасьцю я ішоў да яго, як вінаваты хлопчык да роднага бацькі. Нечакана ён прыняў мяне ласкава і падзякаваў за казаньне, спасылаючыся на добрыя водгукі манахаў, якія чулі мяне. Пачаставаў мяне гарбатай з закускамі і падараваў вялікі свой партрэт з надпісам: “Студэнту багаслоўскага факультэта Варшаўскага ўнівэрсытэта Антону Мартасу на памяць пра першае прамоўленае ім казаньне ў Пачаеўскай Сьвята-Усьпенскай Лаўры ў сьвята Пэратварэньня Гасподняга 6/19 жніўня 1927 года. Архімандрыт Дамаскін, намесьнік Лаўры”.

Архімандрыт Дамаскін, узбадзёрыўшы мяне пахвалою і ўласным партрэтам, прапанаваў мне прамовіць казаньне і на сьвята Ўсьпеньня Божай Маці 15/28 жніўня. Зноў я спрабаваў ухіліцца ад гэтага паслушэнства, але а. намесьнік настойваў на сваім. За паслушэнства я пагадзіўся. Ён даў мне кнігу казаньняў, ня памятаю, якога прапаведніка. Да гэтага казаньня я падрыхтаваўся і, па загадзе а. намесьніка, прамовіў яго ў Шпітальнай царкве за раньняй літургіяй. На гэтым мая “прапаведніцкая дзейнасьць” у Лаўры завяршылася. Надышоў ужо месяц верасень, і я неўзабаве паехаў у Варшаву на пачатак акадэмічнага года на ўнівэрсытэт. Тады я быў маладым цывільным студэнтам. Але першыя казаньні ў Пачаеўскай Лаўры былі нібы прарочыя і прадказвалі маё духоўнае манаскае пакліканьне. Я тады яшчэ ня ведаў і ня думаў, што ў хуткім часе прыму ў Лаўры пострыг.

Восеньскі трыместр акадэмічнага года праляцеў непрыкметна. Надышлі калядныя вакацыі. Студэнты разьяжджаліся з інтэрната на сьвята да сваіх бацькоў. Я сабраўся таксама ехаць дадому. Але атрымалася паводле прымаўкі: “Чалавек думае, а Бог робіць”. Мне не на-

канавана было ехаць дадому. Гасподзь Бог клікаў мяне ў Пачаеўскую Лаўру да манаскага жыцьця. Гэта адбылося такім чынам.

У дзень ад’езду студэнтаў я выпадкова сустрэў на калідоры нашага інтэрната намесьніка Пачаеўскай Лаўры, архімандрыта Дамаскіна, які лічыўся студэнтам багаслоўскага факультэта і прыехаў здаваць свае ўнівэрсытэцкія залікі. Сустрэўшы мяне, ён спытаў:

– Ты куды едзеш на вакацыі?

– Дадому, – адказаў я.

– Студэнты Нарко і Возераў едуць у Лаўру прымаць пострыг. Далучайся да іх і будзеш трэці, – запрапанаваў ён. Я зьбянтэжыўся ад нечаканай прапазыцыі і спачатку разгубіўся, прамармытаўшы:

– А ці мне можна?

– Чаму нельга?! Пішы прашэньне на імя мітрапаліта, які цяпер у інтэрнаце, але сьпяшайся, бо ён зьбіраецца выяжджаць з інтэрната ў Мітраполію. Я занясу тваё прашэньне і падам яму, – сказаў мне а. архімандрыт.

Без ваганьня і маруджаньня я зайшоў у свой пакой і напісаў кароткае прашэньне з просьбай блаславіць мяне на пострыг. Напісаўшы, занёс а. архімандрыту, а ён занёс мітрапаліту. Праз некалькі хвілінаў ён выйшаў з пакою мітрапаліта і з радасьцю сказаў мне:

– Уладыка мітрапаліт блаславіў. З Богам! Выпраўляйся ў Лаўру, – пры гэтым архімандрыт Дамаскін блаславіў мяне.

Вырашыўшы свой лёс такім чынам, я адчуў радасьць і палёгку на душы. Мне здавалася, што я знайшоў тое, што таемна шукаў для сябе самога.

На наступны дзень, уночы, тры студэнты багаслоўскага факультэта – Уладзімір Нарко (3-ці курс), Антон Мартас (2-гі курс) і Мікалай Возераў (1-шы курс) – імчаліся кур’ерскім цягнікам з Варшавы ў горад Крамянец на Валыні ў напрамку Пачаеўскай Лаўры. Зіма выдалася сьцюдзёная: бушавала завея, трашчаў люты мароз, а ў купэ 3-й клясы было цёпла і душна. Пасажыры драмалі, седзячы на цьвёрдых драўляных лаўках. Зімовая ноч – доўгая і цёмная.

На станцыю “Крамянец” прыехалі раніцай. Ужо пачаўся дзень. Адсюль трэба было нам дабірацца на санях 25 кілямэтраў. Танна мы нанялі селяніна з худым конікам, запрэжаным у простыя сані без сядзеньняў. Па дарозе ён завёз нас у вёску ў сваю хату, загадаў жонцы накарміць нас гарачым, зрабіў сядзеньні ў санях, і выправіліся ў дарогу. Мы апрануліся па-студэнцку лёгка: у восеньскія паліто, і нічога цёплага на сабе. Ехалі ўвесь дзень і настала ноч. Брама Пачаеўскай Лаўры ўжо была зачыненая для чужых. Заначавалі ў лаўрскім гатэлі з неабагрэтымі пакоямі. Дзьверы прызначанага для нас пакоя выходзілі на вуліцу і пад імі ляжалі гурбы сьнегу і лёду. Загадчык гатэ-

лю, прыемны стары ігумен Валянцін, са спачуваньнем сказаў: “Начуйце тут. Гэты пакой больш цёплы, бо іншыя яшчэ халаднейшыя за яго”. Горш за ўсё было тое, што мы, галодныя, хацелі што-кольвек зьесьці, але рэстараны былі ўжо зачыненыя. Так і праспалі ўсю ноч у голадзе і холадзе. Загартоўваліся для манаскага подзьвігу. Маладосьць брала сваё. Сталейшы з нас быў Возераў, сын губэрнатара, які закончыў Пажскі корпус і быў паранены ў Добраахвотніцкай арміі ў час вайны з бальшавікамі. Ён больш пакутаваў ад холаду, чым я і мой таварыш Нарко. Але мы не прастудзіліся, нават катару не атрымалі, і мае хворыя лёгкія вытрымалі. Гасподзь нас умацаваў.

Уранку нас уладкавалі ў манастырскім корпусе і памясьцілі ў кельлю двухмэтровай таўшчыні са скляпеньнямі. Кельля была халодная. Далі нам сырыя ды ў сьнезе дровы, але яны не гарэлі, а сухіх для распальваньня не было. Так мы і жылі ў неабагрэтай кельлі. Манастырская ежа бедная: капуста ды грэцкая каша без алею. Калядны, ці Піліпаў пост строга выконваўся брацiяй манастыра. Страўнікі нашы ад нязвыклай манастырскай ежы бунтаваліся, але ў хуткім часе супакоіліся і задаволіліся.

Цяжка было ўставаць раніцай а 4 гадзіне на ўсяночную і ютрань, але мы ўставалі і па халодных калідорах сьпяшаліся ў царкву. Там маліліся і мерзьлі ў неабагрэтай Пячорнай царкве. І так штодня. Маліліся таксама за літургіяй. Чакалі пострыгу ў манаства.

Айцец намесьнік Лаўры прызначыў кожнаму з нас старца з тых, што вызначаліся падзьвіжніцкім жыцьцём. Мой старац быў герамапах Аполас. Старцы рыхтавалі нас да манаства. У манастырскай кравецкай майстэрні пасьпешліва шылі нам рызы і манаскае адзеньне. Калі ўсё было падрыхтавана, а. намесьнік абвясьціў нам, што за тры дні да сьвята Нараджэньня Хрыстова адбудзецца наш пострыг. Нас цікавіла, якое імя кожнаму з нас дадуць пры пострыгу, але а. намесьнік утойваў гэта. Прыйшоў дзень пострыгу. Зранку старцы павялі нас у Пячорную царкву, дзе мы ўкленчылі перад мошчамі вялебнага Іова Пачаеўскага. На яго рацы начавала нашае ўбраньне. Мы маліліся перад мошчамі сьвятога, прасілі ягонай дапамогі ў манаскім подзьвігу. Пасьля гэтага спавядаліся ў сваіх грахах у старцаў.

Пасьля чытаньня часоў да літургіі нас паставілі за шырмай у прытворы Пячорнай царквы. Тут мы зьнялі сваю звычайную вопратку і на голае цела апранулі валасяніцы: доўгія цьвёрдыя кашулі, як жалезныя вярыгі. Кожны пра штосьці думаў, перажываў у гэты момант. Думкі паляцелі, як спалоханыя птушкі. На Малым уваходзе літургіі кліросная брацiя засьпявала сьціхіру Набажэнства нядзелі пра Блуднага сына: “Объятие Отча”. Сьпявалі працягла і ўрачыста, памалу рухаючыся са сьвечкамі ў руках у паўзмроку велізарнага храма ў доўгіх

чорных мантыях у шэрагу па два чалавекі, накіроўваючыся да нас. Старцы пакрылі нас сваімі мантыямі і сагнутымі, са складзенымі накрыж на грудзях рукамі павялі да алтара ўсьлед за пеўчай брацiяй. На амбоне перад адчыненай Царскай брамай мы ўкленчылі з раскінутымі накрыж рукамі і ляжалі так некалькі хвілінаў, пакуль а. намесьнік, архімандрыт Дамаскін, не крануў кожнага з нас сваёю рукою ў знак, што мы павінны ўстаць на ногі. Сваім мэлядычным барытонам ён гучна і строга спытаў:

– “Что пришел еси, брате, припадая ко святому жертвеннику и ко святей дружине сей?”

Пачалася кранальная і працяглая цырымонія пастрыжэньня ў манахі. Расказвалі, што некаторыя з багамольцаў плакалі. Пастрыжаныя атрымалі новыя імёны, якімі назваў а. намесьнік, са словамі: “Брат наш, имя рекъ, постригаетъ власы главы своея в знамение отрицания мира, и всех яжа в мире, и во отвержение своея воли и всехъ плотских похотей, во имя Отца и Сына и Святого Духа: рцемъ о немъ все, Господи помилуй”. Брацiя спявала тройчы “Господи, помилуй”.

Апранутыя ва ўсё манаскае адзеньне, з запаленымі сьвечкамі і крыжамі, стаялі мы на клірасе ў час літургіі пасьля пострыгу, як анёлы ў плоці. Пасьля сьпеву “Запричастна” мы прыступілі да сьвятой чары і прычасьціліся Сьвятых Цела і Крыві Хрыстовых. Пасьля заканчэньня літургіі а. намесьнік павіншаваў нас і сказаў цудоўную прамову ў павучаньне нам.

З царквы перавялі нас у другую царкву ў затвор, дзе мы прабылі тры дні і тры ночы. На трэці дзень нас вывелі з затвора і дазволілі быць вольнымі. Было сьвята Нараджэньня Хрыстова.

## Разьдзел пяты

# Паслужны сьпіс

У царкоўна-адміністрацыйнай практыцы ў Расейскай імпэрыі прынята было весьці паслужны сьпіс пра кожнага сьвятара. Гэтай справай займаліся духоўныя кансысторыі, якія існавалі ў кожнай епархіі і зьяўляліся дапаможнымі органамі епархіяльнага архірэя. У паслужныя сьпісы запісваліся даты нараджэньня і хрышчэньня, высьвячэньня ў дыяканскі і герэйскі саны, атрыманьне ўзнагародаў і пакараньняў, а таксама прызначэньняў і перамяшчэньняў па службе. Гэтая канцылярская практыка мела вялікае значэньне ў царкоўна-адміністрацыйным жыцьці.

У Праваслаўнай Царкве ў Польшчы паслужныя сьпісы ў кансысторыях вяліся дакладна. Маё сьвятарства пачалося ў лоне гэтай Царквы пасьля высьвячэньня мяне ў герадыякана і гераманаха. Я быў залічаны ў склад Варшаўска-Холмскай епархіі яшчэ тады, калі зьяўляўся студэнтам багаслоўскага факультэта ў Варшаве і жыў тут у студэнцкім інтэрнаце. Так распачаўся мой паслужны сьпіс у гэтай епархіі. Вяла яго Варшаўска-Холмская духоўная кансысторыя.

Пасьля бласлаўленьня мітрапаліта Варшаўскага Дыянісія, 29 студзеня 1928 года ў варшаўскім Марыя-Магдалінскім катэдральным саборы я быў высьвечаны ў герадыякана Алексіем, епіскапам Гарадзенскім. Рэзалюцыяй таго ж мітрапаліта мяне прызначылі на пасаду трэцяга дыякана пры гэтым саборы. Я ня меў музыкальнага голасу і добрага слыху, што абмяжоўвала мяне ў богаслужбах. З гэтай прычыны быў незадаволены і рэгент мітрапалітальнага саборнага хору.

На велікодныя студэнцкія вакацыі я накіраваўся ў Пачаеўскую Лаўру. Там прайшоў выдатную богаслужбовую практыку. Служэньне гераманахам у лаўрскіх саборах стала для мяне добрай школай. У Лаўры строга выконваўся богаслужбовы статут і не дапускалася найдрабнейшая памылка. Неабходна было сур'ёзна рыхтавацца да богаслужбаў і быць вельмі ўважлівым падчас іх правядзеньня. Але асабліва моцна я хваляваўся ў час нядзельных і Велікодных богаслужбаў, што адбываліся з асаблівай урачыстасьцю. Калі стаяў сярод манастырскіх сьвятароў – архімандрытаў, ігуменаў, гераманахаў і герадыяканаў з мноствам прыслужнікаў на богаслужбе, мне здавалася, што я знаходжуся на небе і стаю сярод анёлаў і жыхароў неба. Магутны сьпеў царкоўнага сьвецкага хору высока на хорах і манаскага на клірасе напаўняў гукамі вялізны Сьв.-Ўсьпенскі сабор. Мяне, ма-

ладога манаха, усё гэта моцна ўражвала. Ад замілаваньня і захапленьня мімаволі цеклі з вачэй сьлёзы. Зразумее гэта толькі той, хто сам перажыў такі сьвяты момант.

На летнія вакацыі з дазволу а. намесьніка Лаўры я паехаў дамоў у вёску. Адчуваў сябе там добра. Усе мае старыя сябры і знаёмцы ў Завітой былі ласкавыя і ўважлівыя. Суседзі-сьвятары, якія раней ня ведалі мяне, запрасілі да сябе на прастольнае сьвята – у Сноў на сьвятых апосталаў Пятра і Паўла (12/25 ліпеня і 20 ліпеня/2 жніўня). У іх храмах я ўдзельнічаў у служэньні літургіі. Там упершыню пазнаёміўся бліжэй з прыходзкімі сьвятарамі, з іх прыхаджанамі і багамольцамі, якія зрабілі на мяне вялікае ўражаньне сваёй рэлігійнасьцю і ўзьнёсласьцю. Прапаведнікі прачыталі зьмястоўныя павучаньні. Думаю, што былі яны лепшымі нават за гарадзкія ў Варшаве.

Неўзабаве прыйшоў час разьвітацца з родным домам, з усімі дарагімі мясьцінкамі і сьцежкамі, па якіх хадзіў у дзяцінстве. Душа адчувала, што бачу я іх апошні раз. Потым так і не давялося пабываць на радзіме. Прайшло ўжо 50 гадоў, цэлае паўстагодзьдзе, а ўсе гэтыя мясьціны стаяць перад вачыма ўва ўсёй сваёй прыгажосьці і прываблівасьці, як жывыя.

Па дарозе з Завітой у Пачаеўскую Лаўру я моцна прастудзіўся ў вагоне цягніка і захварэў. Прастуда перайшла на лёгкія і ўзнавіла мае застарэлыя сухоты. Хвароба ўвайшла ў вострую форму. Мэдыцынскія лекі не дапамагалі. Я быў у разгубленасьці. Аднойчы, стоячы ва Усьпенскім саборы Лаўры на вячэрні ў нядзелю, я глядзеў на Пачаеўскі цудадзейны абраз і шчыра маліўся Прасьвятой Багародзіцы з просьбай вылечыць мяне. Маліўся і плакаў. Заўважыў гэта мой старац і паспрабаваў мяне супакоіць, але гэта не дапамагло, толькі яшчэ больш узрушыла мяне. Гэта былі жыватворныя сьлёзы, яны выклікалі міласьць Божай Маці. З таго моманту я пачаў папраўляцца і вылечыўся. Прайшлі дзесяткі гадоў і хвароба не вярталася, толькі старыя рубцы на абодвух лёгкіх нагадвалі пра былыя сухоты. Маім Нябесным Доктарам была Божая Маці.

Напрыканцы сакавіка 1927 (?) года мяне высьвецілі ў германаха. Высьвячэньне зьдзейсьніў у Варшаўскім саборы епіскап Крамянецкі Сімон (Іваноўскі), любімы і шанаваны ўсімі архіпастыр. Мітрапаліт часта выклікаў яго для служэньня ў Варшаўскім саборы. Сярод багамольцаў епіскап Сімон карыстаўся вялікай папулярнасьцю. А вось польскія ўлады не любілі яго, бо ён бічаваў іх у сваіх казаньнях. Сан германаха адкрываў мне магчымасьць распачаць пастырскую дзейнасьць.

**Кодзень**

Адслужыўшы сядміцу пасьля высьвячэньня ў гераманаха, я атрымаў камандзіроўку ў мястэчка Кодзень на Падляшшы, дзе не было ні сьвятара, ні царквы. Мястэчка было вялікае, з вялікай колькасьцю праваслаўнага насельніцтва, пазбаўленага духоўнай апекі. Да Першай сусьветнай вайны тут меліся дзьве царквы: адна – новая, прыгожая, каменная, а другая – старая, XVII стагодзьдзя. Падчас вайны абедзьве гэтыя цэрквы забралі палякі-католікі і перарабілі іх на свае храмы – касьцёлы. Праваслаўным, якіх пазбавілі сваіх цэркваў, не было дзе маліцца Богу. Да сьвяткаваньня Вялікадня мітрапаліт Дыянісій паслаў мяне сюды для правядзеньня богаслужбаў у Велікодны тыдзень. Сваё служэньне я пачаў у Вялікі чацьвер. Служыў у маленькай капліцы пасярэдзіне мястэчка. Капліца была настолькі малая, што я адзін мог памясьціцца ў ёй, а народ стаяў вакол у двары пад адкрытым небам. Дажджу не было, але стаяла вільготнае і халоднае надвор’е раньняй вясны. Багамольцы ў вялікай колькасьці акружылі капліцу. Апрача штодзённых Набажэнстваў уранку і ўвечары, я выконваў ахвяры: спавядаў, наведваў хворых, асьвячаў паскі, кулічы і яйкі ў вёсках, куды вазілі мяне на возе па непралазным раздарожжы, мокрай зямлі пасьля расталага сьнегу. Стамляўся я моцна, да таго ж з харчаваньнем было дрэнна: не было часу паесьці строга поснай ежы. У Велікодную ноч на пачатку літургіі я захварэў, закружылася ў мяне галава і я ледзь трымаўся на нагах. Прысутныя праваслаўныя вернікі заўважылі гэта і захваляваліся. Я палка прасіў Бога ўзмацніць мяне для служэньня дзеля народа, які сабраўся на ўрачыстасьць веры і малітвы. Гасподзь умацаваў мяне. Літургію я завяршыў пасьпяхова і прамовіў казаньне. Народ з радасьцю хрыстосаваўся са мною і разыходзіўся па дамах.

У Сьветлы тыдзень я выехаў з Кодзеня ў Варшаву. Праваслаўныя кодзенцы прасілі мяне прыехаць да іх на Тройцу. Я абяцаў. Амаль усім мястэчкам яны праводзілі мяне да ракі Буга, цераз які я пераправіўся на пароме да чыгуначнай станцыі. На сьвята Пяцідзесятніцы я зноў прыехаў у Кодзень. На гэты раз вымушаны быў зьдзяйсьняць Набажэнствы на могілках за мястэчкам, бо польская паліцыя забараніла мне рабіць гэта ў местачковай капліцы. На могілках, сярод магілаў, збудавалі з зялёных галінаў будан накшталт алтара, дзе я служыў, а народ стаяў вакол пад адкрытым небам. Быў гарачы і ветраны дзень. Сьвечкі гасьлі і складана было іх захаваць. Я выкарыстаў гэтую акалічнасьць для свайго палымянага казаньня. Гэта была мая апошняя паездка ў Кодзень, яна пакінула глыбокі сьлед у маёй душы. Мая першая пастырская служба ў Кодзені зрабілася вялікім укладам у маю сьвятарскую дзейнасьць у будучыні.

**Благадатнае**

Такую назву мела невялікая руская калёнія за 50 кілямэтраў ад Варшавы. Насельніцтва вакол гэтай калёніі было польскае і каталіцкае. Рускія каляністы былі выхадцамі з Цэнтральнай Расеі, старaверамі[22], якія прынялі адзіную веру з Праваслаўнай Царквой. Мітрапаліт Дыянісій прызначыў мяне сюды выконваць пастырскія абавязкі. Тут я ня жыў стала, а толькі прыяжджаў з Варшавы ў нядзельныя і сьвяточныя дні для правядзеньня Набажэнстваў. Царква ў Благадатным невялікая, але ўтульная, з іканастасам у стараверскім стылі. Сьпявалі і чыталі на матывы стараверскія – працяжна. Богаслужбовыя кнігі былі стараверскія. Тут я добра пазнаёміўся са стараверскімі звычаямі і парадкамі. За 20 і 15 кілямэтраў адсюль знаходзіліся яшчэ дзьве рускія калёніі: Іванаўка і Скобелеўка. Там рускага насельніцтва было яшчэ менш, але яны належалі ў царкоўна-прыходскіх адносінах да Благадатнага. Цэркваў там не было. Я абслугоўваў і гэтыя дзьве калёніі. Бываў у іх зрэдчас, раз на год, галоўным чынам у Вялікі пост. Праводзіў там Набажэнствы, але езьдзіў з псаломнікам.

Паводле распараджэньня мітрапаліта аднойчы ў нядзелю паехалі ў Благадатнае з місіянэрскай мэтай архімандрыт Сава (Саветаў)[23], пазьней епіскап Гарадзенскі і архіепіскап польскіх войскаў у чыне генэрала ў эміграцыі (памёр ў Лёндане, Англія), протаіерэй Кацылоўскі, былы рымска-каталіцкі польскі сьвятар, які прыняў праваслаўнае веравызнаньне, гераманах Афанасій і тры пеўчыя студэнты. У нядзелю адбылося вячэрняе Набажэнства. У царкву прыйшлі шмат палякаў, мясцовых жыхароў, каб паслухаць казаньне а. Кацылоўскага, пра якое паведамілі напярэдадні. Ён прапаведаваў добра і пераканальна. Невялікая царква не магла зьмясьціць усіх слухачоў і многія стаялі на двары. Калі даведаўся пра гэта польскі ксёндз, то забараніў сваім прыхаджанам і ўсяму польскаму насельніцтву хадзіць у “схізматычную” царкву і слухаць там казаньні. Ён папярэдзіў, што, калі хто пойдзе, адлучыць яго ад прычасьця (экскамунікуе). Спалохаліся і больш не пайшлі. Але сам факт, што нашу царкву наведала сотня католікаў і палякаў, каб паслухаць казаньне, сьведчыў пра тое, што польскае каталіцкае насельніцтва шукала ісьціну і прагнула новага вучэньня.

Як сьвятар, абслугоўваў я гэтую супольнасьць з Нараджэньня Хрыстова 1929 года да чэрвеня наступнага года. Як езьдзіў на аўтобусе ў Благадатнае праз горад Гура Кальварыя, з цікавасьцю і зьдзіўленьнем я бачыў старых габрэяў (жыдоў) і маладых, жыхароў гэтага горада, якія насілі на галаве ярмолкі і доўгія пэйсы-валасы і асаблівыя сурдуты да пятаў. Гэта былі хасіды. У горадзе іх было шмат. Яны складалі значны працэнт насельніцтва.

### Валомін

Пасьля Благадатнага я атрымаў прызначэньне на пасаду настаяцеля Сьв.-Петрапаўлаўскай царквы ў горадзе Валаміне, каб абслугоўваць супольнасьці пры гэтай царкве. Царква тут разьмяшчалася на вышках у доме рускага і праваслаўнага жыхара Міхальчонка, беларуса з Віленшчыны. Невялікая супольнасьць і невялікая царква радавалі мяне ў многіх адносінах: сваёй сумленнасьцю прыхаджанаў і аздабленьнем маленькай царквы, а таксама цудоўным хорам, якім кіраваў царкоўны стараста Лукарэўскі. Горад знаходзіўся за 30 кілямэтраў ад Варшавы. Сюды я прыяжджаў кожны раз для правядзеньня Набажэнства, вячэрняй і ранішняй літургіі.

Калі я служыў настаяцелем царквы ў Валаміне, здарыўся наступны выпадак. Мяне паклікалі да цяжка хворага на сухоты горла. Ён быў опэрным сьпеваком, аднак і шчырым вернікам і спавядаўся са сьлязьмі. Пасьля прыняцьця Сьв. Хрыстовых Таемстваў ён сказаў мне са сьлязьмі: “Бацюшка! Я не хачу паміраць! Я хачу ўбачыць яшчэ радзіму Расею вольнай ад бальшавікоў!” Я суцяшаў яго як мог, але палка маліўся за яго штодзённа. Прайшоў нейкі час. Больш я ўжо не бываў у Валаміне. Я сустрэў царкоўнага старасту Валамінскай царквы ў Варшаве і запытаўся ў яго пра гэтага сьмяротна хворага сьпевака. Атрымаў адказ, што пасьля споведзі і сьв. Прычасьця ён пачаў папраўляцца і цяпер зноў сьпявае ў опэры. Я выказаў вялікую ўдзячнасьць Госпаду за Яго цудоўную дапамогу хвораму.

### Сынадальны архіў

Улетку мне было даручана заняцца ўпарадкаваньнем Сынадальнага архіву. Паказалі, у чым павінна заключацца мая праца. Архіў шмат гадоў знаходзіўся неўпарадкаваным. Трэба было сыстэматызаваць, зрабіць вопіс усіх спраў і дакумэнтаў, а таксама даць кароткі іх зьмест. Маім памочнікам стаў а. Ігнацій (Возераў). Праца ў архіве была складаная і нялёгкая, а галоўнае – у значнай ступені карпатлівая. З вялікай цікавасьцю і жаданьнем прыступіў я да гэтай працы. Заняла яна шмат часу. Чатыры месяцы мы з а. Ігнаціем штодзённа старанна працавалі. Спраў у архіве, розных па зьмесьце, было шмат.

Займаючыся ў архіве, я пазнаёміўся з дзейнасьцю Сьвяшчэннага Сыноду Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Там знаходзілася ўсё ліставаньне па справе правядзеньня аўтакефаліі гэтай Царквы. Былі копіі лістоў да Маскоўскага патрыярха Ціхана[24] па гэтай справе і адказы патрыярха яшчэ ў 1923 – 1924 гадах. Некаторыя з іх памятаю і цяпер. Я не меў намеру тады пісаць гісторыю аўтакефаліі, таму не зьбіраў адпаведных дакумэнтаў. Памятаю, што патрыярх Ціхан абвясьціў аўтаномію Царквы ў Польшчы і ўзьвёў у сан мітрапаліта, які

ўзначальваў яе, архіепіскапа Георгія (Ярашэўскага) указам 30 студзеня 1922 года. Архімандрыт Смарагд Латышэнка, былы рэктар Валынскай духоўнай сэмінарыі, забіў яго стрэлам з рэвальвэра 8 лютага 1923 года за правядзеньне аўтакефаліі Царквы. Пасьля яго сьмерці быў выбраны на мітрапалітную катэдру ў Польшчы архіепіскап Валынскі Дыянісій (Валядзінскі).

У Сынадальным архіве мы знайшлі судовую справу епіскапа Люблінскага Антонія (Марцэнкі), абвінавачанага ў мужаложніцтве з ягоным келейнікам. З вялікай увагай я чытаў яго і жахаўся. Мне падалося, што ў гэтай судовай справе не ўсё было чыста, што былі ілжывыя паказаньні. Магчыма, і Сьвяшчэнны Сынод, які разьбіраў гэтую справу, падазраваў ілжывасьць паказаньняў сьведкі, бо паставіўся памяркоўна да абвінавачанага, не засудзіў яго строга, а вызначыў яму месца жыхарства на спачынку ў Мялецкім манастыры ў Палескай епархіі. Пазьней ён быў вікарыем гэтай епархіі. Напрыканцы Другой сусьветнай вайны апынуўся ў эміграцыі і жыў у Карлсбадзе. Пасьля заканчэньня вайны ў 1945 годзе вярнуўся на савецкую радзіму ў СССР і там недзе зьнік.

### Яблонка Выжна

Гэта было вялікае паселішча ў Карпацкіх гарах у Галіцыі. Жыхары яго перайшлі ў Праваслаўе з Уніі і сваімі сіламі пабудавалі сваю царкву ў сваім мястэчку. Па іх хадайніцтве прызначылі ім праваслаўнага сьвятара. Ён атрымаў адпачынак да сям'і на Валынь, а часова на яго месца камандзіравалі мяне. Прыехаў я сюды позьняй восеньню. У гарах рабілася холадна і часта выпадаў сьнег. Сялянскі домік, дзе я пасяліўся, абгароджаны высокім парканам і крыты саламянай страхой, палохаў мяне так, што ўночы я спаў у ім трывожна, баючыся падпалу уніятамі. Я спачуваў сьвятару, які тут жыў і служыў у царкве. Ён нёс тут нялёгкі пастырскі подзьвіг. З харчаваньнем мне было вельмі дрэнна. Малака ўволю, але яно мне хутка апрыкла, а іншых прадуктаў, апрача капусты, не было. У гарах жыта і пшаніца не расьлі, таму жыхары і ня мелі свайго хлеба, а на кірмашы ў горадзе Турке за 12 кілямэтраў па гарах куплялі, але і то толькі як ласунак. Без хлеба я галадаў. Куплялі мне ў горадзе, але ён хутка чарсьцьвеў і высыхаў. Замест хлеба жыхары пяклі ляпёшкі з грубай аўсянай мукі, якую самі малолі ў жорнах. Я ня мог іх ляпёшак разжаваць. Прабыў я тут больш за месяц, пакуль не прыехаў настаяцель, якога я замяняў. Затое палюбіў я прыхаджанаў. Яны прыходзілі доўгімі восеньскімі вечарамі ў хату і прасілі распавесьці ім з гісторыі, як гвалтоўна была ўведзеная Унія з Рымам. Я распавядаў, а яны слухалі, пакуль не скажу, што час ужо спаць. Яны ішлі дадому. Больш за ўсё я пакутаваў ад іх "цю-

цюню", які яны курылі. Забараніць ім саромеўся. У царкве на літургіі ўсе стаялі паважна і ўзьнёсла ад пачатку да канца: мужчыны па правы, а жанчыны і дзеці па левы бок. Апрануты былі ў палатняныя белыя кашулі з вышытымі каўнярамі і манішкай, зьверху без рукавоў белы кажух для строяў і такія самыя белыя сукенкі з вышыўкамі ў жанчын. Сьпявалі ўсёй царквой, рэгентаў і спэцыяльнага хору не было. Затое з дзіцячых гадоў яны ведалі на памяць літургію. Набажэнства праводзілася на царкоўнаславянскай мове, але з украінскай "вымовай" (вымаўленьнем). Мне вельмі падабаліся агульнанародныя царкоўныя сьпевы. Шкада, што ў нас іх няма. Адтуль я вярнуўся ў Варшаву.

**Кулаковічы**

На сьвята Нараджэньня Хрыстова мяне камандзіравала царкоўная ўлада ў паселішча Кулаковічы на Холмшчыне. Стаяла марозная і сьнежная зіма. Сьвятара там не было: некуды зьехаў. Яго жонка хварэла на сухоты лёгкіх. Царква і дом сьвятара былі. Там быў і псаломнік. Паводле іхняга вясковага звычаю, я зьдзейсьніў усяночнае дбаньне і ўсьлед за гэтым сьв. Усяночую літургію і пачаў служэньне ў 4 гадзіне раніцы, завяршыў у 7 раніцы. Усю ўсяночную храм быў запоўнены багамольцамі. У царкве зрабілася душна ад мноства народу, таму адчынілі вокны і дзьверы, а на дварэ трашчаў мароз. Праваслаўныя жыхары Холмшчыны – рэлігійныя і высокамаральныя людзі. Я дзівіўся іх выносьлівасьці і супраціўленьню каталіцкаму і польскаму ўплыву, сярод якога яны жылі.

**Яблочынскі манастыр**

У палове сьнежня наступнага года я атрымаў прызначэньне на пасаду намесьніка Яблочынскага Сьвята-Ануфрыеўскага мужчынскага манастыра[25] каля ракі Буг на Падляшшы, а таксама загадчыка прытулку для састарэлага духавенства ў гэтым манастыры. Манастыр невялікі, але вядомы сваім гістарычным мінулым. У часы Уніі ў ім жыў Холмскі праваслаўны епіскап. З даўніх часоў у ім славіўся цудадзейны абраз вялебнага Ануфрыя Вялікага, знойдзены ў XV стагодзьдзі на беразе ракі Буг, дзе і пабудаваны быў гэты манастыр. Брацііі ў манастыры налічвалася няшмат. Настаяцелем быў архімандрыт Аляксей (Асташэўскі), курэц, стары, які прасіцца на спачынак. Зь ім я ўжо пазнаёміўся ўлетку, калі праводзіў свае вакацыі ў манастыры. Стары манах ня быў вельмі адукаваны, але меў вялікі досьвед манаскага жыцьця. Было цікава яго паслухаць. Як старога знаёмага, ён прыняў мяне ласкава. Пасаду намесьніка ў манастыры я атрымаў пасьля свайго сябра гераманаха Філафея, якога перавялі ў іншае месца. Мітрапаліт Дыянісій паслаў яго на два гады ў Канстантынопаль для выву-

чэньня грэцкай мовы, дзе ён вучыўся ў багаслоўскай школе на востраве Халкі.

Манастыр улетку патанаў у зеляніне дрэваў. Пераважна гэта былі вольхі. Вакол – заліўныя лугі з невялікімі сажалкамі. Каля манастыра рос шматвяковы дуб, у дупле якога маглі памясьціцца тры чалавекі. Ён быў сьведкам вялікага пэрыяду манастырскага жыцьця. Насупраць манастыра на процілеглым беразе ракі Буг знаходзілася станцыя Дубіца чыгункі Брэст–Холм. Цераз раку перапраўляліся паромам. Да Першай сусьветнай вайны тут быў мост. Прастольнае сьвята манастыра, на якое зьбіраецца шмат багамольцаў, адбываецца 12/25 чэрвеня. Раньняй вясной, калі рухаюцца па рацэ крыгі, вада падымаецца і залівае ўсе лугі вакол манастыра. Тады на месяц манастыр адрэзаны ад зьнешняга сьвету і стаіць сярод дрэваў і вады, як чароўны палац. Да ўтварэньня Польскай незалежнай дзяржавы ў 1918 годзе манастыру належалі вялікія зямельныя надзелы, галоўным чынам, лясы. За пяць вёрстаў ад манастыра ў лесе месьціліся манастырскі скіт і могілкі на беразе вялікага Белага возера сярод лесу. Побач зь ім знаходзіліся яшчэ два возеры: Чорнае і Таемнае. Характэрна, што ў Белым возеры вада была празрыстая і белая, а побач, у Чорным возеры, – вада, як смала, чорная. Лясныя надзелы і азёры адабралі польскія дзяржаўныя ўлады. Манастыру пакінулі ворную зямлю і лугі.

У манастыры надоўга я не застаўся, толькі на 9 месяцаў, і быў пераведзены ў Туркавічы на Холмшчыне. Шкада мне было пакідаць маляўнічы і ўтульны манастыр. Для яго за кароткі тэрмін я набыў панікадзіла ў храм, некалькі срэбных расаў, звон, падсьвечнікі да іканастаса, абнавіў іканастас у трапэзнай, а таксама прывёў у парадак манастырскі сад, які быў запушчаны. Яблыкі з саду і ўсе садовыя дрэвы здавалі жыду Бідэрману ў арэнду. Брація садавіной з манастырскага саду не карысталася. Па-за агароджай манастыра стаялі дзьве прыгожыя капліцы: Усьпенская і Стрэчанская. На прастольнае сьвята ў іх праводзілі літургію для багамольцаў. У 1934 годзе ў манастыры была адчыненая дыякана-псаломніцкая школа з чатырохгадовым навучаньнем. З яе выйшлі сьвятары, дыяканы і псаломнікі. Яна існавала да вайны 1939 года.

### Туркавічы

На маё месца ў Яблочынскім манастыры быў прызначаны мой брат па манастве гераманах Ігнацій (Возераў). Яму я здаў свае абавязкі ў манастыры, а сам паехаў у Пачаеўскую Лаўру на багамольле. У той час там быў мітрапаліт Дыянісій з Варшавы. Я папрасіў у яго аўдыенцыі. У архірэйскім доме Лаўры ён прыняў мяне ласкава, вы-

слухаў пра маю няўпэўненасьць у сваёй місіі будаўніцтва манастырскага падворку ў Туркавічах і даў мне сваё павучаньне. Загадаў мне заехаць у Белеў, дзе знаходзіўся нядаўна абноўлены абраз Божай Маці ў адной мясцовай жыхаркі, беднай удавы. Настаяцелем у Белеўскай царкве быў мой калега гераманах Мелітон. Да яго і пасылаў мяне мітрапаліт пазнаёміцца са справай арганізацыі манастырскага падворку.

У Белеў я заехаў па дарозе назад з Пачаева і прагасьцяваў некалькі дзён у свайго сябра а. Мелітона. У яго нядаўна пабудаванай царкве зьбіралася мноства багамольцаў, што прыходзілі з розных мясьцінаў на пакланеньне цудадзейнаму абразу “Взыскания погибших”, які цудоўным чынам абнавіўся. Царкву і гаспадарку ў падворку вялі манашкі. Паўсюль панавалі чысьціня і парадак.

У Туркавічы я прыехаў цягніком ужо позна ў кастрычніку, калі надвор’е было вільготнае, дажджлівае і слотнае. Туркавічы – вялікае паселішча. Міма праходзіла чыгунка, і ў Туркавічах была станцыя. Пасяліўся я ў хатцы селяніна Рамана Казімірчука, сям’я якога клапатліва мяне абслугоўвала. Я займаў асобны пакой, а яго сям’я цясьнілася ў другім. Нязвыклыя вясковыя абставіны прыгняталі мяне. Я не знаходзіў суцяшэньня для сябе ў вандроўках па парку памешчыка, куды штодзённа хадзіў і ў добрае надвор’е, і ў дождж, і ў сьнег. Шпацыраваў назад і ўперад доўга, больш за гадзіну. Па вуліцы гразь была непралазная, у выніку чаго я вымушаны быў вяроўкамі прывязваць калошы да ботаў, каб у гразі не згубіць іх. У такую гразь я хадзіў у царкву, што стаяла на другім канцы сяла на могілках. Узімку даводзілася ісьці па калені ў сьнезе.

Прызначылі мяне сюды не толькі абслугоўваць рэлігійныя патрэбы туркавічанаў праваслаўных, але таксама для стварэньня манастырскага падворку. У кансысторскім указе пра тое было сказана. На такую справу даў мне сваё блаславеньне мітрапаліт Дыянісій. На мяне ўскладаўся цяжкі абавязак, а па маладосьці і нявопытнасьці гэта здавалася мне не па сіле. Таму я хваляваўся і засмучаўся.

Але ў Туркавіцкай царкве знаходзілася копія цудадзейнага абраза Туркавіцкай Божай Маці. Праваслаўныя вернікі Холмшчыны яго ўшаноўвалі, і на прастольнае сьвята зьбіралася дзесяткі тысяч, каб паманіцца перад сьв. абразам. Прастольнае сьвята спрадвеку адбывалася 2/15 ліпеня, калі стаяла летняя пара. Для Холмшчыны Туркавічы былі сьвятым месцам. Адзін сьвятар склаў наступны верш у гонар Туркавіцкага абраза Божай Маці, які народ сьпяваў у Туркавічах на сьвяце (адпусьце) і дома ці ў час крыжовага ходу. Словы гэтага верша:

Волынь Почаевом слыве,
Яблочином Подлясье,

А Турковичами живе
Вся земля Холмска наша, і г. д.

З 1902 года да Першай сусьветнай вайны ў Туркавічах існаваў вялікі жаночы манастыр. Палякі яго забралі ў 1919 годзе і пасялілі туды сваіх манашак, якія ўтрымлівалі дзіцячы прытулак для польскіх дзяцей. Нашым манашкам не было дзе жыць у Туркавічах. Дзьве родныя сястры-манашкі жылі ў сяле. Маёй задачай было пабудаваць дом для жыльля манашак і сьвятара.

У час вайны манашкі выехалі ў Маскву і забралі цудадзейны (арыгінальны) абраз Туркавіцкай Божай Маці. Там ён дзесьці згубіўся. Туркавічане заказалі напісаць мясцоваму мастаку Зіню ў Грубешаве копію з цудадзейнага абраза. Яна і захоўвалася ў Туркавіцкай царкве на могілках, прыцягваючы шмат багамольцаў. Ад яе і зьдзяйсьняліся цуды. У гэтай царкве пачаў праводзіць Набажэнствы я і маліцца перад сьвятым абразам аб нябеснай дапамозе ў будаўніцтве манастырскага падворку.

Для зьдзяйсьненьня маёй мэты ў Туркавічах патрэбныя былі грошы і месца для будаўніцтва дома, але я ня меў ні аднаго, ні другога. З чаго пачынаць і што рабіць, ня мог даўмецца. Царкоўная каса не давала надзеі на мае мерапрыемствы – яна выплачвала пазыкі за званы. Была толькі адна надзея на дапамогу Царыцы Нябеснай. Да яе я і зьвяртаўся ў сваёй малітве штодзённа.

Надышла вясна 1932 года. Я ў роспачы, што ў мяне нічога не атрымлівалася. Раптам нечакана прыйшла мэцэнатка і ахвяравала неабходную суму грошай на будаўніцтва дома. Я прыняў гэта як цуд дапамогі Божай Маці, за што і дзякаваў ёй. Усьлед за гэтым адзін сумленны туркаўчанін прапанаваў свой невялікі надзел зямлі насупраць царквы на могілках. Становішча выратаванае, і я, не марудзячы, прыступіў да справы. Накрэсьліў плян дома і прапанаваў габрэю Худэсу, гандляру дрэвам, у бліжэйшым мястэчку Тышоўцы пабудаваць дом па маім пляне на працягу аднаго месяца. Ён пагадзіўся ў крэдыт.

З упэўненасьцю я рыхтаваўся да Туркавіцкага прастольнага сьвята 2/15 ліпеня. Да вызначанага тэрміну Худэс завяршаў будаўніцтва дома. Сваім рапартам я паведаміў духоўнай кансысторыі ў Варшаву пра тое, што дом пабудаваны і мая задача выкананая. Мітрапаліт Варшаўскі Дыянісій надаваў гэтаму вялікае значэньне. Ён выдаў распараджэньне духавенству прыбыць у Туркавічы на храмавае сьвята з крыжовым ходам. Сам ахвяраваў у Туркавіцкую царкву мастацкі мэталічны запрастольны крыж з часткай ад Жыватворнага Крыжа Гасподняга і вялікі такой самай працы сьв. абраз Уваскрэсеньня Хрыстова ў мэталічнымківоце, зробленыя ў майстэрні Пачаеўскай Лаўры.

Гэтыя Сьвятыні прынесьлі манашкі Зімненскага жаночага манастыра за 30 кілямэтраў з крыжовым ходам. Апрача таго, вырашыў сам прыехаць у Туркавічы са сваім вікарыем епіскапам Савам і сьвітай з мэтай узначаліць урачыстасьць.

Напярэдадні сьвята мітрапаліт прыбыў цягнікам з Варшавы ў Туркавічы. Паводле прынятага парадку, яго сустрэлі крыжовым ходам на чыгуначнай станцыі і суправаджалі праз сяло ў царкву. Па маёй просьбе туркавіцкі памешчык прыслаў па яго свой аўтамабіль, але мітрапаліт вырашыў ісьці з крыжовым ходам з духавенствам і народам, што яго сустрэлі. Прыбыло больш за сотню сьвятароў і тысячы вернікаў. Казалі, што сабралася каля 30 тысяч паломнікаў. Я сустрэў мітрапаліта з крыжовым ходам і духавенствам на цьвінтары свайго храма. Адсюль, з узвышанага месца адкрывалася велічная карціна: рухаліся да нашай царквы па вуліцы ў строгім парадку лес харугваў, адзін за другім несьлі дзесяткі запрастольных крыжоў, мноства духавенства на чале з мітрапалітам Дыянісіям, з епіскапам Савам і тысячы багамольцаў. Ад замілаваньня такой карцінай я заплакаў і ня мог спыніць сьлёз з маіх вачэй. Гэта была незабыўная карціна – урачыстасьць веры і Праваслаўя.

Усяночнае дбаньне зьдзейсьнілі каля царквы знадворку пад адкрытым небам. Стаяла цудоўнае надвор'е. Магутны царкоўны хор пад кіраўніцтвам сьвятара В. Сагайдакоўскага сьпяваў на званіцы і сваім сьпевам напаўняў вялізную прастору. Здавалася, што сьпяваў увесь шматтысячны народ, які сабраўся на ўрачыстасьць. Набажэнства ўзначальваў епіскап Сава, а мітрапаліт стаяў на высокай стасідыі побач з духавенствам. Калі ўсяночнае дбаньне завяршылася, то ўсю ноч служылі малебны і акафісты ля абраза Божай Маці, а багамольцы падыходзілі з узьнёсласьцю цалаваць яго. Ён зьзяў у высокім кіёце, аколены тысяччу сьвечак, заліты, здавалася, нябесным сьятлом. Усю ноч сьвятары спавядалі багамольцаў, якія прычашчаліся сьв. Хрыстовых Таемстваў Цела і Крыві ў час раньняй і позьняй літургій. Набажэнства ў сьвята закончылася крыжовым ходам на раку Гучву для асьвячэньня вады, а пасьля яго абедам для мітрапаліта, духавенства і ганаровых гасьцей у новым царкоўным доме манастырскага падворку. Мітрапаліт ацаніў маю працу і ўзнагародзіў мяне залатым нагрудным крыжам.

Пасьля заканчэньня Набажэнства ў дзень сьвята, калі багамольцы разышліся, а ў доме засталося духавенства і мітрапаліт, нечакана на чыстым блакітным небе зьявілася на даляглядзе воблака, якое хутка павялічвалася і зацягнула ўсё неба. З яго паліў дождж і ўдарыў моцны гром, які трапіў у падводы з карусэлямі, забіў коней і электрычная іскра пранеслася вакол нашага дома з духавенствам, нікому не

прынёсшы шкоды. Карусэльшчыкі-палякі былі пакараныя за тое, што ўсю нашу літургію гулялі і забаўлялі публіку, разьмясьціўшыся непадалёку ад могілак. Я прасіў іх не перашкаджаць нашаму Набажэнству, але яны сьмяяліся і зьдзекаваліся. Маці Божая пакарала іх за гэта. Пасьля ўжо ніколі не прыяжджалі карусэльшчыкі на Туркавіцкае сьвята. Зразумелі свой грэх.

У час майго служэньня ў Туркавічах ад сьвятога абраза Туркавіцкай Божай Маці зьдзейсьнілася некалькі цудоўных вылечваньняў хворых, а ў мінулым, як распавядалі мне старажылы ў Туркавічах, было вядома іх шмат. Пад старажытнай пяцісотгадовай царквой захоўваліся мыліцы кульгавых, вылечаных ад Туркавіцкага сьвятога абраза.

Туркавічы і наваколье мелі сваю гістарычную мінуўшчыну. Назва гэтая паходзіць ад "ту туркі". Калісьці сюды прыходзілі туркі ў час вайны з Польшчай і разьмяшчаліся станам на беразе ракі Гучвы, уздоўж якой працягнуліся Туркавічы. Рака была глыбокая з балоцістымі і дрыгвянымі берагамі. Туркі не маглі яе перайсьці, на супрацьлеглым беразе стаяў горад з крэпасьцю Чэрвень, пра які ў старажытным летапісе сказана: "Киевский князь Володимирь, шедъ на ляховъ и зая ихъ грады Перемышль, Червень и иные". Туркі не маглі пранікнуць у Чэрвень і заняць гэты горад. Цяпер на месцы Чэрвеня знаходзіцца сяло Чэрмна і высокія валы, рэшткі крэпасьці. Прадмесьцем Чэрвеня было паселішча, якое цяпер называецца Тушыўцы, што азначае – там жылі калісьці шаўцы.

Туркавіцкі абраз Божай Маці ёсьць падабенствам абраза Чанстахоўскай Божай Маці, што знаходзіцца ў Чанстахове ў Польшчы. Цяпер так званы Чанстахоўскі абраз калісьці быў сямейным абразам князёў Галіцкіх. Польскі кароль Казімір заваяваў Галіцкае княства і далучыў яго да Польскай Кароны. Княжацкі род быў вынішчаны. Спадкаемка гэтага роду жыла ў замку ў Белжэцы на мяжы з Холмскім княствам. Польскі князь Мазавецкі ажаніўся з гэтай князёўнай і павёз яе ў Мазоўша. Княжацкі абоз спыніўся на адпачынак у лесе на беразе Гучвы, дзе цяпер стаіць Туркавіцкі манастыр. У абозе знаходзіўся сьвяты абраз Божай Маці князёў Галіцкіх, які везьлі ў Польшчу. Калі абоз паехаў, на месцы дзе стаяў сьвяты абраз, зьявілася зьзяньне, і ў зьзяньні пастухі ўбачылі сьвяты абраз. Паведамілі пра гэта сваім бацькам, а тыя сьвятару. З крыжовым ходам знойдзены абраз перанесьлі ў царкву, ён праславіўся цудамі вылечваньня хворых. Сьвяты абраз быў названы Туркавіцкім.

Паводле захаваных гістарычных фактаў, на месцы, дзе быў знойдзены сьвяты абраз у Туркавічах, існаваў праваслаўны манастыр, але яго разбурылі ў XVII стагодзьдзі уніяты. Адноўлены ён быў толькі на пачатку

XX стагодзьдзя. Пра гэта мы ўжо згадвалі пры апісаньні Туркавічаў. Туркавіцкі жаночы манастыр XX стагодзьдзя вёў шырокую рэлігійна-асьветную і місіянэрскую працу. На свае сродкі ён утрымліваў дзіцячы прытулак для дзяўчынак, царкоўна-настаўніцкую школу, шпіталь для бедных, аптэку для раздачы бясплатных лекаў і абслугоўваў хворых. Мясцовае насельніцтва ўспамінала гэта з удзячнасьцю. У 1943 – 1944 гадах польскія банды[26] забівалі праваслаўнае насельніцтва ў Туркавічах, тыя, што выратаваліся, выехалі са свайго сяла. Туркавічы больш не існуюць, як і ўся Холмшчына. Палякі авалодалі ўсім.

### Кельцы

У сьнежні 1932 года мяне перавялі ў горад Кельцы, у цэнтар Польшчы, у гарах. Тут пражывалі рускія і складалі невялікую царкоўную супольнасьць. Прыбыў я туды напярэдадні сьвята Нараджэньня Хрыстова. На кватэру прынялі мяне мясцовыя домаўладальнікі муж і жонка Станюковічы. У іх багатым доме я ўладкаваўся зручна. У іх жа я і харчаваўся. Набажэнствы праводзіў у нямецка-лютэранскай кірсе пасьля іхняга Набажэнства. Былі нязручнасьці, але іншага выйсьця не было. У хуткім часе мне ўдалося ўгаварыць мясцовага рускага гандляра Іванова дазволіць абсталяваць у ягоным доме дамавую царкву. Ён згадзіўся. З двух пакояў зрабілі невялікую царкву ў гонар сьвятога Мікалая Цудатворцы. У ёй я і праводзіў Набажэнствы.

У горадзе стаялі дзьве праваслаўныя пяцікупальныя царквы, пабудаваныя ў канцы мінулага XIX стагодзьдзя. Цэрквы цудоўнай архітэктуры. Адну царкву каталікі перарабілі на свой храм, а другая стаяла зачыненая з разбураным купалам у цэнтры. Зроблена гэта наўмысна. Хутка яе разабралі. Стаяла яна ў цэнтры горада насупраць каталіцкага катэдральнага сабора і епіскапскага палаца. Яна мазоліла вочы палякам. Я прасіў вярнуць яе праваслаўным, але адмовілі. Да гэтай царквы належаў вялікі двухпавярховы дом, але яго не вярнулі нам. Глум і зьдзек былі зброяй у руках польскіх уладаў.

У сваёй царкве я навучаў дзяцей Закону Божаму, але іх было мала. Па-руску яны ўсе размаўлялі, хоць вучыліся ў польскіх школах.

З горада Кельцы я штомесяц езьдзіў у горад Радом для правядзеньня Набажэнстваў. Было дзьве гадзіны язды. У гэтым горадзе жыло шмат праваслаўных, якіх я абслугоўваў. У цёплую пару года я служыў у капліцы на праваслаўных могілках за горадам. Гарадзкі велічны сабор, што стаяў у цэнтры горада, быў забраны палякамі і ператвораны ў касьцёл. Ва ўсіх гарадах цэнтральнай Польшчы праваслаўныя храмы былі ці разбураныя, ці ператвораныя палякамі ў іхнія храмы. Яны помсьцілі рускім за панаваньне Расеі над Польшчай з часоў імпэратрыцы Кацярыны II.

Апрача гарадоў Кельцы і Радом я абслугоўваў невялікую царкоўную супольнасьць у горадзе Астравец-Келецкі. Там я бываў зрэдчас. Набажэнствы праводзіў у залі на фабрыцы. Гасьцінна прымаў мяне доктар-акуліст, хрышчаны габрэй, жонка яго была руская, праваслаўная. У рэлігійным пляне ён вылучаўся вальнадумствам, а ў душы, магчыма, быў габрэем па веры.

Мае прыхаджане ў Кельцах сьвяткавалі Нараджэньне Хрыстова па новым стылі, а ў Радоме – па старым. Двойчы я служыў на гэтае сьвята: па новым і старым календары. Увогуле, у гарадах цэнтральнай Польшчы рускія жылі па новым календары. У Варшаве ўсе сьвяты сьвяткавалі па новым. Рускія і ўсе праваслаўныя прызвычаіліся да гэтага і лічылі, што так лепш.

Высока ў Сьвята-Кршыскіх гарах, у правінцыі Кельцы, разьмяшчалася турма строгага рэжыму, дзе знаходзіліся і праваслаўныя за падпалы, камунізм, забойствы. У Вялікі пост я спавядаў іх, праводзіў літургію ў турме і прычашчаў вязьняў. Умовы жыцьця ў гэтай турме былі цяжкія.

Кельцкія ўмовы маёй пастырскай дзейнасьці дазвалялі мне езьдзіць у горы Карпаты на адпачынак улетку. Мне было гэта неабходна для ўмацаваньня маіх лёгкіх. Вярнуўшыся з Карпатаў напрыканцы жніўня 1934 года, я атрымаў запрашэньне прыбыць у міністэрства асьветы ў Варшаву. Адразу ж накіраваўся туды бліжэйшым цягнікам. Там мне прапанавалі пасаду выхавальніка ў дзяржаўным інтэрнаце для студэнтаў праваслаўнага багаслоўскага факультэта Варшаўскага ўнівэрсытэта. Маю кандыдатуру на гэтую пасаду прапанаваў мітрапаліт Варшаўскі Дыянісій. Я згадзіўся. Такім чынам, я хутка разьвітаўся з маімі прыхаджанамі ў Кельцах і Радоме. Яны шкадавалі і спрабавалі прасіць мітрапаліта пакінуць мяне ў Кельцах. Дзеля гэтага езьдзіла ў Варшаву дэлегацыя, але посьпеху ня мела.

## Варшава

Мая служба ў студэнцкім інтэрнаце мела выключна пэдагагічны характар, нешта для мяне новае, нязвыклае. Я палюбіў пастырства на прыходах, але мець справу з дарослымі студэнтамі ўнівэрсытэта было нялёгка. Патрэбныя былі такт і вытрымка, а таксама вопыт. Гэта неабходна набываць. Як навічок у такой галіне, я баяўся, што не змагу справіцца са сваімі абавязкамі.

Рэктар інтэрната – архімандрыт, прафэсар, доктар філязофіі Іларыён Васдэкас, рускі грэк, – адрэкамэндаваў мяне студэнтам у інтэрнацкай царкве пасьля вячэрняй малітвы. Прынялі з цікаўнасьцю і добразычлівасьцю. Я адчуў сябе сьмела на сваёй пасадзе. З гэтага часу пачаліся мае дзяжурствы ў інтэрнаце.

Афіцыйна наш інтэрнат называўся так: “Дзяржаўны інтэрнат для студэнтаў багаслоўскага факультэта”. У ім было сваё начальства і своя адміністрацыя: дэлегат міністра асьветы доктар З. Загуроўскі, рэктар інтэрната, прыгаданы вышэй, гармостэр, ці старэйшы выхавальнік, і духоўнік, выхавальнік, інтэндант для вядзеньня гаспадаркі, а таксама гаспадыня на кухні, повар, прыслуга, прыбіральшчыкі. Штат немалы. Усіх студэнтаў было 80 чалавек. Больш не прымалі.

Будынак інтэрната вялікі, пабудаваны міністэрствам у 1929 годзе спэцыяльна для гэтай мэты. Ён знаходзіўся побач з мітрапалітным катэдральным саборам.

У інтэрнаце чысьціня, парадак, падлогі паркетныя, бліскучыя, вялікія памяшканьні, студэнцкія пакоі на дваіх, заля-чытальня, сталовая і ўсе гаспадарчыя прыстасаваньні. Усё зроблена па-сучаснаму і прыгожа. Умовы для студэнтаў былі выдатныя. На верхнім паверсе інтэрнацкая царква ў гонар Сьв. Мікалая Цудатворцы. Там штодня зранку і ўвечары праводзіліся Набажэнствы. Служылі студэнты па групах. Усе не прысутнічалі ў будні, а толькі на сьвяты і па нядзелях. За гэта адказваў я паводле маіх абавязкаў.

На карысьць маёй службы міністэрства абавязала мяне атрымаць пэдагагічную адукацыю на гуманістычным факультэце, я гэта ахвотна выканаў, сумяшчаючы з маімі абавязкамі ў інтэрнаце. Мая праца па пэдагогіцы атрымала выдатную ацэнку прафэсара, дзякуючы чаму я быў вызвалены ад вусных экзамэнаў па пэдагогіцы. Я палюбіў прадмет, асабліва пэдагагічную псыхалёгію, і зьбіраўся пісаць доктарскую працу ў гэтай галіне. Але ў той час мне прапанавалі для доктарскай іншую тэму, багаслоўскую, за якую я і ўхапіўся.

Мяне прызначылі праз год на пасаду гармостэра ў студэнцкім інтэрнаце з месячным акладам ардынарнага прафэсара ўнівэрсытэта (4-я катэгорыя з 13). Гэтае павышэньне па службе я атрымаў дзякуючы пэдагагічнай адукацыі. Маімі абавязкамі сталі: навучаньне студэнтаў практычнаму статуту і правядзеньню Набажэнстваў у царкве, прамаўленьню казаньняў (гамілетычны гурток), царкоўна-славянскай мове пры дапамозе чытаньня на клірасе, выхаваўчыя гутаркі са студэнтамі сам-насам і групамі, назіраньне за іх паводзінамі. Гэтыя меры былі неабходныя для падрыхтоўкі іх для пастырскага служэньня. Студэнты жылі ў інтэрнаце за казённы кошт, нічога не плацілі за сваё ўтрыманьне, апрача ўнівэрсытэта.

Да таго ж мяне запрасілі у камісію пры міністэрстве для цэнзуры і ацэнкі падручнікаў для сярэдніх школаў па Законе Божаму. У гэтай камісіі я займаў пасаду віцэ-старшыні, кім дасюль быў архімандрыт Феафан (Пратасевіч), які пазьней загінуў падчас польскага паўстаньня ў Варшаве[27] ў 1944 годзе. Яго забілі немцы каля царквы на Волі ў

Варшаве. Астатнія члены камісіі былі ў сьвяшчэнным сане. Усе яны потым загінулі ў час вайны.

За кошт міністэрства нашы студэнты трэцяга курса мелі экскурсію па Польшчы з мэтай пазнаёміцца з яе прыгажосьцю. Яна адбылася напрыканцы акадэмічнага года. Паводле маіх абавязкаў я суправаджаў студэнтаў.

Міністэрства імкнулася палянізаваць нашых студэнтаў, але вялікіх посьпехаў ня мела. Студэнты цьвёрда трымаліся сваёй нацыянальнасьці і палянізацыі не паддаваліся. Аднак знаходзіліся адзінкі, якія дзеля выгоды станавіліся палякамі. Яны паводзілі сябе з выклікам і парушалі дысцыпліну. Імі апекаваўся спадар Загуроўскі, але мяне не чапаў. Аднойчы ён сказаў мне: “Я цаню і паважаю вас за тое, што вы добры сьвятар і пастыр”. Ён маю цьвёрдасьць ведаў. Палянізацыі я не спачуваў.

## Разьдзел шосты

# Архімандрыт

Пры атрыманьні ўзнагародаў у мяне здараліся непаразуменьні. Я іх не жадаў і лічыў, што сьвятар павінен выконваць свае пастырскія абавязкі па сумленьні і без узнагародаў. Духоўна абслугоўваючы сваю паству, а таксама стоячы ў царкве перад сьв. прастолам, яны служаць Богу і ад Бога атрымоўваюць узнагароду. Калі імпэратар Мікалай I устанавіў узнагароду для духавенства, мітрапаліт Маскоўскі Філарэт заплакаў і сказаў: "Няшчасьце для Царквы!" У старажытнасьці духавенства служыла без узнагародаў.

Калі мітрапаліт Дыянісій узнагародзіў мяне санам ігумена, я ўхіліўся ад узьвядзеньня ў гэты сан. Паводле маіх перакананьняў, ігуменства не ўзнагарода, а пасада ў манастыры. Ігумен – настаяцель у манастыры. Я ж ня быў настаяцелем манастыра. Аднак маю ўпартасьць зламаў епіскап Сава словамі, сказанымі ў алтары Варшаўскага катэдральнага сабора ў прысутнасьці духавенства: "Не жадаеце ігуменства, а жадаеце архімандрыцтва?" Гэта было непрыемна, і каб так ня думалі, я прыняў сан ігумена. Той жа епіскап у наступную нядзелю узьвёў мяне ў ігуменства.

Да свайго сану гераманаха я прывык і палюбіў яго. Я не хацеў зь ім разьвітвацца. У гэты час узнагароды раздавалі духавенству направа і налева лёгка, часта без асаблівых заслугаў. Стары протасьвятар Варшаўскага катэдральнага сабора аднойчы зазначыў уголас: "Цяпер стала сорамна атрымліваць узнагароды". Узнагароджаных мітрамі было шмат, і станавілася ўсё больш. Гэтую высокую ўзнагароду абясцэнілі.

Мяне не цікавіў сан архімандрыта. Я і не хацеў яго прымаць, калі мітрапаліт у 1938 годзе узнагародзіў мяне гэтым санам. Мяне пераканаў прыняць яго епіскап Сіман, якога я любіў. Мітрапаліт даведаўся пра маю ўпартасьць, але ведаў і яе прычыну, а прычына гэтая была па віне самога мітрапаліта.

Знаходзячыся на ўнівэрсытэцкай службе, я меў тры з паловай месяцы летніх вакацый. Я праводзіў іх часткова ў Яблочынскім манастыры, а ў жніўні адпачываў у Карпатах, звычайна ў Варохце. Горнае паветра было неабходнае для майго здароўя.

У Карпатах застала мяне польская ваенная мабілізацыя. Хутка рыхтаваліся да вайны з немцамі. На гарадзкіх курортах пачалася паніка – усе сьпяшаліся вярнуцца дадому. За дзьве гадзіны да адпраў-

леньня цягніка я з цяжкасьцю атрымаў месца ў вагоне, пасьля мяне гэта было ўжо немагчыма. У вагон набілася грамада, стаялі ў праходах, нават у прыбіральнях.

У Варшаву я не хацеў вяртацца, бо ведаў, што ў час вайны там будзе дрэнна. Паехаў у Пачаеўскую Лаўру, ціхі прытулак у буру. Па дарозе з Варохты меў перасадку ў Львове на другі цягнік. На вакзале гучала баявая музыка, якая падбадзёрвала палякаў. На душы было трывожна.

У сьв. Лаўры было ціха і спакойна. Манастыр жыў сваім жыцьцём: малітвай і пастом. Брацыя праводзіла шмат часу на Набажэнствах у царкве. Пасьля дарогі я акунуўся ў гэтае жыцьцё. Пасьля людзкой марнасьці яно здавалася мне нябесным, жыватворным. Магчыма, яно такое і было.

Намесьнікам Лаўры быў архімандрыт Панцеляймон, пра якога я прыгадаю пазьней. Мы зь ім калегі па ўнівэрсытэце ў Варшаве. Ён узрадаваўся майму прыезду. Разьмясьціў мяне ў пакоі Архірэйскага дома. Ён быў пусты, без гасьцей. У вялізным доме мне было неяк не па сабе. Заняўся перапісваньнем сваёй дысэртацыі на друкарцы. Наведваў Набажэнствы. Абедаў ў брацкай трапэзнай. Стравы строга манастырскія і посныя. Нялёгка было прызвычаіцца да іх.

Нямецка-польская вайна пачалася 1 верасьня 1939 года. Нямецкая авіяцыя і нямецкія танкі пачалі ваенныя дзеяньні без абвяшчэньня вайны. За дзесяць дзён польская армія была разьбітая і немцы займалі краіну. Варшава абаранялася даўжэй, з той прычыны моцна пацярпела ад бамбардзіровак. Па радыё перадавалі трывожныя весткі. Родныя, чые мужы і браты пайшлі на вайну, плакалі. Са сьлязьмі на вачах прасілі выратаваньня перад цудадзейным абразам Божай Маці Пачаеўскай. Народная вера ў дапамогу Царыцы Нябеснай была моцнай. Гэтая вера мяне натхняла.

Нямецкія аэрапляны зьявіліся і над Пачаевам, а горад Крамянец яны бамбардзіравалі аднойчы ў кірмашовы дзень, калі народ зьехаўся на кірмаш. У гэтым ціхім горадзе знайшлі сабе прытулак амбасадары Францыі і Англіі, якія ўцяклі на сваіх аўтамабілях з Варшавы. Але нямецкія аэрапляны выгналі іх з горада. Яны выехалі да румынскай мяжы. Увогуле, гэтыя варожыя аэрапляны былі гаспадарамі становішча і запаланілі ўсю Польшчу, абстрэльвалі цягнікі і калёны бежанцаў.

На Валынь прыбылі польскія бежанцы з Заходняй Польшчы. У Крамянцы і Пачаеве іх было шмат. Людзі галадалі і мерзьлі, калі пачыналіся халады. Асабліва цяжка было тым, што мелі малых дзяцей. Не спадзяваліся, што іх усходні сусед – Савецкі Саюз – ударыць па Польшчы і акупуе яе ўсходнія раёны: Галіцыю, Валынь, Палесьсе і

ўсю Заходнюю Беларусь. Гэта здарылася 17 верасьня, калі тав. Молатаў абвясьціў па радыё з Масквы, што "пераможная чырвоная армія вызваляе братоў украінцаў і беларусаў ад прыгнёту польскіх паноў і ксяндзоў".

У вёсках знаходзілася па-савецку настроеная моладзь. Для сустрэчы чырвонай арміі яна рабіла аркі з зеляніны ў канцы вёсак. Калі я праяжджаў з Пачаева ў Крамянец, то па дарозе я сустракаў гэтыя аркі. Убачыўшы савецкую ўладу на ўласныя вочы, гэтая моладзь хутка вылечвалася ад "чырвонай" хваробы і ў такой самай ступені пачынала "хварэць" на ўкраінскі нацыяналізм. Так было і ў Заходняй Беларусі.

Хутка пасьля прыходу чырвонай арміі на тэрыторыю Польшчы адбыўся прыродны цуд, які прадказваў народную бяду, як зразумелі тое. У цёплую восеньскую паравіну ў верасьні-месяцы выпаў надзвычай вялікі сьнег і ўдарыў моцны мароз. На дарогах утварыўся галалёд, перакульваліся вайсковыя машыны, маладыя дрэўцы ламаліся пад цяжарам сьнегу і лістоты. Сьнег і мароз пратрымаліся некалькі дзён, пакуль не растала.

Мяне асабіста цікавіла рэлігійнасьць чырвонаармейцаў. Калісьці я чытаў у эмігранцкай прэсе, што нібыта маршал Тухачэўскі[28] патрабаваў спыніць антырэлігійную прапаганду сярод вайскоўцаў, бо сярод іх ёсьць 70 % вернікаў. Я шукаў гэтых вернікаў. Магчымасьць была. Невялікімі групамі чырвонаармейцы пад кіраўніцтвам палітрукоў прыходзілі ва Ўсьпенскі сабор Лаўры, каб агледзець яго, убачыць яго прыгажосьць і веліч. Вернікі заходзілі ціха, а бязбожнікі грукалі жалезнымі цьвікамі ў падэшвах і азіраліся. Былі і такія, што непрыкметна аддзяляліся ад сваёй групы і совалі ў руку багамольцам са словамі "памаліцеся". Падавалі пры гэтым запіску з імёнамі. 70 % вернікаў я не знайшоў, але 5 % было.

Лаўру наведвалі чыны НКУС, рабілі вобшукі, шукалі зброю, радыё, лазілі па вышках манастырскіх карпусоў і цягалі за сабой намесьніка архімандрыта Панцеляймона. Гэта стварала трывожную атмасфэру і няўпэўненасьць у заўтрашнім дні. Брацыя Лаўры хвалявалася.

Прыяжджалі таксама палітрукі-агітатары, якія склікалі братоў на галерэю перад саборам і тлумачылі дасягненьні савецкай улады, перавагу сталінскай канстытуцыі і іншае. Старыя манахі не хадзілі слухаць. Я бываў на гэтых сходах і слухаў. Падчас іх з манахамі праводзілі такія прыёмы. Палітрук задае манахам пытаньне, ці задаволеныя яны прыходам савецкай улады. Першыя шэрагі сьцьвярджальна ківаюць галовамі. "Пляскайце ў далоні!" – камандуе палітрук. Манахі пляскаюць, а іх здымаюць на кінаплёнку. Прымушалі іх падымаць рукі за савецкую ўладу і ўсё гэта фатаграфавалі. У Савецкім Саюзе паказвалі ў кіно, як пачаеўскія манахі стаяць гарой за

савецкую ўладу, а ў сапраўднасьці гэта быў гвалт над беднымі, запалоханымі людзьмі.

Лаўра мела вялікія сады. Пляды яшчэ не сабралі. Савецкая ўлада выдала распараджэньне, якое забараняла брацii Лаўры зьбіраць садавіну са свайго саду. Я паехаў з архімандрытам Веніямінам да вайсковага камісара ў Крамянец прасіць дазволу сабраць садавіну. Там мы пайшлі ў будынак былога польскага павятовага ўпраўленьня, дзе разьмяшчаўся камісар. Пасьля дакладаў ён прыняў нас, але ў нашай просьбе рашуча адмовіў і заявіў, што сады – народнае дабро і што без згоды народа ён ня можа даць дазволу. Пры гэтым ён згадаў вайну 1920 года, калі ваявалі палякі з бальшавікамі, што ў Пачаеўскай Лаўры ў той час стаялі польскія войскі і абстрэльвалі бальшавікоў. Мы ведалі ад старых манахаў пра гэты выпадак. Мы растлумачылі яму, што польскіх салдатаў у Лаўры тады не было, а па манастыры стралялі з гарматаў савецкія войскі. “Расказвайце мне казкі”, – сказаў той і спыніў з намі размову. Мы выйшлі расчараваныя. Патруль ля ўваходу запытаўся ў нас: “У Лаўры быў манахам мой дзядзька, ці жывы ён?” Пры гэтым назваў ягонае імя. Мы сказалі, што памёр. Ён агледзеўся вакол і дадаў: “Памаліцеся за мяне”.

Па справе манастырскіх садоў і маёмасьці прыехаў у Пачаеў палітрук і склікаў сход сялян у мястэчку. Было гэта позьняй восеньню, хутка цямнела. На сходзе было няшмат людзей. З цікаўнасьці туды пайшоў і я. Палітрук гаварыў доўга і многа. У сваёй прамове ён закрануў і манастыры: “Манахі – дармаеды і шкоднікі. У Савецкім Саюзе іх не бяруць праз гэта на службу”. Раптам з натоўпу сялян голас: “Гэта вашы свае дармаеды і шкоднікі, а вы на манахаў звальваеце?” Грамада ўздрыгнула і пакрысе пачала разыходзіцца. Палітрук гэта заўважыў і крыкнуў: “Падніміце рукі, хто за канфіскацыю ў манастыра маёмасьці і зямлі?” Голас з натоўпу: “Мы маем сваю зямлю і манастырскай нам ня трэба”. Грамада разышлася ў цемры вечару. На наступны дзень у павятовым упраўленьні, ці сельсавеце, зьявілася паведамленьне: “Агульнай аднагалоснай пастановай жыхароў Пачаева ў манастыра канфіскуюцца ўсе землі і сады”. Народ у гэтым не ўдзельнічаў. Жыхары Пачаева абураліся.

Брацiя Лаўры была кранутая паводзінамі жыхароў Пачаева – падтрымкай манастыра. Архімандрыт Панцеляймон, намесьнік Лаўры, параіўся з архімандрытам Веніямінам і са мной і вырашыў падзякаваць пачаеўцам за гэта. У нядзельныя дні ўвечары прыходзілі многія ў царкву на акафіст Божай Маці, які служылі перад Яе цудадзейным Пачаеўскім абразам. Напрыканцы акафісту і малебну архімандрыт Панцеляймон узышоў на амбон і прамовіў прыблізна такія словы: “Браты і сёстры! З гэтага сьвятога месца, дзе перад намі

зьзяе сьв. абраз Божай Маці, прыношу вам ад свайго імя і ад імя брацii Лаўры глыбокую падзяку за маральную падтрымку ў гэтыя складаныя дні". Пры гэтым ён зрабіў зямны паклон да народу. У царкве пачалося галашэньне. Грамада плакала, плакала брація, плакаў таксама і я. Цяжка было тады на душы ва ўсіх. Простыя кароткія словы, а выклікалі ўсеагульнае галашэньне.

Урачыстая ўсяночная на сьвята Пакроваў Божай Маці. Я стаяў на левым клірасе, глядзеў на цудадзейны абраз, маліўся да Божай Маці і плакаў. Пасьля ўсяночнай я зайшоў да духоўніка Лаўры а. Касьсяна, Афонскага манаха, за духоўным суцяшэньнем. Расказаў яму пра свой настрой. Гляджу, замест суцяшэньня – ён сам плача. На наступны дзень ён таемна пакінуў Лаўру і выехаў у Вільню. Казалі пазьней, што ён праз Літву і Германію выехаў на Афон у Грэцыю.

Маё знаходжаньне ў Лаўры было небясьпечным. Я вырашыў прабірацца ў Варшаву, дзе засталіся мая кватэра і рэчы. Трэба было пераходзіць таемна савецка-нямецкую мяжу цераз раку Буг. Я меў на ўвазе – каля Яблочынскага манастыра, дзе мяне ведалі многія жыхары. На ўсялякі выпадак я ўзяў пропуск з сельсавета ў Пачаеве ў гэты манастыр. У дарозе ён мне спатрэбіўся.

Разьвітаўшыся з архімандрытамі Панцеляймонам і Веніямінам, памаліўшыся ля сьв. Абраза Божай Маці і каля мошчаў сьв. вялебнага Іова Пачаеўскага, я рушыў у дарогу. На разьвітаньне падараваў а. Веніяміну свой фатаграфічны апарат і залатыя рублі, якія не хацеў мець пры сабе. З Пачаева ехаў аўтобусам, набітым пачаеўскімі габрэямі, а з Крамянца ў Брэст – на цягніку. Начаваў у Ковелі на вакзале з вялікай грамадой бежанцаў-палякаў з малымі дзецьмі. Усюды – у Пачаеве, Крамянцы, Брэсьце – я нагледзеўся на дзёрзкія паводзіны маладых ізраэлітаў. Яны трымалі сябе нахабна, з выклікам. Раптоўна перамянілася гэтае племя ў горшы бок пры бальшавіках. У Польшчы яны такімі не былі. Дзе маглі, імкнуліся ўзяць уладу ў свае рукі.

У мястэчку Збуніне і ў Дубіцы мяне арыштавалі, але пропуск з Пачаева ўратаваў. У прызначаны час, позьнім цёмным восеньскім вечарам, мяне перавезьлі на лодцы паненкі з Дубіцы, манастырскія пеўчыя, якія мяне добра ведалі. Страшна было на рацэ. Думалася: а вось заўважаць савецкія памежнікі, высьветляць месца ракетамі і абстраляюць. Маліўся Богу. Да супрацьлеглага берага прычалілі ўдала. Я выйшаў з лодкі, а дзьве паненкі, што мяне перавозілі, вярнуліся ў мястэчка. Страшная і рызыкоўная пераправа прайшла пасьпяхова. Гасподзь захаваў ад напасьці.

У сяле Навасёлкі я пераначаваў у манастырскага дыякана, дзе яго матушка высушыла маё мокрае адзеньне. На наступны дзень зранку з а. дыяканам я прыйшоў у манастыр. У манастыры стаяла нямецкая

памежная варта. Дзяжурны немец-патруль ля брамы манастыра прывітаў нас. Я ў манастыры – як дома. Радасьць і ўдзячнасьць Богу. Настаяцель манастыра, яго намесьнік і брацiя – мае сябры. Але яны ня ведалі, адкуль я прыйшоў. Я баяўся немцаў і пасьпяшаўся выехаць у Варшаву. Чыгуначная станцыя знаходзілася прыблізна за 20 кілямэтраў ад манастыра, і мне давялося ехаць туды на нанятай падводзе. Да вайны манастырская станцыя знаходзілася за ракой Бугам, але цяпер там былі бальшавікі.

Былая прыгажуня Варшава зрабіла на мяне шчымлівае ўражаньне: многія будынкі разбураныя, некаторыя бяз дахаў і вокнаў, трамваяў, рамізьнікаў і таксовак няма. Тратуары запоўненыя пешаходамі. З вакзала я ішоў пешшу, а валізку аддаў везьці на вазку жыдкам. Яны зьніклі ў натоўпе з маёй валізкай. Я застаўся бяз рэчаў. Крыўдна было – усю дарогу яе вёз, а абакралі амаль дома.

Дом мітрапаліта і катэдральны сабор стаялі некранутыя. Сустрэў сяброў, знаёмцаў. Расказвалі мне, што падчас баёў яны сядзелі ў пячорнай царкве пад саборам без вады і ежы. Мая кватэра ў інтэрнаце была занятая пацярпелымі ад вайны. Я зайшоў да мітрапаліта. Ён прыняў мяне з радасьцю, па-бацькоўску і прапанаваў мне пасяліцца ў мітрапалітным доме, што я ахвотна скарыстаў. На абеды ён клікаў мяне да сябе. У гэты час я быў беспрацоўным архімандрытам. Маё ранейшае становішча пры інтэрнаце страцілася. Унівэрсытэт закрылі, а частка яго была спаленая. Немцы не дазвалялі палякам адчыняць школы. З харчаваньнем стала складана.

### Арышт мітрапаліта

Неўзабаве пасьля майго прыезду ў Варшаву, гэта было ў палове лістапада 1939 года, нямецкае гестапа (ваенная жандармэрыя) выклікала мітрапаліта на допыты. Падставай для гэтага сталі даносы на яго з боку рускіх арганізацый, незадаволеных ім і ягонай дзейнасьцю як кіраўніка Аўтакефальнай Праваслаўнай царквы ў Польшчы. Адной з такіх арганізацый было “Таварыства прыхільнікаў праваслаўя”, пасьпешліва арганізаванае і ўзначаленае прафэсарам багаслоўскага факультэта, якога мітрапаліт выпісаў з Баўгарыі і ўладкаваў на прафэсарскую катэдру. Пра гэта расказаў мне сам гэты прафэсар, за што я пакрыўдзіўся на яго і перастаў быць ягоным знаёмцам, хоць ён і быў маім прафэсарам. Чалавечай подласьці я не цярпеў. Рускі эміграцкі асяродак у Варшаве дзейнічаў супраць мітрапаліта Дыянісія і жадаў бачыць сваім мітрапалітам Серафіма Бэрлінскага і Германскага, немца, які належаў да Рускай Зарубежнай царквы. Пры дапамозе нямецкага гестапа таварыства спадзявалася дасягнуць сваёй мэты. Немцы шукалі і іншыя падставы. Пасьля пра-

цяглых допытаў мітрапаліта Дыянісія пасадзілі пад хатні арышт у ягонай кватэры, а келейніка Ігара, студэнта-багаслова, прызначылі яго целаахоўнікам і вартаўніком. Гэты пастараўся выслужыцца перад немцамі і строга трымаў свайго мітрапаліта. Пасьля гэты студэнт быў высьвечаны ў сьвятара мітрапалітам Бэрлінскім Серафімам, і мне расказваў, што ён так ненавідзеў мітрапаліта Дыянісія, што мог застрэліць яго ўласнай рукой. А гэты ж мітрапаліт шмат дапамагаў яму матэрыяльна і лічыў яго верным слугой. Як лёгка можна памыліцца ў людзях. Герэй Ігар трапіў ў ЗША і служыў у Амэрыканскай мітраполіі.

Гестапа, пасадзіўшы мітрапаліта Дыянісія пад хатні арышт, паставіла ўмову: адрачыся ад мітрапаліцкай катэдры ў Варшаве ці трапіць у канцэнтрацыйны лягер у Дахаў. Дахаў – самы пакутніцкі лягер. Мала хто выходзіў жывым адтуль. Мітрапаліт вырашыў адмовіцца ад сваёй Мітраполіі і перадаць яе мітрапаліту Серафіму (Лядэ). За гэта немцы дазволілі яму пасяліцца на сваім летніку ў Атвоцку як прыватнай асобе. Сваю адмову ён напісаў і перадаў у гестапа.

Нібыта мітрапаліт Серафім гэтага і чакаў. Ня ведаў мітрапаліт Дыянісій, калі з любоўю прымаў свайго саперніка ў Варшаве ў верасьні месяцы і падараваў яму каштоўную Панагію. Рускі эмігранцкі асяродак цешыўся з сваёй перамогі – дамагліся свайго.

Немцы вызвалілі мітрапаліта Дыянісія з-пад арышту і загадалі яму неадкладна выехаць у Атвоцк (горад за 30 кілямэтраў ад Варшавы). Келейнік яго Ігар некуды зьбег.

Ад’езд мітрапаліта Дыянісія адбыўся ў кранальнай атмасфэры. У суправаджэньні іпадыяканаў у рызах ён увайшоў у пячорную царкву катэдральнага сабора бяз славы і мантыі і накіраваўся ў алтар. Там маліўся нейкі час. Мітрапаліцкі хор сьпяваў ірмасы Вялікай суботы: “Хваляю марскою” сьпявалі ціха і ўрачыста. Мітрапаліт выйшаў з алтара і пачаў бласлаўляць тых, што падыходзілі да яго па бласлаўленьне. Многія плакалі. У царкве сабралася некалькі дзесяткаў прыхаджанаў, харысты і духавенства. Пасьля гэтага мітрапаліт ціха выйшаў з царквы ў суправаджэньні іпадыяканаў. Сеў у свой аўтамабіль, і яго верны шафёр-паляк павёз яго ў Атвоцк. Усе адчулі сябе сіротамі.

У хуткім часе пасьля ад’езду мітрапаліта Дыянісія гестапа арыштавала яго сакратара С. П. Юдэнку і кіраўніка справамі Сіноду Ю. Г. Рашчыцкага. Абодвух павезьлі ў канцлягер у Дахаў, дзе яны і загінулі. Сакратар духоўнай кансысторыі схаваўся ў Яблочынскім манастыры. Адсюль ён перайшоў нелегальна мяжу на савецкі бок і пасяліўся ў сваіх сяброў у Крамянцы. Зь ім разам быў памочнік мітрапаліта па катэдры пастырскага багаслоўя ва ўнівэрсытэце. Апошні вярнуўся у Варшаву пасьля заканчэньня вайны і займаў пасаду ў ка-

муністычным міністэрстве па веравызнаўчых справах. Зручна прыстасаваўся.

Мітрапаліт Серафім доўга не прыяжджаў у Варшаву, каб узначаліць Мітраполію пасьля мітрапаліта Дыянісія. Царкоўнае жыцьцё працякала па заведзеным парадку. Я заставаўся без прызначэньня і службы. Жыў на свае сродкі ў сяброў на кватэры. Мяне, бяздомнага, прытуліў архімандрыт Філафей, ключнік катэдральнага сабора.

Перад сьвятам Нараджэньня Хрыстова прыехалі ў Варшаву з Яблочынскага манастыра архімандрыты Мітрафан і Мсьціслаў – абодва мае сябры. Яны запрасілі мяне пераехаць на жыхарства ў гэтае сьвятое месца. З радасьцю я прыняў запрашэньне і зь імі разам выехаў з Варшавы. Мне было добра там. Манахі, штодзённыя Набажэнствы, інтэлігентны асяродак: епіскап Цімафей, памянёныя архімандрыты, паэт Вадзімаў-Лісоўскі і іншыя. У манастыры электрычнасьці не было. Свае кельлі асьвятлялі лямпадамі і сьвечкамі. Доўгімі вечарамі зьбіраліся ў кельлі епіскапа Цімафея і там бавілі час. Калі-некалі гулялі ў прэфэранс. Вучылі мяне, але з гэтага нічога не атрымалася. Удзень выходзілі па калена ў сьнезе пілаваць дровы каля манастыра для кухні і кельляў. Мароз быў моцны. Я застудзіўся і захварэў. Хварэў таксама і сакратар Варшаўскай духоўнай кансысторыі Р. А. Кікец. Дактароў не было, так і ляжалі ў ложках. Ежа манастырская бедная, посная. Нягледзячы на гэта, я адчуваў сябе шчасьлівым.

У манастыры стаяла нямецкая памежная варта. Пры пераходзе мяжы па рацэ Бугу лавілі габрэяў, прыводзілі іх у свой участак, рабілі вобшукі і некуды выпраўлялі. Маладых габрэек гвалцілі. Брація баялася немцаў, хоць тыя не чапалі.

У сакавіку новага 1940 года я атрымаў ліст ад благачыннага з Грубешава протаіерэй Рыгора Міцюка, пасьля вайны быў высьвечаны ў епіскапа ў Канадзе для Украінскай Царквы і быў абраны яе мітрапалітам. Тады ён яшчэ быў сьціплым бацюшкам. У лісьце паведамлялася, што мітрапаліт Серафім у Варшаве прызначыў мяне настаяцелем прыходу ў Туркавічах. Гэтае нечаканае прызначэньне ўсьцешыла мяне. Не марудзячы, я сабраўся і паехаў з манастыра. Туркавічы добра ведаў, там я служыў у 1932 годзе, пра што ўжо пісаў раней.

З цяжкасьцю, праз бездарожжа, я дабраўся да ўлюбёных маіх Туркавічаў. Мае былыя прыхаджане сустрэлі мяне са зьдзіўленьнем і радасьцю ад нечаканасьці. Мая царква на могілках і званіца былі разбураныя палякамі ў чэрвені 1938 года. Нашы Набажэнствы ўжо праводзіліся ў старажытнай царкве на тэрыторыі былога Туркавіцкага манастыра. Тамсама, у манастыры, і знаходзілася мая кватэра ў былым прычтавым доме. Я застаў ужо пяць нашых манашак на чале з

ігуменьняй Магдалінай. Яны пачыналі арганізоўваць жаночы манастыр, але манастырскія карпусы былі занятыя каталіцкімі польскімі манашкамі і іхнім дзіцячым прытулкам для хлопчыкаў і дзяўчатаў. Яны злосна пазіралі на нас, але маўчалі. Мы іх не чапалі.

У Туркавічах я ўзяўся за працу па ўзнаўленьні нашага манастыра. Пачатак быў пакладзены манашкамі і ігуменьняй. Зь ёй разам мы атрымалі ад нямецкага павятовага начальніка надзел зямлі пад манастырскі агарод, які ўзаралі і пасадзілі гародніну і бульбу. Манашкі завялі гаспадарку. Наш манастыр станавіўся на ногі. Свае царкоўныя даходы я аддаваў на карысьць манастыра. На пачатку вясны прыбылі новыя манашкі. У нашым манастыры ўжо жылі 12 манашак. Туркавічане былі задаволеныя і дапамагалі нам.

Вядомасьць нашага манастыра распаўсюдзілася ў навакольлі і нават дайшла да Бэрліна. У наш манастыр немцы прыслалі некалькі дзесяткаў бежанцаў-галічанаў з савецкай зоны. Іх уладкавалі ў корпусе польскіх манашак. Бежанцы доўга не затрымаліся і разьехаліся.

Пасьля ад’езду бежанцаў немцы прыслалі ў наш манастыр вялікую групу габрэяў, якіх разьмясьцілі ў былым Народным доме. Іх ганялі на цяжкія мэліярацыйныя працы па ўрэгуляваньні рэчышча ракі Гачвы. Гэта былі ахвяры нямецкай палітыкі ў адносінах да габрэяў. Праз месяц іх пагналі кудысьці.

Без “гасьцей” наш манастыр не заставаўся. Пасьля габрэяў прыехалі да нас украінцы і зрабілі летнік для моладзі. Яны жылі ў палатках. Паводзілі сябе дастаткова добра і нам прыемна было зь імі. Польскія манашкі іх баяліся. Штодзённа яны сьпявалі ўранку і ўвечары свой гімн, у якім былі словы: “Ляхам смерть! – Смерть жидивсько-московський комуни” і іншыя. У нядзельныя дні я служыў для іх у сваёй царкве раніцай абедні і хор іх моладзі сьпяваў. Да нашых манашак ставіліся паважна і добра. Зь імі сябравалі. Яны запрашалі нас вечарамі на свае “ватры” (вогнішчы) і прадстаўленьні. Зь іхняй дапамогай я паставіў вялікі крыж на плошчы, дзе стаяў разбураны палякамі манастырскі сабор. Крыж пастаўлены ў цэнтры манастыра.

Холмскія царкоўна-грамадскія дзеячы запрасілі ў мітрапаліта Дыянісія яшчэ да яго арышту акт на вылучэньне Холмшчыны ў самастойную епархію, якой яна была да Першай сусьветнай вайны. Часовым кіраўніком яе мітрапаліт прызначыў старэйшага сьвятара протасьвятара І. Ляўчука. Мітрапаліт Серафім, уступіўшы ў кіраваньне Варшаўскай Мітраполіяй, не прызнаў самастойнасьці Холмскай епархіі і наведаў яе прыходы: Холм і Грубешаў. Яго сустракалі ўрачыста, як епіскапа, а як мітрапаліта для Холмшчыны не прызналі. Тым часам царкоўныя дзеячы выставілі кандыдатуру архімандрыта Афанасія на пасаду епіскапа для Холмшчыны. Мітрапаліт Серафім

адмовіўся садзейнічаць у гэтай важнай справе, матывуючы тым, што архімандрыт Афанасій не ўкраінец і прапаноўваў свайго кандыдата – ігумена Аляксандра Лоўчага, які служыў у Германіі. Халмшакі не прынялі гэтай кандыдатуры, пасьля чаго пытаньне пра хіратанію епіскапа для Холмшчыны павісла ў паветры.

Ініцыятыву ўзначальваньня Холмскай епархіі ўзялі ў свае рукі ўкраінскія палітычныя дзеячы ў Холме і Кракаве, якія абралі епіскапам прафэсара Івана Агіенку. Гэтую кандыдатуру падтрымаў Грубешаўскі дабрачынны протаіерэй Г. Міцюк і некаторыя ўкраінскія сьвятары Холмшчыны. Для папулярнасьці Агіенку запрашалі ў Холм і Грубешаў, дзе ён чытаў свае лекцыі народу. Гэты кандыдат быў шырока вядомы як украінскі патрыёт і "самостійнік", у мінулым міністар Украінскай рэспублікі[29] ў 1919 годзе. Сярод украінцаў ён меў папулярнасьць. Царкоўнасьцю не вылучаўся.

З мітрапалітам Серафімам украінскія дзеячы не ўзгаднялі кандыдатуры прафэсара Агіенкі. Яны ўвайшлі ў кантакт з вышэйшымі нямецкімі ўладамі, патрабавалі ад іх вяртаньня з высылкі мітрапаліта Дыянісія і адлучэньня мітрапаліта Серафіма. Нямецкае кіраўніцтва разьвязвала вайну з бальшавікамі і задаволіла патрабаваньне ўкраінцаў, спадзеючыся на іхнюю дапамогу ў час вайны. У верасьні 1940 года мітрапаліт Дыянісій быў вернуты на сваю катэдру, а мітрапаліту Серафіму загадалі неадкладна пакінуць Варшаву. Атрымалася так, што ўкраінцы выручылі мітрапаліта Дыянісія з высылкі ў той час, як рускія яго туды загналі даносамі і хлусьнёй. У знак удзячнасьці ўкраінцам, што выратавалі яго, мітрапаліт Дыянісій высьвеціў у епіскапа прафэсара Агіенку і другога ўкраінца – архімандрыта Паладзія Відыбіду-Рудэнку. Для Варшавы сабе ў вікарыі ён хацеў высьвеціць у епіскапа архімандрыта Афанасія, але той рашуча адмовіўся ад гэтага.

Прафэсара Агіенку пасьпешліва пастрыглі ў манахі з імем Іларыён ў Яблочынскім манастыры, высьвецілі ў герадыякана і гераманаха з узьвядзеньнем у сан архімандрыта. Усе гэтыя ступені ён прайшоў за адзін тыдзень. Пастрыгаў і высьвячаў епіскап Цімафей. Наўрад ці такі выпадак быў калі-небудзь ў гісторыі Праваслаўнай Царквы на Русі.

Урачыстая хіратанія ў епіскапа для Холмшчыны архімандрыта Іларыёна адбылася ў Холме ў катэдральным саборы. Хіратанію ўзначаліў мітрапаліт Дыянісій у саслужэньні архіепіскапа Чэскага Савація (Канстантынопальскай патрыярхіі) і епіскапа Цімафея. На ўрачыстасьць сабралася вялікая колькасьць духавенства і вернікаў. Украінскія дзеячы абвясьцілі гэтую падзею сваім нацыянальным сьвятам. Пасьля хіратаніі адбыўся шматлюдны банкет у вялізнай залі архірэйскага дома. Выказана было шмат прамоваў з нагоды гэтай падзеі і ўсхваленьняў у адрас новага архіепіскапа Холмскага і Падляс-

кага. У той самы дзень мітрапаліт Дыянісій узьвёў яго ў сан архіепіскапа за літургіяй.

Духавенства Холмшчыны і насельніцтва асьцерагаліся, што новы холмскі архіпастыр зойме крайні ўкраінскі курс для ўкраінізацыі Набажэнстваў, але ён гэтага не зрабіў. Незадаволеныя гэтым украінскія дзеячы арганізавалі са школьнай моладзі дэманстрацыю супраць яго з плякатамі: “Гэть з москалями!”. Іларыён абураўся, але сваёй тактыкі не зьмяніў.

Да мяне і да нашага Туркавіцкага манастыра ён ставіўся добра. Дамогся ад немцаў для манастыра грашовай дапамогі, а мяне прымаў у сябе дастаткова гасьцінна, даваў мне начлег у сваіх архірэйскіх пакоях. У 1941 годзе прыехаў у Туркавічы на адпусту і ўзначаліў Набажэнства. На гэтым сьвяце было шмат багамольцаў і каля сотні духавенства. У гэты час нямецкія войскі займалі Украіну і набліжаліся да Масквы. Украінцы марылі пра свабодную Украіну. На Холмшчыне яны рабілі высокія насыпы на могілках і ставілі на іх крыжы ў памяць пра загінуўшых за незалежнасьць Украіны. У Туркавічах таксама насыпалі такую магілу.

Пачатак нямецка-савецкай вайны[30] 22 чэрвеня 1941 года мы перажылі без асаблівага хваляваньня. На нашых вачах нямецкія танкі і аэрапляны рухаліся супраць савецкіх войскаў, якія адступалі. Сотні тысяч чырвонаармейцаў немцы бралі ў палон і заганялі за калючы дрот лягераў. Безьліч палонных гінула ад голаду, а позьняй восеньню – ад холаду.

Немцы прагналі бальшавікоў і вызвалілі манастыры на Валыні. Некаторыя манашкі з нашага Туркавіцкага манастыра, у тым ліку і ігуменьня яго Магдаліна, пакінулі Туркавічы і выехалі ў свае манастыры на Валыні. Дзьвюх манашак архіепіскап Іларыён забраў у свой архірэйскі дом весьці гаспадарку. У Туркавіцкім манастыры засталіся толькі чатыры манашкі. Створаны нашымі клопатамі манастыр драбнеў і страчваў сваё значэньне. Смуткавалі туркавічане, смуткаваў і я. З жахам мы бачылі, што будучыні ў нашага манастыра няма. Палякі бралі верх.

Напрыканцы года мяне пачалі непакоіць члены Беларускага царкоўнага камітэта з Варшавы, настойваючы на тым, каб я накіраваўся ў Беларусь на епіскапства. Я пачаў сур’ёзна пра гэта думаць, але шкадаваў пакідаць Туркавічы. Тут прыклаў я столькі энэргіі і працы, на што немагчыма забыцца. Але ўбачыўшы, што наша царкоўная справа пачала марнець, я згадзіўся паехаць у Беларусь не для епіскапства, а наведаць сваіх родных і пабываць на радзіме. Паехаў з гэтым да архіепіскапа Іларыёна ў Холм. Расказаў яму сваю бяду, а ён і слухаць ня хоча, каб адпусьціць мяне.

– Вы будзеце на Украіне епіскапам і Ваша кандыдатура выстаўлена Брацтвам Праваслаўных Багасловаў. А пакуль гэта будзе, я прызначаю Вас рэктарам духоўнай акадэміі ў Холме, якую я адкрываю, – спакушаў ён мяне.

Я адмовіўся і ад епіскапства, і ад рэктарства, бо ўсьведамляў, што з гэтага нічога не атрымаецца.

Пасьля доўгіх разважаньняў усё ж ён згадзіўся адпусьціць мяне з умовай, што я вярнуся на Холмшчыну. На ўсялякі выпадак, калі мяне там затрымаюць, выдаў мне адпускную грамату. З гэтым я вярнуўся ў Туркавічы. На сваё месца я запрасіў свайго сябра з Яблочынскага манастыра архімандрыта Мітрафана. Ён павінны быў замяняць мяне ў Туркавічах у маю адсутнасьць. Сам я паехаў у Варшаву, адслужыўшы сьвята Нараджэньня Хрыстова. З туркавічанамі не разьвітваўся, думаў, што вярнуся. Аднак Гасподзь павёў мяне іншым шляхам і выратаваў мяне ад пагібелі, немінучай у Туркавічах.

Яшчэ пакуль я жыў у Туркавічах, ужо хадзілі чуткі пра зьяўленьне савецкіх і польскіх партызанаў. Паступова яны ўзмацняліся. Польскія банды нападалі на праваслаўных і забівалі цэлыя сем'і. Нападалі і на туркавічанаў. Архімандрыт Мітрафан выехаў з Туркавічаў, і прыхаджане засталіся без сьвятара. Для іх настaлі страшныя дні. Праваслаўныя туркавічане гінулі ад забойцаў – польскіх партызанаў. Гэтая трагедыя адбывалася ў 1942-1943 гадах. Цяпер праваслаўных у Туркавічах няма: адны забітыя, а тыя, што засталіся жывымі, выехалі або ў Савецкі Саюз пасьля вайны, або ў глыбіню Польшчы. Праваслаўнай Холмскай Русі больш не існуе.

## Разьдзел сёмы

## Праваслаўная Царква ў Польшчы

Туркавічы былі апошнім пунктам маёй пастырскай службы ня толькі на Холмшчыне, але і ў Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве ў Польшчы. Прызначалі мяне на служэньне ў розныя месцы і на розныя пасады, але больш за ўсё я палюбіў Туркавічы, бо там пакутаваў.

У Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве ў Польшчы я нарадзіўся духоўна, стаўся яе сьвятаром, служыў ёй сумленна і атрымліваў узнагароды. Яна была маёй духоўнай маці, якая выхавала мяне ў "мужа совершенна". Таму прысьвячаю ёй некалькі радкоў майго пісаньня.

Гэтая Царква пачала сваё існаваньне пасьля Першай сусьветнай вайны ў межах новаўтворанай незалежнай Польскай дзяржавы. Арганізатарам і першым мітрапалітам яе быў архіепіскап былы Мінскі і Тураўскі Георгій (Ярашэўскі), акадэмік, былы рэктар Санкт-Пецярбурскай духоўнай акадэміі. Яго забіў з рэвальвэра архімандрыт, акадэмік, рэктар духоўнай сэмінарыі Смарагд (Латышэнка) 8 лютага 1923 года. На яго месца быў абраны Сынодам архіепіскап Валынскі і Крамянецкі Дыянісій (Валядзінскі). Гэты мітрапаліт закончыў арганізацыю Царквы і атрымаў аўтакефалію ад Канстантынопальскага патрыярха 13 лістапада 1924 года. З таго часу Праваслаўная Царква ў Польшчы была аўтакефальнай[31]. Мітрапаліт Варшаўскі і ўсёй Польшчы насіў тытул "Найшчасьлівейшы".

Царква мела пяць епархій: Варшаўска-Холмскую, Валынскую, Віленскую, Гарадзенскую і Палескую. У кожнай епархіі існавалі мужчынскія і жаночыя манастыры. Усіх манастыроў было 15. Пачаеўская Лаўра займала асаблівае месца ў Царкве. Яна мела вялікае значэньне для праваслаўнага насельніцтва Польшчы. Усе манастыры мелі гістарычнае мінулае.

Для падрыхтоўкі сьвятароў былі адчыненыя дзьве духоўныя сэмінарыі: у Вільні і Крамянцы і багаслоўскі факультэт Варшаўскага ўнівэрсытэта ў Варшаве. Апрача таго, існавалі дыяканска-псаломніцкая школа ў Яблочынскім манастыры і псаломніцка-рэгенцкія курсы ў Крамянецкім манастыры. У Пачаеўскай Лаўры была адчыненая Паслушніцкая школа для манахаў. Усе гэтыя навучальныя ўстановы рыхтавалі сьвятароў і царкоўных служыцеляў.

Перапіс насельніцтва ў Польшчы, праведзены ў 1921 годзе, сьведчыў пра 3 789 000 асобаў праваслаўнага насельніцтва. Калі браць пад ўвагу натуральны прырост і нядобрасумленныя махінацыі

перапісчыкаў, да пачатку 1939 года ўсяго праваслаўнага насельніцтва было 5 000 000 чалавек. Прыходзкіх і прыпісных цэркваў налічвалася больш за дзьве тысячы ва ўсіх епархіях, калі не прыгадваць цэнтральных раёнаў Польшчы, дзе амаль усе праваслаўныя храмы былі адабраныя польскімі ўладамі, перароблены на каталіцкія касьцёлы ці разбураныя. На Холмшчыне яны разбурылі 113 цэркваў у чэрвені 1938 года. Такім чынам, усіх цэркваў у Польшчы разам з адабранымі і разбуранымі было каля 2500.

Па графе гутарковай мовы статыстыка давала наступныя лічбы:

| | |
|---|---|
| украінская | 4 501 000 |
| беларуская | 1 698 100 |
| руская (расейская) | 168 700 |

У графе "ўкраінская мова" пастаўлены таксама галічане – каля 3 000 000. Жыхары Палесься ня вызначылі сваёй мовы і назвалі яе "тутэйшай". Зь іх частка размаўляла па-беларуску, а другая частка – па-ўкраінску. Былі таксама і праваслаўныя чэхі, але іх статыстыка не ўлічыла.

## Разьдзел восьмы

## Частка 1. Епіскап Віцебскі (1942 – 1946)

З Туркавічаў мне трэба было ехаць праз Варшаву ў горад Мінск, сталіцу Беларусі, дзе ствараўся царкоўны цэнтар[32] і знаходзіліся мітрапаліт Мінскі і ўсёй Беларусі Панцеляймон (Ражноўскі), які перасяліўся з Жыровіцкага манастыра, і яго вікарый – епіскап Слуцкі Філафей, мой брат па манаскім пастрыгу, нядаўна высьвечаны ў епіскапа Слуцкага, прыбылы з Варшавы, дзе ён жыў стала. Па сутнасьці, ён і чакаў мяне ў Мінску. Туды я і павінен быў ехаць.

У той час ішла цяжкая нямецка-савецкая вайна, якая нічога добрага не прадказвала. Нямецкая армія адцясьніла савецкія войскі далёка ў глыб Савецкага Саюза (Расеі) і заняла ўсю Беларусь і Украіну, пагражаючы Маскве і Ленінграду (Санкт-Пецярбургу). У Мінску знаходзілася галоўнае кіраўніцтва немцаў на ўсю Беларусь, так званы Генэральны камісарыят. Беларусы былі завэрбаваныя імі толькі як дапаможныя сілы.

Прабыўшы каля месяца ў Варшаве, я накіраваўся ў Мінск у суправаджэньні двух членаў Беларускага царкоўнага камітэта, з якіх адзін добра ведаў нямецкую мову, што было важна для мяне. Цягнікі не хадзілі, а трэба было дабірацца ў Мінск спадарожнымі нямецкімі грузавымі аўтамабілямі. На гэтае падарожжа патрацілі два тыдні, затрымаўшыся на некалькі дзён у Брэсьце і Баранавічах. Добра, што прытулілі нас у сваім доме у Брэсьце протаіерэй М. Зноска, а ў Баранавічах протаіерэй С. Зянкевіч. Яны аблягчылі наша падарожжа. У дарозе тады было цяжка з харчаваньнем, прадукты складана было купіць.

На ўезьдзе ў Мінск мы з жахам убачылі павешаных на слупах людзей, якіх немцы пакаралі за шпіёнства. На нашу просьбу шафёр-немец завёз нас у рэзыдэнцыю мітрапаліта і епіскапа Філафея[33]. Напэўна, ён ведаў адрас, бо без усялякага пытаньня даставіў нас на месца. Уладыкі жылі ў будынках былога жаночага манастыра ў цэнтры горада. У іх спыніліся і мы. Капітальна адрамантаваная манастырская царква служыла для нашых уладыкаў катэдральным саборам. Пры камуністычнай уладзе ў ёй разьмяшчаўся спартовы клюб. Купалы былі разбураныя.

У Мінску ўсё мяне цікавіла. Бо я прыбыў у забароненую краіну, якая для ўсіх нас на захадзе была быццам казачнай краінай, адкуль

ніхто ня мог прабрацца ні да нас, ні ад нас туды. Над усімі вісеў дамоклаў меч[34], але гэтым дамоклавым мячом быў таварыш Сталін і яго камуністычная дыктатура. Але і пасьля яго сьмерці мала што зьмянілася да лепшага. Я адразу ж заўважыў розьніцу ў адзеньні жыхароў падсавецкай улады, іх шэрыя і запалоханыя абліччы, панічную баязьлівасьць у размовах, азіраньне па баках, як бы хто не падслухаў, а ўвогуле, яны прыветлівыя, ласкавыя і сымпатычныя, да якіх адразу адчуваеш прыхільнасьць і спачуваньне.

Цэнтар гораду нямецкая авіяцыя часткова разбамбіла, і вялікія будынкі стаялі бяз дахаў, з вытыркнутымі жалезнымі бэлькамі. Астатнія дамы выглядалі таксама кепска: нерамантаваныя і брудныя. У іх цясьніліся жыхары, нашы суайчыньнікі, многія – праваслаўныя хрысьціяне, якія запаўнялі адчыненыя цэрквы і горача маліліся. Габрэйскае насельніцтва было зьнішчанае немцамі, і іхнія дамы стаялі пустыя. Казалі, што іх было 35 тысяч. Гандлю не было. Працавала толькі адна прыватная камісійная лаўка, дзе можна было набыць срэбныя лыжкі і розны посуд, нават залатыя царскія рублі. Людзі прадавалі, бо галадалі.

Узнаўленьне разбуранага бальшавікамі царкоўнага жыцьця адбывалася марудна. Былі розныя на тое прычыны. Найперш, не хапала духавенства. У Мінску ў адчыненых цэрквах служылі сьвятары, якія прыехалі з Віленшчыны, што знаходзілася пад польскай уладай. У Савецкай Беларусі ўсё духавенства зьнішчылі. Неабходна было шукаць кандыдатаў і высьвячаць іх, але такіх было мала, ды і тыя, неадукаваныя ў галіне багаслоўя, нічога не разумелі ў царкоўнай службе. Епіскап Філафей высьвячаў і такіх. Як гэтыя сьвятары праводзілі Набажэнствы і як пастырствавалі, ведаў адзін Бог. Вернікі маўчалі, ня жаліліся, былі рады і такім.

Уся гэтая сумная карціна зьявілася перада мною ва ўсёй галізне і нішчымніцы. Місіянэрстваваць у такіх умовах было складана. Да таго ж у царкоўныя справы ўмешваліся беларускія актывісты, людзі не рэлігійныя, а можа быць, і бязбожнікі. Яны імкнуліся навязаць сваю волю епіскапам у Мінску. Гэтыя ж актывісты ўцягвалі і нямецкія ўлады ў царкоўныя справы сваімі паклёпамі. Праз ўсялякія інтрыгі мітрапаліт Панцеляймон[35] быў адлучаны немцамі ад кіраваньня епархіяй і Мітраполіяй. Гэтую справу даручылі тыя ж немцы епіскапу Філафею. Кіраўнік Беларускай Царквы мітрапаліт Панцеляймон, застаўся без справы, а епіскап Філафей са сваімі абавязкамі не спраўляўся з прычыны свайго характару і непрацаздольнасьці. У царкоўных справах пачаўся застой і беспарадак. Замест таго, каб цалкам аддавацца царкоўным справам, епіскап Філафей траціў час на непатрэбныя царкоўныя сьпеўкі са сьпявачкамі і ўсялякія размовы, да чаго ён быў

вялікі ахвотнік. Да таго ж не цураўся кар'ерысцкіх памкненьняў – марыў стаць мітрапалітам. І недалёка ад гэтага быў.

Мітрапаліт Панцеляймон, які доўгі час жыў у Жыровіцкім манастыры, атрымаў ад нямецкіх уладаў дазвол на ўзначаленьне Праваслаўнай Царквы ў Беларусі па хадайніцтве яго сябра епіскапа Венядзікта (Бабкоўскага) і на аснове прадстаўленьня начальніка Мінскай акругі Радаслава Астроўскага, будучага прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады (у родзе прэм'ер-міністра) пад нямецкай акупацыйнай уладай. Нямецкі генэрал, камісар Беларусі Кубэ (забіты партызанскай прыслугай), калі выдаваў дакумэнт аб прызнаньні мітрапаліта Панцеляймона кіраўніком Праваслаўнай Царквы ў Беларусі, паставіў свае ўмовы: 1) лічыць Беларускую Праваслаўную Царкву аўтакефальнай і нацыянальнай і што такое павінна быць яе найменьне; 2) не падпарадкоўвацца ні Маскве, ні Варшаве, ні Бэрліну ў царкоўных адносінах; 3) карыстацца беларускай мовай у царкоўным кіраваньні, казаньні і выкладаньні Закона Божага ў школах; 4) скласьці статут для гэтай Царквы. Нямецкі дакумэнт пра гэтае прызнаньне і гэтыя ўмовы выдадзены на пачатку кастрычніка 1941 года, калі нямецкая армія пажынала плады сваіх перамог на ўсіх франтах, як на захадзе, так і на ўсходзе.

Мітрапаліт Панцеляймон ня быў адміністратарам і добрым дыпляматам. З 1923 года ён пражыў у манастырах у Польшчы на спачынку да прыходу чырвонай арміі ў верасьні 1939 года, калі немцы разьбілі Польскую дзяржаву і падзялілі яе з бальшавікамі. Знаходзячыся доўгі час ў становішчы заштатнага архірэя, ён ня меў ні вопыту, ні ведаў у справе адміністрацыі, а па характары быў просты і адкрыты. Гэта яму вельмі шкодзіла ў жыцьці і духоўнай кар'еры. Па сваёй простасьці, забыўшыся на свае абавязкі ў нямецкіх умовах, ён пачаў згадваць за Набажэнствамі ў Мінску Маскоўскага мітрапаліта Сергія[36]. Немцы абвінавацілі яго ў гэтым і адхілілі яго ад кіраваньня царкоўнымі справамі, даручыўшы яму скласьці статут для Царквы ў Беларусі.

Калі я прыехаў у Мінск, мітрапаліт скардзіўся і моцна наракаў на сваё становішча, не затойваў сваёй незадаволенасьці епіскапам Філафеем. Сваіх памылак не прызнаваў. Прасіў мяне скласьці даручаны яму статут Царквы. Я ахвотна згадзіўся, каб дапамагчы старому. Ён даў мне статут Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, якім я карыстаўся пры сваёй працы. За некалькі дзён я склаў статут і перадаў яго мітрапаліту. Ён быў задаволены і ўдзячны.

Для вырашэньня важных царкоўных пытаньняў неабходна было склікаць Сабор Епіскапаў Беларускай Царквы, якіх было ўсяго тры: мітрапаліт Панцеляймон, епіскап Венядзікт, які служыў у Гародні, і

епіскап Філафей у Мінску. Мітрапаліт і епіскап Філафей прасілі мяне паехаць у Гародню і прывезьці епіскапа Венядзікта. Для гэтага прасілі ва ўпраўленьні горада легкавы аўтамабіль і шафёра. Стаяла сьцюдзёная сьнежная зіма, таму аўтамабілем ехаць па сьнезе было нялёгка. Пасьля літургіі ў сьвята Стрэчаньня Гасподняга 2/15 лютага я выправіўся ў дарогу па маршруце Вільня – Гародня. Начавалі ў Смаргоні (калісьці там была школа для навучаньня мядзьведзяў, жартоўна называная Смаргонскай акадэміяй[37]) у мясцовага настаяцеля прыхода. Прыняў ён гасьцінна. Да раніцы наш аўтамабіль замерз і матор не дзейнічаў. Трэба было грэць ваду і адаграваць матор. Важдаліся з гэтым доўга. Пасьля абеду выехалі ў Вільню і да ночы прыехалі. У Сьв.-Духавым манастыры пераначавалі. Тут я наведаў свайго калегу па факультэце протаіерэя І. Ярмалюка, настаяцеля Прачысьценскага сабора, якога неўзабаве немцы расстралялі за тое, што ён хаваў жыдоў. З прычыны адсутнасьці вольнага часу я ня мог добра агледзець горад. Да таго ж было холадна і марозна. Выехалі з Вільні ў Гародню, але на паўдарозе загрузьлі ў сьнезе. Мусілі зьмяніць маршрут і ехаць у горад Ліду. Пераначавалі ў старым будынку былой жыдоўскай карчмы і ўранку прыбылі ў Ліду. Тут шафёр заявіў, што няма больш бэнзіну. Трэба прасіць яго ў немцаў. На шчасьце, знаходзіўся ў Лідзе доктар Ермачэнка, начальнік Беларускага камітэта ў Мінску, які і дапамог мне атрымаць бэнзін. Позна ўвечары ў той самы дзень прыехалі ў Гародню і заехалі да епіскапа Венядзікта. Ён уладкаваў нас на кватэру. Ехалі тры дні.

Пазнаёміўшыся з царкоўнымі справамі і жыцьцём у Мінску, я хацеў вярнуцца з Гародні ў Варшаву і Туркавічы на Холмшчыне. Служыць Царкве ў такіх абставінах мне здавалася не па сіле. Калі я сказаў пра свой плян епіскапу Венядзікту, ён рашуча запратэставаў і сказаў, што ў Мінск без мяне не паедзе. Я мусіў перадумаць свой плян і адкласьці на Мінск, каб адтуль вярнуцца. У Гародні затрымаліся на два тыдні, пакуль епіскап Венядзікт рыхтаваўся. На зваротным шляху ў Мінск ехалі тры дні і начавалі дзьве ночы: у Жыровіцкім манастыры і ў г. Слуцку. Азяблыя і галодныя, прыбылі на месца.

Прыезду епіскапа Венядзікта мітрапаліт узрадаваўся, адразу ажыў, павесялеў, зрабіўся згаворлівы і ласкавы. Назаўтра ж наладзілі фармальнае паседжаньне Сабору Епіскапаў, а мяне запрасілі быць сакратаром. Паседжаньні пачаліся 3 сакавіка 1942 года на другім тыдні Вялікага посту. Зацьвердзілі без папраўак складзены мною статут Царквы, а потым прыступілі да прызначэньня епіскапаў на епіскапскія катэдры, якіх, паводле статуту, налічвалася шэсьць: Віцебска-Полацкая, Гарадзенска-Беластоцкая, Мінска-Вілейская, Магілёўска-Мсьціслаўская, Наваградзка-Баранавіцкая і Смаленска-Бранская, –

пазьней адкрылі Гомельска-Мазырскую. Зь іх пяць епархій – старажытныя, гістарычныя, а дзьве – новыя, хоць Наваградзкая была старажытнай мітрапольнай.

Пастанавілі прызначыць на Мінскую катэдру мітрапаліта Панцеляймона і лічыць гэтую катэдру мітрапольнай, на Магілёўскую – епіскапа Філафея, на Гарадзенскую – епіскапа Венядзікта, на Смаленскую – удовага протаіерэя Сімяона Сеўбу з пастрыжэньнем ў манаства і хіратаніяй у сан епіскапа, на Наваградзкую – епіскапа Веніяміна, які ў той час займаў Палтаўскую катэдру на Украіне, на Віцебскую – архімандрыта Афанасія з хіратаніяй у епіскапа.

Пратакол паседжаньня Сабору я запісваў, але адносна сябе запратэставаў. Пачаліся ўгаворы, пераконваньні і г. д. Я ўпарціўся, матывуючы тым, што зьбіраюся вярнуцца ў Варшаву. Без маёй згоды назначылі маю хіратанію ў бліжэйшую нядзелю – у нядзелю крыжапаклонную, 8 сакавіка па новым стылі. Паведамілі пра хіратанію нямецкім уладам і абвясьцілі ў мясцовай беларускай газэце для агульнага веданьня. Пра гэта я нічога ня ведаў. Атрымалася па прыказцы: “Без мяне, мяне... хіратанізавалі”.

Маё супраціўленьне было зломленае ў суботу напярэдадні назначанай хіратаніі. Перахрысьціўшыся і аддаўшыся волі Божай, я сказаў уладыкам: “Не мая, Гасподзь, а Твая воля няхай будзе!” Мая працяглая нязгода вымусіла ўладыкаў зьдзейсьніць чын нарачэньня ў дзень высьвячэньня на часах. Назвалі мяне епіскапам для горада Віцебска. Усьлед за нарачэньнем у час літургіі на Малым уваходзе хіратанізавалі мяне ў епіскапа. Як мая хіратанія супала з нядзеляй крыжапаклоннай, то ўгледзеў я ў тым прадвесьце маіх пакут падчас ахіпастырскага служэньня, пра што я і сказаў у сваім слове пры нарачэньні. Гэта спраўдзілася.

У той самы дзень, увечары, савецкія аэрапляны ўпершыню бамбілі Мінск. Некалькі бомбаў разарвалася каля мітрапольнага сабора і архірэйскай рэзыдэнцыі. Такім чынам, саветы прывіталі маю епіскапскую хіратанію. Пасьля горад больш не бамбілі.

Віцебска-Полацкая епархія, на якую мяне прызначылі і хіратанізавалі, здаўна называлася Полацкай[38] і была самай старажытнай, заснаванай у 992 годзе. Да 1918 года, г. зн. да камуністычнай рэвалюцыі ў Расеі, у епархіі налічвалася 514 цэркваў і 235 капліц, а таксама 6 мужчынскіх і жаночых манастыроў. Пасьля 1918 года пераважная большасьць гэтых храмаў была разбураная бязбожнікамі і перароблена на тэатры ці склады. Такое самае спусташэньне ўчыненае і ў іншых епархіях Савецкай Беларусі. У Мінску, Віцебску і Магілёве катэдральныя саборы былі разбураныя, закрытыя таксама і манастыры. Мяне чакала аднаўленьне ўсяго разбуранага, а таксама

хрышчэньне няхрышчаных, а іх былі тысячы. Патрэбныя сьвятары, а кандыдатаў для сьвятарства няма. Неабходна было іх шукаць і рыхтаваць духоўна і па-багаслоўску. Але я не баяўся такой місіянэрскай працы: яна мяне прываблівала.

### Узначаленьне Навааградзкай епархіі

На Саборы епіскапы прызначылі мне часова кіраваць Навааградзка-Баранавіцкай епархіяй да прыезду епіскапа Веніяміна. Гэтая епархія складалася са старых арганізаваных прыходаў, захаваных з даўніх часоў дзякуючы таму, што знаходзіліся ў межах Польскай дзяржавы да верасьня 1939 года. Епархія была створаная беларускімі епіскапамі ў сакавіку 1942 года. Да гэтага тэрыторыя яе часткова ўваходзіла ў Гарадзенскую і Віленскую, а таксама Палескую епархіі.

Рэзыдэнцыя для епіскапа Навааградзкай епархіі разьмяшчалася ў Жыровіцкім манастыры. Сюды я і прыехаў перад Вялікаднем. Па дарозе з Мінска разам з архіепіскапам Філафеем я заехаў у Варшаву, забраў свае рэчы ў Туркавічах, дзе застаў архімандрыта Мітрафана на сваім месцы, і накіраваўся ў Жыровічы. Цікава і страшна было ехаць у санях праз дрымучы лес з Івацэвічаў у манастыр. У лесе сустрэў я савецкіх партызанаў, але яны не чапалі мяне і майго фурмана. Велікодны і Сьветлы тыдні я служыў у манастырскім Сьв.-Усьпенскім велічным саборы[39], дзе знаходзіўся ў іканастасе каля царскай брамы Жыровіцкі цудадзейны абраз Божай Маці, перад Якім укленчвалі ў гістарычныя часы польскія каралі і забаранялі жыдам пасяляцца ў мястэчку Жыровічы.

З манастыра я паведаміў духавенству епархіі пра сваё прызначэньне і прыбыцьцё ў манастыр. Бліжэйшыя айцы дабрачынныя прыяжджалі пазнаёміцца са мной. Мяне ніколі ня бачылі і ня ведалі ў епархіі. З гэтай прычыны адбываліся непаразуменьні, калі прыежджыя дабрачынныя прымалі майго сакратара сьвятара П. Кірыка, безбародага, за епіскапа і прасілі яго бласлаўленьня. Памылка хутка высьвятлялася, выклікаючы канфуз у абодвух.

Манастыр меў мала брацііі, але Набажэнствы адбываліся штодзённа раніцай і вечарам. Я адчуваў сябе добра ў манастырскіх умовах. Ва ўсе нядзельныя і сьвяточныя дні я праводзіў Набажэнствы ў саборы пры перапоўненым храме. Не прапускаў Набажэнства без казаньня. Казаў на беларускай мове. Спачатку мне нялёгка было пераключацца з украінскай мовы ў Туркавічах на беларускую, хоць апошняя была маёй роднай мовай з дзяцінства. Але хутка гэта наладзілася.

Маё ціхае манастырскае жыцьцё парушылася, калі ў ваколіцах манастыра зьявіліся савецкія партызаны і пачалі ўночы нападаць на

вёскі. Асабліва становішча абвастрылася ў манастыры, калі з Жыровічаў выехаў у Слонім паліцэйскі нарад і пакінуў безахоўным манастыр. Некалькі начэй я правёў на гарышчы манастырскага сабора, баючыся партызанаў, але ў хуткім часе мусіў перасяліцца ў горад Слонім (10 кілямэтраў ад Жыровічаў). Вялікія атрады паліцыі і нямецкай жандармэрыі ахоўвалі гэты горад. Мне выдзелілі памяшканьне у старым і брудным гатэлі. Вялікі сабор у Слоніме быў разбураны падчас нямецка-савецкіх баёў, а нашы Набажэнствы адбываліся ў каталіцкім храме, перарobленым на царкву. Дзіўна было бачыць у праваслаўным храме вялізныя статуі каталіцкіх сьвятых высока на карнізах, але мы не зьвярталі на гэта ўвагі. Я служыў у нядзелі і ў сьвяты ў гэтым храме. У ім Набажэнствы адбываліся штодзённа дзеля мяне.

Усё габрэйскае насельніцтва Слоніма знаходзілася ў гета. Некалькі чалавек з гета называлі сябе хрысьціянамі. Я прасіў нямецкага гэбітскамісара адпусьціць іх з гета на волю. Камісар адказаў мне: “Мы змагаемся не з хрысьціянамі, а з іудзеямі, а іудзеям месца ў зямлі!”, пры гэтым ён паказаў пальцам уніз. Размову ў такім выпадку нельга было весьці з посьпехам. Адна старая жыдоўка-хрысьціянка спавядалася і прычашчалася ў Жыровіцкім манастыры і, пазьбегнуўшы гета, кудысьці сышла. Пра яе ніхто ня ведаў. Пакуль я жыў у Слоніме, усіх жыхароў гета вывезьлі за горад і расстралялі немцы. Увесь дзень адбывалася гэтае нямецкае злачынства.

Заставацца ў Слоніме і жыць у ім без надзеі на хуткае вяртаньне ў Жыровіцкі манастыр мне было не па сіле, ды і бессэнсоўна. Перада мной стаяла важная задача ўсталяваць сталую рэзыдэнцыю для епіскапа Наваградзкай епархіі. Спачатку я меў намер гэта ўладкаваць у Баранавічах, дзе былі вузлавая чыгуначная станцыя і два вакзалы, але начальнік горада, нацыяналіст-беларус, адказаў майму сакратару на яго хадайніцтва аб атрыманьні памяшканьня ў горадзе для архірэя: “У мяне ў горадзе ёсьць два сваіх бацюшкі, а больш ня трэба!” Гэты нацыяналіст, Сабалеўскі, вядомы быў як будыст і хрысьціянскі атэіст. Пасьля такога стаўленьня гарадзкога галавы да маёй ідэі давялося спыніцца на арганізацыі рэзыдэнцыі ў горадзе Наваградку, гістарычным царкоўным цэнтры, дзе цягам двухсот гадоў знаходзілася катэдра Літоўскіх мітрапалітаў. Пасьля падрыхтоўчых працаў і праведзенага капітальнага рамонту царкоўнага дома ў Наваградку я пераехаў са Слоніма ў гэты горад. Вялікі двухпавярховы будынак, былы манастыр, разьмяшчаўся пры Сьв.-Мікалаеўскім саборы, які стаў маім катэдральным храмам. Тут я арганізаваў духоўную кансысторыю з мясцовага духавенства і адкрыў псаломніцкапастырскія курсы для падрыхтоўкі царкоўных служыцеляў. Праектаваў стварыць духоўную сэмінарыю і падрыхтаваў праграму для

навучаньня, але нямецкія ўлады не далі дазволу.

Савецкія партызаны ўмацоўваліся. Пад іхняй уладай знаходзіліся многія вёскі і лясы Наваградчыны і Слонімшчыны. Налібоцкая пушча[40] стала накшталт іхняй рэзыдэнцыі. Адтуль яны выпраўляліся на свае апэрацыі. Чыгункі мініравалі, рабавалі сьвятароў, некаторых забівалі, чынілі тэрор. На працягу кароткага часу яны забілі 15 добрых пастыраў. Прычыны забойства ня высьветленыя. Епархія ад іх пакутавала. Пакутаваў і я, перажываючы ўсе беды духавенства, асабліва вясковага. Да мяне прыяжджалі сьвятары ў лапцях, бо партызаны забралі ў іх боты. Вясковыя прыходы я ня мог наведваць, але служыў у гарадах: Наваградку, Баранавічах, Наваельні, Стоўбцах, наведаў Новы і Стары Сьвержань, служыў у горадзе Нясьвіжы, сваім родным горадзе ў сьвята Нараджэньня Багародзіцы, дзень свайго нараджэньня. У іншыя мясцовасьці было рызыкоўна для жыцьця наведацца з архіпастырскай візытацыяй. Быў суровы і цяжкі час.

У гэты час нямецкія гэбітскамісары ў гарадах Наваградку і Баранавічах спрабавалі выкарыстаць мяне для сваёй мэты. Баранавіцкі камісар прапаноўваў мне служыць па новым календары, пераносіць усе сьвяты з седмічных дзён на нядзелі, узносіць імя Гітлера на Набажэнствах, наведваць прыходы і казаць, што немцы не адступаюць, а скарачаюць фронт паводле стратэгічных меркаваньняў. Усе гэтыя прапановы я рашуча адхіліў з рызыкай для сваёй свабоды. Бог захаваў і абышлося. Наваградзкі гэбітскамісар патрабаваў ад мяне майго подпісу на яго звароце да партызанаў здацца ў палон са зброяй, за што будуць памілаваныя, і раздаваць гэтыя звароты ў царкве, папярэдне прачытаўшы іх з царкоўнага амбона. І гэтую прапанову я адхіліў, не жадаючы, каб я і духавенства пацярпелі. Наваградзкі гэбітскамісар паказаў сябе добрым чалавекам, які выратаваў маё жыцьцё, пра што скажу ніжэй.

У сакавіку 1944 года ў Наваградак прыехалі данскія і кубанскія казакі са сваёй радзімы, як бежанцы. Накіраваў іх сюды нямецкі ўрад паводле дамовы з генэралам Красновым[41]. Яны прыбылі на сваіх падводах з жонкамі і дзецьмі. У Наваградку абсталяваўся іх штаб на чале з атаманам Паўлавым, а ў вёсках разьмясьціліся атрады і назвалі сябе станіцамі. Іх мэта была – барацьба з партызанамі. З казакамі прыехалі сьвятары, якія па-пастырску абслугоўвалі казакоў. На іх просьбу ўсіх сьвятароў я прыняў у сваю архіпастырскую юрысдыкцыю. Аднак не жадаўшы займацца іх справамі, я зацьвердзіў выбранага імі дабрачыннага протаіерэя В. Грыгор’ева, якому даручыў царкоўна-адміністрацыйныя функцыі для казацкага духавенства.

Казакі пасьпяхова спраўляліся з партызанамі і адагналі іх ад ваколіцаў Наваградка. Але быў забіты памылкова сваімі атаман Паўлаў.

Я адпяваў яго ў сваім катэдральным саборы і суправаджаў на могілкі непадалёку ад сабора ў горадзе. Казакі яго аплаквалі. На месца забітага быў прызначаны атаман Даманаў. Жонка і дзеці атамана Паўлава трапілі ў Буэнас-Айрэс (Аргентына), куды яны эмігрыравалі з Аўстрыі пасьля вайны ў 1948 годзе. Атамана Даманава ангельцы выдалі бальшавікам разам з дзьвюма тысячамі афіцэраў. Там яны ўсе загінулі, а Даманаў быў павешаны ў Маскве.

На Наваградчыне, як і ва ўсёй Беларусі, ды і ня толькі тут, але ва ўсёй Эўропе, было вельмі неспакойна з прычыны вайны. Цяжка гэта перажывала беларуская вёска. У чаканьні абароны ад Бога жыхары вёсак у ваколіцах Наваградка ў адну ноч рабілі вялікія драўляныя крыжы і ставілі іх на ўскраінах сваіх вёсак. Маё духавенства катэдральнага сабора амаль штодзённа выяжджала асьвячаць гэтыя крыжы.

Па царкоўных справах мне даводзілася езьдзіць цягнікамі з Наваградка ў Мінск. Такія паездкі суправаджаліся вялікай рызыкай для жыцьця. Часам цягнік рухаўся марудна па ўзарваных рэйках. Здараліся таксама абстрэлы цягнікоў з кулямётаў партызанамі. Усё гэта мелася на ўвазе.

У верасьні 1942 года ў Мінску адбыўся Царкоўны сабор, які складаўся з выбраных прадстаўнікоў духавенства і цывільных вернікаў. Гэты сабор быў скліканы на патрабаваньне нямецкага генэральнага камісара Беларусі для абвяшчэньня аўтакефаліі Беларускай Праваслаўнай Царквы. Натхніў на гэта немцаў беларускі актыў у Мінску, што складаўся з пяці-шасьці чалавек, якія карысталіся даверам немцаў. Але дэлегаты, што зьехаліся на сабор, не абвясьцілі незаконна аўтакефаліі, толькі зацьвердзілі статут для гэтай царквы. Абвяшчэньне аўтакефаліі адклалі да спрыяльных кананічных умоваў пасьля вайны і незалежнасьці Беларусі. Немцы зьмірыліся з гэтым і не цікавіліся справай.

Калі адбываўся Царкоўны Сабор, то мітрапаліт Панцеляймон знаходзіўся ў нямецкай высылцы ў былым манастыры Ляды за 30 кілямэтраў ад Мінска. Ад яго запатрабавалі паўнамоцтвы архіепіскапу Філафею як ягонаму намесьніку. Мітрапаліт гэтае паўнамоцтва выдаў пад пагрозай. Адсюль яго ў хуткім часе перавезьлі ў горад Вілейку і памясьцілі ў доме сьвятара. Перад Вялікаднём 1943 года на нашае запатрабаваньне – трох епіскапаў: Філафея, Стэфана (Сеўбы) і мяне, – немцы вярнулі яго ў Мінск, дзякуючы чаму мы склалі паседжаньне Сыноду пад старшынствам мітрапаліта. Немцы тады ўжо ішлі на саступкі, бо іхнія посьпехі на савецкім фронце пацярпелі фіяска. Царкоўны сабор 1942 года перастаў усіх цікавіць. Пра яго замаўчалі нават беларускія актывісты. Стваралася ўражаньне, што гэтага сабору як і не было.

У траўні 1944 года нямецкі генэральны камісар патрабаваў склікаць Сабор Епіскапаў Беларусі для асуджэньня быццам бы незаконных выбараў у Маскве патрыярха Сергія. Епіскапы зьехаліся на пачатку траўня і засядалі некалькі дзён. Ганаровым госьцем на Саборы быў прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады Радаслаў Астроўскі. Ён жа быў галоўным стрыжнем скліканьня гэтага Сабору. На Сабор былі запрошаныя ня толькі беларускія епіскапы, але і з Пінска і Брэста, якія не ўваходзілі ў склад Беларускай Царквы. Сабор гэты вынес сваю пастанову адносна Маскоўскага патрыярха Сергія, нямецкія ўлады задаволіліся і нават фатаграфавалі, надаючы гэтаму вялікае значэньне, епіскапа, які падпісваў пастанову. На гэтым справа і скончылася. Надаўшы мітрапаліту Панцеляймону тытул "Найшчасьлівейшага" (тытул патрыяршы), Сабор завяршыўся. Архірэі пасьпешліва разьехаліся ў свае епархіі, бо хутка прасоўваўся фронт з усходу на захад і пагражаў Мінску і іншым гарадам. Украіна ўжо была занятая савецкімі войскамі. Гэта пагражала і Беларусі. Немцы адступалі. Іх цясьнілі з Усходу і Захаду.

## Частка 2
## Эміграцыя
## (Уступ)

Маё жыцьцё і дзейнасьць распадаецца на тры пэрыяды, якія рэзка адрозьніваюцца адзін ад другога.

Першы пэрыяд быў чыста сьвецкі, працягваўся 22 гады жыцьця і ахопліваў дзяцінства і юнацтва, а таксама маладыя гады. Істотную частку гэтага пэрыяду запоўнілі гады навучаньня і выхаваньня ў гімназіі і ўнівэрсытэце з усімі хваляваньнямі, клопатамі, радасьцямі і засмучэньнямі. Трэба было прабіваць сабе дарогу ў жыцьцё, разьвіваць свае сілы і здольнасьці для выкарыстаньня іх на жыцьцёвым вопыце. Цяжкая хвароба ў многім мне перашкодзіла, але яна была не да сьмерці, а да славы Божай. Царыца Нябесная Сваім дотыкам да маіх ранаў вылечыла мяне ад хваробы і паказала мне іншы шлях жыцьця, што вывеў мяне з зямной мітусьні. Манаства паклала пачатак іншаму жыцьцю, духоўнаму, анёльскаму, якое прывяло мяне да служэньня Сьвятой Царкве...

Другі пэрыяд майго жыцьця ахоплівае гады ў манаскім званьні, гады пастырскага служэньня на царкоўнай ніве. Мая дзейнасьць у гэты час была шматгранная і насычаная жыцьцёвым досьведам. Ад настаяцельства манастыром да пастырскага служэньня на прыходах, ад выхавальніцтва студэнцкай моладзі і да кіраваньня епархіяй, а таксама далучэньня да багаслоўскай і пэдагагічнай навукі, – усё гэта

ўвайшло ў праграму маёй дзейнасьці гэтага пэрыяду. І гэта адбывалася на радзіме, ва ўмовах, знаёмых мяне.

Трэці пэрыяд адносіцца да эміграцыі, дзе я апынуўся па волі Божай. Пра гэты пэрыяд я ўжо гаварыў у пачатку сваіх успамінаў, а таксама скажу і ў далейшых яе разьдзелах. Мая епіскапская хіратанія знамянальна была зьдзейсьнена ў нядзелю крыжапаклонную і адкрыла шлях архіпастырскага крыжанашэньня. Па гэтым шляху я іду ўжо 37 гадоў і будуісьці да канца дзён жыцьця майго, пакорліва і цярпліва, бо такая Воля Божая.

## Разьдзел дзевяты

## Шлях на чужыну

У выніку набліжэньня нямецка-савецкага фронту становішча ў Наваградку з кожным днём рабілася больш трывожным. Немцы пацiху рыхтаваліся да выезду на захад. У горадзе панавала злавесная цішыня, на вуліцах амаль не было пешаходаў, а аўтамабіляў тым больш не было. Уночы чуваць буркатаньне савецкіх аэрапланаў, якія скідалі ракеты як сыгналізацыю партызанам. Наваградак не бамбілі з паветра, хоць тут стаяў казацкі штаб. Верагодна, шкадавалі сваіх бомбаў.

Мой катэдральны протаіерэй а. Гарбацэвіч з зяцем Буляком, бургамістрам горада, ціхенька ад мяне рыхтаваліся да ад’езду ў бежанства, для чаго купілі коней і фурманку. Я гэта ведаў, але іх не пытаў, не жадаючы бянтэжыць. Жылі мы ў розных дамах, але на адным двары каля сабора. У мяне ніякага транспарту не было. Сваіх коней і фурманкі я ня меў і ня меў аўтамабіля. Па сутнасьці, я нічога ня меў, хоць і ўзначальваў епархію. Я такі быў пакорлівы волі Божай, што нічога не рабіў для выезду за мяжу. Немцы ўвесь час агітавалі, што адступаюць не таму, што яны слабыя мілітарна, але таму, што скарачаюць фронт па стратэгічных меркаваньнях. Вядома, ніхто ім ня верыў, але не пярэчыў.

Настала нядзеля 2 ліпеня па новым стылі. Я вёў літургію ў саборы і нічога не падазраваў, што ў той самы дзень уначы казакі са сваім штабам, што стаялі ў Наваградку і ў вёсках, выедуць на захад усім сваім Станам. Пра гэта мне паведаміў пад сакрэтам хутка пасьля літургіі казацкі галоўны сьвятар В. Грыгор’еў. Ягоны клопат пра тое, каб казакі ўзялі мяне, ня мелі посьпеху. Стаяла сьпякотнае лета, і ўсю ноч казацкія фурманкі тарахцелі па вуліцах горада, ад’яжджаючы сваім абозам. Я ня спаў усю ноч і часта выходзіў на двор. Ноч ўдалася зорная і ціхая. Уранку прыйшоў да мяне дыякан з просьбай высьвеціць яго ў герэя. Я пагадзіўся, але атрымалася, што фізычныя сілы мае былі такія слабыя, што не дазволілі мне стаяць ля прастола. Гэта адбылося ў мяне з прычыны душэўных пакут усю ноч і бяз сну. Я маліўся Богу, прасіў яго не пакідаць мяне ў гэты крытычны час. Дыякан застаўся без высьвячэньня, але я папракнуў яго за тое, што ён ня думаў пра герэйства раней, калі было можна.

Пра вываз мяне з Наваградка клапаціўся мой сакратар І. Базілевіч і перакладчыца, бежанка. Уранку яны выправіліся да нямецкага на-

чальніка гэбітскамісара і даклалі яму пра маё становішча. Ён ведаў мяне добра і па-сяброўску ставіўся да мяне. З жаданьнем дапамагчы ён загадаў перадаць мне, каб я быў падрыхтаваны да ад'езду праз 15 хвілінаў без рэчаў і адзін. Яны прыбеглі да мяне з такім паведамленьнем. Я рашуча адмовіўся выяжджаць без маіх найбліжэйшых супрацоўнікаў і рэчаў і моцна заплакаў, што не дазволіла мне гаварыць. Плакалі і яны, угаворваючы выпраўляцца і абяцаючы прыехаць да мяне бліжэйшым транспартам. Я згадзіўся, калі яны мне паведамілі, што немцы завязуць мяне ў горад Ліду Наваградзкай епархіі. Я плакаў, мяне апранулі нават ва ўсё зімовае і далі мне маленькую валізку з эвангельлем і Эўхарыстычным сьвяшчэнным посудам. З гэтым багажом яны правялі мяне ў гэбітскамісарыят непадалёку. Там адразу ж прыняў мяне начальнік, палкоўнік Х., супакоіў мяне, кажучы, што немцы адступаюць з горада часова, у сувязі з наступленьнем вялікіх атрадаў партызанаў і праз 2 тыдні я буду зноў у Наваградку, бо нямецкія танкі адгоняць савецкія войскі і партызанаў. Натуральна, я гэтаму ня верыў, але маўчаў і дзякаваў за ўвагу да мяне.

Неўзабаве мяне пасадзілі ў пасажырскі нямецкі аўтамабіль шостым пасажырам і паехалі з горада па шашы ў горад Ліду за 55 кілямэтраў. Я бачыў па дарозе знаёмцаў, якія ішлі пешшу з валізкамі за плячыма. У тым ліку пешшу падарожнічаў генэрал Беларускай арміі (БА), пазьней ён паступіў да казакоў і быў выдадзены ангельцамі Саветам разам з казацкімі афіцэрамі і камандаваньнем у Лінцы (Аўстрыя) на пачатку чэрвеня 1945 года.

У Лідзе мяне высадзілі каля дома сьвятара, настаяцеля царквы ў гэтым горадзе, протаіерэя А. Апанасевіча. Убачыўшы мяне на вуліцы, ён выйшаў да мяне са сваёй матушкай і запрасіў мяне ў дом. Яны ўзрадаваліся майму прыезду, але і засмуціліся падзеямі. Стараліся пачаставаць мяне, але мне было не да ежы. У доме а. Апанасевіча я застаў свайго былога стаўленіка сьвятара А. Г., настаяцеля царквы ў сяле Мыта. Ён паведаміў мне, што ў мясцовасьці спакойна і партызанаў у іх няма. Я пажадаў ехаць да яго. Ад Ліды ягонае сяло знаходзілася за 10 кілямэтраў. Калі даведаліся пра маё жаданьне Апанасевічы, са сьлязьмі пачалі прасіць мяне ня ехаць у вёску, а заставацца ў іх, каб адпачыць ад перажываньняў. "Уладыка, –гаварылі яны мне, – на вас твару няма!" – угаворвалі мяне. Я згадзіўся, але дамовіўся з а. Гагалушкам, што заўтра раніцой ён прыедзе забраць мяне да сябе, але ён не прыехаў і больш я яго ня бачыў.

Тады ў Лідзе ўжо часова спыніліся архіепіскап Смаленскі Стэфан (Севба) і яго вікарый епіскап Павел (Мялецьеў) са сваёй сястрой-манашкай. Павел неўзабаве наведаў мяне, а я зь ім накіраваўся да архіепіскапа Стэфана, які ляжаў, моцна зьбіты падчас свайго пада-

рожжа грузавіком з Мінска. Абодва яны жылі ў нейкім габрэйскім пустым доме. Габрэеў у Лідзе ўжо не было – немцы ўсіх расстралялі. Епіскап Павел прыехаў з Магілёва ў асобным вагоне, нагружаным усялякай маёмасьцю сваёй і з магілёўскага музэю, які ён разрабаваў, спыніўшыся ў гэтым горадзе на шляху ў бежанства. Ён вывез нават сталовую мэблю з Царскай Стаўкі, якая знаходзілася ў 1916 – 1917 гадах у гэтым горадзе. З нямецкай службай бясьпекі (СД) ён быў добра знаёмы.

Немцы рыхтавалі горад Ліду да здачы савецкім войскам: палілі склады і вывозілі ўсё, што ім было патрэбна. Мы змаглі затрымацца тут толькі на тры дні. Па хадайніцтве епіскапа Паўла нямецкія чыгуначныя ўлады далі яму і зь ім разам а. Апанасевічу з сям'ёй і мне зь епіскапам Стэфанам вагон, але адкрыты, без даху. Мы разьмясьціліся ў ім на падлозе ці на скрынках. На зьмярканьні наш цягнік ціха выйшаў са станцыі і накіраваўся ў шлях. Прыблізна за 10 кілямэтраў ад станцыі цягнік спыніўся ў лесе і ў той самы час мы ўбачылі ракеты над Лідай, якія асьвятлялі горад. Саветы пачалі бамбіць горад з аэраплянаў. Калі б затрымаліся на станцыі хвілінаў на 10 – 15, мы трапілі б пад бомбы і загінулі. Госпадзь нас захаваў: наш цягнік своечасова пакінуў горад.

На сьвітаньні першыя вагоны нашага цягніка наскочылі на міны, падкладзеныя пад рэйкі партызанамі. Седзячы ў вагоне, мы драмалі, але ад выбуху і трасеньня зваліліся са сваіх месцаў і спалохаліся. Цягнік рэзка спыніўся. Пасажыраў, апрача нас, не было, бо ў вагонах везьлі нейкі тавар. У адкрытым полі прастаялі на санцапёку ўвесь дзень, пакутуючы ад смагі і голаду. За адну вярсту была відаць вёсачка. Надвячоркам падкаціў з супрацьлеглага боку паравоз, да якога прычапілі наш цягнік і паехалі ў Гародню.

Уранку прыехалі ў Гародню і спыніліся далёка ад вакзала на запасным пуці. Епіскап Павел і протаіерэй Апанасевіч і іншыя зь імі паехалі ў Германію, а мы з епіскапам Стэфанам пешшу прыйшлі ў архірэйскую рэзыдэнцыю, дзе пражываў архіепіскап Венядзікт Гарадзенскі і ў яго гасьцявалі мітрапаліт Панцеляймон і архіепіскап Філафей, уцеклыя з Мінска. Тут жа, у Гародні, служыў епіскап Рыгор (Барышкевіч). Такім чынам тут склалася група епіскапаў на чале з мітрапалітам, што называецца Сабор Епіскапаў Беларускай Праваслаўнай Царквы.

У Гародні таксама было неспакойна, хоць панікі не заўважалася. Штодзённа мы слухалі весткі з фронту па радыё, але яны былі мала суцяшальныя. Нам хацелася пачуць вестку, што савецкія войскі адступілі і што мы можам вяртацца дадому. На жаль, такіх вестак не было. Тут я захварэў дызэнтэрыяй з крывёю, але вылечыў доктар Карнкоўскі.

Гарадзенскія ўладыкі выпрасілі вагон для вывазу царкоўнай рызьніцы ў горад Сасновіцы ў Сілезіі. Але ніякай рызьніцы не зьбіраліся вывозіць, а падрыхтавалі яго для сябе. Вагон пасажырскі і ў добрым стане. На яго разьлічвалі і мы, прыбылыя з Ліды. У той час ў Варшаве ўспыхнула паўстаньне палякаў супраць немцаў, і нам шлях на гэты горад зачынілі. Заставалася ехаць праз Усходнюю Прусію, г. зн. акружной дарогай.

У Гародні мы прастаялі тыдні два ў чаканьні ад'езду. Аднойчы прыйшлі нямецкія жандары і загадалі архіепіскапу Венядзікту быць падрыхтаваным да ад'езду. Па яго рэчы і яго набліжаных прыслалі грузавік і адправілі ў вагон на вакзал. Епіскап Стэфан хацеў застацца ў Гародні, але жандар не дазволіў. На вакзале прастаялі трое сутак у чаканьні ад'езду. Выявілася, што чыгуначнікі-палякі байкатавалі нас, папоў, і не прычэплівалі нашага вагона да цягнікоў. Я з адным спадаром пайшоў да начальніка вакзала, немца, папрасіў яго паскорыць наш ад'езд, што ён ахвотна і зрабіў. Вечарам таго ж дня мы выехалі з Гародні.

Праяжджалі міма Мазурскіх азёраў ва Усходняй Прусіі, бачылі багатыя сядзібы нямецкіх хутаранцаў, якія нічым не нагадвалі нашых бедных хацінаў пад саламянымі стрэхамі. Я ўспамінаў свайго брата, які загінуў недзе ў гэтых азёрах у час вайны 1914 года.

Ехалі двое сутак, пакуль прыбылі ў Сасновіцы. На нашу просьбу наш вагон падвезьлі да самай царквы – яна стаяла каля чыгункі, і адчапілі яго побач з царкоўным плотам. Настаяцель царквы, мой унівэрсытэцкі калега протаіерэй Канстанцін Гаўрылкаў, з радасьцю нас сустрэў і прыняў да сябе ў двор. Тут жа стаяла прыгожая пяцікупальная царква. У ёй штодзённа ўранку і ўвечары мы праводзілі Набажэнствы, але з нашай прыежджай групы ніхто на Набажэнствы не прыходзіў, хоць цэлы дзень снавалі туды і сюды міма яе. Мне было крыўдна за іх, што ў такі цяжкі час ня ходзяць у царкву і ня моляцца Богу, у тым ліку былі нават архірэі і протаіерэі. Ад іх патрабуецца больш, чым ад цывільных вернікаў, хоць і апошнія мелі дачыненьне да духоўнага жыцьця і знаходзіліся ў архірэйскай групе. Часта я праводзіў Набажэнствы і пастаянна прысутнічаў на іх наш мітрапаліт Панцеляймон. Настаяцель клапаціўся пра нас і ўладкаваў усіх на кватэру, а таксама для атрыманьня харчовых картак.

Мы, епіскапы, напісалі адсюль ліст мітрапаліту Серафіму ў Бэрлін, паведамілі пра наш прыезд у межах яго епархіі і прасілі дапамагчы нам уладкавацца на жыхарства ў адным з курортаў: Карлсбадзе, Фанцэнсбадзе ці Марыенбадзе, якія былі на чэскай тэрыторыі, далучанай да Германіі і названай Студэтэнланд. Наш ліст ён атрымаў і ўзбудзіў хадайніцтва перад міністэрствам аб атрыманьні намі для па-

сяленьня аднаго з названых курортаў. У міністэрстве хутка зрэагавалі адносна нас і прыслалі міністэрскага чыноўніка, які размаўляў па-руску, перавезьці ўсю нашу групу ў Кюстрын-на-Одэры. Гэта ён і зрабіў. У Сасновіцах мы прастаялі больш за два тыдні. Было лета, канец ліпеня, і сьпякотна.

Кур'ерскім цягнікам мы прыехалі ў Кюстрын. На станцыі прастаялі тры дні, пакуль шукалі для нас памяшканьне. Чыноўнік, які суправаджаў нас, больш не зьявіўся. Яму было сорамна сустракацца з намі пасьля яго пустых абяцаньняў, дадзеных нам у Сасновіцах, што быццам бы нас чакаюць вілы, сасновы лес, летнікі і інш. Нічога падобнага мы не атрымалі, а ўладкавалі нас у пустой нямецкай школе. Далі для нашай групы: сем епіскапаў, некалькі протаіерэяў з іх сем'ямі, а таксама некалькі чалавек цывільных з набліжаных архіепіскапа Венядзікта. Уся група складалася з 35 чалавек. Мітрапаліту і архіепіскапу Венядзікту далі пакоі ў найбліжэйшым гатэлі, а астатнія разьмясьціліся ў двух клясах. Ложкі і матрацы былі пастаўленыя. Абеды і вячэры прыносілі з суседняга лягеру для рабочых з Польшчы і СССР. Усяночныя служылі на калідоры нашага памяшканьня, а літургію ў нямецкай кірсе побач са школай. Да школы прымыкалі старыя закрытыя могілкі, зарослыя дрэвамі, як парк. Там я праводзіў дні. Духоўныя асобы хадзілі на ноч у жандарскую казарму, дзе адвялі нам пустую залю з ложкамі і коўдрамі. Адным словам, у Кюстрыне нам было някепска.

Мітрапаліт Серафім Бэрлінскі быў у такой ступені ўважлівы да нас, што ў адну з суботаў прыслаў да нас пасланцоў: дыякана Ігара Зуземіля і іпадыякана Рымарэнку, якія суправаджалі нас, чатырох архірэяў – Венядзікта, Філафея, Рыгора і мяне – у Бэрлін для правядзеньня Набажэнства ў катэдральным саборы. Мы паехалі і там служылі ў храме, перапоўненым остаўскімі рабочымі, вывезенымі немцамі з акупаваных раёнаў Савецкага Саюза. Двойчы: вечарам і ноччу хаваліся ў бомбасховішча, бо здараліся алярмы і налёты ангельскіх аэрапланаў. Хацелася хутчэй выехаць з Бэрліна. Нялёгка было б прызвычаіцца да такіх абставінаў.

У Бэрліне тады я ўпершыню сустрэўся з мітрапалітам Серафімам, якога ня бачыў з 1940 года, калі ён быў у Варшаве, і быў ягоным госьцем; пазнаёміўся са сьвятаром сабора Мануілам Любек-Эсенскім, перакананым тэосафам, будучым сьвятаром у маім Гамбургскім вікарыяцтве, якога я ўзьвёў у сан протаіерэя, а яшчэ пазьней, менавіта ў 1968 годзе высьвеціў у епіскапа вікарыя для Аўстралійскай епархіі. У яго я і начаваў. Ён жыў з немкай, сам жа цэлібат. Доўга гутарыў я з протаіерэем А. Рымарэнкам, вялікім прыхільнікам Опцінскіх старцаў, які пазьней памёр у заснаваным ім жаночым манастыры "Новае

Дзівеева" ў штаце Нью Ёрк (ЗША) у сане архіепіскапа ў 1976 годзе. Пазнаёміўся ў бункеры з архімандрытам Іаанам Шахоўскім, у далейшым архіепіскапам Паўночна-Амерыканскай мітраполіі[42]. Так што паездка ў Бэрлін не прайшла бясьследна для мяне, а пакінула глыбокія ўспаміны пасьля бачанага і перажытага. З а. Мануілам лёс мяне сутыкнуў праз шмат гадоў.

У Кюстрыне мы жылі больш за два тыдні. Аднойчы зьявіўся да нас высокі міністэрскі чыноўнік Розэн і ў размове з намі прапанаваў нам пасяліцца ў Дармштаце, дзе была руская царква. Мы прасілі ягонага дазволу жыць у Францэнсбадзе, дзе таксама існавала руская царква. Ён паехаў, а праз некалькі дзён зьявіўся другі чыноўнік і завёз нас у Францэнсбад. Для нашай групы гэта быў прыемны сюрпрыз. Гэта сьведчыла пра тое, што нямецкія сталічныя ўлады ўспрымалі нас як важных асобаў і хацелі зрабіць нам зручныя ўмовы для жыцьця.

У Францэнсбадзе нашай групе выдзелілі гатэль у два паверхі, невялікі, але чысьценькі і ўтульны. Гаспадыня-немка строга сачыла за чысьцінёю, і жанчынам нашай групы ўвесь час указвала "шмуц". За гэты "шмуц" надакучыла яна ўсім. Харчаваліся на карткі. Паводле картак я атрымліваў абед у рэстаране: суп з гародніны без тлушчу і на другое вараную бульбу з нейкай мучной падлівай. Хлеба было ў абрэз: атрымлівалі на 10 дзён кіляграм. Мой сьняданак складаўся з тоненькай скібачкі хлеба з мармэлядам і эрзац-гарбаты. Харчаваньне беднае, затое на страўнікі ніхто не пакутаваў.

Вакол курорта насаджаныя былі вялікія паркі з яловых дрэваў. Там і сям у парках знаходзіліся гаючыя крыніцы з мінэральнай вадой. Дачнікаў не было, і я на самоце блукаў па парках, адпачываў і маліўся. Царква ў Францэнсбадзе шмат гадоў стаяла зачыненая, і ўсюды павукі зьвілі свае гнёзды, а на падлозе ляжаў тоўсты слой сьмецьця. Калі я ўпершыню ўвайшоў у гэтую царкву, жахнуўся ад яе бруду і запусьцеласьці. Закасаўшы рукавы тры дні я чысьціў яе, замятаў і разганяў павукоў. У ёй мы праводзілі Набажэнствы ў сьвяточныя і нядзельныя дні. Маленькі хор пеўчых быў свой. Часам нашы архірэі служылі архірэйскім чынам без іпадыяканаў. Ключы ад царквы знаходзіліся ў магістраце-кургаўзе. Ніякіх богаслужбовых прадметаў у царкве не было, але абразы стаялі на месцах. Царква невялікая, але прыгожая знутры і звонку.

Ня маючы што рабіць, нашы архірэі задумалі абмяркоўваць кананічнае палажэньне Беларускай Царквы на радзіме і ў эміграцыі. Сабраліся ў пакоі мітрапаліта і пад ягоным старшынствам праводзілі шмат гадзінаў штодзённа ў абмеркаваньні гэтага пытаньня. Пісалі таксама пратаколы паседжаньня і надавалі гэтаму важнае значэньне. Вядома, нікому гэта не спатрэбілася. Так праходзілі люты і сакавік

1945 года. Тым часам вайна была ў разгары, і Германія набліжалася да канца свайго існаваньня як вольнай дзяржавы. Напрыканцы красавіка два фронты: з заходу – ангельска-амэрыканскі і з усходу – савецкі, – набліжаліся адзін да другога і сьціскалі сваёй масай нямецкія войскі, якія ўпарта абараняліся. Жывучы ў Францэнсбадзе, мы вельмі баяліся, што нас захопяць у свае рукі чырвоныя, але, на шчасьце, у хуткім часе прыйшлі амэрыканцы. Мы ўздыхнулі свабодна. Наш Вялікдзень адбываўся без звычайнага царкоўнага сьвяткаваньня, бо Францэнсбад знаходзіўся ў франтавой паласе. З вуліцы насупраць нашага гатэля амэрыканцы некуды стралялі з танкавых гарматаў. Выбухі ад стрэлаў былі такія моцныя, што трэсьліся сьцены нашага гатэля. Я адзін у сваім пакоі прасьпяваў а 12 гадзіне ночы велікодны канон і так адсьвяткаваў Вялікдзень. Іншых архірэяў я ня бачыў – са сваіх пакояў не выходзілі.

Мітрапаліты Анастасій[43] і Серафім з набліжанымі жылі ў Карлсбадзе, але яны своечасова пасьпелі выехаць на поўдзень Баварыі, інакш іх захапілі б чырвоныя, якія ўвайшлі ў гэты курорт. Мітрапаліт Серафім па дарозе трапіў пад бамбардзіроўку ў Пілзене і цудам ўратаваўся. Затое страціў свой багаж – архірэйскае адзеньне і іншае.

Немцы капітулявалі і спынілі ваенныя дзеяньні. Гэта было 8 мая 1945 года[44]. У Францэнсбадзе, як грыбы пасьля дажджу, зьявіліся чэскія міліцыянэры, якія выдатна размаўлялі па-руску. Яны прыходзілі да нас у гатэль, цікавіліся намі і суцяшалі нас, што адправяць на радзіму, гэта значыць у Савецкі Саюз. Нам нічога не заставалася рабіць, як толькі ратавацца ўцёкамі з Францэнсбада ў суседнюю Баварыю, акупаваную амэрыканскімі войскамі. Малымі групамі мы нанялі сялян “баўэраў” з фурманкамі і паехалі зь імі на баварскі бок. На мосьце на мяжы стаялі два амэрыканскія патрулі. Мы кожнаму далі па бутэльцы віна, і яны нас прапусьцілі, сказаўшы “о’кэй”. Такім чынам, мы ў Баварыі. Давезьлі нас да фабрыкі ў Шлотэнгофе і кінулі. Фуманы паехалі дадому, а мы часова ўладкаваліся на гэтай фабрыцы, якая стаяла зачыненая. Гаспадары дазволілі нам спыніцца на тры дні, але за віно мы засталіся ў ёй на ўсё лета.

На пачатку чэрвеня мы, епіскапы, зьвярнуліся з пісьмовай просьбай да галоўнакамандуючага арміяй Заходняга фронту ген. Д. Айзенгаўэра[45], каб ён выратаваў нас ад гвалтоўнай рэпатрыяцыі на радзіму і здачы ва ўладу савецкага НКУС. У хуткім часе атрымалі адказ праз мясцовую амэрыканскую ваенную камэндатуру, у якім было сказана, што нас ніхто ня мае права рэпатрыяваць супраць нашай волі, што мы зьяўляемся перамешчанымі асобамі (ДП)[46], што нам належыць узмоцнены паёк за цяжкую працу і кватэры для жыхарства. З гэтым дакумэнтам мы атрымалі ўсё, што ў ім было пазначана.

Да нашай групы ў Францэнсбадзе далучыліся ўкраінскія епіскапы Міхаіл Харошы і Уладзімір Малец са сваімі сем’ямі. Яны належалі да Украінскай аўтакефальнай царквы (некананічнай). У Міхаіла была жонка і дарослы сын, студэнт, а ва Уладзіміра – жонка-“сястра” і тры дачкі. Нейкія царкоўныя ўлады афіцыйна іх разьвялі з жонкамі, але яны працягвалі зь імі і далей жыць. З Шлотэнгофа Міхаіл паехаў далей у Германію, а Уладзімір застаўся з намі. Пазьней ён пераехаў ва ўкраінскі лягер.

У Шлотэнгофе нашы ўладыкі сумавалі бяз справы, часам хадзілі ў грыбы, але найчасьцей сядзелі ў бараку, пра нешта размаўлялі ці гулялі ў прэфэранс да позьняй ночы. Жанчыны займаліся кухняй і гатаваньнем ежы. Я бавіў час у бліжэйшым лесе ці хадзіў у поле. Там я думаў, маліўся і цікавіўся расьлінамі, якіх не было на маёй радзіме. Флёра Нямеччыны крыху адрозная ад нашай.

Першы час мы галадалі. Апрача ялавічнага тлушчу ў мяне нічога не было. Да немцаў я не хадзіў прасіць прадуктаў, але на лузе зьбіраў дзікае (конскае) шчаўе, лісьце кармавых буракоў і з іх варыў сабе боршч, нясмачны і маласпажыўны. Хлеба таксама было ў абрэз. Пазьней мы пачалі атрымліваць праз Міжнародную арганізацыю ЮННРА[47] кер-пакеты з ЗША, што складаліся з прадуктаў у кансэрвах, а таксама кавы і гарбаты. Зьявіліся грыбы. Гэта падмацоўвала мяне. Але мы жылі спакойна і на лоне цудоўнай прыроды, як на лецішчы. У такіх варунках пра лепшае жыцьцё ня мроілася.

У верасьні арганізацыя ЮННРА ўладкавала нас у лягеры для бежанцаў у Тырсгайме, дзе нам выдзелілі двухпавярховы дом з асобнымі пакоямі і кватэрамі. У ім мы ўладкаваліся добра.

## Разьдзел дзясяты

# Архіпастырства ў Нямеччыне (1945 – 1950)

У Францэнсбадзе я жыў ня толькі як на курорце з сусьветнавядомай славай, але і як у манастыры – адлучаны ды ізаляваны ад вонкавага сьвету. Хоць мы ўсе жылі ў адным гатэлі, але я ні да каго не заходзіў і са сваімі ў гатэлі не сустракаўся. Кожны з нас жыў сваім жыцьцём і займаўся сваімі зацікаўленьнямі. Велічныя паркі і самотныя алеі былі маімі ўлюбёнымі мясьцінамі для адпачынку і прагулак. Такі стан рэчаў мне падабаўся і я адчуваў сябе дастаткова добра, хоць і жылося ў голадзе.

Мне здавалася, што пра маё знаходжаньня нікому не вядома і пра мяне ніхто ня ведае. Таму я быў вельмі зьдзіўлены і занепакоены, калі аднаго дня ў кастрычніку 1944 года зьявіўся да нас з Бэрліна наш агульны знаёмец П. І. Сьвірыд з запрашэньнем у міністэрства, і ён прыехаў мяне суправаджаць. Чаму і навошта ён і сам ня ведаў ці, магчыма, сказаць не хацеў. У той жа дзень уначы мы выехалі цягніком у Бэрлін. Тады іншых шляхоў не было.

Пераначаваўшы там у сваіх знаёмцам з Наваградка, спачатку ў іхняй кватэры, а потым у бамбасховішчы, раніцою я паехаў па дадзеным мне адрасе ў міністэрства. Мне трэба было зьявіцца да сп. Розэна. Прыняў ён мяне прыязна і адразу ж патэлефанаваў нейкаму генэралу, сказаў, што хоча зь ім пазнаёміць. Прыйшлі да генэрала. У кабінэце пасадзілі мяне ў фатэль, зьявіўся перакладчык, і генэрал асьцярожна і дыпляматычна пачаў размову – па якой справе я запрошаны. Увогуле, я даведаўся, што мне прапануюць пасаду вайсковага епіскапа над рускімі ды ўкраінскімі палкавымі капэлянамі пры нямецкай арміі і для гэтага даюць званьне нямецкага генэрала з усімі прывілеямі, належнымі гэтаму чыну. Я спалохаўся і ў думках зьвярнуўся да Бога з просьбай выбавіць з такога ліха. Адмовіцца я не рызыкаваў, але спадзяваўся на дапамогу Усявышняга. Да гэтага часу я толькі слухаў і маўчаў. Па-нямецку тады я размаўляў і разумеў і цяпер, у крытычны момант жыцьця, я вырашыў гаварыць сам. Да немалога зьдзіўленьня генэрала і перакладчыка, я загаварыў па-нямецку. Даведаўшыся, у чым сутнасьць справы, я сказаў генэралу, што не магу заняць прапанаваную пасаду, бо рускія і ўкраінскія вайсковыя праваслаўныя капэляны не захочуць падпарадкавацца мне як епіскапу Беларускай Царквы. Генэрал яшчэ запытаўся нешта для ветлі-

васьці і разьвітаўся са мною, сказаўшы: “Мы запросім Вас у бліжэйшы час, калі сфарміруюцца беларускія атрады”. З радасьцю я выйшаў з міністэрства, дзякуючы Усёмагутнаму за выратаваньне. Я праходзіў каля рускага рэстарана “Мядзьведзь”, які разьмяшчаўся ў разбураным аднапавярховым доме. Быў час абеду, і я добра пад’еў у ім, вядома, на нямецкія карткі.

Наведаў архімандрыта Гермагена (Ківачука), якога я добра ведаў яшчэ з яго студэнцкіх гадоў у Варшаве і які цяпер служыў вайсковым капэлянам пры арміі генэрала Уласава[48]. Пераначаваў у яго і спаў усю ноч спакойна. Уранку выехаў у Францэнсбад. Дома, пасьля прыезду, архірэі распытвалі мяне, у чым справа. Я растлумачыў ім падрабязна ўсю маю гісторыю. Мітрапаліт Панцеляймон злосна заўважыў: “Вы ня мелі права адмовіцца. Ваш абавязак – бараніць радзіму”. Я запытаўся толькі ад каго. Ён мне не адказаў. На гэтым нашая размова закончылася і больш не ўзнаўлялася.

Набліжаліся сьвяты Нараджэньня Хрыстова. Яшчэ больш мілітарна слабела Германія, але ўпарта абаранялася. Мы разумелі, што яе канец набліжаецца. 1944 год завяршаўся. Нечакана прыехаў да мяне малады казак з Казацкага Стану, што знаходзіўся ў Італіі, у Альпах. Ён прывёз для мяне ліст ад казацкага протасьвятара Васіля Грыгор’ева і дакумэнты на праезд па чыгунцы ў горад Талмеца да казакоў. Айцец протасьвятар паведамляў, што казацкае духавенства прызнае мяне за свайго епіскапа яшчэ з Наваградка і іншага епіскапа ня мае. Прасіў мяне прыехаць да іх у Казацкі Стан у Талмеца да Нараджэньня Хрыстова. Мне было прыемна атрымаць гэтую вестку, бо я ня ведаў нічога, дзе знаходзяцца казакі, што выехалі з Наваградка. Пра мяне яны даведаліся толькі ад мітрапаліта Серафіма Бэрлінскага.

Вырашыў ехаць да казакоў і пачаў рыхтавацца. Ня меў пры сабе архірэйскага адзеньня, але пазычыў яго ў мітрапаліта Палескага Аляксандра (Іназемцава), які ў той час жыў у Марыенбадзе, непадалёку ад Францэнсбада. Падрыхтаваўшы ўсё неабходнае, я выехаў з прысланым да мяне казаком у Італію.

Ехалі двое сутак. У Філяху і яшчэ на адной станцыі ў гарах начавалі. Падарожжа было цікавае – сярод Альпаў, праз цясьніны і тунэлі. У некаторых мясьцінах цягнік імчаў на вялікай вышыні ўздоўж бездані. На месца даехалі ўранку. На вакзале мяне сустрэлі казакі і адвезьлі ў царкву, дзе ўжо адбывалася літургія. Царкву зрабілі ў былой залі кінатэатра, доўгай і вялікай. Вернікаў было мала.

Госьця пачалі з гонарам прымаць, спачатку ў афіцэрскім клюбе, а потым у прыватных асобаў. Казацкія афіцэры з новых і старых эмігрантаў ставіліся да мяне з павагай. За сталамі, крыху на падпітку, яны жадалі і спрабавалі гаварыць са мною пра свае перажываньні

і духоўныя патрэбы. Гаварылі шчыра, некаторыя са сьлязьмі. Былі як дарослыя дзеці. Я палюбіў іх: добрыя хлопцы. Ва ўсе нядзельныя ды сьвяточныя дні я праводзіў Набажэнствы. Мне саслужылі протаіерэй В. Грыгор'еў і сьвятар У. Чаканоўскі. Былі галасісты протадыякан і добры хор.

Аднойчы атаман Даманаў павёз мяне ў аддаленую станіцу ў гарах. Там я служыў літургію і прапаведаваў. Настаяцельстваваў протаіерэй Ісідор Дзераза, украінец, які гаварыў па-руску з моцным украінскім акцэнтам. У 1950–1954 гадах я сустрэў яго ў Аўстраліі, дзе ён сьвятарстваваў, эмігрыраваўшы сюды пасьля вайны. Пазьней вярнуўся на радзіму і служыў у Крывым Рогу. Там і памёр. Атаманам гэтай станіцы быў палкоўнік Ротаў. Сваім клопатам арганізаваў ансамбаль песьні і танца. З нагоды нашага прыезду яны зладзілі канцэрт. Выконвалі народныя песьні выдатна. Адным з нумароў канцэрту быў танец лезгінка. Прыродныя чэркесы, яны выканалі гэты танец, як сапраўдныя артысты.

У Талмеца я наведваў казакоў у шпіталі. Там паказалі мне казакоў, зь якіх зьдзекаваліся партызаны: выкалалі ім вочы і адрэзалі языкі. Шкада да сьлёз і страшна было глядзець на гэтых няшчасных маладых людзей. Ім сказалі, хто прыйшоў іх адведаць. Яны хацелі плакаць, але замест плачу вылі. Без языкоў не маглі гаварыць.

Ваенная абстаноўка ў Казацкім Стане мне не падабалася. І я вырашыў вярнуцца ў Францэнсбад і папрасіў дапамагчы мне ў гэтым і даць суправаджэньне. Протаіерэй Грыгор'еў прасіў мяне застацца зь імі, але я абяцаў прыехаць у Талмеца на Велікодныя сьвяты. Прабыўшы там больш за месяц, паехаў у Францэнсбад. Мяне суправаджалі палкоўнік Якуцэвіч, былы інспэктар беларускай арміі і мой келейнік Юлік Рымко, вядомы мне яшчэ з радзімы, і немец – маёр Р., які гаварыў па-руску. Ён выратаваў мяне ад сьмерці на зваротным шляху ноччу, калі ў цягніку мяне амаль не затапталі нямецкія салдаты пры пагрузцы ў вагон на станцыі Шпіталь (Аўстрыя). Да ўсяго наш цягнік абстралялі з кулямётаў аэрапляна цітаўскія партызаны. Аэраплян заўважылі, цягнік спынілі, і ўсе пасажыры выбеглі з вагонаў у глыбокі сьнег, схаваліся пад вялікімі елкамі. Адзін казак быў забіты ў вагоне. Мае валізкі, якія засталіся ў вагоне, былі пасечаныя кулямі, а віно, якое я вёз у падарунак за адзеньне мітрапаліту Аляксандру, зьнікла. У Францэнсбад я вярнуўся ўдала.

Незадоўга да Вялікадня прыехаў да мяне мой казацкі келейнік Юлік, каб суправаджаць мяне ў Казацкі Стан. Германія тады знаходзілася на краі пагібелі. Было зразумела, што доўга яна не пратрымаецца. Адносна паездкі да казакоў я вагаўся. Мне страшна за іхні лёс, бо яны ваявалі з камуністамі на баку немцаў. Апрача таго, мяне клікаў

да казакоў архіпастырскі абавязак, як да сваёй паствы. Каб прыняць рашэньне, я прызначыў сабе пост на працягу трох дзён і пасьля яго заканчэньня служыў літургію, а потым у царкве, у алтары, кінуў жэрабя. Выпала з указаньнем ня ехаць. Другі раз кінуў. І другі раз выпала тое самае слова. Адольвала мяне спакуса: хацелася выцягнуць жэрабя з указаньнем ехаць. Паведаміў пра гэта Юліку і загадаў яму ехаць без мяне. Я напісаў ліст протаіерэю Грыгор'еву з тлумачэньнем прычыны майго непрыезду. У той самы дзень пасланец паехаў. Я маліўся пра яго шчасьлівае падарожжа. Аказалася, як той расказаў пасьля вайны, што ён цудам уратаваўся ад сьмерці па дарозе ад мяне да казакоў.

Бог захаваў мяне ад паездкі ў Казацкі Стан. Іхняя трагедыя ўсім вядомая. Ангельцы усіх казацкіх афіцэраў выдалі праз падман савецкім камуністам на сьмерць, а потым гвалтам шмат цывільных: жонак і дзяцей перадалі тым самым Саветам. Гэтая трагедыя адбылася 1 чэрвеня 1945 года. Калі б я тады быў з казакамі, і мяне маглі гвалтам перадаць Саветам.

Пасьля вайны Юлік расказваў мне, што яму было дадзенае распараджэньне ехаць зноў у Францэнсбад і перавезьці мяне ў Зальцбург, дзе для мяне падрыхтавалі вілу. Для гэтага далі яму ў дапамогу некалькі нямецкіх салдатаў для аховы і вялікі аўтобус. Яму было загадана арыштаваць мяне і вывезьці, калі я не захацеў бы ехаць у Зальцбург. Але ў гэты час фронт з захаду ўжо быў недалёка ад Францэнсбада. Юліку не ўдалося выканаць сваю місію. Ён вярнуўся ў Талмеца, а адтуль з казакамі пераправіўся праз Альпы ў Аўстрыю. Тут з казакамі расправіліся ангельцы, гвалтам перадаўшы савецкім ваенным уладам увесь штаб, афіцэраў, шмат шарагоўцаў, а таксама жанчын і дзяцей, некаторых сьвятароў. Пра гэта я ўжо згадваў у папярэдніх радках. Але гэтая выдача адбывалася ўжо пасьля заканчэньня вайны зь немцамі і акупацыі ўсёй Германіі і Аўстрыі зьвязьнікамі – Англіяй, ЗША, Францыяй і Савецкім Саюзам.

Я ўжо казаў пра тое, як нашая епіскапская група выехала з Францэнсбада ў Баварыю. Пасьля чатырохмесячнага туляньня, ня маючы сталага месца жыхарства, мы атрымалі ў сваё распараджэньне вялікі зручны дом у два паверхі ў гарадку Тырсгайм. Уладкавала нас туды ЮННРА (Міжнародная арганізацыя Дапамогі перамешчаным асобам). Яна ж выдала нам і харчаваньне. Зь нямецкай эканомікай мы спраў ужо ня мелі. За выключэньнем адзінага – зьбіралі ў навакольным лесе нямецкія грыбы.

Мае браты архірэі сядзелі бяз працы, сумавалі, гулялі ў карты або ўспаміналі мінулае. Я хадзіў увесь дзень па лесе ці па палях, прыгадваючы сваю Завітую, дзе я таксама бавіў час у лесе, полі і лугах. Вяс-

ковая прырода была маёй роднай стыхіяй. Апрача таго, я пачаў выдаваць тут часопіс на беларускай мове з дапамогай ратaтара, які атрымаў у нямецкай канцылярыі. Сваёй працай я быў задаволены. Мне здавалася, што я ўсё ж прыношу нейкую карысьць сваім суайчыньнікам. Артыкулы да часопісу сам складаў у місіянэрска-рэлігійным і маральным духу. Рассылаў іх беларусам у лягеры.

Самы сумны час – гэта зіма. Слота, холад, мароз і сьнег не дазвалялі прайсьціся. Але і сядзець у пакоі бяз спраў цэлымі днямі было невыносна. У такім настроі прайшлі зімовыя месяцы, пачатак 1946 года. Нядзелю я праводзіў у Рэгензбургу, дзе для беларусаў праводзіў Набажэнствы ў Беларускім камітэце[49] і выкладаў Закон Божы ў іхняй гімназіі[50] ў лягеры. На гэта я траціў тры дні на тыдзень.

Дый тое адабралі ад мяне канкурэнты – беларусы-каталікі і адзін протаіерэй. Я перадаў яму свой занятак у пачатку студзеня 1946 года. Увесну, у траўні, я атрымаў прызначэньне ад сваіх беларускіх епіскапаў абслугоўваць беларусаў, але зьбітыя з панталыку беларускія дзеячы не далі мне магчымасьці выканаць сваю задачу. Я пакінуў іх і больш ужо не вяртаўся да гэтага занятку.

Беларусы мелі падставы не пускаць нас у свае цэрквы і не дазваляць духоўна абслугоўваць іх, бо іхнія архіпастыры ў лютым 1946 года аб’ядналіся зь епіскапствам Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы, да якой належаў мітрапаліт Бэрлінскі Серафім (Лядэ). Беларускія дзеячы абвясьцілі сваіх епіскапаў за гэта здраднікамі і на мітынгах і ў сваіх газэтах заклікалі нас выйсьці са складу Рускай Замежнай Царквы. З гэтай нагоды епіскапы Беларускай Царквы пісалі пасланьні да сваёй паствы з тлумачэньнем прычынаў, якія прывялі іх да аб’яднаньня, але тое ня мела посьпеху. Адбыўся разрыў беларускіх вернікаў на эміграцыі са сваімі епіскапамі, што не наладзілася і ў далейшым. Невялікая група беларусаў польскай арыентацыі стварыла сваю царкоўную арганізацыю пад назвай “Беларуская аўтакефальная царква”[51], якую ўзначаліў украінскі епіскап Сяргей Охоценка[52], большасьць беларусаў пайшлі пад амафор Канстантынопальскага патрыярха і арганізавалі свае прыходы ў ЗША і ў Канадзе[53]. Беларускія епіскапы атрымалі прызначэньні на катэдры ў Рускай Зарубежнай Царкве ў розных краінах.

Мітрапаліт Анастасій, першаіерарх Рускай Зарубежнай Царквы і старшыня Архірэйскага Сыноду, склікаў Сабор епіскапаў ў Мюнхэне, які адбыўся 5 траўня 1946 года. У гэтым Саборы ўдзельнічалі беларускія і ўкраінскія аўтаномныя епіскапы, аб’яднаныя з герархамі Рускай Зарубежнай Царквы. Такім чынам, тры епіскапскія групы, незалежныя адна ад адной, аб’ядналіся ў складзе Рускай Зарубежнай Царквы. Гэтае аб’яднаньне мела на мэце больш пасьпяховае і доб-

рае духоўнае абслугоўваньне рускіх, украінцаў і беларусаў на эміграцыі. Украінскія аўтакефальныя епіскапы трымаліся самастойна і ў ніякія аб'яднаньні не ўваходзілі. Да іх далучыліся амаль усе ўкраінцы ў лягерах ДП, а пазьней і з розных краінаў, дзе яны пасяліліся.

У Рэгензбургу я стварыў беларускі прыход у Нямеччыне, але доўга служыць у ім мне не давялося. Маё месца настаяцеля заняў протаіерэй Мікалай Лапіцкі[54], які і прадоўжыў маю пастырскую працу. На сьвята Дабравесьця Прасьвятой Дзевы Марыі я служыў літургію ў царкоўнай супольнасьці ў Заўгаў на поўдні Баварыі і ўсклаў мітру на настаяцеля гэтай супольнасьці протаіерэя Ю. Альхоўскага, які належаў да Наваградзкай епархіі на радзіме. Потым я правёў Набажэнства ў горадзе Равенсбургу, дзе служыў сьвятаром протаіерэй М. Гарбацэвіч з катэдральнага сабора ў Наваградку. Адтуль мяне павезьлі ў вёску, дзе часова жыла група бежанцаў са Слоніма, якіх абслугоўваў протаіерэй А. Самойлавіч. Гэтыя тры царкоўныя супольнасьці былі маёй паствай з наваградзкай епархіі з радзімы. У сьвята Пяцідзесятніцы я служыў літургію ў горадзе Марбургу, дзе знаходзілася група студэнтаў з Наваградчыны, якія вывучалі мэдыцыну. У час літургіі яны сваім хорам сьпявалі на працягу ўсяго Набажэнства. Іх настаяцелем быў а. Барадаеў. Усюды мяне прымалі добра і з радасьцю. Я рады быў наведваць сваіх землякоў на чужыне і маліцца зь імі. Пазьней усе яны разьехаліся – хто ў Аўстралію, а большасьць у ЗША і Канаду.

## Разьдзел адзінаццаты

## Кіраўнік вікарыяцтва
## (1946 – 1950)

У верасьні 1946 года я атрымаў ад Сыноду прапанову заняць пасаду адміністратара, ці кіраўніка, Паўночна-Германскага вікарыяцтва з рэзыдэнцыяй у Гамбургу. Мяне зацікавіла гэтая прапанова, хоць у Тырсгайме мне жылося спакойна і добра. Стамляла тут толькі бязьдзейнасьць, а ў Гамбургу чакала жывая праца. Запрасіўшы да сябе ў сакратары В. П. Януцэвіча з нашай групы, я выехаў у Гамбург. У той час яшчэ ня быў наладжаны нармальны рух цягнікоў, складана было ў перапоўненых пасажырамі. Даводзілася гадзінамі стаяць на нагах, бо месцы для сядзеньня былі занятыя. Пасьля ўсялякіх цяжкасьцяў у дарозе ўночы прыбылі ў Гамбург. На начлег спыніліся ў бункеры пад вакзалам. Скразьнякі, холадна, хоць паліліся печкі. Спаць не выпадала ўсю ноч, не было і на чым. Даводзілася стаяць ці сядзець на цэмэнтавай падлозе. Гамбург і ўсё вікарыяцтва знаходзіліся ў Брытанскай акупацыйнай зоне[55], але ангельскіх салдатаў я нідзе ня бачыў. Кіравалі ўсім немцы пад наглядам ангельцаў.

Раніцою выправіліся пешшу ўздоўж чыгункі да так званага Архіпастырскага падворку па дадзеным мне адрасе. Ішлі каля гадзіны. Адшукалі гэты падворак зь цяжкасьцю. Было вельмі рана і ў доме ўсе яшчэ спалі. На званок у дзьверы выйшаў заспаны Віктар Віктаравіч і пусьціў нас у дом. Форма дома – доўгі барак і пасярэдзіне прыбудаваны другі паверх. У ім разьмяшчалася аранжарэя багатага гандляра-габрэя. Недалёка ў садзе – ягоная віла. Праз вуліцу – возера Альстэр-Зэ. Гэты раён быў заможны, тут знаходзіліся вілы розных гандляроў. З аднаго боку барака разьмясьцілася царква ў гонар вялебнага Пракопія Усьцюжскага Цудатворцы, пасярэдзіне – кухня і сталовая, а далей – маленькія пакоі для жыльля. Гэтае памяшканьне атрымаў ад ангельскіх ваенных уладаў архімандрыт Нафанаіл (Львоў), які і арганізаваў гэты падворак. Анастасій з мітрапалітам Серафімам высьвецілі яго ў епіскапа, але за ягоныя дрэнныя паводзіны перавялі Нафанаіла ў Мюнхэн, а адтуль у Парыж, дзе ён узначаліў Заходне-Еўрапейскую епархію Рускай Замежнай Царквы. Яго не было ў Гамбургу, калі я сюды прыехаў. У Гамбургу архімандрыт Нафанаіл кіраваў Паўночна-Германскім вікарыяцтвам.

Увайшоўшы у дом, я ўбачыў паўсюдны беспарадак і няскончаны рамонт. Апрача кухні, не было памяшканьня, каб адпачыць пасьля

доўгай і стамляльнай дарогі. Прытуліў нас у сябе протаіерэй Стэфан Ляшэўскі, які жыў непадалёку. У яго і спыніўся.

У Гамбургу існавала старая Сьвята-Мікалаеўская царква на трэцім паверсе Брацкага дома. У пакоі побач з гэтай царквой разьмяшчаліся два сьвятары Мікалай Чаркашын і Масіч, якія былі з казакамі і пазьбеглі прымусовай рэпатрыяцыі. Я ведаў іх, калі яны служылі сьвятарамі ў казакоў у Італіі. Мне прыемна было сустрэцца зь імі як з былымі сваімі сьвятарамі. Сьвята-Мікалаеўская і Сьвята-Пракопаўская цэрквы знаходзіліся побач, дзесьці з паўкілямэтра адна ад адной.

У бліжэйшую нядзелю я праводзіў Набажэнства ў Сьвята-Мікалаеўскай царкве, бо другая рамантавалася. Невялікая пакаёвая царква была запоўненая народам. Хораша сьпяваў царкоўны хор пад кіраўніцтвам дыякана Пятра Завадоўскага, які пазьней эміграваў у Бразылію. Як належыць, я сказаў павучаньне. У наступную нядзелю я служыў літургію ў вялікім лягеры ў Фішбэку, недалёка ад Гамбурга. Там пражывала каля дзьвюх тысяч праваслаўных бежанцаў з савецкіх тэрыторый Украіны, Беларусі і часткі Расеі, якія былі акупаваныя нямецкімі войскамі падчас вайны. У гэтым лягеры настаяцелем царквы быў ігумен Віталій (Усьцінаў), пазьней епіскап-вікарый у Бразыліі, а потым у Канадзе – кіраўнік епархіі. Яму дапамагалі два сьвятары Мікалай Усьпенскі і Сяргей Шчукін.

На суседняй віле з падворкам разьмяшчаўся так званы Гамбурскі Камітэт, які складаўся з рускіх салідарыстаў і займаўся рэгістрацыяй рускіх бежанцаў, якія мелі намер перасяліцца ў Марока, Аргентыну, Францыю ды іншыя краіны. За сваю працу сябры камітэту атрымоўвалі плату ад рэгістраваных асобаў. На гэта яны жылі досыць добра. Супрацоўнікам камітэту і ягоным старшынёй быў епіскап Нафанаіл. За яго ўсе стаялі гарою і спадзяваліся на яго хуткае вяртаньне. Да мяне яны ставіліся ня толькі абыякава, але і варожа, бо сваім епіскапам лічылі Нафанаіла. У такім духу яны праводзілі агітацыю ў Гамбургу, у Фішбэку ды ў іншых лягерах. Гэтае становішча мне не падабалася, таму я вырашыў адмовіцца і паехаў у Мюнхэн да мітрапаліта Анастасія.

Мітрапаліт маёй адмовы не прыняў і ўгаварыў вярнуцца ў Гамбург, каб кіраваць прыходам і ў гамбурскай акрузе. Нічога не заставалася, як пагадзіцца. Не слухацца я ня меў права. У Тырсгайме мне было добра, але служба – не дружба, трэба быць там, куды пасылае начальства. Заехаўшы на некалькі дзён у Тырсгайм, забраўшы свае неабходныя рэчы і папрасіўшы не выкрэсьліваць мяне са сьпісу жыхароў, я паехаў напрыканцы лістапада ў Гамбург.

Памяшканьні на падворку так і не рамантаваліся. Справы рамонту вёў інжынэр-архітэктар фон Клот, прыхільнік епіскапа Нафанаіла.

Хтосьці яму даў распараджэньне спыніць рамонт спэцыяльна насуперак мне. Здагадаўшыся, у чым справа, я наняў рабочых-немцаў і загадаў рабіць рамонт так, каб закончыць яго ў бліжэйшы час. Убачыўшы мае рашучыя дзеяньні, спадар Клот зьявіўся і пачаў кіраваць працамі. Рамонт быў завершаны. Я пасяліўся ў пакоі падворку на другім паверсе і пачаў рэгулярна весьці Набажэнствы ў Сьв.-Пракопаўскай царкве. Сьв.-Мікалаеўскую царкву я прызначыў для службаў на нямецкай мове для праваслаўных немцаў і грэкаў. Грэкі не наведвалі Набажэнствы, а немцы прыходзілі. Арганізаваўся нямецкі хор пад кіраўніцтвам рускага Якімца, знайшоўся дыякан-немец і я адшукаў студэнта-мэдыка Бакгаўза, які разам з жонкай прыняў праваслаўную веру, пазьней яго падрыхтаваў і высьвеціў у сан дыякана і сьвятара. Яны і праводзілі Набажэнствы па-нямецку раз на месяц для немцаў. Прот. А. Бакгаўз, добры доктар, праводзіць Набажэнствы і да сёньня. Нядаўна ён наведаў мяне ў Буэнас-Айрэсе.

У Гамбургу я меў свой аўтамабіль маркі “Мэрсэдэс-Бэнц” і свайго шафёра. Гэтая акалічнасьць дапамагала мне часьцей наведваць усе лягеры і гарады, дзе жылі праваслаўныя рускія бежанцы ДП і дзе меліся свае цэрквы зь сьвятарамі. Такіх царкоўных супольнасьцяў і сьвятароў было пад маім кіраўніцтвам 25. Усе гэтыя пункты я наведваў пераважна ў прастольныя царкоўныя сьвяты і іншым разам з асаблівай нагоды. Прымалі мяне радасна і ўрачыста. Паўсюль у храмах сьпявалі выдатныя царкоўныя хоры з дасьведчанымі ў сваёй справе рэгентамі. Сьвятары ўсе мелі багаслоўскую адукацыю і пастырскі стан. Я паважаў іх і цаніў, адзначаў іх заслугі герэйскімі ўзнагародамі. Кантакт зь імі ў мяне завязаўся шчыльны. Яны зьярталіся да мяне ва ўсіх сваіх патрэбах і атрымлівалі маю дапамогу. Многія зь іх мелі свае праблемы, у вырашэньні якіх мне даводзілася ім дапамагаць. Пастырская дысцыпліна падтрымлівалася і парушэньняў не было.

З такім духавенствам пры спрыяльных умовах я свабодна разьвіваў сваю архіпастырскую дзейнасьць. Першымі маімі крокамі была арганізацыя для духавенства пастырскіх нарад і размоў. Гэта я рабіў двойчы на год. У Гамбургу я ня меў належнага памяшканьня для такіх сходаў, таму атрымаў дазвол зьбіраць сваё духавенства ў замку Імсгаўзэн у правінцыі. Там разьмяшчаўся лютэранскі рэлігійны цэнтар бежанцаў з Усходняй Прусіі. Дырэкцыя іхняга цэнтру давала мне сваё памяшканьне. Мы мелі там бясплатнае харчаваньне за кошт дабрачынных арганізацый дапамогі бежанцам і кватэру для сьвятароў, у замку кожнаму выдзелілі асобныя пакоі з усімі выгодамі. Нашы сходы доўжыліся пяць дзён. У суботу сьвятары вярталіся ў свае прыходы. На працягу дня прафэсары чыталі курсы па розных багаслоўскіх

прадметах: маральнае багаслоўе – прафэсар І. Шумілін, Сьвятое Пісьмо – прафэсар Шміт, царкоўны статут і пастырскае багаслоўе – епіскап Афанасій, філязофію – прафэсар Андрэеўскі. Вольнага часу не было. Але гэтыя лекцыі павышалі рэлігійны і асьветны ўзровень нашых сьвятароў. Усе яны, калісьці і чамусьці неяк вучыліся, але забыліся, а іншыя і зусім не вывучалі многіх з названых прадметаў. Мая мэта заключалася ў тым, каб натхніць пастыраў чым-небудзь і разьвіць у іх пачуцьцё самаадданасьці ў пастырскім служэньні Царкве і народу. Ніхто з архірэяў ў Нямеччыне нічога такога не рабіў. Адзін я рупліва працаваў на карысьць іншых.

Другі раз на год я склікаў духавенства ў Вялікі пост для пастырскага гавеньня. Больш спрыяльныя ўмовы для гэтага былі ў лягеры Фішбэк каля Гамбурга. Пастырскае гавеньне доўжылася тры дні і завяршалася саборным служэньнем першаасьвечанай літургіі ў сераду. Суправаджалася гавеньне штодзённымі вялікапоснымі службамі ўранку і ўвечары, а таксама пастырскімі размовамі пра споведзь і іншыя таемствы Царквы. Абмяркоўваліся мэтады, як найлепш праводзіць споведзь, каб яна дасягала сваёй мэты. Шмат часу аддавалася таксама на абмеркаваньне пытаньня падрыхтоўкі да прыняцьця Сьвятых Таемстваў Хрыстовых. Думаю, што такія гутаркі былі неабходныя для пастырскай і духоўнай дзейнасьці ў прыходах. З пункту гледжаньня духоўнай настроенасьці і пастырскай самаадданасьці ня ўсе сьвятары былі на вышыні. Такіх выправіць нялёгка.

Не забываўся я на моладзь. З дапамогай прадстаўніка Сусьветнай Рады Цэркваў[56] містэра Патэрсана Моргана я зьбіраў гэтую моладзь з лягераў у адным з цэнтраў УМКА для духоўнай гутаркі. Такія зьезды моладзі доўжыліся пяць дзён. На маё запрашэньне чыталі лекцыі прафэсар Андрэеўскі, протаіерэй Ёванавіч і іншыя. Мэта гэтых нашых зьездаў – жаданьне пазнаёміць моладзь з догматамі Праваслаўнай веры і з вучэньнем Царквы. На зьездах зьбіралася столькі моладзі, колькі магло зьмясьціцца ў памяшканьні УМКА. Тут выдавалася ня толькі ежа, але і можна было пераначаваць.

Па маім хадайніцтве згаданы Патэрсан Морган ад імя Сусьветнай Рады Цэркваў забясьпечваў нашых праваслаўных бежанцаў у лягерах розным адзеньнем (касьцюмамі, бялізнай і г. д.). Разьмяркоўвалі гэтыя рэчы сярод прыхаджанаў настаяцелі цэркваў з прызначаным імі камітэтам вернікаў. Адзеньне атрымлівалі ўсе, але ня ўсе мелі ў ім патрэбу. Некаторыя гэтыя рэчы прадавалі немцам ці мянялі на прадукты. Былі не задаволеныя камітэцкім разьмеркаваньнем рэчаў, але іх нараканьні былі беспадстаўныя.

Да мяне, як да епіскапа, зьвярталіся сэрбскія сьвятары па дапамогу ў розных сваіх пастырскіх патрэбах. Галоўным чынам, я забясь-

печваў іх сьв. мірам. Свайго епіскапа ў Нямеччыне яны ня мелі, а падпарадкоўваліся епіскапу Дыянісію, які жыў ў ЗША і ў Нямеччыну не прыяжджаў. Гэты епіскап, даведаўшыся, што сэрбскія сьвятары зьвяртаюцца да мяне з рознымі просьбамі, выдаў строгую забарону гэта рабіць, матывуючы тым, што рускія епіскапы імкнуцца русыфікаваць сэрбаў. Сэрбскія сьвятары аднесьліся да такога загаду епіскапа Дыянісія досыць скептычна і пастанавілі на сваім сходзе прынесьці мне прабачэньні за паводзіны свайго епіскапа. І надалей яны падтрымлівалі са мною сяброўскія стасункі, запрашалі наведаць іх лягер і правесьці ў іхніх храмах Набажэнствы. Я ахвотна езьдзіў да іх і маліўся ў іх храмах. Усім сваім лягерам яны сустракалі мяне ўрачыста, з прамовамі і пачастункамі па іхняму звычаю. Шмат хто зь іх пазьней выехаў у Аўстралію, туды і я быў прызначаны з Германіі. Там я зноў сустракаўся зь імі.

Паведамілі мне ў 1948 годзе, што ў канцэнтрацыйным лягеры ў Мюнстэры знаходзяцца дзьве тысячы сэрбскіх вайскоўцаў з партыі Лёціча, прывезеныя з Італіі. Ангельскія ўлады зьбіраліся іх перадаць камуністу і дыктатару Югаславіі Ціта[57], дзе іх чакаў суд і расправа як над ворагамі. Зь цяжкасьцю я атрымаў дазвол ангельскіх ваенных уладаў у Нямеччыне, каб адведаць зьняволеных. Гэта было на пачатку жніўня. З пэўнымі ўмовамі дазвол мне далі. Нанёс візыт спачатку камэнданту гэтага лягера – ангельскаму палкоўніку, сымпатычнаму і прыветліваму чалавеку ў сталым веку. Я прыехаў на сваім аўтамабілі з шафёрам і сакратаром у якасьці перакладчыка. Палкоўнік сустрэў мяне гасьцінна, пачаставаў кавай, а потым пасадзіў мяне і перакладчыка ў свой аўтамабіль і павёз у лягер, які быў абгароджаны высокай сьцяной з калючага дроту ў два рады і вакол якога хадзілі ангельскія патрулі. Каля лягернай брамы ў палкоўніка запыталіся пароль і запатрабавалі паказаць асабістыя дакумэнты. Пасьля гэтага патруль адваліў ад брамы цяжкія мяшкі зь пяском і ўпусьціў нас, зачыніўшы яе за намі. Мне стала ніякавата: упершыню ў сваім жыцьці я апынуўся за калючым дротам. Зайшлі ў канцылярыю, дзе былі свае начальнікі. Я папрасіў склікаць усіх праваслаўных у капліцу на кароткае Набажэнства. Камэндант прасіў мяне не закранаць палітыкі а ні ў казаньні, а ні ў размовах. Я паабяцаў. На Набажэнства прыйшлі чалавек 50 зьняволеных. Адслужыўшы малебен, я сказаў ім кароткае слова, заклікаючы верыць у сілу Божую і маліцца пра вызваленьне зь няволі. Пасьля Набажэнства мяне зноў запрасілі ў канцылярыю, дзе ўжо былі сэрбскі протаіерэй Н. Простран і брат Лёціча, яны папрасілі мяне прыслаць ім антымінс і сьвяшчэнны посуд для правядзеньня літургіі на сьвята Усьпеньня Божай Маці, якое прыпадала на 15 (28) жніўня, бо яны хацелі ўсе прычасьціцца перад сьмерцю: іх у

хуткім часе зьбіраліся выдаць Ціта. На зваротным шляху з лягера я прасіў палкоўніка выратаваць іх ад выдачы камуністам на сьмерць. Ён абяцаў зрабіць што зможа.

Праз год пасьля гэтага зайшлі да мяне ў Гамбургу два сэрбы – былыя вязьні з лягера ў Мюнстэры, дзякавалі мне за той візыт і расказалі, што яны выкапалі падземны ход пад калючым дротам і па адным уцяклі праз выкапаны праход на волю. Ангельцы іх не шукалі. Цяпер яны ад'яжджаюць у ЗША на пастаяннае жыхарства. Я тады зразумеў, што ўцёкі адбыліся зь ведама палкоўніка, які хацеў гэткім чынам іх вызваліць. Магчыма, нават ідэю камусьці падказаў, але сам на гэта заплюшчыў вочы.

У Брытанскай зоне Нямеччыны я лічыўся афіцыйнай асобай Праваслаўнай Царквы. Мой подпіс прызнавалі ва ўсіх ангельскіх і нямецкіх установах. З 1948 года я атрымліваў месячны заробак зь нямецкай казны як епіскап. Гарадзкія ўлады магістрата запрашалі мяне на ўрачыстыя прыёмы царкоўных гасьцей з-за мяжы, як, напрыклад, Кентэрбэрыйскага архіепіскапа. Гэтыя ж ўлады выдалі мне пасьведчаньне, што я зьяўляюся грамадзянінам горада Гамбурга, які па даўняй традыцыі лічыўся вольным горадам – Ганзэнскім гарадам. Улады ставіліся да мяне прыхільна. Я тады добра размаўляў па-нямецку і ня меў патрэбы ў перакладчыку. Але ў выключных выпадках браў з сабою свайго перакладчыка Н. С. Бунякоўскага ці С. С. Іванова.

Галоўная кватэра ІРА[58] запрапанавала мне прызначыць прадстаўніка ад рускіх для пастаяннай сувязі з гэтай бежанскай арганізацыяй. Я зрабіў памылку, што запрасіў Гамбурскі камітэт на нараду па гэтым пытаньні. Яго члены сарвалі вырашэньне праблемы сваімі інтрыгамі супраць мяне, асабліва ягоны старшыня. У выніку я адмовіўся ад прапанаванай мне місіі прызначэньня прадстаўніка ад рускіх-бежанцаў пры Галоўнай кватэры ІРА, яго так і не прызначылі. Іншыя нацыянальнасьці мелі сваіх прадстаўнікоў. Гамбурскі камітэт спрабаваў устанавіць сваю дыктатуру ў рускіх справах і нікога іншага не дапускаў. Аднак улады не прызнавалі гэтага камітэту. Ён існаваў і дзейнічаў самастойна як салідарысцкая арганізацыя. Вялікай папулярнасьці сярод рускіх ДП ён таксама ня меў: не прымалі яго дыктатуры.

## Разьдзел дванаццаты

# На епіскапстве ў Аўстраліі (1950 — 1953)

Бежанцы ДП з Нямеччыны і Аўстрыі, а таксама з іншых краінаў Заходняй Эўропы, дзе яны часова жылі пачынаючы з 1948 года, масава перасяляліся ў заморскі край: Аўстралію, Аргентыну, Бразылію, Парагвай, Вэнэсуэлу, ЗША, Канаду і Марока. У свае родныя мясьціны пад камуністычнай уладай ніхто не жадаў вяртацца – баяліся рэжыму і турмы. Заходняя Эўропа, асабліва Заходняя Германія, хутка вызвалялася ад бежанцаў з Усходу. Лягеры масава зачыняліся, ліквідаваліся з прычыны адсутнасьці насельнікаў. Памяншалася колькасьць прыхаджанаў і ў Гамбургу. Дзякуючы амэрыканскаму камандаваньню, на маю просьбу, пераправілі аэраплянам з Бэрліна да мяне ў Гамбург сям'ю майго старога прыяцеля протаіерэя П. Закідальскага, якому пагражала высылка на радзіму. Ён прасіў мяне дапамагчы яму зь сям'ёй перасяліцца ў Гамбург.

Выпісваючы сабе ў дапамогу протаіерэя Закідальскага, я меў на ўвазе, што ён зойме маё месца ў Гамбургу як настаяцель прыходу. Маё становішча ў Германіі зрабілася няпэўным, бо мяне запрашалі двойчы ў Паўночную Амэрыку на епіскапства. Архірэйскі Сынод маўчаў адносна мяне, а я не жадаў пераходзіць у Паўночна-Амэрыканскую Мітраполію, дзе мне прапаноўвалі епіскапскую катэдру. Але на пачатку 1950 года прыйшла, нарэшце, чарга за мною. Мітрапаліт Анастасій, старшыня Архірэйскага Сыноду, пісьмова прапанаваў мне месца вікарнага епіскапа ў Аўстраліі, дзе ўжо кіраўніком Аўстралійскай епархіі быў епіскап Феадор, прызначаны туды яшчэ ў 1948 годзе. З ім я быў даўно добра знаёмы, яшчэ з акадэмічных студэнцкіх гадоў у Варшаве, а потым шматразова сустракаўся ў Мюнхэне, дзе ён жыў прыватна, як просты бежанец. У сан епіскапа ён быў высьвечаны на роднай яму Валыні ў 1942 годзе і належаў да Ўкраінскай аўтаномнай Царквы[59]. Адтуль ён выехаў у бежанства і пасяліўся ў Мюнхэне, ператрываўшы розныя бежанскія нягоды. Знаходзячыся ў Аўстраліі і жывучы ў Сіднэі, ён пісаў мне лісты зрэдчас. Аднойчы ён напісаў мне ліст з просьбай прыбыць у Аўстралію яму ў дапамогу. А мітрапаліту Анастасію напісаў прапанову прызначыць мяне кіраўніком Аўстралійскай епархіі, а яго прызначыць вікарыем. Мітрапаліт на гэта не пагадзіўся і вырашыў мяне паслаць яму ў дапамогу. Таму і запрасіў маёй згоды. Усьведамляючы, што Сынод кудысьці

пашле мяне з Германіі, я аддаў перавагу ехаць, ці плыць, у далёкую і невядомую мне Аўстралію. Мяне прываблівалі старое знаёмства і сяброўства з епіскапам Феадорам (Рафальскім), былым протаіерэем да епіскапства, як я яго з таго часу ведаў.

На падставе маёй згоды на епіскапскую катэдру ў Аўстралію епіскап Феадор зьвярнуўся з просьбай у міністэрства іміграцыі ўключыць мяне ў сьпіс імігрантаў у Аўстралію. Міністэрства пагадзілася і дало распараджэньне сваім чыноўнікам у Германіі ўключыць мяне ў сьпісы. ІРА ў Германіі паведаміла мне пра гэта, выклікаўшы на мэдыцынскую камісію. Адначасова я атрымаў запрашэньне ад містэра Патэрсана Моргана правесьці месячны адпачынак у горадзе Лакарна (Швэйцарыя) у доме Сусьветнай Рады Цэркваў. Я прыняў гэтае запрашэньне і напрыканцы лютага туды паехаў. Там было добра: выдатныя ўмовы ў доме, мэдыцынская дапамога, прыемная адукаваная грамада прафэсараў і здаровы горны клімат. Горад разьмешчаны на беразе вялікага возера – Ляка Маджора. Пачыналася вясна, расьцьвіталі дрэвы мімозы і паўсюль было шмат кветак. Штодзённа я гуляў па бульварах, засаджаных дрэвамі і кветкамі. Калі-нікалі гуляў па прысадах у гарах. Я захапляўся цёплым кліматам пасьля халоднай і сьнежнай зімы ў Гамбургу.

Перад ад'ездам у Лакарна я напісаў мітрапаліту Анастасію ў Мюнхэн ліст, паведамляючы пра сваю паездку. І зрабіў кепска, бо сам сабе пашкодзіў. Мітрапаліт адказаў мне, што адпачываць я буду на параходзе, шляхам у Аўстралію, і загадаў паскорыць ад'езд з Швэйцарыі назад у Гамбург для падрыхтоўкі да адплыцьця. Я пайшоў да доктара. Агледзеўшы мяне, ён катэгарычна раіў застацца яшчэ на месяц у Лакарна. Аднак, каб не аслухацца мітрапаліта, неўзабаве я зьехаў адтуль, не дачакаўшыся канца прызначанага тэрміну.

Па дарозе назад вырашыў я наведаць Жэнэву. Праяжджаў цягніком па цясьнінах высокіх Альпаў, цераз доўгія тунэлі і з шматлікімі прыпынкамі на станцыях у гарах. Маляўнічыя краявіды. На італьянскім баку на станцыях заходзілі ў вагон жабракі прасіць міласьціны, грошай. Убогі яны мелі выгляд. У Лазане была перасадка на мясцовы электрычны поезд. У вагоне гучала француская мова. З увагай я ўслухоўваўся ў размовы пасажыраў, стараўся зразумець іх маўленьне. Францускую мову я ведаў, але за шмат гадоў бяз практыкі яе забыўся, а цяпер успамінаў, услухоўваючыся ў чужое маўленьне.

З Лакарна я паведаміў настаяцелю рускай царквы ў Жэнэве пра свой прыезд, але на вакзале ніхто мяне не сустрэў. Дзякуючы сваёй францускай мове я ўдала даехаў да царквы. Дапамог мне ў гэтым кандуктар трамвая. Настаяцель, архімандрыт Лявонцій, сказаў мне, што не атрымаў майго ліста. Ён уладкаваў мяне ў бліжэйшым гатэлі, а на

абеды я хадзіў да яго. Быў першы тыдзень Вялікага посту і прытрымліваліся строгага посту. Харчаваліся галоўным чынам бульбай у мундзірах з сольлю. У доме настаяцеля гасьцявалі: ягоны брат архімандрыт Антоній, цяпер архіепіскап Жэнэўскі і Заходнеэўрапейскі, ягоны родны бацька, архімандрыт Іоў, настаяцель манастыра ў Мюнхэне, як цывільны – палкоўнік, епіскап Нафанаіл і яшчэ нехта. Вялікая грамада. Размовы за сталом вяліся пераважна на палітычныя тэмы, пра Расею, пра тое, што няма ўкраінцаў, і іншыя шавіністычныя гутаркі. Мне не падабаліся гэтыя прамовы. Стараўся больш не заходзіць. Хадзіў па горадзе, наведаў унівэрсытэт і музэі. Даўні горад, але без асаблівых славутасьцяў. Затое Жэнэўскае возера – аздоба горада. Вакол яго разьмешчаны шыкоўныя вілы і гатэлі. З епіскапам Нафанаілам і архімандрытам Лявонціем я наведаў грэцкага мітрапаліта Фіятырскага Германаса. Ён распавядаў пра сваю паездку ў Маскву на ўрачыстасьці аўтакефаліі Рускай Царквы. Хтосьці з нас запытаўся, як ён лічыць, ці законная герархія ў Маскве. Грэк падумаў і сказаў: “Кананічна законна, але па сумленьні складана прызнаць”. Спыніўся ён у гатэлі на беразе возера. Апрануты – у цывільным.

У Жэнэве я прабыў тры дні і зьехаў у Мюнхэн. Да мяне далучыўся архімандрыт Іоў, які вяртаўся ў свой манастыр. У дарозе агіналі вялікае Бодэнскае возера. Ён распавядаў мне, як правозіў удала розныя тавары з Жэнэвы ў Мюнхэн без кантролю, і лічыў гэта цудам. Злосьліва і аднабакова нападаў на мітрапаліта Варшаўскага Дыянісія. Я спрабаваў растлумачыць яму ягонае няправільнае меркаваньне. Беспасьпяхова, тады я пайшоў у іншае купэ. Ён застаўся на самоце, але перад прыбыцьцём у Мюнхэн прымірыўся са мною. Мы разьвіталіся з ім па-братэрску. Стварылася ў мяне ўражаньне непрыхільнае, тыповае для старога эмігранта з 1-й вайны з ягонымі мэнтальнасьцю і патрыятызмам. Для новага пакаленьня ён не падыходзіў. Расказвалі пра яго, што ў сваім манастыры, калі заўважаў, што на клірасе размаўляюць, ён падыходзіў і камандаваў: “У шэрагу не размаўляць!”

У Мюнхэне разьвітаўся з сваімі ўладыкамі: мітрапалітамі Панцеляймонам (Ражноўскім) і Анастасіем, а таксама Серафімам Бэрлінскім і Германскім, які выказаў шкадаваньне, што я пакідаю Нямеччыну. Разьвітаўся таксама і з іншымі ўладыкамі і знаёмцамі. Усьведамляў, што ў жыцьці больш ня ўбачуся з імі. Мітрапаліты Панцеляймон і Серафім неўзабаве памерлі ў Мюнхэне і там пахаваныя. Мітрапаліт Панцеляймон удзельнічаў у маёй хіратаніі ў епіскапства ў Мінску на пачатку сакавіка 1942 года, а мітрапаліт Серафім ставіўся да мяне вельмі добра і дапамагаў, калі быў у Варшаве ў 1940 годзе.

У Мюнхэне мне перадалі Сынадальны указ аб прызначэньні мяне на новаадчыненую катэдру вікарнага епіскапа ў горадзе Мэльбур-

не з тытулам “епіскап Мэльбурнскі”. Туды я і накіраваўся, не ведаўшы будучыні. Але на месцы ўжо высьветлілася, што маё епіскапства ў Мэльбурне было толькі пераходным этапам на паперы. Пачалася гульня Сыноду і епіскапа Феадора са мной, як з мячыкам футбалістаў.

Пасьля вяртаньня ў Гамбург з Швэйцарыі я прадаў аўтамабіль за бясцэнак. Прызначыў а. Закідальскага сваім намесьнікам, якога зацьвердзіў мітрапаліт Серафім. Сам я паехаў у лягер на мэдыцынскую камісію ў г. Мюнстэр. Там прабыў каля двух тыдняў. У камісіі рэнтгенаўскія здымкі выявілі старыя рубцы былога тубэркулёзу лёгкіх. Рускі доктар з гэтай камісіі дапамог мне тым, што аўстралійскаму доктару падставіў здымак лёгкіх здаровага чалавека пад маім імем. Мяне прапусьцілі ў Аўстралію. Гэты доктар ужо шмат гадоў жыве ў Сан-Паўла (Бразылія) і карыстаецца вялікай папулярнасьцю ня толькі сярод рускіх, але і сярод бразыльцаў.

Перад ад’ездам у Аўстралію я вырашыў наведаць свайго дваюраднага брата Міхаіла Мартаса, які жыў у Лёндане (Англія) і якога я ня бачыў шмат гадоў. Мы разам з ім правялі нашае юнацтва. Ён служыў у польскай арміі шмат гадоў і падчас польска-нямецкай вайны ў верасьні 1939 года эвакуяваўся разам з палякамі праз Румынію і Францыю ў Англію. Служыў у арміі генэрала Андэрса[60]. Ажаніўся з англічанкай і меў свой дом. Зьліставаўшыся з ім, на аэрапляне я выправіўся ў Лёндан ў назначаны дзень. Быў моцны вецер, і наш аэраплян падымаўся ў паветра з хістаньнем. Але наверсе было ціха і сонечна. На аэрадроме сустрэлі мяне архіепіскап Сава Саветаў, епіскап з Польшчы, і архімандрыт Віталій, настаяцель рускага прыходу ў Лёндане. Архіепіскап Сава меў чын польскага генэрала па сваёй пасадзе вайсковага епіскапа. Архіепіскап запрасіў мяне ў госьці і на начлег. Архімандрыт Віталій на сваім аўтамабілі адвёз да сябе ў царкоўны дом і пачаставаў абедам. Тамсама я сустрэў свайго пляменьніка Аляксандра. На наступны дзень я гасьцяваў у брата. Архіепіскап Сава папрасіў мяне наведаць ягоную царкву і адслужыць акафіст. Ягонымі прыхаджанамі былі беларусы з арміі Андэрса. Да іх я зьвярнуўся з словам павучаньня.

Архіепіскап Сава і архімандрыт Віталій вазілі мяне і паказвалі горад, каралеўскі палац, парлямэнт, палац архіепіскапа Кентэрбэрыйскага і шмат іншых славутасьцяў. Усё гэта мне было цікава. На зваротным шляху я крыху прыхварэў, але пасьпяхова вярнуўся ў Гамбург.

Неўзабаве мяне выклікалі ў транзытны лягер у Дэльмэнгорст каля Брэмэна. Разьвітаўшыся з прыхаджанамі, з а. Закідальскім і ўзяўшы свае неабходныя рэчы, я паехаў у Дэльмэнгорст. Там пратрымалі мяне амаль месяц. Была нейкая інтрыга супраць мяне: хтосьці жадаў перашкодзіць мне з ад’ездам у Аўстралію. Быў адзін такі ў гэтым ля-

геры. Мяне вазілі з транспартам у лягер Аўрых каля мяжы з Даніяй, а адтуль зноў у Дэльмэнгорст. Мне дапамог Іван Яўсеенка, былы рэгент у Фішбэку, які выпраўляўся да сваіх бацькоў у Мэльбурн. Ён папрасіў аўстралійскага начальніка транспарту ўключыць мяне ў якасьці параходнага капэляна для праваслаўных. Той і зрабіў. Дзякуючы гэтаму 17 чэрвеня на параходзе “Скаўгум” я адплыў у Аўстралію. На нашым параходзе знаходзіліся дзьве тысячы пасажыраў-эмігрантаў.

Пасьля 25-дзённага падарожжа прыплылі ў заходнюю Аўстралію, у порт Фрымантл каля горада Пэрт. Дзённы прыпынак мелі толькі ў Порт-Саідзе. Пасажыры, убачыўшы здалёк аўстралійскія берагі, моцна ўзрадаваліся і масава выйшлі на палубу паглядзець на іх. Штосьці думаў кожны. На прыстані каля парахода сустрэў мяне а. гераманах Афанасій Магілёў, якога я ведаў па лягеры Фішбэк. Ён выпрасіў для мяне ў адміністрацыі транзытнага лягера легкавы аўтамабіль з шафёрам, на ім ён і адвёз мяне ў гэты лягер, названы Нордзэм, былы амэрыканскі вайсковы лягер. Мне далі асобны пакой у бараку і дазволілі сталавацца разам з адміністрацыяй. Такім чынам мяне ўважылі.

У лягеры пратрымалі мяне нядоўга. Адтуль я езьдзіў праводзіць Набажэнствы ў г. Пэрт і служыў з а. Афанасіем у лягеры Нордзэм. Усе прыбылыя ДП, якіх назвалі “новыя аўстралійцы”, праходзілі мэдыцынскую камісію. Тут прычапіліся да маіх лёгкіх і хацелі вярнуць мяне ў Нямеччыну. Параілі мне зьвярнуцца да галоўнага доктара камісіі. Я растлумачыў яму мэту свайго прыезду, і ён ахвотна пагадзіўся адпусьціць мяне з лягера ў Сіднэй. Па паходжаньні ён быў аўстрыйскі габрэй з Вены. З ім я гаварыў па-нямецку. Пасьля камісіі я атрымаў свае рэчы і білет на чыгунку і паехаў з лягера. Цягнік імчаўся тры дні цераз неаглядную пустыню. Вагоны былі спальныя, для чатырох пасажыраў. У нашым купэ ехалі тры “новыя аўстралійцы” і адзін “стары аўстраліец”, які бесьперапынна піў піва і нас частаваў. У Адэлаідзе параселі на іншы цягнік да Мэльбурна. Я разьвітаўся з сваімі спадарожнікамі. На вакзале сустрэў мяне сьвятар І. Зуземіль, знаёмец з Бэрліна і Якаўлевы, якія забралі мяне да сябе ў дом.

## Епіскап Брысбэнскі

У Аўстралію прызначылі мяне на катэдру епіскапа Мэльбурнскага, але, пакуль я знаходзіўся ў марскім плаваньні на шляху ў Аўстралію, мяне перавялі на катэдру епіскапа Брысбэнскага. Пра гэта я даведаўся ад епіскапа Феадора, якога ўжо ўзьвялі ў сан архіепіскапа. У Мэльбурне я затрымаўся толькі праездам на некалькі дзён і правёў там Набажэнства ў англіканскім храме. У Мэльбурн толькі прыяжджалі на пасяленьне рускія, украінцы і беларусы з Германіі, але яшчэ не ўладкаваліся, таму не было і сваёй царквы. Усе здымалі сабе

кватэры дзе-небудзь на ўскраінах горада. Пазьней, калі ўладкаваліся і разбагацелі, купілі ўчасткі і пабудавалі свае дамкі, невялікія, але з усімі выгодамі. Так было і ў Сіднэі, і ў Брысбэне, і ў Адэлаідзе, і ў іншых гарадах. У Сіднэі і ў Брысбэне жылі старажылы, рускія эмігранты з Сыбіры і цэнтральнай Расеі. Яны абжыліся за шмат гадоў, мелі свае дамы і пабудавалі цэрквы: у Сіднэі – Сьв.-Уладзімірскую, а ў Брысбэне – Сьв.-Мікалаеўскую. У гэтых двух гарадах служылі ў цэрквах старыя сьвятары: у Брысбэне – протаіерэй Валянцін Антоньеў, былы палкавы сьвятар у Сыбіры, у Сіднэі – архімандрыт Феадор (Будашкін), стары манах з манастыра Казанскай епархіі з чарамісаў. З гэтымі сьвятарамі ня ладзіў уладыка Феадор: ён скардзіўся на іх, а яны на яго. Гэта і зрабілася падставай прасіць Сынод прызначыць мяне ў Аўстралію. Ён палохаў іх маёй асобай, што я строгі і патрабавальны архірэй. Сам уладыка Феадор служыў і жыў па чарзе то ў Сіднэі, то ў Брысбэне, дзе ў абодвух гарадах былі кватэры пры храмах.

Архіепіскап Феадор сустрэў мяне радасна, хваліў і знаёміў з прыхаджанамі. Мы служылі з ім літургію ў Сьв.-Уладзімірскім храме. На наступным тыдні ён павёз мяне ў сталіцу Аўстраліі – Канбэру – для прадстаўленьня міністру іміграцыі Холту. У Аўстраліі ўрад не цікавіцца Царквой і яе жыцьцём – паводле прынцыпу: Царква аддзеленая ад дзяржавы, – таму мой і архіепіскапа візыт да міністра ня быў патрэбны, але ўладыка жадаў яго зрабіць. Міністар прыняў ветліва і нешта пытаўся. Уладыка дзякаваў яму за дапамогу ў справе майго прыезду ў Аўстралію. Перакладчыцай была мясцовая жыхарка Гунчанка. Яна ж пасьля прыёму ў міністра забрала нас у свой дом і пачаставала абедам. Там я захварэў на моцны прыпадак мігрэні і ня мог прысутнічаць за сталом. Гэтая хвароба адбылася ўпершыню і больш не паўтаралася. Прычыны таму я не знайшоў, але толькі мы селі ў цягнік, хвароба мая супакоілася.

Праз нейкі час прабываньня ў Сіднэі архіепіскап Феадор павёз мяне цягнікам у Брысбэн як епіскапа Брысбэнскага, але трымаў у сакрэце, баючыся, што ў Брысбэне мяне могуць не прыняць. Падставаў у яго, вядома, не было для гэтага. Ён думаў, што, калі да яго ставіліся недружалюбна прыхаджане там, то і да мяне таксама паставяцца. Але ад мяне гэта ён хаваў.

На вакзале ў Брысбэне сустрэў нас настаяцель протаіерэй Антоньеў. Я быў новы чалавек, а ўладыка Феадор ужо лічыўся там сваім і звыклым. Прыехалі ў царкоўны дом, вялікі і добра абстаўлены, які стаяў побач з царквой ў двары. Была субота, а ўвечары служылі ўсяночную. Храм напоўніўся прыхаджанамі. Цікавіліся, які новы архірэй прыехаў. Пасьля Набажэнства ўсе падыходзілі да мяне па блаславеньне. Архіепіскап заставаўся нібы ўбаку. На наступны дзень, у

нядзелю, служылі літургію, а пасьля яе зрабіла чай сястрыцтва для архірэяў і прыхаджанаў. Вялікая заля была застаўленая сталамі, і сядзела грамада. Падчас чаю праз прамову з нагоды майго прыезду адбыўся канфлікт паміж а. Антоньевым і архіепіскапам. Грамада гэта заўважыла і заняла пазыцыю на абарону а. Антоньева. Гучна ніхто нічога не казаў, але пазьней я даведаўся пра гэта. Мне тэлефанавалі і прасілі перадаць архіепіскапу, каб папрасіў прабачэньня публічна перад а. Антоньевым. Я, вядома, не перадаваў гэтай просьбы. Архіепіскап прабыў некалькі дзён і паехаў у Сіднэй.

Пазнаёміўшыся з Брысбэнскай царкоўнай абстаноўкай, я ўзяўся за працу. Першай справай пачаў выдаваць царкоўны часопіс і назваў яго “Праваслаўны хрысьціянін”. Выдаваў яго на ратэтары, які прывёз з сабой з Нямеччыны, штомесяц. Сам я пісаў артыкулы, набіраў іх на матрыцы і друкаваў на ратэтары, а потым рассылаў па прыходах, якія памнажаліся з прыездам былых ДП з Эўропы. На гэтую справу ішло два тыдні. Праводзіў я Набажэнствы ў кожную нядзелю і па чарзе з а. Антоньевым прапаведаваў. Ён чытаў свае казаньні па сшытку і пра зьмест даваў тлумачэньні на эвангельскую тэму. Мне падабаліся ягоныя казаньні. Я ж прамаўляў свае павучаньні экспромтам і закранаў разнастайныя пытаньні жыцьця, разглядаючы іх з эвангельскага пункту гледзішча. Па суботах я езьдзіў у бліжэйшы лягер і навучаў праваслаўных дзяцей Закону Божаму. Апрача таго, арганізаваў пры царкве ў Брысбэне царкоўную суботнюю школу, падзяліўшы вучняў на шэсьць клясаў. Навучальная справа пайшла добра. Клясы запоўніліся вучнямі. Падабраны былі дасьведчаныя выкладчыкі па ўсіх прадметах.

У нядзелі адзін раз на месяц увечары я зьбіраў дарослую моладзь на духоўныя размовы. Зьбіраліся і размовамі цікавіліся. Частку моладзі салідарысты зьвялі ў Рускі клюб, дзе іх забаўлялі танцамі. Наступіў Вялікі пост, і я прыпыніў свае размовы з моладзьдзю, а размаўляў з дарослымі прыхаджанамі. Гэтыя размовы праходзілі больш пасьпяхова і мнагалюдна. У правядзеньні размоваў з прыхаджанамі дапамагаў мне а. Антоньеў, які ўжо меў вялікі досьвед у гэтай справе з папярэдняй сваёй дзейнасьці.

Мае адносіны з а. Антоньевым устанавіліся добрыя і не было паміж намі ніякіх непаразуменьняў. Толькі ён прызвычаіўся быць самастойным у сваёй дзейнасьці цягам многіх гадоў і без нагляду епіскапа, таму прысутнасьць архірэя на месцы была яму ў цяжар, але сваёй незадаволенасьці не выказваў. Прыхаджане ставіліся да мяне таксама добра. З ініцыятывы а. Антоньева прыхаджане сабралі грошы і заказалі ў жаночым манастыры ў Ерусаліме мітру для мяне ў падарунак з нагоды майго 10-годзьдзя архірэйства (у сакавіку 1952 го-

да). А. Антоньеў ад імя прыхаджанаў падарыў мне гэтую мітру падчас аднаго з Набажэнстваў у сьвяточны дзень у прысутнасьці прыхаджанаў. Я падзякаваў за ўвагу і любоў. Гэтая мітра была доказам таго, што прыхаджане ацанілі маю дзейнасьць і маё служэньне.

Пасьля гэтага я вырашыў абнавіць іканастас у сваім катэдральным саборы. У ім знаходзіліся абразы прымітыўнай працы, і некаторыя былі зусім кепскія. Я заказаў іканапісцу Савіцкаму, які прыбыў з Шанхая і які напісаў новыя абразы ў ніжні ярус іканастаса, а прыхаджане сваімі ахвяраваньнямі іх аплацілі. Чамусьці а. Антоньеў быў незадаволены гэтым і спрабаваў угаварыць Савіцкага адмовіцца ад пісаньня абразоў. Посьпеху ня меў. Антоньеў супакоіўся і пазьней задаволіўся. Напісаныя новыя абразы і цяпер аздабляюць гэты храм. Ужо тых ахвяравальнікаў няма – памерлі, а іх месца займаюць новыя, якія прыехалі з Харбіна ў 1960-я гады як новыя эмігранты.

З Брысбэнскім англіканскім архіепіскапам у мяне наладзіліся добрыя стасункі. Ён наведваў наш храм, часам прысутнічаў на нашых Набажэнствах і запрасіў мяне наведаць яго духоўную сэмінарыю. Мяне сустракалі па цырымоніі епіскапаў Англіканскай Царквы з сьпевамі хору сэмінарыстаў, з духавенствам ў адзеньні і прамовай рэктара, а таксама з кароткім Набажэнствам. На мяне ўсе гэта зрабіла вялікае ўражаньне.

У мяне тады гасьцяваў мой прыяцель англіканскі сьвятар а. В. Лек, які быў у Брытанскай зоне Германіі прадстаўніком Кентэрбэрыйскага архіепіскапа Фішера і які шмат дапамагаў нашаму духавенству. Дзякуючы яму я хутка авалодаў ангельскай мовай.

У царкоўным доме пры саборы я жыў на самоце. Прысутнасьць а. Лека разнастаіла маё жыцьцё. З ім мы наведвалі горад і знаёміліся з яго славутасьцямі. На жаль, ён доўга ня быў і зьехаў у Інданэзію. Я застаўся зноў адзін у доме. Маю самоту скарысталі нядобрасумленныя людзі і пачалі распаўсюджваць плёткі з мэтай падарваць мой аўтарытэт і пашкодзіць маёй дзейнасьці. Пісьменьнік М. Горкі ў творы "У людзях" выказаўся пра такіх людзей такімі словамі: "Расея па-ранейшаму пакутуе на сваю хранічную хваробу – лішак нягоднікаў". Такія знайшліся і ў Брысбэне сярод рускіх.

Апрача катэдральнага Сьв.-Мікалаеўскага сабора ў Брысбэне быў адкрыты другі прыход для незадаволеных протаіерэем а. Антоньевым. Адзін стары падараваў свой дом прыходу, і ў ім зрабілі прыгожую дамавую царкву. Я часта служыў у гэтай царкве. Настаяцелем яе быў сьвятар Н. Усьпенскі, якога я прызначыў і які быў пад маім кіраўніцтвам у лягеры Фішбэк (Германія). У Брысбэне ён жыў з сваёй сям'ёй. Быў ён добры знаўца царкоўных сьпеваў.

### Епіскап Мэльбурнскі

Маё служэньне набліжалася да завяршэньня. Архіепіскап Феадор задумаў перавесьці мяне ў Мэльбурн, пра што мне і паведаміў. Але ён хутка захварэў і ня зьдзейсьніў свайго намеру. Нагодай для майго перамяшчэньня ў Мэльбурн была тая акалічнасьць, што там арганізавалася невялікая група прыхаджанаў, якая адкрыта выступіла супраць мясцовага настаяцеля сьвятара І. Зуземіля, абвінаваціўшы яго ў розных праступках. Архіепіскап камандзіраваў мяне дасьледаваць абвінавачваньні супраць а. Зуземіля. Туды я езьдзіў і служыў у царкве, распытаўся ўсіх абвінаваўцаў, але ніхто зь іх ня мог даказаць віны а. Зуземіля. Увесь пісьмовы матэрыял пра допыты і абвінавачваньні я перадаў архіепіскапу, а ён склікаў епархіяльную раду і даручыў вынесьці пастанову супраць а. Зуземіля. Епархіяльная рада не змагла асудзіць а. Зуземіля, але прапанавала архіепіскапу тры рэзалюцыі для зацьвярджэньня на яго выбар. Архіепіскап разззлаваўся на членаў епархіяльнай рады і абазваў іх “дурнямі”. У склад епархіяльнай рады ўваходзілі шанаваныя протаіерэі і епіскап Афанасій як старшыня замест архіепіскапа. Пасьля гэтага ўладыка архіепіскап сур’ёзна захварэў і тры месяцы знаходзіўся ў шпіталі. Кіраваньне епархіяй часова перадалі мне, але кантралявалі, баючыся, што я магу што-небудзь зрабіць яму кепскае. У Мэльбурне ворагі сьвятара Зуземіля замоўклі, але прасілі мяне перасяліцца ў Мэльбурн і заняць пасаду настаяцеля царквы. Зуземіль у гэты час атрымаў у сваё веданьне цудоўны англіканскі храм і зрабіў у ім вялікую царкву з іканастасам.

Перад Вялікаднём 1953 года архіепіскап Феадор выйшаў з шпіталя і прапанаваў мне перасяліцца ў Мэльбурн. У адносінах да мяне заняў непрыхільную пазыцыю. У Мэльбурне прызначыў протаіерэя Т. Кірычука, настаяцеля другога прыходу з незадаволеных а. Зуземілем, дабрачынным і праз яго меў зносіны са мною. Я пасяліўся ў Мэльбурне і праводзіў Набажэнствы па чарзе: адну нядзелю ў царкве сьвятара Зуземіля, а наступную нядзелю ў храме а. Кірычука. У першага ў храме было шмат вернікаў, у другога – толькі дзесяткі два. Зуземіль з сваіх царкоўных сум аплачваў мне кватэру і даваў грошы на ўтрыманьне. Другі нічога не плаціў мне. Фактычна я харчаваўся пераважна на свае асабістыя грошы. А ўвогуле маё становішча было даволі нядобрае. Прыхаджане ставіліся да мяне з павагай і любоўю, ня ведаючы нашых узаемінаў духавенства. Ім ніхто гэтага не даводзіў. Затое ў Мэльбурне я жыў спакойна і без усялякіх інтрыг. Муж і жонка Фрэзе купілі сабе дом і запрасілі мяне перасяліцца да іх. Нейкі час я думаў, але пасьля іх настойлівых просьбаў пагадзіўся. Яны ставіліся да мяне вельмі клапатліва, як да роднага, блізкага. У іх доме мне было добра. Абое яны працавалі і ўвесь дзень адсутнічалі. Я ж заставаўся нібы гаспадаром.

У кастрычніку 1953 года ў Нью Ёрку адбыўся Сабор Епіскапаў Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы. З прычыны свайго хваравітага стану архіепіскап Феадор на Сабор не паляцеў аэрапляням, бо баяўся, а параходу на той час у Нью Ёрк не было. Не паслаў і мяне туды замест сябе. Аднак напісаў рапарт з просьбай перавесьці мяне з Аўстраліі і прызначыць на маё месца іншага епіскапа. Ён мусіў прывесьці нейкія важкія аргумэнты супраць мяне, бо архірэі пастанавілі перавесьці мяне з Аўстраліі, а на маё месца прызначыць протаіерэя Раеўскага з пастрыжэньнем яго ў манаства, настаяцеля прыходу ў Маямі ў Фларыдзе (ЗША). Аднак якія б ні былі тыя аргумэнты, яны былі паклёпніцкія і зьневажальныя. Архірэі павінны былі спачатку правесьці дасьледаваньне па сутнасьці прыведзеных аргумэнтаў супраць мяне, запытаўшыся і мяне адносна іх, а потым выносіць сваю пастанову. Але нічога такога не зрабілі, што сьведчыць пра легкадумнасьць архірэяў Сабору. Фактычна мой лёс знаходзіўся ў руках аднаго архіепіскапа Феадора. Ён вырашаў, пісаў свае вырашэньні ў Сынод, і Сынод іх зацьвярджаў без усялякай праверкі на грунтоўнасьць. Так было з пераменай майго месцажыхарства ў Аўстраліі: у Аўстралію я прыбыў на епіскапства ў Мэльбурн, а ў Аўстраліі архіепіскап Феадор спачатку прызначыў мяне ў Брысбэн, а пазьней зноў у Мэльбурн, а цяпер зусім пераводзіў мяне з Аўстраліі. Такога зьдзеку з архірэя ніколі не было ў Рускай Праваслаўнай Царкве. Вінаваты быў у гэтым і мітрапаліт Анастасій, як першагерарх і старшыня Сыноду і Сабору Епіскапаў, што дапусьціў такую практыку, а дакладней, самавольства епіскапа над іншым епіскапам.

Я даведаўся пра свой перавод толькі тады, калі завяршыўся Сабор епіскапаў і Сынод даслаў мне праз пошту ўказ пра гэта. Атрымаўшы яго, я быў моцна расхваляваны нечаканасьцю свайго звальненьня і пераводу з Аўстраліі. Шчыра я шкадаваў, што паслухаўся калісьці запрашэньня і пакінуў Гамбург. Аднак лічыў паводле сваёй веры, што такая была воля Ўсявышняга.

Загадкавай была для мяне асоба майго начальніка архіепіскапа Феадора, якога раней я мала ведаў па характары і настроі. У Аўстраліі я лепш яго зразумеў і вывучыў. Найперш ён вылучаўся сумніўнасьцю і гістэрычнасьцю, а таксама раўнівасьцю і падазронасьцю да іншых. Псыхічна ён быў неўраўнаважаны і часта мяняўся ў настроі. Выдумаў сабе, што я жадаю яму сьмерці, каб заняць ягонае месца. Протадыякану Грышаеву аднойчы ён з гневам сказаў: “Ня ўбачыць ён маёй епархіі як сваіх вушэй без люстэрка”. Тычылася гэта мяне. Відавочна, гэтыя асаблівасьці ягонага характару і зрабілі яго маім ворагам.

## Разьдзел трынаццаты

## Епіскап без епіскапства (1953 – 1956)

Гульня Архірэйскага Сыноду са мною, як з мячыкам футбалістаў, працягвалася і пасьля пастановы пра мой перавод з Аўстраліі на Саборы ў кастрычніку 1953 года. Прызначылі ў Туніс (Паўночная Афрыка) на сьвятарскае месца, што супрацьстаіць нават сьвяшчэнным канонам, якія забараняюць зводзіць епіскапа на месца сьвятара. Аднак выйшлі з такога становішча тым, што ўсклалі на мяне абавязкі кіраваць прыходамі ў гэтай частцы Афрыкі. На паперы тое атрымоўвалася добра, але на практыцы кепска, бо там не было рускіх прыходаў для епіскапскага кіраваньня імі. У гэтай частцы Афрыкі была юрысдыкцыя праваслаўнага патрыярха Александрыйскага. У Тунісе сьвятара ў прыходзе не было. Пасланы туды архірэй павінен быў выконваць абавязкі сьвятара. Гэта Архірэйскі Сынод і вызначыў епіскапу Афанасію ў сваім указе. Ня гледзячы на ўсё тое, я мусіў па службе выпраўляцца туды.

У Аўстраліі я жыў без усялякага грамадзянства і замежнага пашпарта для візы ня мог атрымаць. У Тунісе рускім прыхаджанам давялося прасіць дазволу на мой прыезд. Па гэтай справе я напісаў царкоўнаму старасту горада Плешка, каб зрабіў мне францускую візу ў Туніс, бо Туніс знаходзіўся пад пратэктаратам Францыі. Староста мне адказаў, што яны просяць прыслаць да іх сьвятара як мага хутчэй, бо царква стаіць зачыненая доўгі час і прыходу пагражае катастрофа. Сынод з свайго боку таксама нічога не рабіў, каб атрымаць для мяне дазвол на ўезд у Туніс. Да мяне ў Тунісе служыў епіскап Нафанаіл, якога паслалі ў манастыр у Мюнхэн на пакаяньне, туніскія ж прыхаджане чакалі ягонага вяртаньня і не жадалі іншага епіскапа, г. зн. мяне. Пра такое становішча напісаў мне мой былы ўнівэрсытэцкі калега А. Бельскі, які жыў у той час у Тунісе. З свайго боку я таксама нічога не рабіў для атрыманьня візы ў Туніс па згаданай прычыне. Час праходзіў. Нарэшце, Сынод вызваліў мяне ад прызначэньня ў Туніс, а туды камандзіраваў сьвятара з Парыжа. У Мэльбурне я заставаўся жыць у становішчы беспрацоўнага архірэя, аднак зрэдчас служыў у царкве а. Зуземіля.

Неўзабаве я даведаўся, што ў штаце Вікторыя знаходзяцца лягеры з нашымі эўрапейскімі бежанцамі, дзе не было сьвятароў. Я паехаў у гэтыя лягеры і пачаў іх абслугоўваць. Адзін лягер – Бэнала –

разьмешчаны ў 50 мілях ад Мэльбурна, а другі лягер – Банэгіла – значна далей. У Бэнала жылі рускія сем'і, а ў Банэгіла – украінскія. Апошні лягер мне вельмі спадабаўся сваім месцазнаходжаньнем, і на маё хадайніцтва міністэрства іміграцыі зацьвердзіла мяне капэлянам у ім. Калі зьехалі ўсе украінцы, прыслалі ў гэты лягер грэкаў з Грэцыі. Я праводзіў Набажэнствы па-грэцку, а багамольцы пелі ўсю літургію, гарманічна і ладна. Яны былі палкімі наведнікамі Набажэнстваў. Часам яшчэ задоўга да пачатку Набажэнства ля баракаў царквы зьбіралася шмат багамольцаў у чаканьні майго прыходу. Усю літургію, ад пачатку і да канца, стаялі і маліліся – жанчыны і дзеці зьлева, а мужчыны справа.

У Мэльбурнскім храме а. Зуземіля адбылася драма перад сьвятам Нараджэньня Хрыстова. Спрычыніўся да яе сам а. Зуземіль на глебе незаконнага рамана з замужняй жанчынай, жонкай свайго сябра, зубнога доктара. Архіепіскап Феадор забараніў яму служыць па-сьвятарску, а ён з усім сваім прыходам перайшоў у юрысдыкцыю грэцкага архіепіскапа Канстантынопальскай патрыярхіі. У Мэльбурне адбыўся царкоўны раскол. Архіепіскап Феадор прыехаў выправіць гэтае становішча, але яшчэ больш паглыбіў канфлікт. У той час я быў даўно не пры справах. Пасьля зыходу Зуземіля я пазбавіўся магчымасьці праводзіць Набажэнствы ў ягонай царкве. Паступова многія прыхаджане адышлі ад яго, але ён застаўся ў грэкаў. Заняўся гандлем і служыў у сваёй царкве. Сынод пазбавіў яго сьвятарскага сану. Пацярпелы муж падаў на яго ў грамадзянскі суд за сваю жонку. Разбор судовай справы працягваўся два тыдні з прысяжнымі засядацелямі. Былі выкліканыя з рускіх 25 сьведак, але суд апраўдаў яго за недахопам абвінавачваньняў. Пасьля таго ён перайшоў у юрысдыкцыю Маскоўскай патрыярхіі і там быў высьвечаны ў епіскапа для Германіі. Цяпер ён – архіепіскап Венскі ў Аўстрыі.

Сюды, у Мэльбурн, прыехаў да мяне ў госьці мой прыяцель, англіканскі сьвятар Лек, якому я быў рады. Ён заставаўся ў мяне некалькі месяцаў, а потым вярнуўся ў Англію. Ён спрабаваў уладкавацца на службу ў Мэльбурне ці іншых гарадах Аўстраліі, але ня меў посьпеху. Быў ужо для гэтага застары. Апрача таго, аўстралійцы не любілі ангельцаў.

Напрыканцы лютага 1954 года Архірэйскі Сынод пастанавіў мне быць епіскапам у г. Эдмантане з прызначэньнем на катэдру епіскапа Заходне-Канадзкай епархіі. Даслалі мне ўказ пра гэта. У Канадзкім прадстаўніцтве запатрабавалі ад мяне рэнтгенаўскі здымак лёгкіх і назвалі свайго доктара. Распараджэньне я выканаў. Праз нейкі час даслалі мне з Канады адказ з паведамленьнем, што па нейкім законе аб эмігрантах я не магу атрымаць дазволу на ўезд у Канаду і пасялень-

не там з прычыны былой у маладосьці хваробы лёгкіх (тубэркулёзу). Не выпадала мне патрапіць у Канаду, хоць я з задавальненьнем паехаў бы туды. Паведаміў рапартам мітрапаліту Анастасію ў Сынод пра тое, што Канада не дае мне жыхарства.

У Сынодзе доўга ня думалі, а пастанавілі прызначыць мяне на катэдру вікарнага епіскапа ў Бразылію ў дапамогу састарэламу епіскапу Феадосію (Самайловічу). Атрымаўшы Сынадальны ўказ пра гэта, я выправіўся ў Бразыльскае консульства даведацца адносна візы. Там мне сказалі, што Бразылія не прымае рускіх па нараджэньні на пастаяннае жыхарства. А я нарадзіўся ў той час, калі была вялікая Расейская Імпэрыя. У Савецкай я ніколі ня быў, але абмежаваныя бразыльцы ня бачылі розьніцы паміж былой Расеяй і Савецкім Саюзам. Яны ведалі толькі Савецкую камуністычную Расею, якая ўяўлялася ім небясьпечнай.

Мітрапаліту Анастасію я паведаміў, які адказ атрымаў у Бразыльскім консульстве. Мабыць, ён занепакоіўся адносна майго неўладкаваньня. Каб супакоіць мяне, напісаў, што па волі Божай прызначылі мяне ў Бразылію і што архіепіскап Бразыльскі Феадосій атрымае для мяне дазвол у парадку выключэньня, як епіскапу. “Не хвалюйцеся”, – пісаў ён мне. Я адказаў, што воля Божая не спраўджваецца ў пастановах Архірэйскага Сыноду, а воля Божая выявіцца адносна мяне пазьней, чаго ні Сынод, ні я ня здольныя цяпер прадбачыць. Мітрапаліт мне больш не пісаў, але распарадзіўся архіепіскапу Феадору Аўстралійскаму даць мне кватэру ў царкоўным доме і выплачваць штомесячную дапамогу на ўтрыманьне. Архіепіскап выканаў распараджэньне мітрапаліта і прапанаваў мне пераехаць у царкоўны дом пры Сьв.-Уладзімірскім храме з правам правядзеньня Набажэнстваў у ім. Не давяраючы ўладыку Феадору ў гэтым пытаньні, я папрасіў выдаць мне пісьмовае пацьвярджэньне ў тым, што ніхто не выселіць мяне з гэтага дома на вуліцу. Такое пацьвярджэньне мне выдаў. Для ўстанаўленьня братэрскіх стасункаў ён запрасіў мяне ў Мэльбурнскай царкве правесьці з ім літургію. Неахвотна я пагадзіўся, бо лічыў яго віноўнікам маіх хваляваньняў у Аўстраліі ў сувязі з пераводам адсюль праз ягоную скаргу на мяне, неабгрунтаваную і незаслужаную. Ён гэта ўсьведамляў і стараўся мяне задобрыць. У Сынодзе разумеў маё становішча і мітрапаліт Анастасій, які часьцяком у лістах суцяшаў мяне. Ён шчыра жадаў уладкаваць мяне на епіскапцтва, але ўсё няўдала, міжволі. Я не злаваўся ні на яго, ні на членаў Архірэйскага Сыноду, якія да майго лёсу былі абыякавыя.

Новы епіскап Мэльбурнскі ўжо прыехаў у Мэльбурн і зьдзяйсьняў Набажэнствы ў securityнованабытай царкве, купленай прыхаджанамі да яго прыбыцьця. Ён кіраваў яе рамонтам. Для іканастаса заказаў у мясцо-

вага рускага мастака вялікія абразы Выратавальніка і Божай Маці ў старым рускім стылі. Калі іх усталявалі, то ўсе прыхаджане запратэставалі супраць гэтых абразоў, а царкоўны стараста Мокры сам іх прыбраў з іканастаса. Епіскап Сава з сваім іпадыяканам паставіў гэтыя абразы на горнім месцы з мэтай прызвычаіць прыхаджанаў да іх выгляду. А выгляд іх быў такі, што складана было верніку прыняць іх за сьвятыя абразы. Справа скончылася тым, што заказалі іншыя.

Архіепіскап Феадор з першых жа дзён яго чамусьці не ўзьлюбіў. Мабыць, таму што адчуваў сябе вінаватым перада мною. Епіскап Сава прыбыў на маё месца. Уладыка Феадор ня мог гэтага сабе дараваць. Тое высьветлілася, калі ён паміраў у красавіку 1955 года. Знаходзячыся ў шпіталі цяжка хворым, калі я прыходзіў яго наведаць, ён з сьлязьмі шматкроць прасіў майго дараваньня. Нават у апошнюю ноч свайго жыцьця, прытомны, ён клікаў акамянелым языком: “Уладыка Афанасій, даруй мяне”. Я і не злаваўся на яго, спрабаваў суцешыць. На маіх вачах ён памёр у шпіталі ў 8 гадзінаў 15 хвілінаў 5 траўня 1955 года.

Епіскап Сава быў выкліканы ў Сіднэй да сьмяротна хворага, але архіепіскап Феадор не пажадаў зь ім гаварыць, а распарадзіўся перадаць мне як спадчыну кіраваньне епархіяй у Сіднэі, а епіскапу Саве ў Мэльбурне, г. зн. падзяліў яе на дзьве паловы – поўнач і поўдзень. Завяшчаньне гэтае было несапраўднае, і я яго не прыняў, хоць епіскап Сава пытаўся мяне адносна яго. Сынод прызначыў Саву епіскапам Аўстралійска-Новазэляндзкай епархіі. Атрымаўшы гэтае прызначэньне, ён спрабаваў выселіць мяне з царкоўнага дома, але абараніла мяне сястрыцтва гэтай царквы, на чале якога стаяла энэргічная і культурная генэральша Сідорына. Сам ён жыў у іншым доме пры катэдральным саборы і кватэра была яму непатрэбная.

Цяжкія хваляваньні выклікалі ў мяне хваробу грудной жабы ў складанай форме. Гэтая хвароба пазбавіла мяне магчымасьці хадзіць у бліжэйшую краму купляць сабе прадукты. Я зрабіўся інвалідам, няздольным на працу. У такім стане здароўя я атрымаў новае прызначэньне, на гэты раз ужо ў Аргентыну.

## Разьдзел чатырнаццаты

# Епіскап Аргентынскі (1956 – 1957)

У першыя дні сьнежня 1955 года я атрымаў тэлеграму: “Вы прызначаны на епіскапскую катэдру ў Аргентыну. Чакаем Вашай згоды. Тэлеграфуйце. Мітрапаліт Анастасій”. Стан майго здароўя затрымаў мяне з адказам. Хутка атрымаў другую тэлеграму: “Чакаем Вашай згоды. Мітрапаліт Анастасій”. Памаліўшыся, я адказаў: “Згодны”.

Заставацца ў Сіднэі ці ў Аўстраліі я ня мог, бо супраць гэтага быў бы епіскап Сава ды і Сынод. Мае сябры ў Адэлаідзе запрашалі мяне да іх, пра што прасілі мітрапаліта Анастасія, але епіскап Нікан па даручэньні мітрапаліта адказаў адмовай. Зрабілі гэтае без майго ведама і згоды, а потым паведамілі мне.

Пра Аргентыну і аргентынскае царкоўнае жыцьцё я мала што ведаў. Для атрыманьня зьвестак адтуль я напісаў ліст протаіерэю Н. Масічу, якога я ведаў па Гамбургу і Казацкім Стане. Зь ім быў там і а. Чаркашын, мой знаёмец з Гамбургу і Казацкага Стану. Неўзабаве атрымаў ад іх лісты, ляканічныя, але з тлумачэньнем становішча. А. Масіч пісаў, што храм і кватэра для архірэя ёсьць, у храме служаць галасістыя дыяканы, ёсьць сьвятары, выдатны царкоўны хор, рэгент, а астатняе сам убачу. У другім лісьце паведамлялася пра тое, што ў царкве камандуюць тры асобы: протаіерэй Соін, царкоўны стараста Гегелашвілі і ягоны памочнік Увараў, з якімі давядзецца мець непрыемныя справы. Па зьмесьце гэтых лістоў я здагадаўся, у чым справа і запытаўся мітрапаліта. Той адказаў мне з прапановай паскорыць ад’езд у Аргентыну аэраплянам. На аплату білета абяцаў даслаць мне грошай. Замежны пашпарт атрымаў хутка, бо ўжо я быў аўстралійскім грамадзянінам. Выдача аргентынскай візы затрымалася. У Буэнас-Айрэсе выпрошвалі для мяне аргентынскую візу на сталае жыхарства. На гэта патрэбны быў дазвол міністэрства. Пакуль цягнулася справа з атрыманьнем пастаяннай візы, даслалі мне ўказ з Сыноду, у якім паведамлялася, што мяне прызначылі на катэдру Епархіяльнага архірэя Аргентынскай епархіі з тытулам: “Епіскап Буэнас-Айрэскі і Аргентынскі”. Я быў задаволены, што выйшаў з становішча вікарнага епіскапа. Перажыўшы гэтае прыніжальнае становішча, я зрабіўся ворагам прызначэньня на епіскапскія вікарыяцтвы.

Напрыканцы лютага наступнага 1956 года я вылецеў аэраплянам “Квантас” у Буэнас-Айрэс па лініі – Фіджы, Кэнтан, Ганалулу, Лос-Ан-

жэлес, Сан-Францыска з прыпынкам на тры дні і далей – Гватэмала, Панама, Ліма і Аргентына. У Сан-Францыска я наведаў сваіх старых знаёмцаў, сяброў і пазнаёміўся з горадам. На месца прыбыў раніцай у суботу 3 сакавіка. Тады лятаалі аэрапляны чатырохматорныя, а джэтаў не было ўвогуле.

На аэрадроме чакалі мяне прадстаўнікі прыходу, бо я паведаміў ім тэлеграмай пра дзень і час свайго прыбыцьця. У храме сустрэлі мяне саборнае духавенства і даволі шмат народу, як і раней. Харысты былі ў поўным зборы. Малебен, прамова царкоўнага старасты і мая ў адказ. Пасьля царквы чай у архірэйскай кватэры ў гонар духавенства і госьця. Ня ведаю чаму, але ўсё ўбачанае ўпершыню зрабіла на мяне сумнае ўражаньне, падалося нішчымным. І не памыліўся я ў сваіх адчуваньнях.

Пасьля афіцыйнай часткі пацягнуліся будзённыя дні з усёй іх галізной. Царкоўная каса пуставала, епархіяльнай касы не было, асабістага катэдральнага сабора таксама не было. Набажэнствы праводзілі ў наёмным каталіцкім падвале школы, цесным і нізкім. Усе сабраныя грошы ішлі на аплату гэтых памяшканьняў. Прадбачыў я, што мяне чакае вялікая праца па ўрэгуляваньні ўсіх спраў. Гасподзь прывёў мяне сюды не для адпачынку і спакою, а для працы і клопату. Здавалася, што перада мною ляжыць некранутае поле, цаліна. Трэба было мець цярпеньне.

Першай справай я вырашыў увесьці ў кананічнае рэчышча так званую Рускую Праваслаўную кангрэгацыю ў Аргентыне, якая мела юрыдычную асобу Аргентынскай епархіі і на імя якой былі купленыя ўчасткі зямлі і будаваліся храмы. Але паводле статуту гэтай арганізацыі епархіяльны архірэй быў убаку ад кіраваньня царкоўнаепархіяльнай маёмасьцю. Займаліся гэтай справай вернікі без удзелу свайго епіскапа. Я лічыў такое становішча ненармальным і небясьпечным для епархіі. Па рускай прыказцы – новая мятла добра мяце, – так і я ўзяўся за справу ачышчэньня ад сьмецьця царкоўнага дому. Пераадольваючы перашкоды з боку вернікаў гэтай кангрэгацыі, я пры падтрымцы большасьці дасягнуў сваёй мэты. Быў зьменены статут і зацьверджаны дзяржаўнымі ўладамі, згодна з якім епархіяльны архірэй зьяўляўся па пасадзе старшынёй праўленьня названай кангрэгацыі. Гэтае новае становішча зацьвердзіў Архірэйскі Сынод і выказаў мне падзяку.

Адначасова з гэтай справай я аддана ўзяўся за ідэю будаўніцтва катэдральнага сабора. Мяне не спыняла тая акалічнасьць, што ў царкоўнай касе не было грошай увогуле, а тым больш на будаўніцтва храма і пакупку ўчастка. Спадзяваўся на Божую дапамогу, верыў, што Гасподзь прыслаў мяне ў гэтую краіну для арганізацыі царкоўных

спраў. У ЗША і ў краінах Захаду звычайна будуюць храмы дзякуючы займу грошай у банках, але мы ў Буэнас-Айрэсе не маглі разылічваць на гэта па розных прычынах. Трэба нам будаваць за свой кошт, на ахвяраваньні дабрачынцаў. На іх была мая надзея.

У дзень прастольнага сьвята катэдральнага падвальнага храма Ўваскрэсеньня Хрыстова я абвясьціў з царкоўнага амбона, што будзем будаваць сваімі сіламі свой сабор, і заклікаў вернікаў ахвяраваць на гэтую сьвятую справу і дапамагаць у будаўніцтве сваімі сіламі, г. зн. працай. Я не памыліўся ў сваіх спадзяваньнях. Пасьля доўгага пошуку патрэбнага ўчастка напрыканцы 1956 года мы яго купілі. Ахвяраваньні паступалі. Увесь цяжар клопатаў і розных хадайніцтваў, зьвязаных з будаўніцтвам, палягаў на мне. Калі былі зацьверджаны гарадзкімі ўладамі пляны нашага сабора, я асьвяціў плошчу і зрабіў закладку сабора ў палове кастрычніка 1957 года, а ў чэрвені 1958 года мы ўжо праводзілі рэгулярныя Набажэнствы ў сваім храме. Дружна дапамагалі ў гэтай справе добрыя людзі – адны грашыма, другія працай. Імёны ўсіх увекавечаныя на шыльдзе ўнутры сабора пры ўваходзе для ведама ўсіх і для малітоўнага памінаньня. Многія рабочыя працавалі бясплатна. Вялікія ахвяраваньні грашыма і пакупкай неабходнага матэрыялу для рызьніц і аздабленьня храма зрабіла Н. Н. Кенігсберг. Сам я працаваў фізычна, не саромеўся ніякай цяжкай і бруднай працы. Усе ўносілі свае пасільныя лепты на Божы дом.

Будаўніцтвам катэдральнага сабора і архірэйскага дома пры ім ствараўся Епархіяльны цэнтар Аргентынскай епархіі Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы, дзякуючы чаму яна перастала быць часовай і бежанскай на чужой зямлі.

Усялякая добрая справа праводзіцца з вялікімі цяжкасьцямі і перашкодамі. Так было з катэдральным саборам. Адны ахвяравалі і працавалі ў гэтай сьвятой справе, а іншыя супрацьдзейнічалі і заміналі. Сваёй энэргіяй і жаданьнем я вынес на сабе ўсё будаўніцтва сабора і дома. Сам фізычна працаваў з мулярамі чатыры гады. Гасподзь даваў сілу і здольнасьць. У дадзеным выпадку мне даводзілася рабіць кладку цэглы, тынкаваць, выконваць сталярныя працы і іншае, пра што ў жыцьці ніколі і ня думаў.

Апрача будаўнічай працы, я траціў энэргію і час на выданьне часопіса “Епархіяльны весьнік”, на духоўныя размовы з прыхаджанамі і дарослай моладзьдзю. На мае размовы прыходзілі многія: для прыхаджанаў асобна і для моладзі асобна. Праводзіў таксама пастырскія сходы, падчас якіх размаўлялі пра богаслужбовую практыку, царкоўны статут, пастырскую дзейнасьць і розныя праблемы царкоўнага жыцьця. Надакучаў усім, каму толькі мог. Жаданьне ў мяне было ня дзеля сваёй славы, а хацелася павысіць рэлігійны і маральны ўзро-

вень ўсіх рускіх людзей, якія бачылі мяне і гаварылі са мною. Многіх не ўдалося ўскалыхнуць духоўна, але некаторыя пасталелі.

Патрэбная такая праца, бо рускія ў Буэнас-Айрэсе не складалі маналіт ці адну нацыянальную і праваслаўную сям'ю. У царкоўных адносінах яны былі раздробленыя ня толькі на асобныя супольнасьці, але і на юрысдыкцыі. У горадзе існаваў стары, першы ў Аргентыне, рускі прыход з велічным храмам, настаяцелем і будаўніком якога быў яшчэ напрыканцы XIX стагодзьдзя протаіерэй К. Ізрасцоў. Самавольна ён выйшаў з лона Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы і самавольна перайшоў у Паўночна-Амэрыканскую мітраполію. Ён павёў за сабою і сваіх прыхаджанаў. Ён і яго прыхільнікі, як гэта звычайна здараецца псыхалягічна ў раскольнікаў, стараўся нашкодзіць нашай епархіі ў Аргентыне і агітаваў супраць яе разьвіцьця і царкоўнага жыцьця. Посьпеху ня меў, бо ўносіў спрэчкі паміж рускімі. Неўзабаве ён памёр. Яго намесьнік, больш спакойны, пазьней перайшоў у маю юрысдыкцыю разам з прыходам у 1961 годзе перад Вялікаднём. Сьвятарстваваў архімандрыт Міхаіл Дзікі, які меў прыход са сваіх прыхільнікаў, але той не перашкаджаў нашаму епархіяльнаму жыцьцю. Спрабавалі місіянэрстваваць каталіцкія сьвятары ўсходняга абраду, але рускіх яны мала пераманілі. Усе гэтыя падзелы не спрыялі царкоўнаму жыцьцю ў яго разьвіцьці ў мірных абставінах. Шмат было цывільных арганізацый, галоўным чынам ваеннага і палітычнага характару, якія паміж сабой не мірыліся. Паступова ўсе гэтыя падзелы зьнікалі ў выніку сьмерці адных і старасьці другіх. З дапамогай Божай Аргентынская епархія разьвівалася пасьпяхова і набывала аўтарытэт і значнасьць.

## Разьдзел пятнаццаты

## Архіепіскап Аргентынскі (1957 – 1969)

Напачатку мітрапаліт Анастасій і Архірэйскі Сынод не зьвярталі ўвагі на маю актыўную дзейнасьць у Аргентыне. З Буэнас-Айрэса дасылалі ім паклёпы на мяне, якім мітрапаліт надаваў значэньне і гаварыў: “Не бывае дыму без агню”. Праўдзівасьці гэтых паклёпаў не правяралі, але насьцярожыліся ў адносінах да мяне. Галоўным і актыўным паклёпнікам аказаўся протадыякан майго “катэдральнага сабора”, які ўзяў на сябе ролю абаронцы пацярпелага духавенства, нібы пакрыўджанага мной. У даносах скажалі мае словы, прыпісвалі мне тое, чаго ў сапраўднасьці не было. Абвінавачвалі мяне нават у тым, што я нібы непаважліва адгукаўся пра нябожчыка майго папярэдніка архіепіскапа Іясафа. І Сынод рабіў запыты ў мяне наконт гэтых абвінавачваньняў.

Паклёпнікі зьбіралі матэрыялы супраць мяне з першага дня майго прыезду ў Аргентыну. Мая віна перад духавенствам епархіі заключалася ў тым, што я выдаў цыркулярнае распараджэньне з патрабаваньнем праводзіць Набажэнствы па ўстаноўленым парадку і не ўносіць сваіх зьменаў пры служэньні розных богаслужбовых малітвасловаў: малебнаў, паніхід і інш. У сваім цыркуляры я пазначаў нават падрабязны парадак гэтых Набажэнстваў. Маёй спробай было ўвесьці аднастайнасьць у царкоўна-богаслужбовую практыку і пазьбегнуць разнабою, які я засьпеў у гэтых адносінах у Аргентынскай епархіі. Нябожчык архіепіскап не зьвяртаў увагі на гэта і сьвятары прывыклі да сваёй практыкі. “Вось нябожчык уладыка быў добры і ўважлівы да духавенства, а гэты, прыежджы, іншы, кепскі!” Паўтаралі вернікам сьвятыя айцы давeранай мне епархіі, асабліва двое зь іх, пра якіх папярэджвалі мяне яшчэ ў Аўстраліі: мітрафорны протаіерэй Т. Соін і памянёны протадыякан. Знайшліся нелянівыя людзі, якія сталі распаўсюджваць чуткі пра цуды нябожчыка архіпастыра і называлі яго сьвятым. Пісалі ў газэтах пра гэта, але папулярнасьці ня мелі. Рабілася гэта, вядома, насупраць мне, але я не зьвяртаў увагі на выхадкі такога характару. Хутка ўсё заглухла, і пра цуды забыліся. Супакоіліся.

Паўтара года я дзейнічаў у буэнас-айрэскіх царкоўных абставінах, багатых на усялякага кшталту сваркі, звадкі і паклёпы, але і на набожнасьць многіх прыхаджанаў. Апошнія наведвалі царкву і Набажэн-

ствы і ад усяго іншага стаялі ўбаку. Гэтыя і былі маёй паствай, з якой я маліўся, будаваў катэдральны сабор і царкоўнае жыцьцё.

Прайшло паўтара года, пакуль мітрапаліт Анастасій з Сынодам зьвярнуў на мяне сваю прасьвятарскую ўвагу. Напрыканцы жніўня 1957 года адбылося паседжаньне Архірэйскага Сыноду, на якім пастанавілі ўзьвесьці архіепіскапа Афанасія ў сан архіепіскапа за ягонае стараннае служэньне Сьвятой Царкве і архіпастырскія працы па кіраваньні Аргентынскай епархіяй. Даслалі мне тэлеграму і ўказ з Сыноду.

Гэтае ўзнагароджаньне я прыняў абыякава, лічыў яго запозьненым. Я думаў яго зусім не прымаць і зваць сябе па-ранейшаму епіскапам. У мяне заўсёды была абыякавасьць да ўсялякіх узнагародаў і адзнак, у дадзеным выпадку гэта выявілася мацней. Пра свой настрой я паведаміў архіепіскапу Грыгорыю (Барышкевічу), якога паважаў і якому давяраў. У адказ я атрымаў ад яго ліст наступнага зьместу:

"Вашае Велясьвятарства, Дарагі ў Хрысьце брат, найбольш шаноўны зь епіскапаў Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы!

Я даўно зьбіраўся напісаць Вам пра цяжкую хваробу, якая напаткала мяне, але да апошняга часу так і не сабраўся. Я адчуваю сябе перад Вамі вінаватым, хоць я ніколі на Вас не забываюся. Я дастаткова яскрава разумею цяжкасьць Вашага архіпастырскага служэньня як ў маральных, так і ў матэрыяльных і побытавых адносінах. Вы першы з нашых епіскапаў з глыбокім адчуваньнем адказнасьці перад Богам і гісторыяй сур'ёзна паставіліся да ўскладзенай на Вас архіпастырскай працы ў Аргентыне. За гэта вы атрымалі ўдзячнасьць і павагу як сярод найлепшай часткі Вашай паствы, так і сярод найбольш добрасумленных нашых братоў – епіскапаў. Пішу Вам пра гэта без ліслівасьці, калі ўва мне змагаюцца дзьве сілы – жыцьця і сьмерці. Перад хуткай магчымасьцю апошняй у мяне няма месца для ліслівасьці. Дапамажы Вам Гасподзь на ўсіх шляхах Вашага высокага архіпастырскага служэньня. Не зьвяртайце ўвагі на тыя нярэдкія выпрабаваньні, якія Гасподзь Вам пасылае, магчыма, для гартаваньня Вашага духа. Не засмучайцеся, калі гэтыя нягоды даводзіцца трываць і ад сваіх братоў епіскапаў і ад Архірэйскага Сыноду.

16 жніўня ў пятніцу мяне ў доме доктара А. М. Лешчука (бацькі яго з Мінскай губэрні), у паселішчы Хеўрань, наведаў уладыка мітрапаліт Анастасій. Прабыў ён каля мяне гадзінаў 5. Шмат мы зь ім гаварылі пра справы царкоўныя. Гаварылі шмат пра ўладыкаў, цяпер аддаленых ад кіраваньня Канадзкай епархіяй. Успомніў уладыка мітрапаліт і пра Вас. Ён сказаў, што ў Аргентынскай епархіі ўсё супакоілася і цяпер час узьвесьці ўладыку Афанасія ў сан архіепіскапа. Я паўтараў уладыку мітрапаліту Анастасію, што было своечасовым гэта зрабіць

пры вырашэньні пытаньня пра ўзнагароджаньне гэтым санам епіскапа Савы, які ў парадку старшынства павінны быў ісьці ва ўсялякім выпадку пасьля ўладыкі Афанасія.

"Цяпер мы выправім гэтую памылку", – зазначыў ён.

І я Вас, Уладыка дарагі, прашу не рабіць ніякіх пярэчаньняў супраць пастановы Сыноду аб узьвядзеньні Вас у сан архіепіскапа. З пакорай прыміце гэтае высокае званьне як заслужанае Вамі. Мы добра бачым, хто шуміць пра сябе і здольны займацца "паказухай" і хто робіць Божую справу са сьціпласьцю, але з карысьцю для Царквы. Вы вельмі засмуцілі мяне і, я ведаю, многіх другіх, калі б сталі на шлях байкатаваньня.

17.VII. Мяне праапэрыравалі ў Чыкаскім шпіталі. Выдалілі язву страўніка, аднак болі ў страўніку адчувальныя, хоць іх імкнуцца прыглушыць пілюлямі. Як відаць, апэрацыя зроблена позна. Доктар, які лячыў мяне да апэрацыі, запэўніваў мяне, што ніякай апэрацыі ня трэба рабіць, і толькі доктар унівэрсытэцкага шпіталя, дзе я быў на дасьледаваньні, пераканаў мяне і яго ў адваротным...

Цяпер мы жывём напярэдадні адраджэньня нашай Радзімы. Гэта адчуваецца па ўсіх прыкметах. Хацелася б мне дажыць да гэтага радаснага часу і бачыць народ свабодным ад камуністычнага ярма і Царкву Рускую абноўленай і свабоднай. Але Гасподзь наўрад ці наканаваў мне дажыць да гэтых радасных дзён...

Беражы Вас Гасподзь! Прашу Вас шчыра маліцца за маё здароўе, а па сьмерці і за спачын. Дапамажы Вам Гасподзь ва ўсім. З любоўю ў Хрысьце застаюся – архіепіскап Грыгорый.   24.VIII/1957 г."

Уладыка Грыгорый памёр у палове кастрычніка таго ж 1957 года ад раку страўніка. Пахаваны ў Сьвята-Траецкім манастыры ў Джарданвіле. Я ведаў яго добра з маладых сваіх гадоў, як протаіерэя на Валыні і ў Гародні. У маладосьці ён закончыў Казанскую духоўную акадэмію са ступеньню кандыдата багаслоўя. Манаства і епіскапскі сан прыняў у горадзе Вене (Аўстрыя) у верасьні 1943 года. На радзіме быў у лоне Праваслаўнай Беларускай Царквы.

Сваё архіпастырскае служэньне я прадаўжаў са шчырасьцю і любоўю, не шкадуючы сілаў і здароўя. У Сынодзе гэта ведалі. Будаўніцтва катэдральнага сабора і іншыя мерапрыемствы пералічыў у папярэднім разьдзеле. У дадатак да ўжо згаданага лічу патрэбным сказаць пра заснаваньне мною Епархіяльнай Пахавальнай касы ў дапамогу бедным рускім людзям пры пахаваньні іх родных у Буэнас-Айрэсе. З гэтай касы выдалі грашовую дапамогу больш як у 100 выпадках сьмерці.

Важнай падзеяй у нашым епархіальным жыцьці было далучэньне з Паўночна-Амэрыканскай Мітраполіі старога і вялікага прыхо-

ду ў Буэнас-Айрэсе з прыгожым храмам Сьв. Тройцы на чале з мітрафорным протаіерэем Ф. Фарманчуком перад Вялікаднём 1961 года. З далучэньнем гэтага прыходу ліквідаваўся адзін з царкоўных расколаў у Аргентыне. Гэта зрабіла добрае ўражаньне на Архірэйскі Сынод ў Нью Ёрку.

У Архірэйскім Сынодзе прынялі ва ўвагу мае заслугі і пастанавілі ўзнагародзіць мяне правам нашэньня брыльянтавага крыжа на клабуку. Пастанова Сыноду адбылася 17 жніўня 1961 года. У Сынадальнай пастанове па гэтай справе былі пералічаныя мае заслугі на царкоўнай ніве з пазначэньнем пра будаўніцтва катэдральнага сабора і вяртаньне ў юрысдыкцыю Архірэйскага Сыноду і Епархіяльнага архірэя Аргентынскай епархіі Сьв.-Траецкага храма. Такім чынам, яны ўшанавалі мяне як аднаго са старэйшых архірэяў Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы. Гэтым становішчам я ніколькі не ганарыўся, але і не саромеўся яго.

Вялікай важнасьцю для мяне былі палёты аэраплянам у Нью Ёрк на Саборы Епіскапаў нашай Зарубежнай Царквы. Такія Саборы адбываліся ў 1956, 1959, 1962, 1964 1967, 1976, 1978 гадах, дзе я прысутнічаў і актыўна ўдзельнічаў. Апрача таго, мяне запрашалі ў Сынод для ўдзелу у 1963, 1965 – 1966, 1974 і 1981 гадах. З названых паездак удзельнічаў у юбілейных урачыстасьцях мітрапаліта Філарэта ў 1974 і 1981 гадах. Дзякуючы ўдзелу ў паседжаньнях Сабору і Сыноду я добра пазнаёміўся з царкоўным жыцьцём нашай Зарубежнай Царквы. На Саборы ў 1962 годзе я быў выбраны ў рэвізійную камісію разам з архіепіскапам Аўстралійскім Савам для праверкі сынадальнай справаздачнасьці і Сьв.-Траецкага манастыра. Гэтую працу мы выканалі добрасумленна і выявілі, што справаздачнасьць вялася неўпарадкавана і неакуратна. Мітрапаліт Анастасій быў незадаволены гэтым.

На Саборы Архірэяў у 1964 годзе ў траўні быў выбраны на катэдру мітрапаліта Зарубежнай Царквы епіскап Філарэт. Мітрапаліт Анастасій пайшоў на спачынак па старасьці гадоў. Былі выстаўлены кандыдатуры архіепіскапаў Іаана і Нікана. Пры галасаваньні абодва кандыдаты атрымалі аднолькавую колькасьць галасоў. Ніводны зь іх адмаўляцца не захацеў. Тады пры дапамозе вуснага апытаньня ўсіх архірэяў быў выбраны аднагалосна згаданы епіскап Філарэт, вікарый Аўстралійскай епархіі. Аднолькавая колькасьць галасоў пры галасаваньні для выбару пры двух кандыдатах атрымалася таму, што адзін з кандыдатаў, які прысутнічаў на паседжаньні, падаў голас за сябе. Як высьветлілася, гэта епіскап Нікан. З майго пункту гледжаньня абодва кандыдаты не падыходзілі для адказнай пасады мітрапаліта і першагерарха Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы.

У Буэнас-Айрэсе знайшліся сярод рускіх зламысьнікі, якія па нечым загадзе паднялі і вялі ў сваіх газэтах і вусна агітацыю супраць мяне. Спачатку я перажываў і гараваў, але хутка прызвычаіўся, бо яны не спыняліся. Падставы для агітаваньня не было, але яны самі выдумлялі і ўсе факты скажалі для эфэкту. Разважлівая мая паства не надавала значэньня гэтай акцыі супраць мяне, аднак рашуча выступала ў маю абарону, для чаго зьбіралася на агульныя сходы і выносіла ганьбаваньне баламутам. Такі сход адбыўся ў вялікай залі ў горадзе ў кастрычніку 1968 года. І тут, як і ў Брысбэне (Аўстралія), пацьвердзіліся словы М. Горкага, што "рускія па-ранейшаму пакутуюць на сваю хранічную хваробу – лішак нягоднікаў". У мае ворагі патрапілі два ўкраінцы, адзін немец, адзін паляк і адзін савецкі патрыёт. Гэтыя людзі называлі сябе рускімі.

Мая актыўная дзейнасьць на славу Божую і на карысьць Аргентынскай епархіі Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы ня ўсім спадабалася. Гэтага дабрабыту Рускай Зарубежнай Царквы ў Аргентыне не жадалі яе ворагі сьвядомыя і несьвядомыя. Але добрае было мною зроблена, пра гэта сьведчаць Сынадальныя ўзнагароды, архіепіскапства і брыльянтавы крыж на клабуку. Сьведчаць пра гэтае добрае Уваскрэсенскі катэдральны сабор, які красуе ў Буэнас-Айрэсе, і архірэйскі дом пры ім. Сьведчаць пра гэта многія іншыя справы, пералічаныя ў разьдзеле пра Аргентынскую епархію. Вынікамі сваёй нястомнай архіпастырскай працы я быў задаволены, хоць гэта далося мне стратай здароўя. Дзякую Богу за ягоную дапамогу ва ўсіх пачынаньнях. Слава Богу, Дабрадзею нашаму, на векі вечнай. Амін.

## Разьдзел шаснаццаты

# Архіепіскап Аўстралійскі

У далёкай Аўстраліі, дзе сьвятарстваваў архіепіскап Сава, узьніклі вялікія хваляваньні вакол катэдральнага сабора і сярод яго прыхаджанаў. Састарэлы архіепіскап і яго вікарый епіскап Канстанцін справіцца не маглі. У такіх абставінах успомнілі пра мяне.

Архіепіскап Сава і раней пісаў мне лісты, у якіх запрашаў перасяліцца ў Сіднэй, лічыў мяне свабодным архірэем без епархіі. Аднак у гэтых лістах нічога канкрэтнага не прапаноўваў. На іх я не зьвяртаў увагі, адпісваў толькі агульнымі фразамі для ветлівасьці. Ён нават пісаў нешта мітрапаліту Філарэту, бо той запытваўся ў мяне, ці ня думаю я паехаць у Аўстралію. Але гэта было толькі ліставаньне, якое ня мела канкрэтных вынікаў.

На пачатку верасьня таго ж 1969 года быў скліканы Архірэйскі Сынод у пашыраным складзе, які пастанавіў наступнае:

"... 23 жніўня – 15 верасьня 1969 года слухалі пісьмовыя даклады епіскапа Канстанціна пра рэгістрацыю Саборнага прыходу ў Сіднэі і архіепіскапа Савы пра стан рэчаў у Аўстралійска-Новазэляндзкай епархіі. Архіепіскап Сава зноў зьвяртае ўвагу на тое, пра што ён ужо і раней пісаў, што Прасьвятарны Архіепіскап Афанасій, як асоба з вышэйшай багаслоўскай адукацыяй, выдатны кананіст і дасьведчаны адміністратар, мог бы быць карысным для Аўстралійскай епархіі. Цяпер архіепіскап Сава падкрэсьлівае, што ў дадзеных абставінах архіепіскап Афанасій патрэбны ў Аўстраліі, калі мы жадаем захаваць епархію ў нашай Зарубежнай Царкве. Таму Прасьвятарны Сава лічыць неабходным хуткі перавод архіепіскапа Афанасія ў Аўстралію для ўзначальваньня Аўстралійска-Новазэляндзкай епархіі. Пасьля абмеркаваньня гэтага пытаньня пастанавілі:

1. Прасьвятарнага Архіепіскапа Саву па настойлівай ягонай просьбе, з прычыны ягонай хваробы, вызваліць ад кіраваньня епархіяй з падзякай яму за шматгадовую працу па кіраваньні епархіяй з тым, што ён прызначаецца прадстаўніком Архірэйскага Сыноду для названай епархіі.

2. Прасьвятарны Архіепіскап Афанасій пераводзіцца з катэдры Буэнас-Айрэскай і Аргентынскай на катэдру Аўстралійска-Новазэляндзкую. Даверыць яму безадкладна прывесьці ў выкананьне памянёнае прызначэньне і пачаць кіраваньне Аўстралійска-Новазэляндзкай епархіяй".

На катэдру Аргентынскай епархіі быў прызначаны архіепіскап Чылійскі Лявонцій (Філіповіч), які шмат гадоў марыў пра гэта.

Перамяшчэньне мяне ў Аўстралію было вялікай нечаканасьцю для мяне. Архірэі не палічылі патрэбным, хоць бы па братэрскай ветлівасьці, запрасіць па тэлефоне ці тэлеграмай маёй згоды, як гэта звычайна рабілася ў іншых выпадках з іншымі архірэямі. Пра гэты перавод я даведаўся з ліста епіскапа Савы (Сарачэвіча) Эдмантанскага, вікарыя Канадзкай епархіі, які пасьпяшаўся паведаміць мне пра гэта прыватным чынам. Даведаўшыся пра свой перавод, я адразу паслаў тэлеграму мітрапаліту Філарэту з просьбай спыніць дзеяньне гэтай пастановы. У дадатак да тэлеграмы даслаў яму грунтоўны і матываваны ліст па той самай справе. Ні адказу, ні зьменаў не адбылося. Высьветлілася, што мітрапаліт ужо адпачываў у Сан-Францыска (Каліфорнія), куды ён паехаў цягнікам пасьля заканчэньня паседжаньня Архірэйскага Сыноду. На мой ліст адказаў зь вялікім спазьненьнем з Сан-Францыска, напісаўшы, што ня можа адмяніць пастановы Сыноду адносна мяне. Тады я выслаў яму другі ліст з настойлівай просьбай пакінуць мяне ў Аргентыне. У ім я прапаноўваў выправіцца ў Аўстралію толькі часова на тры месяцы з мэтай пазнаёміцца там з абставінамі і па магчымасьці дапамагчы ў спрэчнай справе. Адказу ад мітрапаліта Філарэта не было.

У хуткім часе мяне пачалі атакаваць лістамі і тэлефонамі з Сіднэя, знаёмілі мяне з сутнасьцю спрэчкі вакол сабора. Мяне прысьпешвалі з прыездам у Аўстралію, бо вікарны епіскап Канстанцін, мой былы падначалены сьвятар у Германіі, арганізаваў кампанію супраць мяне і майго прызначэньня туды. На мой запыт адносна епархіяльных спраў ён адказаў мне з рэкамэндацыяй не сьпяшацца з прыездам, пакуль усё не супакоіцца. Пісаў мне і архіепіскап Сава са шкадаваньнем, што мяне не было ў Сіднэі, калі там пачалася спрэчка. Я, на ягоную думку, не дапусьціў бы гэтага. Адным словам, карціна падалася мне вельмі змрочнай і я выпраўляўся туды, як на баявы фронт.

Адкладваць на доўгі час свой ад’езд у Аўстралію я ня мог, бо ў Сынадальнай пастанове было вызначана мне безадкладна пачаць кіраваньне Аўстралійскай епархіяй. Апрача таго, з дня на дзень я чакаў прыбыцьця майго намесьніка архіепіскапа Лявонція, якому я пісаў, запрашаў прыехаць, каб прыняць ад мяне Аргентынскую епархію. Я вырашыў выяжджаць у Аўстралію. Назначыў на нядзелю 17 лістапада разьвітальную літургію з прыхаджанамі катэдральнага сабора, а на наступны дзень адлёт аэраплянам у Нью Ёрк. Адразу ж напісаў лісты мітрапаліту Філарэту і членам Архірэйскага Сыноду з просьбай сабрацца ў Сынодзе да майго прыбыцьця, каб перагледзець маю справу з прызначэньнем у Аўстралію.

З болем у сэрцы я разьвітваўся з прыхаджанамі і Аргентынскай епархіяй, дзе столькі працаваў для яе арганізацыі. Прыляцеў у Нью Ёрк і зьявіўся ў Сынод. Ніхто з архірэяў не прыехаў туды, як я прасіў. Мітрапаліт адпачываў у Сан-Францыска і займаўся сваім улюбёным заняткам – лоўляй рыбы. Архіепіскап Нікан сказаў мне, што без мітрапаліта Сынод ня можа адбыцца. Мне нічога не заставалася, як толькі выправіцца ў Сіднэй на цяжкі подзьвіг. Паведаміў туды пра дату свайго прылёту аэрапляном.

Мой маршрут у Сіднэй: Нью Ёрк, Лос-Анжэлес, Ганалулу і Аўстралія. У Лос-Анжэлесе праводзіў мяне архіепіскап Антоній Сан-Францыскі, вельмі ўважлівы да мяне, што падалося мне падазроным, бо раней ён такім ня быў. З цяжкім пачуцьцём я вандраваў усю падвойную ноч, ня спаў, а думаў пра наступныя пакуты. Я добра ўсьведамляў, што чакае мяне ў Сіднэі. Пры набліжэньні да Сіднэя ахапіла мяне цяжкае шчымлівае прадчуваньне, у выніку зьявіліся сьлёзы, якія яшчэ больш засмучалі і непакоілі. Сходзіў я з аэрапляна ў Сіднэі на аэрадроме маркотны і заплаканы. У такім стане мяне сустрэлі абодва вікарныя епіскапы: Канстанцін і Феадосій. Сустракалі на аэрадроме і прадстаўнікі прыхаджанаў сабора: царкоўны стараста і іншыя. Епіскапы павезьлі мяне ў архірэйскую рэзыдэнцыю ў Кройдан.

Прыбыў я ў Сіднэй 9 сьнежня. З таго моманту пачаліся мае пакуты, а дакладней Галгофа. Адразу ж пасьля прыбыцьця наведаў катэдральны сабор і архіепіскапа Саву, які знаходзіўся ў манастыры ў 55 мілях ад Сіднэя. Архіепіскап выказаў мне свае пажаданьні, падобныя да інструкцыі. Былі са мной абодва вікарныя епіскапы. Неспадзявана ашаламілі мяне сваімі размовамі і непрыемнымі патрабаваньнямі, асабліва епіскап Канстанцін. Епіскап Феадосій загадкава маўчаў. З гэтай першай сустрэчы з трыма архірэямі зьявілася ўражаньне, што трапіў у асінае гняздо. Зразумеў тады, што яны пойдуць супраць мяне, калі я прыму рашэньне не ў іхнім духу. Так і здарылася.

Пазнаёміўся з епархіяльнымі справамі. Вяліся яны своеасабліва і не па царкоўных правілах (маю на ўвазе Палажэньне пра Рускую Зарубежную Праваслаўную Царкву). Сапраўднай Епархіяльнай Рады не было, а замест яе быў нейкі своеасаблівы парлямэнт, складзены з падабраных епіскапам асобаў, ягоных прыхільнікаў. Епархіяльныя сходы з духавенства і прадстаўнікоў прыхаджанаў не склікаліся шмат гадоў. Я разумеў, што неабходна склікаць гэты сход і выбраць на ім епархіяльную раду. Мне здавалася, што гэтыя два органы епархіяльнай улады могуць шмат у чым дапамагчы. Спраўджваць гэтую думку я і пачаў.

Епархіяльны сход я склікаў падчас дзяржаўнага аўстралійскага сьвята, калі ўсе вольныя ад заняткаў і службы. Некаторыя папярэдзілі

мяне, каб я яго не склікаў. Але я лічыў, што горш, чым цяпер, ня будзе. Спадзяваўся на разважлівасьць сьвятароў і дэлегатаў ад вернікаў з кожнага прыходу. У сваіх меркаваньнях я моцна памыліўся. На сходзе выступалі рэвалюцыянэры з правакацыйнымі прамовамі пры суцэльным абыякавым маўчаньні астатніх, якія маглі б выказаць карысную для справы думку. На жаль, такіх не знайшлося. Высьветлілася, што епіскап Канстанцін паклапаціўся добра падрыхтаваць і перацягнуць на свой бок больш актыўных, якія і выступалі на сходзе. Епіскапа Канстанціна падтрымліваў і протаіерэй Р. Ган, адзін з настаяцеляў сіднэйскіх прыходаў, вядомы алькаголік. З цяжкасьцю мне ўдалося дамагчыся выбару кандыдатаў у Епархіяльную Раду, куды ўвайшоў той самы а. Ган.

Мае і прыхаджанаў катэдральнага сабора супраціўнікі агітавалі і сваёй агітацыяй дэзінфармавалі праваслаўных прыхаджанаў у Сіднэі і ў епархіі. Дзеля супраціўленьня гэтаму я пачаў выдаваць на рататары “Епархіяльны весьнік”, дзе зьмяшчаў свае распараджэньні і паведамленьні пра царкоўнае жыцьцё. Архіепіскап Сава, які ўжо знаходзіўся на спачынку, быў незадаволены гэтым выданьнем і напісаў мне рэзкае пасланьне з патрабаваньнем закрыць “Весьнік”. У спакойным тоне я растлумачыў яму карысьць і неабходнасьць гэтага выданьня. Яго ўцягвалі ў царкоўныя справы супраціўнікі маіх захадаў.

Важнай і галоўнай справай для унармаваньня царкоўнага жыцьця ў Сіднэі была зьмена праведзенай юрыдычнай рэгістрацыі Саборнага прыходу, з прычыны якой ускалыхнулася ўсё царкоўнае жыцьцё ня толькі ў Сіднэі, але і ў епархіі. Агітацыя са скажэньнем рэчаіснасьці спрыялі гэтаму. Для унармаваньня гэтага жыцьця Сынод і прызначыў мяне ў Аўстралію насуперак майму жаданьню. І ў гэтым кірунку я зрабіў тое, што было магчыма, на карысьць епархіі і царкоўнага жыцьця. Але гэтага не хацелі царкоўныя баламуты і злосна агітаваўшыя групы людзей, захопленых не інтарэсамі царквы, а ўласнымі амбіцыямі і царкоўным бунтам. Былі выступы раней і супраць архіепіскапа Савы, але яны ня мелі посьпеху і спыняліся. У дадзеным выпадку склаліся спрыяльныя ўмовы, пры якіх баламуты ўзвысілі таемна свой голас. Гэтыя абставіны я ўлічваў і дзейнічаў з асьцярожнасьцю і надзеяй на разважлівасьць.

Руская прыказка кажа, што адзін заварыў кашу, а другі мусіць яе расхлёбваць. На маю долю выпала няшчасьце расхлёбваць кашу, завараную архіепіскапам Савам і яго вікарыем епіскапам Канстанцінам. Усё пачалося пасьля таго, як з благаславеньня архіепіскапа Саввы, як епархіяльнага архірэя, прыходзкая рада Петрапаўлаўскага прыходу катэдральнага сабора правяла па аўстралійскіх законах складаную юрыдычную рэгістрацыю (інкарпарацыю) свай-

го прыходу пад назвай “Царкоўная супольнасьць”. Такія рэгістрацыі былі праведзеныя ва ўсіх прыходах ЗША і Канады, а таксама ў дзяржавах Паўднёвай Амэрыкі і Заходняй Эўропы. Архіепіскап Сава згадзіўся на рэгістрацыю і зацьвердзіў пастанову агульнага сходу прыхаджанаў пра гэта, але пасьля зьмяніў сваё стаўленьне і запатрабаваў адмяніць праведзеную рэгістрацыю на падставе некаторых цьмяных параграфаў юрыдычнага статуту прыходу. Прыход не згадзіўся адмяніць яе, баючыся, каб у будучыні катэдральны сабор, пабудаваны ягонымі высілкамі і ахвярамі, не трапіў у неадпаведныя рукі. Узьнялася праз гэта спрэчка архіепіскапа Савы з сабаранамі. Ён перастаў служыць у саборы ў знак свайго пратэсту. Сам ён хварэў і перадаў кіраваньне епархіяльнымі справамі свайму вікарыю епіскапу Канстанціну. Той забараніў у сьвяшчэннаслужэньні двух старэйшых сьвятароў: мітрафорнага протаіерэя Феадара і архімандрыта Веніяміна. У саборы праводзіў Набажэнствы хворы протаіерэй Анатолій. У такі спрэчны час прыбыў я ў Сіднэй.

Руская праваслаўная супольнасьць ў Сіднэі была падзеленая на прыхаджанаў сабора ў колькасьці 500 чалавек і іхніх супраціўнікаў з нагоды рэгістрацыі. З самага пачатку я ўпэўніўся, што адмяніць рэгістрацыю немагчыма, як хацелі яе супраціўнікі, але я прапанаваў кампраміснае вырашэньне – зьмяненьне параграфаў зарэгістраванага статуту ў духу кананічных правілаў. Сабаране ахвотна пагадзіліся і зрабілі новую рэдакцыю гэтых параграфаў у прымальным пляне. Сынод зацьвердзіў гэтыя зьмены, ухваліў іх і даслаў мне пастанову пра гэта, параіўшы спыніць грамадзянскі судовы працэс, пачаты архіепіскапам Савам і епіскапам Канстанцінам. Але такое вырашэньне справы падалося непрымальным для супраціўнікаў рэгістрацыі на чале з архіепіскапам Савам. Да ведама ўсіх я выдаў ухваленыя Архірэйскім Сынодам зьмененыя параграфы, але гэтая публікацыя выклікала незадаволенасьць сярод супраціўнікаў. Гэтыя супраціўнікі пачалі кампанію варожасьці і хлусьні супраць мяне, пакінуўшы ўбаку прыхаджанаў катэдральнага сабора.

З супраціўнікаў рэгістрацыі ўтварылася так званая ініцыятыўная група, што і пачала дзейнасьць. Усю сваю акцыю яна скіравала супраць мяне як епархіяльнага архірэя. У яе склад увайшлі вопытныя правакатары, агітатары і бессаромныя махляры. Мала таго, што на словах, дык яны друкавалі лістоўкі супраць мяне і раздавалі іх прыхаджанам у храмах і каля іх, а таксама на гарадзкіх станцыях каля цэркваў. Мне тэлефанавалі і пагражалі забойствам, калі я не паеду з Аўстраліі. Акружылі мяне таемнымі шпіёнамі і даносчыкамі, якія падслухоўвалі размовы, калі хто з наведвальнікаў быў у мяне. На ўсяночнай і на літургіі на наступны дзень з нагоды прастольнага сьвята

архірэйскай Крыжовай Царквы Усіх Сьвятых Расеі харысты адмовіліся сьпяваць падчас гэтых Набажэнстваў. Яны стаялі на клірасе і не дазвалялі сьпяваць добраахвотнікам. З пагрозамі прымусілі пакінуць царкву маіх іпадыяканаў і прыслужнікаў. Крыжовы ход пасьля літургіі вакол храма я зьдзяйсьняў пад аховай скаўтаў, якія акружылі мяне ланцугом. Архіепіскап Сава і епіскап Канстанцін гэта ведалі, але самі ўсхвалялі і бласлаўлялі дзеяньні такога кшталту “Ініцыятыўнай групы”.

Душой я адпачываў падчас служэньня ў катэдральным саборы. Ён заўсёды быў напоўнены багамольцамі. Да мяне ставіліся як да архіпастыра – з любоўю і павагай. У саборы я служыў часта.

Пакуль яшчэ можна было, я зьбіраў дарослую моладзь на духоўныя размовы. Прыяжджалі многія. Мне было прыемна бачыць гэтую моладзь і весьці з ёй гутаркі. Яны цікавіліся рэлігійнымі пытаньнямі, таму і прыходзілі ў вялікай колькасьці, запаўняючы вялікую залю пры царкве ў рэзыдэнцыі архірэя. Але ворагі і тут пачалі свае дзеяньні. Яны падсылалі правакатараў, якія не давалі мне спакойна весьці размовы з моладзьдзю, перапынялі мяне і задавалі правакацыйныя пытаньні. Асабліва старалася адна маладая замужняя жанчына, на якую я наклаў за яе паводзіны эпітымію. Яна, вядома, не падпарадкоўвалася. Я быў вымушаны спыніць духоўныя размовы.

Пра жахлівае становішча ў Сіднэі я пісаў свае даклады мітрапаліту Філарэту, але суцяшальных адказаў з Сыноду мне не дасылалі. Я прасіў вызваліць мяне і вярнуць мне Аргентынскую епархію. На гэта Сынод адказаў, што ён зацьвярджае мяне на Аўстралійскай катэдры, а вярнуць Аргентынскую епархію ня можа. У Сынодзе былі задаволеныя маім становішчам. Там сяброў маіх не было, але былі ворагі: архіепіскапы Серафім і Нікан. Ад іх я меў шмат непрыемнасьцяў.

***

У згаданых умовах майго жыцьця ў Сіднэі настаў ліпень 1970 года – па-аўстралійску гэта быў зімовы месяц, а па-паўночна-амэрыканску – сьпякотнае лета. Мітрапаліт Філарэт паехаў у Сан-Францыска на адпачынак, яго замяняў у Нью Ёрку архіепіскап Нікан. У Сынод паступалі паклёпніцкія даносы на мяне ад епіскапа Канстанціна, протаіерэя Гана і “Ініцыятыўнай групы”. Архіепіскап Нікан даслаў пастанову архіепіскапу Саву, як прадстаўніку Архірэйскага Сыноду, з даручэньнем склікаць усіх архірэяў: архіепіскапа Афанасія, епіскапаў Канстанціна і Феадосія – і абмеркаваць з імі дадзенае становішча епархіі і знайсьці выйсьце з гэтага становішча. Даручэньне было адразу ж выкананае. Архірэі не маглі нічога вырашыць з прычыны ра-

зыходжаньня ў думках. Нэрваваўся епіскап Канстанцін, сыпаў усялякія вулічныя “Ініцыятыўнай групы” абвінавачваньні ў мой адрас. Я вырашыў пакінуць паседжаньне, бо старшыня архіепіскап Сава яго не спыняў. Але ўсё ж нейкую пастанову вынесьлі і ўсе падпісалі. Архіепіскап Сава адаслаў яе ў Сынод.

Хутка прыйшла новая пастанова з Сыноду за подпісам на гэты раз мітрапаліта. У пастанове запрашалі прыехаць на паседжаньне Сыноду мяне і вікарных епіскапаў па жаданьні. Быў вызначаны тэрмін паседжаньня. Першым вылецеў епіскап Канстанцін з дэлегацыяй маіх супрацоўнікаў. Епіскап Феадосій застаўся. Я замарудзіўся з адлётам, бо пісаў даклады ў Сынод пра становішча ў Аўстралійскай епархіі. Калі ж я прыляцеў у Нью Ёрк і прыехаў у Сынод, то там застаў епіскапа Канстанціна з дэлегацыяй, якія ўжо пасьпелі абылгаць мяне перад усімі членамі Сыноду. Епіскап Канстанцін зьвяртаўся да членаў Сыноду: “Выратуйце епархію і прыбярыце архіепіскапа Афанасія!” І гэта рабіла на іх уражаньне.

Архірэйскі Сынод у пашыраным складзе сабраўся на сваё паседжаньне, калі я прыбыў на месца. Маіх дакладаў не захацелі слухаць, хоць я і прачытаў адзін. Яшчэ да майго прыбыцьця было вырашана звольніць мяне на спачынак. У гэтым я не сумняваўся перад адлётам з Сіднэя ў Нью Ёрк. Чакаючы звальненьня, я прыбраў свае рэчы з архірэйскіх пакояў у Кройдане і вызваліў іх для новага архірэя.

Такім чынам, я застаўся без епархіі, без службы, на становішчы беспрацоўнага. Мне было цяжка гэта ўсьведамляць, але я перанёс гэты ўдар мужна, умацоўваючыся малітвай. У Сынодзе абышліся са мной несправядліва і няшчыра. Ніхто не выказаў мне спачуваньня. Думалі і чакалі, што, магчыма, я перайду ў другую юрысдыкцыю і тады расправіліся б са мной, але я застаўся. Крыўду прычынілі мне вялікую, але я перанёс яе глыбока ў маім сэрцы, аддаўшы гэтую справу на Божы суд. Я разумеў, што ўладыкі абышліся са мной, як з чужым для іх. Адзін са старэйшых уладыкаў на паседжаньні Сабору Епіскапаў пакрыкваў на сэрба епіскапа Саву, калі той выказваў свае думкі па разгляданым пытаньні: “Вы сэрб і замаўчыце. Вам няма справы да нашых пытаньняў”. І гэта прайшло пры поўным маўчаньні астатніх, якія, відаць, пагаджаліся.

Калі ў Сіднэі даведаліся пра маё звальненьне з Аўстралійскай епіскапскай катэдры, неадкладна прыляцела дэлегацыя ў складзе чатырох чалавек з надзеяй выратаваць мяне. Пасьля паседжаньня Архірэйскага Сабору мітрапаліт паехаў у Каліфорнію, разьехаліся і ўсе іншыя епіскапы. Я застаўся ў Сынодзе і наведаў сваіх сяброў і землякоў у Саўт-Рывэры, недалёка ад Нью Ёрка. Там існаваў беларускі прыход, што знаходзіўся ў юрысдыкцыі Канстантынопальскага пат-

рыярха. Дэлегаты, якія прыбылі з Сіднэя, выклікалі мяне ў Сан-Францыска. Яны папрасілі аўдыенцыі ў мітрапаліта. Мітрапаліт доўга вагаўся, але прыняў холадна. Прасілі яго прызначыць мяне настаяцелем катэдральнага сабора ў Сіднэі з падпарадкаваньнем менавіта Архірэйскаму Сыноду. Іхнюю просьбу не задаволіў. Са мной мітрапаліт пазьбягаў сустракацца і размаўляць. З мужам і жонкай Букасевымі, што былі ў ліку дэлегатаў, па іх запрашэньні, я паляцеў у Сіднэй, прагасьцяваўшы некалькі дзён у Сан-Францыска ў свайго былога старога казацкага сьвятара а. Масіча, настаяцеля Сынадальнага падворку ў Бурлінгаме.

Беларусы ў Паўночнай Амэрыцы не аднойчы запрашалі мяне перайсьці ў грэцкую юрысдыкцыю, у якой яны знаходзіліся. Я вырашыў застацца на спачынку і чакаць вырашэньня свайго лёсу.

## Разьдзел сямнаццаты

# На спачынку
# (1970 – 1971)

Вяртаючыся з ЗША ў Аўстралію, я затрымаўся са сваімі спадарожнікамі ў Ганалулу на тры дні з мэтай агледзець славутасьці гэтага вядомага вострава і горада. Пры дапамозе турыстычнага аўтобуса гэта было нескладана. Паведамілі ў Сіднэй сабаранам пра нашае вяртаньне.

У Сіднэі на аэрадроме, нягледзячы на раньні час, прыбылі мяне сустракаць больш як сотня прыхаджанаў катэдральнага сабора. Былі, вядома, і супраціўнікі ў ролі гледачоў. Стаялі здалёк. Прыхаджане падыходзілі да мяне, прасілі бласлаўленьня, спачувалі, але мала што разумелі пра сутнасьць справы. Муж і жонка Букасевы забралі мяне ў свой аўтамабіль і адвезьлі ў свой багаты дом ня толькі ў госьці, а пакінулі на пастаяннае жыхарства, атуліўшы клопатам і ўвагай.

На аўстралійскую архірэйскую катэдру часова прызначылі хворага архіепіскапа Саву. Многія зьдзіўляліся мудрасьці Архірэйскага Сыноду, які здаровага архірэя выправіў на спачынак, а хворага прызначыў кіраваць епархіяй. Але гэта было часова. Неўзабаве на ягонае месца прызначылі вікарнага епіскапа Феадосія.

Пры звальненьні мяне на спачынак дазволілі мне члены Сыноду правесьці толькі адну літургію і разьвітацца з прыхаджанамі. Замест сабора епіскап Феадосій дазволіў мне служыць у прыходзкай Сьв.-Мікалаеўскай царкве ў прадмесьці Бэнкстаўне, дзе настаяцельстваваў архімандрыт Веніямін, мною прызначаны.

Несправядліва і неразумна ставіліся да мяне кіруючыя архірэі: мітрапаліт і епіскап Феадосій. Як, напрыклад, памёр настаяцель катэдральнага сабора протаіерэй А. Гільчэнка, епархіяльны архірэй епіскап Феадосій не прыслаў сьвятара і сам не прыехаў адпяваць яго ў саборы, у якім памерлы служыў. Не было каму яго адпяваць і праводзіць на могілкі. Я прасіў іх дазволу адпяваць яго, але мне не дазволілі адпяваць у саборы. Я мусіў адпяваць яго ў англіканскім храме на гарадзкіх могілках. Мне саслужылі не епархіальныя сьвятары: архімандрыт Веніямін і мітрафорны протаіерэй Феадор Міхалюк, былы сакратар епархіяльнага праўленьня пры архіепіскапе Феадоры (памёр 5.5.1955). Усе прыхаджане сабора былі абураныя адносінамі ўладык да памерлага.

Пасьля скону а. Гільчанкі прыхаджане катэдральнага сабора за-

сталіся без сьвятара. Епіскап Феадор не прызначыў новага настаяцеля, якога сабаране маглі б прыняць з радасьцю і любоўю. Па маёй парадзе яны зьбіраліся ва ўсе нядзельныя і сьвяточныя дні ў саборы, слухалі сьпевы хору богаслужбовых сьпеваў і чытаньне часоў, Апостала і Эвангельля. Такая практыка была вымушаная, але ў жаночых манастырах, дзе не было сьвятара, манашкі маліліся без сьвятароў. У старой Русі так бывала і ў мужчынскіх манастырах – без сьвятароў. Нягледзячы на гэтае сумнае становішча, сабор быў запоўнены вернікамі. Я сам зьдзіўляўся адданасьці сабаранаў. З імі я часта маліўся.

Надышлі велікодныя дні. Сьвятара не было. Мне не дазваляў служыць епархіяльный архірэй. Вернікі запаўнялі сабор на ўсе Набажэнствы ў гэтыя сьвятыя дні. Дванаццаць эвангельляў у вялікі чацьвер чытаў цывільны вернік, таксама па-цывільнаму выносілі сьв. Плашчаніцу. Трагічна чакалі надыходу вялікай суботы і велікоднай ночы. Мне шкада было да сьлёз няшчасных прыхаджанаў сабора без сьвятара. Я вырашыў сам зрабіць ім радасьць Вялікадня сваім нечаканым служэньнем у саборы, прыступіў да сьвятых дзеяньняў на сваю асабістую рызыку. О, як жа радасна прынялі мой выступ у сьвятую Ноч! З якім радасным пачуцьцём яны сьпявалі ў час крыжовага ходу і адказвалі на мае велікодныя прывітаньні: “Хрыстос уваскрэс!” Мне здавалася, сьцены сабора радаваліся разам з вернікамі ў гэтую сьв. Велікодную Ноч. Архірэйскі Сынод не адважыўся выкарыстаць санкцыі да мяне за гэтае маё велікоднае Набажэнства.

У свой свабодны час я пісаў даклады ўсім епіскапам Зарубежнай Царквы пра памылкі Сыноду і несправядлівае стаўленьне да мяне. Такіх дакладаў я напісаў некалькі і разаслаў іх па адрасах. Ніхто мне не адказаў на іх – баяліся. Але мне важна было, каб ведалі пра гэта. Тады я пераканаўся, што нашы архірэі заклапочаныя толькі сваімі епархіямі і самімі сабою. Да іншых ім справы няма. Выяўляўся ў нейкай ступені эгаізм, а таксама адсутнасьць братэрскай любові і спачуваньня да іншых. Аднак я нікога не асуджаў і нічога ад іх не жадаў, але маліўся: “Збаў мяне, Божа, ад паклёпаў чалавечых і хай не пануе ўсялякае беззаконьне”.

Хоць я знаходзіўся на спачынку, але спакою мне не давалі. Мае супраціўнікі працягвалі паклёпнічаць на мяне адкрыта, асабліва з нагоды апублікаванай мною брашуркі пра ўмовы майго жыцьця і дзейнасьць у Аўстраліі. У ёй я апісаў усе нягоды, якія мне выпалі, калі я быў на аўстралійскай архірэйскай катэдры. Гэта не спадабалася маім ворагам. Прыдзіраўся да мяне таксама епіскап Феадосій, які патрабаваў ад мяне, слухаючы маіх ворагаў, выяўленьня нейкай ляяльнасьці да Архірэйскага Сыноду ў пісьмовай форме і апублікаваньня ў салідарысцкай рускай газэце ў Мэльбурне “Единение”. Ён

апраўдваўся тым, што яму загадаў мітрапаліт Філарэт запатрабаваць ад мяне гэтую ляяльнасьць. Ад мяне патрабаваць ляяльнасьці да Архірэйскага Сыноду і, відавочна, Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы, хто праслужыў гэтаму Сыноду і Царкве вераю і праўдаю 25 гадоў, было формай зьдзеку нада мною, старым архірэем і па гадах і па сане! Маліўся словамі Псалмапеўца: "Збаў мяне, Божа, ад прыгнёту чалавечага і ад чалавека хлусьлівага і несправядлівага".

Па-ранейшаму я знаходзіў сабе суцяшэньне сярод прыхаджанаў катэдральнага сабора, з якімі вёў духоўныя размовы ў прысаборнай залі ў нядзельныя дні ўвечары. Размовы былі на тэмы багаслоўскія і рэлігійна-асьветныя. Душэўна я адпачываў у доме Букасевых, дзе мне было добра і ўтульна, а таксама гасьцінна.

Знаходзячыся на спачынку, я атрымліваў шмат лістоў ад старых сяброў з розных краінаў, нават з Савецкага Саюза, і ад сваёй паствы з Аргентыны. Усім адказваў і ўсім распавядаў пра сваё жыцьцё. У Савецкім Саюзе сьвятарствавалі мае ўнівэрсытэцкія калегі і многія мае інтэрнацкія багаслоўскага факультэта ў Варшаве студэнты. Лёс іх раскідаў па вялізнай тэрыторыі гэтай краіны, як і нас на эміграцыі. "Адтуль" пісалі асьцярожна і коратка, баючыся цэнзуры і нагляду дзяржаўных арганаў. Пісалі мне праз сваіх знаёмых у ЗША ці проста на адрас краіны, дзе я жыў, без пазначэньня горада і вуліцы, а на канвэрце пісалі толькі па-руску: "Архіепіскап Афанасій". Ліст даходзіў і пошта прыносіла мне.

З ЗША і Канады, з Германіі і Францыі, з Паўднёвай Амэрыкі мне пісалі сябры, выказвалі сваё спачуваньне з нагоды майго звальненьня на спачынак.

Ніжэй мне падалося патрэбным і важным прывесьці вытрымкі з лістоў маіх сяброў, каб паказаць, як і ў якой ступені кожны з іх успрыняў і перажыў Сынадальны акт аб маім звальненьні на спачынак. Не называю прозьвішчаў, бо гэта не патрэбна.

> "Ваш прымусовы сыход на спачынак нас моцна ўсхваляваў той несправядлівасьцю, якую выявіў у адносінах да Вас Сынод Зарубежнай Царквы..."
>
> "Дарагі Ўладыка! Сабраўся аднесьці ліст на пошту, але перажываючы ўсё, што адбылося з Вамі, ня спаў усю ноч, абдумваючы, і прыйшоў да высновы, што Ваша звальненьне – вынік інтрыг супраць Вас..."
>
> "Ваша Велясьвятарнасьць, шаноўны і дарагі Ўладыка! Мы зьбянтэжаны ня толькі самім фактам звальненьня Вас на спачынак, выдатнага Герарха, без Вашай просьбы, але таксама і яго сапраўднымі прычынамі, хоць і старанна прыхаванымі. Калі мы

ўспомнім, што яшчэ нядаўна Вас бяз Вашай волі перавялі з Аргентыны ў Аўстралію, то атрымліваецца яскравая карціна злоснай і няшчырай інтрыгі. Не хацелася дасюль верыць, што ў асяродку герархаў нашай Зарубежнай Царквы ёсьць асобы, якія асабістыя зацікаўленьні кар'ернага характару паставілі вышэй за інтарэсы сьв. Царквы...”

“Нават мітрапаліт і Сынод нам нічога не адказваюць на нашы просьбы і патрабаваньні вярнуць Вас да нас у Аргентыну. Асобы, што сядзяць у Сынодзе, ня маюць Бога ў сэрцы сваім, чыняць поўнае самавольства і беззаконьне. Тое, што зрабілі з Вамі архірэі, гэта злачынства...”

“Мы зьбянтэжаны несправядлівасьцю, выяўленай у адносінах да Вашай Велясьвятарнасьці. Мы вельмі хвалюемся, бязьмежна спачуваем. Гэтая падступная гульня, вядома, была прадуманая і распрацаваная загадзя. Яны ведалі, што адразу ўзяць і прыбраць Вас з Аргентыны – выкліча буру пратэстаў, а таму перавялі Вас у Аўстралію, ведаючы, што за кароткі час там Вы не пасьпееце набыць шмат сяброў. Але такую подлую ролю адыграў аўстралійскі Сава! Ён прасіў менавіта Вас туды прызначыць і, калі прызначылі, паступіў так жахліва. Вас прыбралі з дарогі. Усё ўзятае разам вельмі і вельмі прыкрае. Чалавек, калі ня верыць і не паважае князёў Царквы, можа дайсьці да атэізму ўвогуле...”

“Рашэньне Сыноду, якое выключыла архіепіскапа Афанасія з ліку кіруючых епіскапаў Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы, мы, ніжэй падпісаныя, лічым несправядлівым і жорсткім, незразумелым многім сотням праваслаўных вернікаў ня толькі Аргентынскай і Аўстралійскай епархій, але і ўсёй Замежнай Царквы” (прашэньне аргентынскай паствы).

“А Аргентынскай епархіі не спакойна – хваляваньні. Мітрапаліт і Сынод страцілі прэстыж. Становішча ствараецца складанае...”

“Нечаканая вестка, што Сынод звольніў Вас у заштат, як гром з яснага неба, узрушыла і ўсхвалявала ў Буэнас-Айрэсе ўсіх нас. Адважыцца на выдаленьне такога заслужанага Архіпастыра, як Вы, Ваша Велясьвятарнасьць, калі паўсюль адчуваецца востры недахоп ня толькі ў энэргічным і адукаваным духавенстве, але і нават у звычайных сьвятарах, могуць толькі тыя, што ставяць свае зацікаўленьні, асабістыя і групавыя, вышэй за ўсё, нават за Царкву...”

“Ваша Велясьвятарнасьць, Дарагі Уладыка! Прыкрае ўсё тое, што адбылося і адбываецца ў Аўстраліі. Нам збоку разабрацца ва ўсім гэтым не магчыма. Усёй душой спачуваю Вам. Ведаю толькі адзінае, што ўладыка Сава сам запатрабаваў Вас неадкладна ў Аўстралію як адзінага чалавека, які можа выратаваць епархію. Я ж прызвычаіўся бачыць у Вашай асобе на Саборах пачатак разумнасьці і законнасьці. У многія пытаньні, абмеркаваныя на Архірэйскіх Саборах, Вы ўносілі парадак і яснасьць. Вы разважалі заўсёды спакойна і пераканальна, перамагаючы супрацiўнікаў лёгікай і веданьнем канонаў. І вось цяпер пасыпалася на Вас столькі бедаў і непрыемнасьцяў. Не магу нікога асуджаць, бо ад таго, што адбываецца ў Вас, я далёкі... Дапамажы Вам Гасподзь, Дарагі Ўладыка, перанесьці мужна ўсе выпрабаваньні і нягоды. Разумею, як шмат Вы зрабілі ў Аргентыне, але Вашы ворагі там разам з архіепіскапам Лявонціем зрабілі Вашае вяртаньне туды немагчымым. Мне сорамна за ўладыку Лявонція, якога Вы на Саборах заўсёды падтрымлівалі і абаранялі...” (Адзіны архірэй гэта напісаў мне.)

“Па сваім асабістым маленькім вопыце ведаю, як цяжка, невыносна цяжка, перанесьці паклёпы і несправядлівасьць, да таго ж ад сваіх братоў. Вядома, мой вопыт не параўнаны з цяжкімі выпрабаваньнямі, якія Вам выпалі. Аднак я магу сказаць, што Вы перанесьлі ўсе нягоды з хрысьціянскім гонарам і пакорай, што паслужыць для многіх прыкладам. Сустракаючыся з Вамі на Саборах у Нью Ёрку, па Вашых паводзінах я бачыў, што Вы ўсім даравалі і ня маеце да іх варожых пачуцьцяў, а толькі з шчымлівасьцю прыгадваеце мінулае. Думаю, што забыцца, выкрасьліць з памяці крыўды і напрасьліны вельмі складана. Але калі Вы здолелі так мужна вытрываць тое, што адбылося, то я ўпэўнены, што і ўспамін хутка страціць сваю вастрыню...”

“Вельмі падступна Вас падманулі. І зрабілі гэта архірэі, ахоўнікі праўды і справядлівасьці. Бог бачыць праўду, ды ня хутка скажа...”

“Агітацыя супраць уладыкі Афанасія пачалася за некалькі тыдняў да яго прыбыцьця ў Аўстралію. У Сіднэі гэтая акцыя была даручана протаіерэю Расьціславу Гану, які тэлефанаваў аднаму вядомаму грамадзкаму дзеячу з просьбай дапамагчы арганізаваць сход пратэсту супраць прызначэньня ў Аўстралію архіепіскапа Афанасія. У Сіднэі гэты пачатак ня меў вялікага посьпеху, але грамадзкі сход у Мэльбурне 2 лістапада 1969 года ў памяшканьні школы пры Пакроўскім храме (катэдральным) быў удалы. Сход вынес рэзалюцыю на імя мітрапаліта Філарэта з настойлівай

просьбай адмяніць прызначэньне архіепіскапа Афанасія ў Аўстралію. Гэты сход адлюстраваны ў паклёпніцкім артыкуле № 44 газэты “Единение” ад 7-га лістапада, г. зн. тады, калі архіепіскап Афанасій быў яшчэ за трыдзевяць зямель ад Аўстраліі” (з часопіса).

“Архіепіскап Афанасій прыбывае ў Аўстралію 9 сьнежня 1969 года з цяжкім адчуваньнем. Унутраны голас падказвае яму, што на новай ніве рыхтуецца для яго нешта нядобрае... Ззаду варожа настроены Сынод, сьпераду двое варожых архірэяў, былых сапернікаў, а цяпер аднадумцаў, а за імі злосны ашалелы ад сьляпой нянавісьці люд, разьюшаны царкоўнай грамадзкасьцю”, агітацыяй, як “жидове излиха вопияху – распни Его!” ( з друку).

“Калі архіепіскап Афанасій быў у Аўстраліі, на яго сыпаліся як з рогу дастатку зьневажаньні, даносы, правакацыі і ўсё ўласьцівае гандлярам цёмных спраў. Распаўсюджваліся лістоўкі ў цэрквах, на цьвінтарах царкоўных, на сходах; дасылаліся па пошце, а зьмест лістовак – як вышэй сказана...” (з друку).

“Пастаўлены перад неабходнасьцю выбраць паміж верай у праўду або верай у хлусьню, асьлеплены непрыязнасьцю да архіепіскапа Афанасія, Сынод прыняў ва ўвагу хлусьню...” (з друку).

Прыведзеныя цытаты з прыватных лістоў і часопісных артыкулаў сьведчаць пра тое становішча, у якім я знаходзіўся ў той час, і пра тое, што думалі цывільныя вернікі і духавенства. Пра гэта я выдаў асобную брашуру.

## Разьдзел васемнаццаты

## Архіепіскап Афанасій

У верасьні 1971 года сабраўся Сабор Епіскапаў у г. Манрэалі (Канада). Мяне ня клікалі туды, бо я знаходзіўся на спачынку, заштатам. Аднак я падазраваў, што мяне не абыдуць маўчаньнем і нешта вызначаць. Маё беспрацоўнае становішча ў Сіднэі зьяўлялася бяльмом у вачах мясцовых архірэяў. Мяркуючы, што мне могуць тэлефанаваць з Канады па нейкай справе, я папрасіў гаспадароў сказаць, што мяне няма дома, але калі патэлефануе мой сябра архіепіскап Філафей, паведаміць мне. Якраз патэлефанаваў апошні і перадаў трубку архіепіскапу Віталію. Сказаў, што я прызначаны ў Аргентыну, і запытаўся, калі я думаю туды выправіцца.

Гэтае прызначэньне мяне суцешыла тым, што ўбачу сваю аргентынскую паству і свой катэдральны сабор, у будаўніцтва якога я ўклаў столькі працы і энэргіі. З гэтай прычыны з Аргентынай мяне зьвязвалі духоўныя ніты.

Даслалі мне ўказ аб прызначэньні ў Аргентыну. З яго я даведаўся, на свой жаль, што мяне прызначылі з умовамі і пагрозамі, што ў выпадку не выкананьня іх Сынод звольніць мяне на спачынак. Апрача таго, Сынод адняў ад Аргентынскай епархіі стары Сьв.-Траецкі прыход і перадаў у вядзеньне мітрапаліту Філарэту. Такім чынам, мой аўтарытэт быў падарваны архірэямі ў прынцыпе. Відавочна, спадзяваліся, што пасьля такіх адносінаў да мяне я адмоўлюся ад Аргентыны. Чатыры архіепіскапы, члены Сабору, выказаліся супраць майго прызначэньня ў Аргентыну. Нягледзячы на ўсё гэта, я вырашыў ляцець у Аргентыну часова, пакуль мяне ня звольняць зноў на спачынак. Сваім сябрам у Сіднэі я сказаў пра тое, бо яны старанна прасілі мяне заставацца ў Аўстраліі і дажываць там свой век. Яны абяцалі купіць мне дом, дзе я мог бы жыць і зрабіць сваю дамавую царкву. З меркаваньнем на адзін год я выправіўся ў Аргентыну.

У палове сакавіка 1972 года я разьвітаўся з сябрамі ў Сіднэі. Перад маім адлётам у Буэнас-Айрэс яны ўрачыста і шматлюдна сьвяткавалі 30-годзьдзе маёй архірэйскай хіратаніі. Ганаравалі мяне банкетам у саборнай залі. Многія прыехалі на аэрадром правесьці мяне. З сумам я разьвітваўся з усімі, усьведамляючы, што яны без мяне застаюцца авечкамі без пастыра і духоўнага бацькі. Усіх натхняла надзея на хуткае маё вяртаньне да іх.

Пасьля вяртаньня ў Буэнас-Айрэс я адчуў у сваёй старой грамадзе сяброў і ворагаў, але апошнія адышлі ад мяне ў Сьв.-Траецкі пры-

ход і там замоўклі. Мая аргентынская паства была задаволеная маім вяртаньнем. Многія выказвалі ўголас сваю радасьць. Я зьвярнуў увагу на запушчаны сабор. Не было гаспадара, які з любоўю клапаціўся б пра яго. Давялося мне пасьпешліва прасіць фарбавальніка Л. Казанцава фарбаваць сабор. Неўзабаве я высьвеціў яго ў дыякана, але ён доўга не пажыў.

Мая дзейнасьць у Аргентынскай епархіі зводзілася да правядзеньня Набажэнстваў у храмах і ў сваім саборы, а таксама да пропаведзі Слова Божага. Зробленая мною спроба ўзнавіць духоўныя размовы з моладзьдзю ня мела посьпеху, бо гэтая моладзь ня ведала рускай мовы. У 1974, 1976, 1978 гадах лятаў у Нью Ёрк на паседжаньні Сабору Епіскапаў. У 1974 годзе быў на ўрачыстасьцях сьвяткаваньня 10-годзьдзя ў мітрапалітным сане ўладыкі Філарэта. У кастрычніку 1978 года наведаў Сіднэй і сваіх сяброў там. Многія ўжо памерлі, іх я згадваў у малітве. Шчымліва было ўсьведамляць, што іх больш няма ў жывых. Абставіны складваліся так, што доўга я ня мог заставацца ў Сіднэі. Архіепіскап Аўстралійскі Феадосій прапанаваў мне служыць у катэдральным саборы, што знаходзіўся ў яго вядзеньні, але я адмовіўся. Маліўся з сваімі старымі сябрамі ў іншай царкве. Наведваньне Сіднэя вельмі мяне задаволіла. Там я ліквідаваў усе свае справы і рэчы, што чакалі мяне. Вяртаўся Чылійскай авіяцыйнай лініяй. Начаваў у Саньцьяга ў архімандрыта Веніяміна ў манастыры. Зьдзівілі яго і манашкі Іўліяніі працы на карысьць дзіцячага прытулку ў іх манастыры.

На Архірэйскіх Саборах 1974 і 1976 гадоў мусіў абараняць царкоўную маёмасьць Аргентынскай епархіі ад замаху на яе з аднаго боку "Русского Очага", а з другога – Архірэйскага Сыноду, які падтрымліваў гэты "Очаг". Перамаглі правасудзьдзе і здаровы розум у гэтай справе. Маёмасьць епархіі была выратаваная ад захопу.

У 1979 годзе я сьвяткаваў 50-годзьдзе свайго пастырскага служэньня. Аргентынская паства суцешыла мяне сваім удзелам у маіх урачыстасьцях. 1980 год стаў годам маіх хваробаў у небясьпечнай для жыцьця форме...

## Заканчэньне

У заключным разьдзеле сваіх нататак хачу закрануць важную дагматычную ісьціну, у якую мы, праваслаўныя, веруем і якая выявілася ў маім жыцьці ў цудоўнай форме. Гэтая ісьціна называецца Воляй Божай. Вучэньне пра гэтую ісьціну раскрытае ў Сьвятым Пісаньні і Сьвятым Паданьні.

Вызначэньне Волі Божай чытаем у катэхізісе наступнае: “Воляй Божай называецца клопат Бога пра сьвет і чалавека, калі Гасподзь захоўвае і скіроўвае ўсталяваныя ў прыродзе законы і сілы, а калі таго недастаткова, цудадзейна дапамагае людзям, асабліва ў справе выратаваньня іх. Усё добрае ў жыцьці чалавека здараецца не выпадкова і не намі ствараецца, ад Бога нам даецца, як і сказана: “Усякі дар добры і ўсякі дар дасканалы – звыш ёсьць, і зыходзіць ад Яго – Айца сьветаў” (Як. 1, 17)”.

Пра Волю Божую ведалі старажытныя паганскія народы Грэцыі і Рыма, але называлі гэтую ісьціну “лёсам” або “конам”. Абодва паняткі ўтрымліваюцца ў сьвядомасьці многіх хрысьціян да сёньня. Іх выкарыстоўваюць вернікі часьцей у жыцьці, не разумеючы ні іх дзеяньня, ні іх значэньня. А пра Волю Божую мала ведаюць.

Сьв. Іаан Златавуст[61], архіепіскап Канстантынопальскі (III – IV стст.), казаў у адным павучаньні наступныя словы: “Калі ёсьць кон, то няма суда; калі ёсьць кон, то няма веры; калі ёсьць кон, то Бога няма; калі ёсьць кон, то няма дабрачыннасьці і няма заганы; калі ёсьць кон, то ўсё дарэмна, усё без карысьці робім і трываем; няма пахвалы, няма няславы, няма сораму, няма ганьбы, няма законаў, няма судоў”. У іншым месцы ён патлумачыў: “Ня будзем прыпісваць кіраваньне сьветам д’яблам; ня будзем думаць, што ў справах ніхто ня думае, ня будзем супрацьпастаўляць Волі Божай тыранію нейкага кону ці лёсу. Усё гэта перапоўнена блюзьнерствам”. Гэтыя паганскія вераваньні ў лёс і кон не павінны займаць хрысьціян.

Для ўмацаваньня веры ў Волю Божую сьв. Апостал Якаў павучае: “Паслухайце вы, хто кажа – сёньня ці заўтра выправімся ў нейкі горад, і пражывем там адзін год, і будзем гандляваць і атрымліваць прыбытак; вы, хто ня ведае, што здарыцца заўтра, бо што такое жыцьцё вашае? – Паравіна, што зьяўляецца на малы час і потым зьнікае. Замест таго, каб вам казаць: калі заўгодна будзе Госпаду, і жывы будзем, то зробім тое і іншае” (Як. 4, 13–15).

Гэтымі словамі сьв. Апостал Хрыстовы паказваў на тое, што ў жыцьці кожнага чалавека дзейнічае Воля Божая, ад якой залежыць

чалавечае жыцьцё. Хоць нам дараваная Богам свабодная воля, але чалавечая воля павінна стасавацца з Воляй Божай. Чалавек, які жыве па Волі Божай і выконвае запаветы Яго, знаходзіцца пад ўзьдзеяньнем Волі Божай. Старазапаветны Псалмапевец кажа: “Госпадам зацьвярджаюцца крокі праведніка. Калі ён будзе падаць, не ўпадзе, бо Гасподзь падтрымлівае яго за руку” (Пс. 36, 23–24). У іншым месцы той жа Псалмапевец павучае: “Грэшнікі ідуць сваім шляхам па сваёй волі, але іх шляхі Гасподзь пагубіць” (Пс. 145, 9). “Бязбожнікі загінуць, і ворагі Госпаднія, як тук агнецаў зьнікне, у дыму зьнікнуць” (Пс. 36, 20).

На Слове Божым стварaліся расейскія прыказкі: “Без Бога ни до порога, а с Богом хоть за море”, а таксама многія іншыя падобнага кшталту.

З маіх назіраньняў у жыцьці ў мяне склалася ўражаньні, што кожны чалавек знаходзіцца пад ўзьдзеяньнем трох сілаў духоўных: волі асабістай, чалавечай, грахоўнай; волі д’ябальскай, ліхой і згубнай; і Волі Божай, жыватворнай і выратавальнай. Воля Божая выяўленая ў запаветах Божых, у Эвангельлі. Хрысьціянін, які жыве па запаветах Божых, выконвае Волю Божую. “Богам зацьвярджаюцца крокі такога чалавека, і Ён садзейнічае на шляху яго” (Пс. 36,23).

У свае маладыя гады я мала ведаў пра ўсё гэта і сур’ёзна не задумваўся пра Волю Божую. З гэтай ісьцінай я пазнаёміўся з багаслоўскіх кніг па дагматычным багаслоўі. У іх было выкладзенае вучэньне багаслоўскае даволі сухой багаслоўскай мовай, мала даступнай для разуменьня і запамінаньня. Вывучалася толькі для атрыманьня здавальняючай адзнакі, але не ахоплівала чалавечай істоты, таму хутка забывалася. Далейшае жыцьцё мяне навучыла разумець гэтую сьвятую ісьціну вучэньня пра Волю Божую, а разуменьне яе ўмацавала маю веру.

У сьвятле веры ў Волю Божую я прасачыў усё сваё жыцьцё і зразумеў, што Міласэрны Гасподзь наш Ісус Хрыстос шматкроць выратоўваў мяне ад ілжывага жыцьцёвага шляху і скіроўваў маю волю па іншым шляху, Богам абранаму. Як магло здарыцца, што я, выхадзец з сьвецкага вясковага асяродку, здолеў стаць тым, кім стаў – сьвятаром Царквы Хрыстовай у епіскапскім сане. Толькі Гасподзь мяне выбраў і паставіў на п’едэстал гэтага высокага служэньня. І майго імкненьня да кар’еры не было. У гэтай кар’еры спраўджвалася не мая воля, а воля Ўсявышняга, калі прыгадаць, пры якіх абставінах адбылася мая хіратанія ў епіскапа.

Мая духоўная кар’ера нічым не падобная на кар’еру епіскапаў у старой Імпэратарскай Расеі. Там заканчваў малады чалавек духоўную акадэмію, прымаў пострыг і яго кар’ера ўжо была забясьпечаная. У мой час усё складвалася інакш, часьцей насуперак лёсу.

Узгадаваны ў вясковай глушы Урочышча Завітая, я палюбіў вясковае жыцьцё, яго цішыню, прыгажосьць прыроды. І ў маладосьці, пасьля заканчэньня шасьці клясаў гімназіі, я захацеў стаць вясковым настаўнікам і ўжо паступіў на настаўніцкія курсы, але Найвышэйшая Сіла прымусіла мяне адмовіцца ад гэтага. Калі я стаў бы настаўнікам, маё жыцьцё пайшло б па сьвецкім шляху.

Пасьля заканчэньня гімназіі мяне ўгаворвалі ажаніцца і сваталі багатых нявест, аднак маё сэрца не ляжала да гэтага, апрача таго, я не знайшоў сабе нявесты па сэрцы. Гэта была спакуса. І такіх спакусаў я пераадолеў мноства. Бог мне дапамагаў.

Марыў паступіць на мэдыцынскі факультэт і быць доктарам, але з гэтага нічога не атрымалася, а Гасподзь паклікаў мяне на багаслоўскі факультэт і прывёў мяне да манаства і духоўнага доктарства.

Нашая сям’я не была рэлігійнай і нічым не адрозьнівалася ад мноства такіх самых сем’яў. Але ў гэтай сям’і я адзіны выгадаваўся, з дзіцячых гадоў, глыбока рэлігійным да містыцызму. Адпрыроднае пачуцьцё рэлігійнасьці ўзмацнілася ўва мне пад уплывам маёй дабрачыннай і хваравітай маці, Евы Сьцяпанаўны. Пасьля яе раньняй сьмерці (мне было 11 гадоў) маім выхаваньнем і навучаньнем заняўся мой бацька, Вікенцій Дамінікавіч, чалавек мала рэлігійны і просты; ён жадаў, каб ягоны малодшы сын Антон, гэта значыць я, атрымаў адукацыю. Ён аддаў мяне ў гімназію, але, на жаль, памёр ад тыфу ў 1922 годзе, калі мне не было поўных 18 гадоў. Хварэў і я тады на сыпны тыф, аднак Гасподзь выратаваў мяне ад сьмерці.

Уражлівасьць, сэнтымэнтальнасьць і любоў да прыгажосьці заўсёды былі рысамі майго характару. Кветкі, карціны, жывапіс, краявіды: лясы, палі, лугі, горы і моры – моцна захаплялі мяне. У раньняй маладосьці я сам маляваў, і даволі добра, але жыцьцёвыя ўмовы не дазволілі мне заняцца гэтым мастацтвам. З юначых гадоў мне падабаліся доўгія сьвятарскія расы, богаслужбовыя рызы, цэрквы, патрыярхальнае аблічча сьвятара ў расе, з доўгімі валасамі, барадой, з зіхоткім крыжам на грудзях. Чамусьці мне сьніліся ў маладосьці прарочыя сны з указаньнем майго духоўнага сану і нават епіскапства. Я не надаваў ім значэньня і ня верыў у іх. Вайна нямецка-савецкая прысьнілася мне задоўга да яе пачатку з таемным указаньнем яе выніку не на карысьць Гітлера. Напад немцаў на Югаславію ў красавіку 1943 года прысьніўся мне загадзя. Гэтыя сны я тлумачыў асаблівым станам маёй нэрвовай сыстэмы. Сьняцца яны і цяпер.

Уражлівасьць і сэнтымэнтальнасьць спрычыніліся да многіх маіх непрыемнасьцяў. Часам з-за драбязы я вельмі хваляваўся. Гэта адмоўна ўплывала на здароўе і нэрвовую сыстэму. Неяк я прачытаў верш В. Венядзіктава:

Не дала мне судьба
Ни черствого сердца, ни медного лба.
С черствым бы сердцем я жил бы припевая,
А с медным бы лбом мне все б было нипочем.

У мяне не было ад прыроды ні чэрстрага сэрца, ні меднага лба, таму даводзілася душэўна пакутаваць.

Мае пакуты пачаліся на эміграцыі. Знамянальна было тое, што мая епіскапская хіратанія адбылася ў нядзелю крыжапаклонную, калі пасярод царквы ляжаў вынесены для пакланеньня сьвяты крыж і калі за Боскай літургіяй чыталі Эвангельле пра крыжанашэньне. Гэтае супадзеньне па-прарочы паказвала мне на маё крыжанашэньне ў епіскапскім сане. На радзіме гэтага я яшчэ не адчуваў, але ў апошнія дваццаць гадоў майго архіпастырскага служэньня ў Аўстраліі і Аргентыне крыж майго служэньня часам здаваўся мне не па сілах. Шчымліва было ўсьведамляць, што гэты крыж мне абцяжарвалі мае браты архірэі, і ў першую чаргу члены Архірэйскага Сыноду.

Ні да каго я ня меў злосьці і хутка забываўся на крыўды. Я лічыў сябе найгоршым і таму нічым не ганарыўся. З усімі людзьмі, з духоўнымі і цывільнымі, паводзіў сябе папросту. І такія мае паводзіны часта мне ж і шкодзілі. Многія пачыналі ставіцца да мяне па-панібрацку, што не было карысным у маім архірэйскім сане. Важнічаць я ня ўмеў, гэта не ў маім характары.

Манахам я стаў на 23-м годзе жыцьця, аднак у манастырах давялося жыць мала, а сваё пастырскае служэньне праходзіў у сьвеце. Спакусы мною авалодвалі, але я змагаўся з імі з усёй сілай маёй волі. Вернікі і прыходзкія сьвятары жартавалі з мяне з нагоды майго манаскага подзьвігу. Гасподзь умацоўваў мае сілы, дзякуючы чаму перамагалася ліха.

Шмат я чытаў сьвятаайцоўскай літаратуры, якая дапамагала мне супрацьдзейнічаць спакусам.

Сьв. Васіль Вялікі[62] (IV ст.) апісваў цяжкасьці манаскага і падзьвіжніцкага жыцьця, мала вядомыя цывільным людзям. “Хто жыве па Богу, у таго шмат паклёпнікаў і нярэдка самыя бліжнія да яго падглядаюць за ягоным жыцьцём. Людзі заганныя часьцяком і прыгожыя справы стараюцца ачарніць, а мала важных правіннасьцяў не сьпяшаюцца пакінуць нявысьмеянымі. Як на ніве, калі які барацьбіт пасьлізьнецца, а супраціўнік наступае на яго неадкладна, наносіць яму ўдары, даводзіць яго да поўнага падзеньня, так і яны, як хутка ўбачаць, што той, хто жыве ў подзьвігу дабрачыннасьці, адхіліўся ад дасканаласьці, нападаюць на яго, як стрэламі, паражаюць яго дакорамі і паклёпамі”, – пісаў сьв. Васіль Вялікі.

Сьв. Ціхан Задонскі[63] (XVIII ст.) павучаў: “Непрыяцель, калі бачыць сваю зьнямогу, іншых зьвязьнікаў сваіх на дапамогу кліча, так і вораг наш д’ябал, калі сам не пасьпявае супраць хрысьціяніна, то шукае сабе ў дапамогу ліхіх людзей і змагаецца праз іх з хрысьціянінам”. Асабліва ў гэтым пасьпяховыя жанчыны, якія паслужылі падставай для складаньня рускай прыказкі: “Где диавол сам не возмет, туда бабу пошлет”.

У хвіліны выпрабаваньняў я маліўся словамі Псалмапеўца: “Божа мой! Збаў мяне з рукі грэшніка, бязбожніка і прыгнятальніка” (Пс. 70, 4). “Изми мя отъ врагъ моихъ, Боже, и отъ востающихъ на мя избави мя”.

Будучы ў манаскім сане, я глыбока шанаваў сьвятыя храмы. Дзе я ні служыў, паўсюль клапаціўся пра іх прыгажосьць і чысьціню, часта рабіў гэтую чысьціню сваімі рукамі. Сьвятым правілам для мяне былі словы: “Палюбі прыгажосьць дому Твайго і месца сяленьня славы Тваёй, Гасподзь”.

Зь верай і шчырасьцю я заўсёды шанаваў Божую Маці. Па веры і малітвах Яна вылечыла мяне ад тубэркулёзу лёгкіх у 1928 годзе ў Пачаеўскай Лаўры праз цудадзейны Свой абраз Пачаеўскі. Яна прывяла мяне для служэньня ў Туркавічы, дзе знаходзіўся Яе сьв. абраз Туркавіцкі, а ў 1942 годзе ў Жыровіцкі манастыр да падножжа Яе цудадзейнага абраза Жыровіцкага. Зь верай і спадзяваньнем я ставіўся да Царыцы Нябеснай, як да сваёй нябеснай Заступніцы і Выратавальніцы.

Матэрыяльна забясьпечаны па пасадзе ў Варшаўскім унівэрсытэце, частку свайго заробку я раздаваў бедным студэнтам багаслоўскага факультэта, сваім выхаванцам, а на рэшту грошай будаваў манастыр у сваім родным гнязьдзе – у Завітай, але прыйшла чырвоная армія і ўсе бальшавіцкія парадкі і ўсе мае пляны парушылі. Сам жа я, зь міласьці Божай, трапіў на чужыну. Працуючы тут на ніве Хрыстовай, часта прыгадваю словы паэта:

Хотя бесчувственному телу равно повсюду истлевать,
Но ближе к милому пределу мне все ж хотелось почивать.

## Памяці сяброў

Пусть многих нет, пусть многие далеко,
Но в памяти они всегда живут.
Они запали в душу так глубоко,
Что ласково в прошедшее зовут...

*К. Кульнёў*

Імёны сяброў дарагія для мяне. Шмат хто зь іх ужо адышоў, але ў маёй памяці яны як жывыя. Малюся за іх – і за памерлых, і за жывых. У малітве нітуюся зь імі.

У гэтым сьпісе падаю імёны і прозьвішчы толькі нямногіх, асабліва блізкіх мне. Усіх немагчыма пералічыць тут:

Вялебны Мітрапаліт Дыянісій (Валядзінскі), галава Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, прафэсар і заснавальнік багаслоўскага факультэта Варшаўскага ўнівэрсытэта, магістар багаслоўя Казанскай духоўнай акадэміі, былы рэктар Холмскай духоўнай сэмінарыі, высьвечаны ў сан епіскапа Крамянецкага ў Пачаеўскай Лаўры ў 1913 годзе Сьвяцейшым патрыярхам Антыяхійскім, памёр у Варшаве 15.03.1960 года.

Вялебны Мітрапаліт Цімафей (Шрэтэр), галава згаданай Царквы ў камуністычнай Польшчы, магістар багаслоўя Варшаўскага ўнівэрсытэта, памёр у Варшаве.

Архіепіскап Веніямін (Сяргей Навіцкі), магістар багаслоўя Варшаўскага ўнівэрсытэта, высьвечаны ў епіскапы з манахаў Пачаеўскай Лаўры ў чэрвені 1941 года, адпакутаваў дзесяць гадоў у канцлягеры ў Сыбіры, памёр на катэдры епіскапа 14.10.1976 года ў СССР.

Архіепіскап Філафей (Уладзімір Нарко), магістар багаслоўя Варшаўскага ўнівэрсытэта, высьвечаны ў епіскапа Слуцкага, вікарыя Мінскай епархіі з лістапада 1941 года ў Жыровіцкім манастыры, быў намесьнікам мітрапаліта Мінскага і ўсяе Беларусі Панцеляймона (Ражноўскага), у эміграцыі прызначаны на катэдру Бэрлінскай і Германскай епархіі Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царквы з тытулам архіепіскапа Бэрлінскага і Германскага з рэзыдэнцыяй у Гамбургу.

Епіскап Крамянецкі, вікарый Валынскай епархіі Сімон (Іваноўскі), кандыдат багаслоўя Маскоўскай духоўнай акадэміі (1912), высьвечаны ў епіскапа ў 1925 годзе ў Польшчы, адбыў 10 гадоў канцлягераў у Сыбіры, пасьля служыў архіепіскапам Чарнігаўскім, памёр 1.2.1966 года ў Віньніцы на спачынку.

Архіепіскап Грыгорый (Барышкевіч), кандыдат багаслоўя Казанскай духоўнай акадэміі (1913), мітрафорны протаіерэй у Праваслаўнай Царкве ў Польшчы, у кастрычніку 1943 года прыняў манаскі пострыг і быў высьвечаны ў епіскапа на катэдру Гомельскую і Мазырскую (у Беларусі), памёр у эміграцыі 9.10.1957 года ў Чыкага, дзе займаў епіскапскую катэдру ў Рускай Зарубежнай Праваслаўнай Царкве.

Архімандрыт Ігнат (Мікалай Возераў), закончыў Пажскі корпус у Пецярбургу ў 1916 годзе, багаслоўскі факультэт Варшаўскага ўнівэрсытэта ў 1931 годзе, прыняў манаства ў Пачаеўскай Лаўры напрыканцы 1927 года, першапачаткова сьвятарстваваў у Польшчы, пазьней – у Югаславіі, памёр ад зьнясіленьня ў камуністычнай Альбаніі ў 1947 годзе.

Епіскап Мітрафан (Міхал Гуткоўскі), магістар багаслоўя Варшаўскага ўнівэрсытэта, манах Пачаеўскай Лаўры, настаяцель Яблочынскага манастыра, высьвечаны ў епіскапа Бабруйскага ў 1955 годзе, памёр у Куйбышаве (Самара), дзе займаў епіскапскую катэдру ў СССР.

Мітрафорны протаіерэй Канстанцін Гаўрылкаў, магістар багаслоўскіх навук Варшаўскага ўнівэрсытэта, займаў розныя сьвятарскія пасады ў Польшчы, а пасьля вайны з 1945 года ў СССР, памёр 12.6.1973 года ў Рызе.

Архіепіскап Дамаскін (Малюта), намесьнік Пачаеўскай Лаўры, высьвечаны ў епіскапа Чарнавіцкага ў чэрвені 1940 года ў Маскве, пазьней быў епіскапам і архіепіскапам Камянец-Падольскім, загінуў у 1944 годзе ў час наступу савецкіх войскаў.

Протаіерэй Георгій Латоцкі, магістар багаслоўя Варшаўскага ўнівэрсытэта, забіты бомбай у Варшаве ў жніўні 1944 года ў час польскага паўстаньня.

Архімандрыт Феафан (Феадосій Пратасевіч), зь беларускага духавенства, дырэктар інтэрната Праваслаўнага багаслоўскага ліцэя ў Варшаве, настаяцель царквы на Волі, забіты немцамі ў 1944 годзе.

Мітрафорны протаіерэй Віктар Раманоўскі, вайсковы сьвятар у Польскай арміі, магістар багаслоўя Варшаўскага ўнівэрсытэта, расстраляны бальшавікамі ў Катыні каля Смаленска ў 1940 годзе.

## Мае публікацыі

Я – не пісьменьнік і не вучоны, які ўзбагачае літаратуру навуковымі працамі і мастацкімі творамі. Аднак навуку заўсёды любіў і быў руплівы. У выніку зьявіліся невялікія, часопіснага характару артыкулы і некалькі больш грунтоўных працаў, якія друкаваліся і распаўсюджваліся. Крытыкі не зьвярталі на іх сваёй увагі, маўчалі, таму я не магу аб'ектыўна сказаць пра іх вартасьць або недахопы. Ніжэй падаю сьпіс маіх працаў:

— Гісторыя Яблочынскага манастыра. Яблочын, 1931;

— Сьвяціцель Дзьмітрый Растоўскі як пастыр і настаўнік пастыраў (магістэрская дысэртацыя). Варшава, 1933;

— Што такое маральны характар і як яго выхоўваць у школе (публікацыя з галіны пэдагогікі). Варшава, 1936;

— Разьвіцьцё рэлігійнага пачуцьця ў моладзі школьнага ўзросту. Варшава, 1937;

— Праваслаўнае веравызнаньне Кіеўскага мітрапаліта Пятра Магілы. Вялікі катэхізіс (доктарская дысэртацыя). Варшава, 1939;

— Гісторыя Старога Запавету паводле сучасных навуковых дадзеных (на беларускай мове). Гамбург, 1947;

— Гісторыя Праваслаўнай Царквы ў Беларусі (на беларускай мове). Гамбург, 1948;

- Беларусь у гістарычным дзяржаўным і царкоўным жыцьці. Буэнас-Айрэс (Аргентына), 1966*.

**Артыкулы:**

— Доказы быцьця Божага;
— Дагматычнае і кананічнае ўладкаваньне Праваслаўнай Царквы;
— Іконы і іконашанаваньне;
— Духавенства і народ;
— Літургія або таемства Эўхарыстыі;
— Таемствы Праваслаўнай Царквы;
— Знакі часу. Цудоўныя зьявы ў сьвеце;
— Паніхіды па памерлых іншаверцах;
— Пра Царкву;
— Інфляцыя чалавека;
— Пагрозьлівы паход атэізму;
— Васьміканцовы крыж – рускі крыж;

— Царква і дзяржава ў Расеі;
— Дагматычна-кананічная пагроза Рускай Царкве;
— Маці ўсіх Цэркваў – Царква Праваслаўная;
— Сьвята-Уладзімірскі шлях рускага народа;
— Духоўнае пакліканьне – сьвятарства;
— Грэцкія епіскапы-старастыльнікі.

Гэтым сьпісам не вычэрпваюцца ўсе мае артыкулы, напісаныя ў розны час і апублікаваныя ў царкоўных часопісах. Я зьмясьціў тут толькі найбольш істотныя.

## Камэнтары

[1] **Польская аўтакефальная праваслаўная царква**, кананічнае праваслаўна-адміністрацыйнае аб'яднанне праваслаўных епархій у межах польскай дзяржавы. У 1922 г. патрыяршым экзархам у Польшчы мінскім архіепіскапам Георгіем (Ярашэўскім) абвешчана аўтакефалія Польскай царквы. 13.11.1924 г. ПАПЦ прызнана Канстанцінопальскім патрыярхам, 17.9.1925 г. урачыста абвешчаны акт аўтакефаліі. У 1939 г. ахоплівала 5 епархій: Варшаўскую, Валынскую, Віленскую, Гродзенска-Навагрудскую і Палескую. Маскоўская патрыярхія прызнала кананічнасць ПАПЦ 22.6.1948 г.

[2] **Руская зарубежная праваслаўная царква**, заснавана ў 1921 г. прадстаўнікамі рускай царкоўнай эміграцыі. Да канца 1920-х гг. падтрымлівала сувязі з Рускай праваслаўнай царквой. Афіцыйна не прызнана аўтакефальнымі праваслаўнымі цэрквамі. Аб'ядноўвае каля 500 тыс. веруючых больш чым у 30 краінах свету, найбольшая іх колькасць у ЗША. Узначальваецца мітрапалітам з рэзідэнцыяй у г. Джорданвіль. Вышэйшы орган – Сінод, які складаецца з 5 архірэяў. З 1993 г. мае свайго прадстаўніка ў Расіі.

[3] **Чорная Русь**, у гістарычнай традыцыі назва паўночна-заходняй часткі Беларусі, якая ў сярэдзіне 13 ст. увайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага. Гісторыка-геаграфічныя ўяўленні 18–20 стст. лакалізавалі Чорную Русь вакол Навагрудка, Гродна, Ваўкавыска, Слоніма. Падзел на Белую, Чорную і Чырвоную Русь узнік у заходнееўрапейскай гістарычнай традыцыі не раней за 17 ст. і не быў уласцівы самім усходнім славянам.

[4] **Белая Русь**, назва некаторых зямель сучасных Беларусі і Расіі ў 13-18 ст. Упершыню тэрмін ужыты ў 13 ст. Заходнееўрапейскія і польскія храністы шырока выкарыстоўвалі гэтую назву, але без дакладнай лакалізацыі. З пач. 17 ст. назва ўсё больш звязваецца з верхнім Падняпроўем і Падзвіннем, якія ў ВКЛ раней называлі проста Руссю. У 18 ст. расійскі ўрад лічыў беларускімі Магілёўскую і Віцебскую губерні. У 19 ст. наз Белая Русь пашырылася на ўсю этнічную тэрыторыю беларусаў і дала пачатак сучаснай назве Беларусь.

[5] **Вялікае княства Літоўскае** (ВКЛ), Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае (афіцыйная назва з 15 ст.), феадальная дзяржава на тэрыторыі Беларусі, Літвы, Украіны, часткі Расіі. З 1569 г. у складзе Рэчы Паспалітай. Утворана ў сярэдзіне 13 ст. яго ядром былі беларускія землі верхняга і сярэдняга Панямоння і сярэдняга цячэння ракі Віліі. Дзяржава

ўзнікла ва ўмовах пастаяннай барацьбы з крыжацкай агрэсіяй і пад пагрозай мангола-татарскага нашэсця. Сталіцамі дзяржавы з'яўляліся Навагрудак (з 1240-х гг.) і Вільня (з 1323 г.). Першы вялікі князь Міндоўг.

[6] **Гедымін** (Гедзімін; каля 1275—1341 гг.), вялікі князь ВКЛ у 1316—1341 гг. У час яго княжання асноўная частка беларускіх земляў ад Заходняга Буга да Дняпра ўвайшла ў склад ВКЛ. Вёў актыўныя ваенныя дзеянні супраць тэўтонскага ордэна, клапаціўся аб ваенным умацаванні дзяржавы. Па яго ініцыятыве пабудаваны замкі ў Вільні, Троках, Крэве, Лідзе, Віцебску і інш. Пры Гедыміне была створана літоўская праваслаўная мітраполія з цэнтрам у Навагрудку, якая падпарадкавалася канстанцінопальскаму патрыярху. Загінуў у баі з крыжакамі пры аблозе крэпасці Баербург. Існуе версія, што быў атручаны. Нашчадкі Гедыміна ўтварылі дынастыю Гедымінавічаў.

[7] **Жмудзь**, балцкае племя, іншая назва Жэмайты, Жамойць. Галоўнае племя літоўцаў, жывуць на захадзе сучаснай Літвы. З 1260-х гг. уваходзілі ў склад ВКЛ, але неаднаразова ўздымалі паўстанні супраць улады вялікага князя. Пасля Грунвальдскай бітвы 1410 г. з крыжакімі канчаткова далучаны да ВКЛ і ахрышчаны па каталіцкаму абраду. Жамойць – гістарычная вобласць і адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка ў складзе ВКЛ. Польская назва Жмудзь, лацінская – Самагіція. З 1441 г. поўная афіцыйная назва ВКЛ абавязкова ўключала і назву Жамойць, якая называлася зямлёй, але фактычна была роўнай ваяводству. Падзялялася на воласці, на чале якіх стаялі цівуны.

[8] **Першая сусветная вайна**, 1914—1918 гг. Адбылася паміж дзвюма кааліцыямі дзяржаў. У першую кааліцыю уваходзілі Германія, Аўстра-Венгрыя, Турцыя, Балгарыя, у другую – Антанту – Расія, Францыя, Вялікабрытанія, Сербія, да якіх далучыліся Японія, Італія, Румынія, ЗША. У вайне ўдзельнічала 38 дзяржаў з насельніцтвам больш за 1,5 млрд чалавек. Германія імкнулася да панавання ў Еўропе, ставіла мэтай разграміць Англію, пазбавіць яе калоній і флоту, а таксама Францыю, Бельгію, Галандыю, аслабіць Расію, ад якой забраць Польшчу, Беларусь, Украіну і Прыбалтыку. Зачэпкай для вайны паслужыла забойства членамі сербскай падпольнай арганізайцыі 28.06.1914 г. у Сараеве (Аўстра-Венгрыя) наследніка аўстрыйскага трона эрцгерцага Франца Фердынанда. 28.7.1914 г. Аўстра-Венгрыя аб'явіла вайну Сербіі, 1.8.1914 г. Германія аб'явіла вайну Расіі, 3.3.1914 г. – Францыі. 4.8.1914 г. Англія аб'явіла вайну Германіі. У выніку германскага наступлення 1915 г. каля палавіны тэрыторыі Беларусі апынулася пад нямецкай акупацыяй. У кастрычніку 1915 г. фронт стабілізаваўся на лініі Дзвінск–Паставы–Баранавічы–Пінск. Вайна цягнулася больш за 4 гады і мела надзвычай разбуральны характар – загінула каля 10 млн чалавек, паранена больш за 20 млн чалавек. 3.3.1918 г. падпісаны Брэсцкі мір паміж Германіяй і Расіяй, які быў анульяваны ў выніку лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. ў Германіі.

28.6.1919 г. краіны Антанты падпісалі Версальскі мірны дагавор з Германіяй. У верасні 1919 г. – жніўні 1920 г. былі падпісаны аналагічныя дагаворы паміж краінамі Антанты і дзяржавамі германскага блоку, выпрацаваныя на Парыжскай мірнай канферэнцыі.

[9] **Бежанцы**, у Першую сусветную вайну мірнае насельніцтва, якое з набліжэннем фронту прымусова высялялася і пакідала сталае месца жыхарства. Паводле няпоўных даных, на 14.2.1917 г. у Расіі было 3,2 млн бежанцаў. Бежанцы з Беларусі былі раскіданы па ўсёй Расіі, асабліва ў Тамбоўскай, Самарскай, Калужскай, Казанскай, Курскай, Саратаўскай губернях. На 11.5.1918 г. у Расіі жыло 2 292 395 бежанцаў з Беларусі. Пасля паражэння расійскай арміі вясной-летам 1915 г. і з набліжэннем фронту Беларусь ператварылася ў бежанскі лагер. Рух бежанства быў стыхійны, не існавала плана эвакуацыі. Сяляне імкнуліся застацца на сваёй гаспадарцы, але казакі адпраўлялі іх у бежанства прымусова.

[10] Аўтар мае на ўвазе Лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. у Расіі, у выніку якой было скінута царскае самадзяржаўе. Рэвалюцыйным падзеям папярэднічалі палітычныя стачкі і дэманстрацыі рабочых, пераход на бок рэвалюцыі арміі і флоту. 2(15).3.1917 г. цар Мікалай II адрокся ад прастола, у гэты ж дзень быў сфарміраваны Часовы ўрад.

[11] У выніку лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. у Германіі была скінута манархія. 11.11.1918 г. падпісаннем Кампьенскага перамір’я Германія адмовілася ад Брэсцкага міра, згодна з якім значная частка тэрыторыі Беларусі (па лініі Дзвінск–Свянцяны–Ліда–Пружаны–Брэст) была акупіравана Германіяй. 13.11.1918 г. Брэсцкі мір быўануляваны Усерасійскім цэнтральным выканаўчым камітэтам. Канчаткова скасаваны паводле Версальскіх мірных пагадненняў 1919 г. з Германіяй.

[12] Аўтар мае на ўвазе польска-савецкую вайну 1919-1920 гг. У лютым 1919 г. Польская дзяржава пры падтрымцы краін Антанты і ЗША пачала ўзброеную барацьбу супраць савецкай Расіі. У сакавіку-красавіку 1919 г. польскія войскі занялі Брэст, Ваўкавыск, Слонім, Скідзель, Шчучын, Пінск, Баранівічы. 8.8.1919 г. польскія войскі занялі Мінск. 25.4.1920 г. войскі Польшчы пачалі новае наступленне ў Беларусі і на Украіне. У Беларусі ім супрацьстаялі войскі Заходняга фронту, якія перайшлі ў наступленне ў маі 1920 г. 11.7.1920 г. быў вызвалены Мінск, 14.7.1920 г. войскі Заходняга фронту занялі Вільню і выйшлі на тэрыторыю Польшчы. Але наступленне Чырвонай Арміі было прыпынена, яна была вымушана адступіць. Вынікі вайны былі замацаваны Рыжскім мірным дагаворам 1921 г., паводле якога ў складзе Польшчы засталіся Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна.

[13] **Рыжскі мірны дагавор**, падпісаны 18.3.1921 г. у Рызе паміж РСФСР і УССР з аднаго боку і Польшчай з другога. З’явіўся вынікам вайны паміж савецкай Расіяй і Польскай дзяржавай у 1919—1920 гг. Пера-

мовы аб заключэнні міру пачаліся 17.8.1920 г. у Мінску, з 21.9.1920 г. працягваліся ў Рызе. 12.10.1920 г. быў падпісаны дагавор аб перамір'і і папярэдніх умовах міру. Перамір'е на фронце наступіла 19.10.1920 г. Рыжскі мірны дагавор быў падпісаны дэлегатамі Польшчы, РСФСР і УССР у рыжскім палацы Шварцкопф. Ад імя БССР дагавор падпісала савецкая Расія. Згодна з умовамі дагавора да Польшчы адыходзіла Заходняя Беларусь, тэрыторыя якой складала 113 тыс. км$^2$ з насельніцтвам 4,6 млн чалавек. Дагавор дзейнічаў да пачатку Другой сусветнай вайны і далучэння Заходняй Беларусі да БССР.

[14] Верагодна, размова ідзе пра дзяржаўную польскую гімназію імя Уладзіслава Сыракомлі. У гімназіі вучылася каля 200 чалавек, галоўным чанам палякаў, але вучыліся таксама беларусы і яўрэі. Навучанне было платным. Курс навучання быў разлічаны на 8 гадоў. Абітурыенты вытрымлівалі ўступны экзамен за курс пачатковай 4-класнай школы. У праграму навучання ўваходзілі агульнаадукацыйныя прадметы – польская мова і літаратура, матэматыка, фізіка, гісторыя, геаграфія, анатомія, хімія, французская або нямецкая мова. Выкладаліся таксама лацінь і Закон Божы.

[15] **Багаслоўскі праваслаўны факультэт Варшаўскага універсітэта**, створаны мітрапалітам Дыянісіем (Валядзінскім) у 1924 г., існаваў да 1939 г.

[16] **Дыянісій** (Валядзінскі Канстанцін), праваслаўны царкоўны дзеяч. Нарадзіўся 16.5.1876 г. у г. Мурам Уладзімірскай вобласці (Расія). Скончыў Казанскую духоўную акадэмію. З 1913 г. епіскап крамянецкі, з 1922 г. архіепіскап валынскі і крамянецкі, з 1923 г. мітрапаліт варшаўскі і валынскі. У 1924–1939 і 1940–1948 гг. кіраваў Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквой, стварыў праваслаўны багаслоўскі факультэт пры Варшаўскім універсітэце, прафесар гэтага факультэта. Памёр 15.3.1960 г.

[17] **Нямецка-польская вайна 1939 г**., назва ў гістарычнай літаратуры баявых дзеянняў узброеных сіл фашысцкай Германіі па акупацыі Польшчы з 1.9.1939 г. да 5/6.10.1939 г. Германскія войскі пачалі наступ і наблізіліся да Варшавы, 15.9.1939 г. – да Брэста. У ноч на 18.9.1939 г. польскі ўрад пакінуў краіну. У ходзе вайны Польшча страціла каля 250 тыс. чалавек забітымі і параненымі, каля 750 тыс. трапілі ў палон, з іх 70 тыс. беларусаў.

[18] **Другая сусветная вайна 1939-1945 гг.**, з'яўлялася самай вялікай і кровапралітнай у гісторыі чалавецтва. У вайне ўдзельнічала 61 дзяржава, баявыя дзеянні ішлі на тэрыторыі 40 краін. Блоку Германіі, Японіі, Італіі і інш. супрацьстаялі дзяржавы антыгітлераўскай кааліцыі (Вялікабрытанія, Францыя, ЗША, СССР і інш.). Да пачатку вайны ў 1938 г. Германія акупіравала Аўстрыю, у 1939 г. – Чэхаславакію. Вайна пачалася 1.9.1939 г. нападам Германіі на Польшчу. 3.9.1939 г. вайну Германіі аб'я-

віі Вялікабрытанія і Францыя. Пасля разгрому Польшчы Германія акупіравала Данію, Нарвегію, Бельгію, Галандыю, Люксембург, у 1940 г. пачала ваенныя дзеянні супраць Францыі, якая капітулявала 22.6.1940 г. У верасні 1940 г. Германія ўвяла войскі ў Румынію, вясной 1941 г. акупіравала Балгарыю, Грэцыю, частку Югаславіі. Саюзнікамі фашысцкай Германіі ў вайне сталі Венгрыя, Румынія, Славакія, Балгарыя і Фінляндыя. З нападу 22.6.1941 г. Германіі на СССР пачалася Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гг. У поўнач 8.5.1945 г. у Карлхорсце (прадмесце Берліна) прадстаўнікі германскага вярхоўнага галоўнакамандавання падпісалі акт аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі. Вайна скончылася падпісаннем акта аб капітуляцыі Японіі 2.9.1945 г.

[19] **Пачаеўская лаўра** (Пачаеўска-Успенская лаўра), праваслаўны мужчынскі манастыр (да 1833 г.) у сяле Пачаеў Крамянецкага раёна Цярнопальскай вобласці Украіны, потым атрымаў статус лаўры (назва найбольш буйных і ўплывовых праваслаўных манастыроў, якія карыстаюцца асаблівымі правамі і колькасць манахаў у якіх не абмяжоўваецца). Згадваецца ў крыніцах упершыню ў 16 ст. У сярэдзіне 16 ст. атрымаў значныя зямельныя падараванні ад уладальніцы Пачаева. У 1579 г. пабудавана мураваная царква. З пачатку 18 ст. да 1831 г. належаў базыльянам, пасля паўстання 1830–1831 гг. зноў перададзены праваслаўнай царкве. Архітэктурнымі помнікамі з'яўляюцца Успенскі сабор (пабудаваны ў 1771–1791 гг.) і Троіцкі сабор (пабудаваны ў 1906 г.).

[20] **Жыровіцкі манастыр**, Жыровіцкі Успенскі манастыр – мужчынскі праваслаўны манастыр у в. Жыровічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці. Упершыню згадваецца ў 1587 г., заснаваны на месцы з'яўлення Жыровіцкага абраза Маці Божай. У 1609–1839 гг. быў уніяцкім. Да 1845 г. пры манастыры знаходзілася кафедра Літоўскай праваслаўнай епархіі і духоўная семінарыя. Манастыр меў вялікую бібліятэку і архіў. У 1945–1969 гг. і з 1989 г. пры манастыры дзейнічае Мінская духоўная семінарыя. Архітэктурнае аблічча аформілася ў 17–18 стст. і складаецца з мураваных Успенскага сабора, Крыжаўздзвіжанскай і Яўленскай цэркваў, званіцы, семінарыі, жылога корпуса і гаспадарчых пабудоў.

[21] **Жыровіцкі абраз Маці Божай**, знаходзіцца ў Жыровіцкім Успенскім манастыры. З'яўляецца адной з галоўных святынь Беларусі і праваслаўнай і уніяцкай цэрквамі ўшаноўваецца як цудатворны. Паводле царкоўнага падання, абраз з'явіўся ў 1470 г. пастушкам у лесе на грушыдічцы. З пачатку 17 ст. стаў славіцца як цудатворны за вылячэнні хворых.

[22] **Стараверы** (старaабраднікі), назва ў гістарычнай літаратуры прыхільнікаў рэлігійнай плыні, якая ўзнікла ў выніку расколу ў Рускай праваслаўнай царкве, калі частка веруючых адмовілася прыняць царкоўныя рэформы патрыярха Нікана ў другой палове 17 ст. Стараверы па-

дзяліліся на 2 часткі: папоўцаў (якія захавалі ўвесь традыцыйны духоўны лад) і беспапоўцаў (адмовіліся ад інстытута святарства і лічаць ерэтычнай афіцыйную праваслаўную царкву). У Беларусь пачалі перасяляцца з другой паловы 17 ст. Беспапоўцы аселі пераважна на паўночных землях: Браслаў, Лепель, Полацк, Сянно, Віцебск і інш. Папоўцы – на паўднёвым усходзе Беларусі: Магілёў, Чэрыкаў, Ветка, Гомель. Найбуйнейшым пасяленнем старавераў у Беларусі была Ветка, заснаваная ў 1685 г. Царскія ўлады перасьледавалі старавераў, неаднаразова праводзілі іх прымусовае высяленне ў Сібір. У сучаснай Беларусі існуе больш 30 абшчын старавераў, якія жывуць ва ўсіх абласцях краіны.

[23] **Сава** (Саветаў Юрый Яўгенавіч), праваслаўны царкоўны дзеяч. Нарадзіўся 18.4.1898 г. у Санкт-Пецярбургу. Вучыўся на тэалагічных факультэтах Бялградскага (1921—1924 гг.) і Варшаўскага (1926—1928 гг.) універсітэтаў. З 1920 г. у эміграцыі ў Сербіі. У 1925 г. пасвячоны ў святара. З 1931 г. епіскап люблінскі. З 1937 г. епіскап гродзенскі і навагрудскі. Прыкладаў намаганні ў накірунку паланізацыі Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, ініцыятар мерапрыемстваў па ператварэнні беларусаў і украінцаў у так званых праваслаўных палякаў. З верасня 1939 г. у Літве, Германіі, Румыніі, Турцыі, Індыі. У 1942—1943 гг. у ЗША і Вялікабрытаніі, адкуль польскім эміграцыйным урадам накіраваны ў 2-і польскі корпус генерала У.Андэрса, у званні генерала брыгады займаў пасаду ваеннага капелана, прайшоў з корпусам увесь яго баявы шлях. Пасля Другой сусветнай вайны ў Вялікабрытаніі. З 1947 г. архіепіскап. Памёр 21.5.1951 г.

[24] **Ціхан** (Балявін Васіль Іванавіч), расійскі праваслаўны царкоўны дзеяч. Нарадзіўся 31.1.1865 г. У Пскоўскай губерні (цяпер Пскоўская вобласць). Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя (1888 г.). Выкладаў у рэлігійных навучальных установах, з 1898 г. у прыходах Рускай праваслаўнай царквы ў ЗША. У 1907–1913 гг. архіепіскап растоўскі і яраслаўскі, у 1914–1917 гг. – літоўскі і віленскі. З ліпеня 1917 г. мітрапаліт маскоўскі і каломенскі. 18.11.1917 г. на памесным саборы Рускай праваслаўнай царквы абраны патрыярхам маскоўскім і ўсяе Расіі. У складаных для царквы ўмовах у 1921 г. пагадзіўся на самастойнае царкоўнае кіраванне ў межах асобных епархій ці іх груп. Памёр 7.4.1925 г. У 1988 г. кананізаваны Рускай праваслаўнай царквой.

[25] **Яблочынскі Свята-Ануфрыеўскі манастыр**, праваслаўны мужчынскі манастыр. Знаходзіцца ў в. Яблочын за 30 км ад г. Цярэспаль на беразе р. Буг у Люблінскім ваяводстве Польшчы. Заснаваны ў пачатку 14 ст. Згодна падання, месца для яго ўказаў святы Ануфрый Вялікі, які аднойчы з’явіўся рыбакам, а праз нейкі час да берага прыстаў цудадзейны абраз святога. Пасля Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. манастыр застаўся праваслаўным. У 1838—1840 гг. пабудаваны галоўны манастырскі му-

раваны храм св. Іаана Багаслова, які дзейнічае і цяпер. У 1840 г. падпарадкаваны архіепіскапу Варшаўскаму. У 1915 г. эвакуіраваны ў Маскву, у 1918 г. большасць манахаў вярнулася ў Яблочын, але манастырскія збудаванні былі зруйнаваны, маёмасць канфіскавана. З 1929 г. пры манастыры існавалі прытулак для састарэлых святароў, псаломшчыкаў, дыяканаў, настаўнікаў Закону Божага. У Другую сусветную вайну манастыр разбураны, яго адраджэнне пачалося ў 2-й палове 1960-х гг.

[26] Аўтар мае на ўвазе фарміраванні так званай Арміі Краёвай (АК), падпольнай ваеннай арганізацыі, якая дзейнічала ў 1942–1945 гг. на акупіраванай Германіяй тэрыторыі Польшчы і частцы тэрыторыі СССР (Беларусь, Літва, Украіна). Знаходзілася ў падпарадкаванні польскага эмігранцкага ўраду ў Лондане, налічвала да 300 тыс. чалавек. У сваёй дзейнасці кіравалася тэорыяй "двух ворагаў" – Германіі і СССР. Пасля разрыву адносін паміж СССР і польскім эмігранцкім урадам у красавіку 1943 г. узмацнілася канфрантацыя АК з савецкімі партызанскімі атрадамі. Найбольш буйнымі атрадамі АК на тэрыторыі Беларусі былі атрады Навагрудскай акругі, якія аб'ядноўвалі каля 7 тыс. чалавек. Афіцыйна фарміраванні АК распушчаны 9.1.1945 г. Лонданскім эмігранцкім урадам, але працягвалі ўзброеную барацьбу да пачатку 1950-х гг.

[27] **Польскае паўстанне ў Варшаве 1944 г.**, узнята 1.8.1944 г. эмігранцкім урадам Польшчы і фарміраваннямі Арміі Краёвай у сувязі з пачаткам вызвалення тэрыторыі Польшчы Чырвонай Арміяй. Было слаба падрыхтаваным, таму жорстка задушана нямецкімі войскамі.

[28] **Тухачэўскі** Міхаіл Мікалаевіч, савецкі ваенны дзеяч, з 1935 г. маршал Савецкага Саюза. Нарадзіўся 16.2.1893 г. у Маскве. З 1912 г. служыў у арміі царскай Расіі, з 1918 г. у Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у баях з арміяй Калчака. З 1920 г. камандуючы Заходнім фронтам у час савецка-польскай вайны, кіраваў Варшаўскай аперацыяй Чырвонай Арміі. З 1921 г. займаў важныя ваенныя пасады – быў начальнікам Ваеннай акадэміі, начальнікам штаба Чырвонай Арміі, камандуючым ваеннымі акругамі, з 1936 г. першы намеснік наркама абароны СССР. У 1937 г. рэпрэсіраваны, рэабілітаваны ў 1957 г.

[29] **Украінская народная рэспубліка** (УНР), была абвешчана 20.11.1917 г. у Кіеве Украінскай цэнтральнай радай. Напачатку дэкларавалася ўкраінскай нацыянальнай дзяржавай у складзе федэратыўнай Расіі, з 22.1.1918 г. – як незалежная дзяржава. 29.4.1918 г. генерал П.П.Скарападскі замест УНР абвясціў Украінскую дзяржаву (Гетманшчыну), але ў снежні 1918 г. УНР была адноўлена Украінскай дырэкторыяй. Знаходзілася ў стане ваеннага супрацьстаяння з РСФСР і УССР, урадам генерала А.І.Дзянікіна. Падтрымлівала цесныя зносіны з краінамі аўстрагерманскага ваеннага блоку і Польшчай. З 1921 г. пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора ўрад УНР існаваў у эміграцыі.

[30] Аўтар мае на ўвазе Вялікую Айчынную вайну 1941-1945 гг., якую вёў СССР супраць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў (у іх ліку Італія, Румынія, Венгрыя, Фінляндыя). Вайна з'яўлялася найбольш важнай складаючай часткай Другой сусветнай вайны. Ваенныя дзеянні адбываліся з 22.6.1941 г. да 9.5.1945 г., у тым ліку на тэрыторыі Беларусі да 28.7.1944 г.

[31] **Аўтакефальная царква**, самастойная царква ў праваслаўі, адміністрацыйна незалежная ад іншых цэркваў. У лік аўтакефальных цэркваў уваходзяць Албанская, Александрыйская, Амерыканская, Антыяхійская, Балгарская, Грэчаская, Грузінская, Іерусалімская, Канстанцінопальская, Кіпрская, Польская, Румынская, Руская, Сербская, Праваслаўная царква Чэшскіх зямель і Славакіі.

[32] **Беларуская праваслаўная царква**, з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны частка духавенства і беларускіх палітычных дзеячаў зрабіла спробу аднавіць аўтакефальную Беларускую праваслаўную царкву, якая была абвешчана ў 1927 г. У 1941—1942 гг. было сфарміравана царкоўнае кіраўніцтва (мітрапаліцкая ўправа, затым Сінод) на чале з мітрапалітам Панцеляймонам. Да сярэдзіны 1944 г. існавалі Мінская, Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская, Навагрудская і Палеская епархіі. Царкоўны сабор, які адбыўся ў Мінску ў жніўні-верасні 1942 г., зацвердзіў Статут царквы, але адклаў фармальнае абвяшчэнне аўтакефаліі да канца вайны.

[33] **Філафей** (Уладзімір Нарко), праваслаўны царкоўны дзеяч. Нарадзіўся 25.2.1905 г. у мястэчку Ілья (паводле іншых звестак – у в. Занарач) Віленскай губерні (цяпер Мінская вобласць). Скончыў Віленскую праваслаўную духоўную семінарыю, у 1925–1929 гг. вучыўся на багаслоўскім факультэце Варшаўскага універсітэта. З пачатку 1930-х гг. выконваў святарскія абавязкі на Холмшчыне, у Галіцыі, у Варшаве. У 1941 г. рукапаложаны ў сан епіскапа, у 1942 г. прызначаны епіскапам Магілёўскім і Мсціслаўскім Беларускай праваслаўнай царквы. З 1944 г. у эміграцыі, у 1946 г. далучыўся да рэлігійнай юрысдыкцыі Рускай зарубежнай праваслаўнай царквы. З канца 1940-х гг. стала жыў у Германіі. Памёр 24.9.1986 г. у Гамбургу.

[34] **"Дамоклаў меч"**, выраз, які абазначае пастаянную небяспеку. Згодна са старажытна-грэчаскім паданнем, Дамокл быў фаварытам сіракузскага тырана Дыянісія Старэйшага і лічыў яго самым шчаслівым з людзей. Каб паказаць нетрываласць свайго шчасця, Дыянісій у час піру пасадзіў Дамокла на сваё месца і павесіў над яго галавой на конскім воласе востры меч, чым паказаў небяспечнасць жыцця.

[35] **Панцеляймон** (Ражноўскі Павел Стафанавіч), праваслаўны царкоўны дзеяч. Нарадзіўся 2.10.1867 г. у г. Кастраме (Расія). Скончыў духоўныя курсы пры Казанскай духоўнай акадэміі. У 1913 г. пасвячоны ў епіскапа. Маскоўскі патрыярхат у 1920 г. прызначыў яго епіскапам

пінскім. У 1922—1939 гг. польскімі ўладамі пазбаўлены епіскапскай кафедры і знаходзіўся пад наглядам у розных манастырах Польшчы. У 1939—1940 гг. патрыяршы экзарх Заходніх Беларусі і Украіны, у 1940—1941 гг. архіепіскап гродзенскі. Ва ўмовах ваеннай акупацыі ў 1941—1944 гг. мітрапаліт мінскі і ўсяе Беларусі. З 1944 г. у эміграцыі, з 1946 г. перайшоў пад юрысдыкцыю Рускай зарубежнай праваслаўнай царквы. Памёр 30.12.1950 г.

[36] **Сергій**, патрыярх Маскоўскі і ўсяе Расіі. Нарадзіўся ў 1867 г. у г. Арзамас. У 1890 г. скончыў Санкт-Пецярбургскую духоўную акадэмію. З 1907 г. архіепіскап, з 1917 г. мітрапаліт. З 1937 г. местаблюсціцель патрыяршага прастолу. На Архірэйскім саборы ў верасні 1943 г. абраны патрыярхам Маскоўскім. Памёр у 1944 г. у Маскве.

[37] **Смаргонская акадэмія**, так жартоўна называўся промысел па лоўлі і дрэсіроўцы мядзведзяў, які быў заснаваны Радзівіламі ў Смаргоні і існаваў з 17 ст. да пачатку 19 ст. Недалёка ад Смаргоні мядзведзяў дрэсіравалі: вучылі стаяць на задніх лапах, кланяцца, танцаваць. Павадыры з вучонымі мядзведзямі хадзілі па кірмашах не толькі Беларусі, але і Расіі, Венгрыі, Германіі і іншых краін. Прыбытковым быў гандаль дрэсіраванымі мядзведзямі.

[38] **Полацкая праваслаўная епархія**, старэйшая праваслаўная епархія на тэрыторыі Беларусі. Цэнтр – у г. Полацк. Была заснавана ў 992 г., яе кафедральным храмам стаў Полацкі Сафійскі сабор. У 1511 г. атрымала статус архіепіскапіі. Пасля падпісання Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г. замест праваслаўнай была ўтворана Полацкая уніяцкая епархія. Як праваслаўная адноўлена ў 1833 г. З 1840 г. межы епархіі супадалі з адміністрацыйнымі межамі Віцебскай губерні. У 1920-я – 1930-я гг. царкоўнае жыццё заняпала, пасля 1945 г. епіскапы не прызначаліся. Адноўлена 22.7.1989 г., ахоплівала тэрыторыю Віцебскай вобласці. З 1992 г. межы епархіі звузіліся (ахоплівае 11 раёнаў Віцебскай вобласці, падзелена на 8 благачынных акруг).

[39] **Жыровіцкі Свята-Успенскі сабор**, галоўны сабор Жыровіцкага Успенскага манастыра. Мураваны сабор пабудаваны ў 1650 г. у стылі барока. Рэканструяваны ў 1-й палове 19 ст., пасля чаго набыў рысы класіцызму. З’яўляецца помнікам гісторыі і культуры Беларусі.

[40] **Налібоцкая пушча**, лясны масіў, які размешчаны ў басейнах правых прытокаў Нёмана, Бярэзіны і Усы, займае ўсходнюю ўскраіну Верхненёманскай раўніны. Каля 80 % яе тэрыторыі займаюць лясы, пераважна хваёвыя. На поўначы даходзіць да Ашмянскіх град, на ўсходзе – да Мінскага ўзвышша. Займае плошчу каля 140 тыс. га. Паўднёва-ўсходнюю частку пушчы займае біялагічны заказнік Налібоцкі, створаны ў 1960 г. з мэтай аховы ўнікальнага прыроднага комплексу (Валожынскі, Стаўбцоўскі, Іўеўскі, Навагрудскі раёны Беларусі).

[41] **Красноў** Пётр Мікалаевіч, расійсківаенны дзеяч, генерал-лейтэнант (1917). Нарадзіўся 22.9.1869 г. у Пецярбургу ў сям'і казацкага генерала, атрымаў ваенную адукацыю. У Першую сусветную вайну камандаваў казацкімі брыгадай, дывізіяй, корпусам. У Кастрычніцкую рэвалюцыю 1917 г. быў прызначаны А.Ф. Керанскім камандуючым войскамі і накіраваны з фронту ў Петраград для падаўлення рэвалюцыі. Быў разбіты і ўзяты ў палон. Збег на р. Дон, дзе быў абраны атаманам Войска Данскога, стварыў казацкую армію, наступаў на г. Царыцын, але быў разбіты. З 1919 г. у Германіі. У час Другой сусветнай вайны ствараў казацкія часці і іншыя вайсковыя антысавецкія фарміраванні. Захоплены савецкімі войскамі і 17.1.1947 г. смяротна пакараны.

[42] **Амерыканская праваслаўная царква**, аўтакефальная царква з 1970 г. Кафедра знаходзіцца ў Нью Йорку, узначальваецца мітрапалітам. У межах ЗША мае 8 епархій, больш 350 парафій. Распаўсюджвае сваю рэлігійную юрысдыкцыю на частку праваслаўных веруючых Канады, краін Лацінскай Амерыкі і Аўстраліі.

[43] **Анастасій** (А.Грыбаноўскі; 1873—1965 гг.), рэлігійны дзеяч, мітрапаліт, кіраўнік Сінода Рускай зарубежнай праваслаўнай царквы з 1936 г.

[44] Капітуляцыя Германіі з'яўлялася завяршальным актам Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. і завяршала вайну ў Еўропе на еўрапейскім тэатры ваенных дзеянняў Другой сусветнай вайны. Падпісана ў ноч на 8.5.1945 г. у прыгарадзе Берліна Карлсхорсце. Генерал-фельдмаршал В. Кейтэль у прысутнасці прадстаўнікоў Савецкага Саюза – маршала Г.К. Жукава, Англіі – галоўнага маршала авіяцыі А. Тэдэра, ЗША – генерала К. Спаатса, Францыі – генерала дэ Латр дэ Трасіны ад імя германскага вярхоўнага галоўнакамандавання падпісаў акт аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі.

[45] **Эйзенхаўэр** Дуайт Дэвід, дзяржаўны і ваенны дзеяч ЗША. Нарадзіўся 14.10.1890 г. У Другую сусветную вайну камандаваў амерыканскімі войскамі ў Еўропе, кіраваў у 1944 г. высадкай англа-амерыканскіх войск у Францыі. Пасля разгрому Германіі камандаваў войскамі ЗША у Германіі, быў начальнікам штаба войск ЗША, галоўнакамандуючым войскамі НАТО у Еўропе. У 1953–1961 гг. прэзідэнт ЗША. Памёр 28.3.1969 г. у Вашынгтоне.

[46] **Перамешчаныя асобы**, людзі, якія былі вывезены ў час Другой сусветнай вайны ў Германію з акупіраваных ёю тэрыторый на прымусовыя работы. З тэрыторыі Беларусі было вывезена каля 400 тыс. чалавек. Каля 250 тыс. з іх вярнуліся на радзіму да пачатку 1946 г. У заходніх зонах Германіі і Аўстрыі знаходзілася каля 250 тыс. чалавек, якія да 1.9.1939 г. былі грамадзянамі Польшчы, а таксама Латвіі, Літвы і Эстоніі. Каля 100 тыс. беларусаў, якія знаходзіліся ў заходніх зонах акупацыі Германіі саюзнікамі, не жадалі вяртацца ў Беларусь. Як перамешчаныя асо-

бы яны перайшлі пад апеку ЮННРА (Арганізацыі аб'яднаных нацый у справах дапамогі і аднаўлення), а потым Міжнароднай арганізацыі па правах бежанцаў (IRO). На тэрыторыі Заходняй Германіі і Аўстрыі існавала каля 20 беларускіх лагераў. Яны мелі самакіраванне са сваёй адміністрацыяй, сацыяльнымі і культурнымі ўстановамі. Да сярэдзіны 1950-х гг. большасць перамешчаных асоб перасяліліся на сталае жыхарства ў краіны Еўропы, Амерыкі і ў Аўстралію.

[47] **ЮНРРА** (англ. United Nations Relief and Rehabilitation Administration), Адміністрацыя дапамогі і аднаўлення Арганізацыі аб'яднаных нацый, міжнародная арганізацыя, створаная краінамі антыгітлераўскай кааліцыі 9.11.1943 г. для аказання дапамогі краінам, якія пацярпелі ў Другую сусветную вайну ў галіне фінансаў, прамысловага і сельскагаспадарчага аднаўлення, аховы здароўя і інш. У складзе арганізацыі дзейнічаў камітэт па пытаннях утрымання перамешчаных асоб. У 1947 г. арганізацыя спыніла сваё існаванне.

[48] **Уласаў** А.А., генерал-лейтэнант Чырвонай Арміі, камандуючы 2-й Ударнай арміі Волхаўскага фронту, які здаўся ў палон германскім войскам у ліпені 1942 г. Узначаліў вайсковыя фарміраванні, якія дзейнічалі супраць Чырвонай Арміі. У маі 1945 г. захоплены ў палон на тэрыторыі Чэхаславакіі і 1.8.1946 г. пакараны смерцю згодна з прыгаворам Вайсковай калегіі Вярхоўнага суда СССР.

[49] **Беларускі нацыянальны камітэт у Рэгенсбургу**, грамадская арганізацыя, якая дзейнічала ў 1945—1950 гг. у Германіі ў лагерах для перамешчаных асоб. Камітэт быў створаны ў жніўні 1945 г. у амерыканскай акупацыйнай зоне. Займаўся дабрачыннай і культурна-асветнай дзейнасцю сярод беларускіх эмігрантаў.

[50] **Беларуская гімназія імя Янкі Купалы**, існавала ў 1945—1950 гг. у Германіі. Была створана ў лагеры для перамешчаных асоб у г. Рэгенсбург каб рыхтаваць беларускую моладзь для паступлення ў вышэйшыя навучальныя установы замежных краін. Мела 8 класаў, адбылося 5 выпускаў, пасведчанні аб заканчэнні атрымалі 44 чалавекі. Выкладаліся агульнаадукацыйныя прадметы, рэлігія, замежныя мовы.

[51] **Беларуская аўтакефальная праваслаўная царква**, рэлігійная арганізацыя беларусаў у эміграцыі. Заснавана ў чэрвені 1948 г. у Германіі рэлігійнымі і грамадскімі дзеячамі – прыхільнікамі ўрада БНР. Дзейнічала ў Еўропе (Германія, Англія, Францыя, Бельгія), з пачатку 1950-х гг. у ЗША, Канадзе і Аўстраліі. У 1949 г. створаны сабор епіскапаў БАПЦ. У наш час у замежных краінах дзейнічае каля 20 прыходаў царквы.

[52] **Сергій** (Рыгор Ахоценка), праваслаўны святар, рэлігійны дзеяч беларускага замежжа. Нарадзіўся 12.3.1890 г. у в. Малыя Гарошкі на Жытоміршчыне ў сялянскай сям'і. У 1911–1921 гг. атрымаў пачатковую ду-

хоўную адукацыю ў Багаяўленскім манастыры ў г. Жытомір. У 1919 г. пастрыжаны ў манахі. У жніўні 1943 г. высвячаны ў епіскапа Украінскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы. З 20.12.1949 г. архіепіскап Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы на эміграцыі. З 1950 г. у Аўстраліі. Памёр 2.10.1971 г. у г. Адэлаіда.

[53] **Беларуская праваслаўная царква Паўночнай Амерыкі**, аб'ядноўвае беларускія праваслаўныя прыходы, якія ўзніклі ў ЗША і Канадзе ў пачатку 1950-х гг. З'яўляецца самастойнай епархіяй у складзе экзархата Канстанцінопальскай патрыярхіі ў Паўночнай і Паўднёвай Амерыцы. Створана ў 1970 г. на царкоўным з'ездзе ў г. Саўт-Рывер. Кіруецца статутам, прынятым у 1980 г.

[54] **Лапіцкі** Мікалай, рэлігійны дзеяч беларускага замежжа. Нарадзіўся 26.1.1907 г. у в. Грэлікі Віленскага павета (цяпер Мінская вобласць). Скончыў Віленскую праваслаўную духоўную семінарыю (1930 г.) і багаслоўскі факультэт Варшаўскага універсітэта. З 1944 г. у Германіі, з 1950 г. у ЗША. Служыў настаяцелем беларускага храма св. Ефрасінні Полацкай у г. Саўт-Рывер. З'яўляўся кіраўніком Беларускай праваслаўнай царквы Паўночнай Амерыкі, якая падпарадкоўваецца Канстанцінопальскаму патрыярху. Памёр 8.8.1976 г.

[55] **Брытанская зона акупацыі**, уключала тэрыторыю паўночна-заходняй часткі Германіі (Вестфалія і Гановер) з буйнымі гарадамі Бон, Кёльн, Дусбург, а таксама Гамбург, Любэк, Кіль і інш.

[56] Сусветны Савет Цэркваў, створаная ў 1948 г. міжнародная арганізацыя, якая з'яўляецца выразнікам экуменічнага руху за ліквідацыю дзялення хрысціян на канфесіі. Першыя экуменічныя арганізацыі ўзніклі ў еўрапейскіх краінах у 1920-я гг. У наш час Сусветны Савет Цэркваў акрамя вырашэння сваёй галоўнай мэты – распрацоўкі асноў будучай адзінай царквы – праводзіць работу, накіраваную на вырашэнне найбольш складаных праблем грамадства – захавання міру, дасягнення сацыяльнай справядлівасці, экалагічнай бяспекі. Сусветны Савет Цэркваў аб'ядноўвае большасць пратэстанцкіх цэркваў, старакаталіцкіх, праваслаўных, а таксама армянскую царкву (каля 300 рэлігійных арганізацый з больш чым 150 краін свету, больш чым 450 млн веруючых). Падтрымлівае сувязі з ААН, ЮНЕСКО і інш. міжнароднымі арганізацыямі.

[57] **Ціта**, Броз-Ціта Іосіф, дзяржаўны і палітычны дзеяч Югаславіі. Маршал (1943 г.), тройчы Народны герой (1944 г., 1972 г., 1977 г.). Нарадзіўся 25.5.1892 г. у Харватыі. У час барацьбы супраць фашысцкай Германіі ў 1941—1945 гг. быў галоўнакамандуючым Народна-вызваленчай арміі і партызанскіх атрадаў. Прапаноўваў уласную мадэль сацыялістычнага грамадства. У 1952—1966 гг. генеральны сакратар Саюза камуністаў Югаславіі, з 1953 г. – прэзідэнт Югаславіі і старшыня Саюзнага выканаўчага веча. Памёр 4.5.1980 г.

[58] **IRO** (International refugee organization), Міжнародная арганізацыя па правах бежанцаў. Дзейнічала ў сістэме ААН у 1946—1951 гг. і змяніла ў сваёй дзейнасці Адміністрацыю Арганізацыі аб'яднаных нацый у справах дапамогі і аднаўлення (ЮНРРА).

[59] **Украінская аўтаномная праваслаўная царква**, створана на саборы, які адбыўся ў Пачаеўскім манастыры ў жніўні 1941 г., часткай епіскапаў Заходняй Украіны, якія пасля далучэння гэтай тэрыторыі да Савецкага Саюза перайшлі з рэлігійнай юрысдыкцыі Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў юрысдыкцыю Маскоўскай патрыярхіі. Кіраваліся пастановамі Маскоўскага сабора 1917—1918 гг. аб дараванні царкве на Украіне аўтаноміі, якія ў 1922 г. былі пацверджаны патрыярхам Ціханам. На чале царквы стаяў мітрапаліт Алексій (Грамадскі; забіты ў 1943 г. бандэраўцамі), які быў абвешчаны мітрапалітам-экзархам. У канцы 1942 г. у царквы было 16 епіскапаў, больш за 20 манастыроў. Пасля 1944 г. частка іерархаў эмігрыравала, частка далучылася да Маскоўскай патрыярхіі.

[60] **Армія Андэрса**, вайсковыя фарміраванні польскага эміграцыйнага урада ў Другую сусветную вайну, якімі камандаваў генерал У. Андэрс. Створана на тэрыторыі СССР у жніўні 1941 – сакавіку 1942 гг. як Польская армія ў СССР. Падставай для яе стварэння з'явілася савецка-польскае пагадненне ад 14.8.1941 г. аб сумесных дзеяннях на савецка-германскім фронце. Да жніўня 1942 г. падпарадкоўвалася камандаванню Чырвонай Арміі, складалася з 6 пяхотных дывізій, налічвала 66 тыс. чалавек. У сакавіку-красавіку і жніўні 1942 г. эвакуіравана ў Іран і Ірак. У складзе арміі Андэрса змагалася каля 30 тыс. ураджэнцаў Беларусі.

[61] **Іаан Златавуст** (па-грэчаску Хрызастом; каля 350—407 гг.), візантыйскі царкоўны дзеяч, прапаведнік. У 398—404 гг. з'яўляўся Канстанцінопальскім патрыярхам. Вылучаўся выдатным красамоўствам.

[62] **Васіль Вялікі** (каля 330—379 гг.), рэлігійны дзеяч, царкоўны багаслоў, які мае асаблівае значэнне ў хрысціянстве. З'яўляўся епіскапам Кесарыі Кападакійскай. Аўтар пропаведзей, гутарак, настаўленняў, распрацаваў варыянт літургіі, прыняты ў праваслаўі да нашага часу.

[63] **Ціхан Задонскі**, праваслаўны царкоўны дзеяч, багаслоў, рэлігійны пісьменнік, святы. Нарадзіўся ў 1724 г. у Наўгародскай губерні. У 1758 г. прыняў манаства. З 1761 г. епіскап Кексгольмскі і Ладажскі, з 1763 г. епіскап Варонежскі. З 1769 г. жыў у Задонскім манастыры. Аўтар пропаведзей, настаўленняў, пісьмаў і іншых багаслоўскіх твораў. Памёр 13.8.1783 г.

## Зьмест


Уступнае слова ... 7
Прысьвячэньне ... 20
Замест прадмовы ... 22
Разьдзел першы. Родныя далячыні ... 24
Разьдзел другі. Рэлігійнасьць ... 31
Разьдзел трэці. Багаслоўскі факультэт ... 34
Разьдзел чацьвёрты. Манаства ... 38
Разьдзел пяты. Паслужны сьпіс ... 44
Разьдзел шосты. Архімандрыт ... 60
Разьдзел сёмы. Праваслаўная Царква ў Польшчы ... 72
Разьдзел восьмы. ... 74
Частка 1. Епіскап Віцебскі ... 74
Частка 2. Эміграцыя (уступ) ... 83
Разьдзел дзевяты. Шлях на чужыну ... 85
Разьдзел дзесяты. Архіпастырства ў Нямеччыне ... 93
Разьдзел адзінаццаты. Кіраўнік вікарыяцтва ... 99
Разьдзел дванаццаты. На пасадзе епіскапа ў Аўстраліі ... 105
Разьдзел трынаццаты. Епіскап без епіскапства ... 115
Разьдзел чатырнаццаты. Епіскап Аргентынскі ... 119
Разьдзел пятнаццаты. Архіепіскап Аргентынскі ... 123
Разьдзел шаснаццаты. Архіепіскап Аўстралійскі ... 128
Разьдзел сямнаццаты. На спачынку ... 136
Разьдзел васемнаццаты. Архіепіскап Аргентынскі ... 142
Заканчэньне ... 144
Памяці сяброў ... 149
Мае публікацыі ... 151
Камэнтары (Л. Языковіч) ... 153